Артыкул 560. Падставы для адмовы ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 561. Форма і змест апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 562. Пакіданне апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту без руху
Артыкул 563. Дзеянні суда першай інстанцыі пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 564. Дапаўненні, змяненні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 565. Далучэнне да апеляцыйнай скаргі
Артыкул 566. Водзыў на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст
Артыкул 567. Адмова ад апеляцыйнай скаргі, адкліканне апеляцыйнага пратэсту
Артыкул 568. Адмова істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам, зацвярджэнне міравога пагаднення ў судзе апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 569. Медыяцыя, перагаворы бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, прымірэнчая працэдура ў судзе апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 570. Вяртанне справы судом апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 571. Спыненне вядзення па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце
Артыкул 572. Прыпыненне выканання рашэння суда першай інстанцыі судом апеляцыйнай інстанцыі
§ 3. Падрыхтоўка і разгляд справы судом апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 573. Падрыхтоўка да разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 574. Тэрміны разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 575. Прадмет і межы разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 576. Парадак разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 577. Фіксаванне ходу судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 578. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 579. Падставы для адмены або змянення рашэння суда першай інстанцыі
Артыкул 580. Падставы для адмены рашэння суда поўнасцю ці ў частцы са спыненнем вядзення справы або пакіданнем заявы без разгляду
Артыкул 581. Парадак разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, што паступілі пасля разгляду справы ў апеляцыйным парадку
§ 4. Вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі
Артыкул 582. Змест апеляцыйнага вызначэння
Артыкул 583. Парадак вынясення і абвяшчэння апеляцыйнага вызначэння
Артыкул 584. Законная сіла апеляцыйнага вызначэння
Артыкул 585. Прыватнае вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі
§ 5. Перагляд у апеляцыйным парадку вызначэнняў суда першай інстанцыі
Артыкул 586. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў суда першай інстанцыі
Артыкул 587. Парадак падачы і разгляду прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту
Артыкул 588. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі пры разглядзе прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту на вызначэнне суда першай інстанцыі

Артыкул 589. Законная сіла апеляцыйнага вызначэння, вынесенага па прыватнай скарзе і (або) прыватным пратэсце
ГЛАВА 56. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ СУДОЎ ПЕРШАЙ І АПЕЛЯЦЫЙНАЙ ІНСТАНЦЫЙ (КАСАЦЫЙНАЕ ВЯДЗЕННЕ)
§ 1. Перагляд судовых пастаноў у касацыйным парадку
Артыкул 590. Суды касацыйнай інстанцыі
Артыкул 591. Права на зварот з касацыйнай скаргай у суд касацыйнай інстанцыі
Артыкул 592. Прадстаўленне суддзі ў суд касацыйнай інстанцыі
Артыкул 593. Парадак і тэрмін падачы касацыйнай скаргі
Артыкул 594. Форма і змест касацыйнай скаргі
Артыкул 595. Вяртанне касацыйнай скаргі
§ 2. Узбуджэнне касацыйнага вядзення
Артыкул 596. Разгляд касацыйнай скаргі
Артыкул 597. Вызначэнне аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі
Артыкул 598. Вызначэнне аб перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі
Артыкул 599. Прынясенне касацыйнага пратэсту
Артыкул 600. Касацыйны пратэст Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікаў, старшыні абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшыні Апеляцыйнага эканамічнага суда
Артыкул 601. Касацыйны пратэст пракурора
Артыкул 602. Водзыў на касацыйную скаргу і (або) касацыйны пратэст, прадстаўленне
Артыкул 603. Прыпыненне выканання судовай пастановы
Артыкул 604. Спыненне касацыйнага вядзення
§ 3. Разгляд справы судом касацыйнай інстанцыі
Артыкул 605. Парадак і тэрміны разгляду справы судом касацыйнай інстанцыі
Артыкул 606. Падставы для адмены або змянення судовых пастаноў у касацыйным парадку
Артыкул 607. Прадмет і межы разгляду справы ў касацыйным парадку
Артыкул 608. Паўнамоцтвы суда касацыйнай інстанцыі
Артыкул 609. Судовая пастанова суда касацыйнай інстанцыі
Артыкул 610. Абавязковасць указанняў суда касацыйнай інстанцыі
Артыкул 611. Недапушчальнасць падачы паўторнай касацыйнай скаргі
ГЛАВА 57. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ ЎСТУПІЎШЫХ У ЗАКОННУЮ СІЛУ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ У ВЯРХОЎНЫМ СУДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (НАГЛЯДНАЕ ВЯДЗЕННЕ)
§ 1. Агульныя палажэнні
Артыкул 612. Абскарджанне судовых пастаноў у парадку нагляду
Артыкул 613. Суд нагляднай інстанцыі
Артыкул 614. Права на зварот з нагляднай скаргай
Артыкул 615. Прадстаўленне суддзі ў суд нагляднай інстанцыі
Артыкул 616. Парадак і тэрмін падачы нагляднай скаргі
Артыкул 617. Форма і змест нагляднай скаргі
Артыкул 618. Вяртанне нагляднай скаргі
§ 2. Узбуджэнне вядзення ў парадку нагляду
Артыкул 619. Разгляд нагляднай скаргі суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь
Артыкул 620. Вызначэнне аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі
Артыкул 621. Вызначэнне суддзі аб перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі
Артыкул 622. Прынясенне пратэсту ў парадку нагляду
Артыкул 623. Прыпыненне выканання судовай пастановы
§ 3. Разгляд справы судом нагляднай інстанцыі
Артыкул 624. Парадак і тэрміны разгляду справы судом нагляднай інстанцыі
Артыкул 625. Падставы для адмены або змянення судовых пастаноў у парадку нагляду
Артыкул 626. Прадмет і межы разгляду справы ў парадку нагляду
Артыкул 627. Паўнамоцтвы суда нагляднай інстанцыі
Артыкул 628. Судовая пастанова суда нагляднай інстанцыі
Артыкул 629. Абавязковасць указанняў суда нагляднай інстанцыі
ГЛАВА 58. ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ПА НАНАВА АДКРЫТЫХ АБСТАВІНАХ

Артыкул 630. Падставы для перагляду судовых пастаноў па нанава адкрытых абставінах
Артыкул 631. Суды, якія пераглядаюць судовыя пастановы па нанава адкрытых абставінах
Артыкул 632. Парадак і тэрмін падачы заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах
Артыкул 633. Форма і змест заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах
Артыкул 634. Разгляд заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах
Артыкул 635. Вызначэнне суда па заяве, прадстаўленні аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах
Артыкул 636. Разгляд справы пасля вынясення вызначэння аб задавальненні заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах
РАЗДЗЕЛ IX. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
ГЛАВА 59. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 637. Прызнанне страты сілы заканадаўчымі актамі і асобнымі палажэннямі законаў
Артыкул 638. Пераходныя палажэнні
Артыкул 639. Меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса
Артыкул 640. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса

# АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ I
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## ГЛАВА 1
## АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Асноўныя тэрміны, якія прымяняюцца ў гэтым Кодэксе, і іх азначэнні*

* Часткі артыкулаў (за выключэннем тых, дзе адна частка) у гэтым Кодэксе нумаруюцца арабскімі лічбамі з кропкай, пункты частак артыкулаў – арабскімі лічбамі з дужкай.

Для мэт гэтага Кодэкса прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

1) апеляцыйная скарга – скарга аб адмене або змяненні рашэння, якое не ўступіла ў законную сілу;

2) апеляцыйны пратэст – пратэст упаўнаважанага гэтым Кодэксам пракурора аб адмене або змяненні рашэння, якое не ўступіла ў законную сілу;

3) блізкія сваякі – бацькі, дзеці, усынаўляльнікі (удачаральнікі) (далей – усынаўляльнікі), усыноўленыя (удачароныя) (далей – усыноўленыя), родныя браты і сёстры, дзядуля, бабуля, унукі;

4) відэаканферэнцсувязь – спосаб ажыццяўлення працэсуальных дзеянняў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, з выкарыстаннем праграмна-тэхнічных сродкаў перадачы аўдыё- і відэаінфармацыі па каналах сувязі ў рэжыме рэальнага часу;

5) грамадзяне – грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства;

6) грамадзянскія справы (далей, калі не ўказана іншае, – справы) – справы іскавага вядзення па спрэчках, узніклых з грамадзянскіх, сямейных, працоўных, жыллёвых, фінансавых, зямельных і іншых праваадносін, справы загаднага вядзення, справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, справы асаблівага вядзення, іншыя справы, аднесеныя да кампетэнцыі судоў гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

7) законныя прадстаўнікі – бацькі, усынаўляльнікі, апекуны, апекавальнікі істца, адказчыка, трэцяй асобы, іншай асобы, якая ўдзельнічае ў справе, мае непасрэдны інтарэс у яе зыходзе, іншыя асобы, якім гэта права прадастаўлена законам, а таксама арганізацыі, на апекаванні якіх знаходзяцца ісцец, адказчык, трэцяя асоба, іншая асоба, якая ўдзельнічае ў справе, мае непасрэдны інтарэс у яго зыходзе;

8) заява – іскавая заява, заява, хадайніцтва і іншыя звароты, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам;

9) замежныя асобы – замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі;

10) замежныя арганізацыі – замежныя юрыдычныя асобы і арганізацыі, што не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі па праве замежнай дзяржавы, на тэрыторыі якой яны заснаваны;

11) касацыйная скарга – скарга аб адмене або змяненні судовых пастаноў раённых (гарадскіх) судоў, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), вынесеных па першай інстанцыі, і (або) судовых пастаноў абласных (Мінскага гарадскога) судоў, Апеляцыйнага эканамічнага суда, вынесеных у апеляцыйным парадку, якія ўступілі ў законную сілу;

12) касацыйны пратэст – пратэст упаўнаважанай гэтым Кодэксам службовай асобы аб адмене або змяненні судовых пастаноў раённых (гарадскіх) судоў, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), вынесеных па першай інстанцыі, і (або) судовых пастаноў абласных (Мінскага гарадскога) судоў, Апеляцыйнага эканамічнага суда, вынесеных у апеляцыйным парадку, якія ўступілі ў законную сілу;

13) сціслы пратакол, пратакол – судовыя дакументы, у якіх з захаваннем парадку, устаноўленага гэтым Кодэксам, фіксуюцца факт вядзення па грамадзянскай справе, змест і вынікі працэсуальных дзеянняў;

14) наглядная скарга – пададзеная ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь скарга аб адмене або змяненні судовых пастаноў судоў першай, апеляцыйнай, касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – і суда нагляднай інстанцыі, якія ўступілі ў законную сілу;

15) нерабочыя дні – субота (за выключэннем суботы, на якую Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь перанесены рабочы дзень), нядзеля (за выключэннем нядзелі, аб'яўленай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь рабочым днём), дзень тыдня, з якога Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь перанесены рабочы дзень, а таксама дзяржаўныя святы і святочныя дні, аб'яўленыя ва ўстаноўленым парадку нерабочымі;

16) вызначэнне – любая судовая пастанова судоў усіх інстанцый, за выключэннем пастаноў, указаных у пунктах 19 і 23 гэтага артыкула;

17) падведамнасць – размежаванне кампетэнцыі па вырашэнні спрэчак і разглядзе спраў паміж Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь, судамі агульнай юрысдыкцыі, трацейскімі судамі, міжнароднымі арбітражнымі (трацейскімі) судамі, органамі па вырашэнні працоўных спрэчак і разглядзе спраў, іншымі органамі і арганізацыямі;

18) падсуднасць – аднясенне грамадзянскай справы, падведамнай суду агульнай юрысдыкцыі, да вядзення суда першай інстанцыі;

19) пастанова – судовая пастанова, прынятая Прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прэзідыумамі абласных (Мінскага гарадскога) судоў, прэзідыумам Апеляцыйнага эканамічнага суда па выніках праверкі судовых пастаноў у касацыйным парадку і ў парадку нагляду;

20) прэюдыцыя – прадрашэнне пытання аб сапраўднасці фактаў і праваадносін, устаноўленых судовай пастановай, якая ўступіла ў законную сілу, пры разглядзе іншай справы паміж тымі ж асобамі;

21) пракурор – Генеральны пракурор і падначаленыя яму пракуроры, у тым ліку транспартныя пракуроры, іх намеснікі, памочнікі па асаблівых даручэннях, старшыя памочнікі і памочнікі, саветнікі, начальнікі структурных падраздзяленняў органаў

пракуратуры і іх наméснікі, старшыя пракуроры па асаблівых даручэннях, старшыя пракуроры і пракуроры структурных падраздзяленняў органаў пракуратуры, што дзейнічаюць у межах сваёй кампетэнцыі;

22) пратэст у парадку нагляду – прынесены ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь пратэст упаўнаважанай гэтым Кодэксам службовай асобы аб адмене або змяненні судовых пастаноў судоў першай, апеляцыйнай, касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – і суда наглядчай інстанцыі, якія ўступілі ў законную сілу;

23) рашэнне – судовая пастанова суда першай інстанцыі, што разгледзеў справу па сутнасці, дзе маецца адказ (адказы) на заяўленыя патрабаванні;

24) суд – любы ўтвораны на законных падставах суд агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь, што разглядае грамадзянскія справы аднаасобна або калегіяльна: суд першай інстанцыі, суд апеляцыйнай інстанцыі, суд касацыйнай інстанцыі, суд наглядчай інстанцыі;

25) суд апеляцыйнай інстанцыі – суд, правамоцны правяраць у апеляцыйным парадку законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў суда першай інстанцыі, што не ўступілі ў законную сілу;

26) суд касацыйнай інстанцыі – суд, правамоцны правяраць у касацыйным парадку законнасць судовых пастаноў судоў першай і апеляцыйнай інстанцый, якія ўступілі ў законную сілу;

27) суд наглядчай інстанцыі – Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, правамоцны правяраць у парадку нагляду законнасць судовых пастаноў судоў першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – і суда наглядчай інстанцыі, якія ўступілі ў законную сілу;

28) суд першай інстанцыі – суд, правамоцны вынесці судовую пастанову пры разглядзе грамадзянскай справы па сутнасці заяўленых патрабаванняў;

29) судовая пастанова – рашэнне, вызначэнне, пастанова судоў усіх інстанцый;

30) суддзя – асоба, назначаная (абраная) на пасаду суддзі ў парадку, устаноўленым Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і законамі, для выканання абавязкаў суддзі на прафесійнай аснове;

31) тоесная справа – справа па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах;

32) прыватная скарга – скарга на вызначэнне суда першай інстанцыі, якое не ўступіла ў законную сілу;

33) прыватны пратэст – пратэст упаўнаважанага гэтым Кодэксам пракурора на вызначэнне суда першай інстанцыі, якое не ўступіла ў законную сілу;

34) члены сям'і істца, адказчыка, трэцяй асобы, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – іншага грамадзяніна – муж (жонка), блізкія сваякі, указаныя ў пункце 3 гэтага артыкула, а таксама іншыя сваякі, непрацаздольныя ўтрыманцы, якія пражываюць сумесна з істцом, або адказчыкам, або трэцяй асобай, або іншым грамадзянінам і вядуць з імі агульную гаспадарку, а таксама іншыя асобы, прызнаныя членамі сям'і ў судовым парадку;

35) эканамічны суд – эканамічны суд вобласці (горада Мінска), Апеляцыйны эканамічны суд, судовая калегія па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 2. Адносіны, якія рэгулююцца заканадаўствам аб грамадзянскім судаводстве**

Заканадаўства аб грамадзянскім судаводстве рэгулюе грамадскія адносіны, якія ўзнікаюць пры разглядзе і вырашэнні грамадзянскіх спраў.

**Артыкул 3. Прававое рэгуляванне грамадзянскага судаводства**

1. Грамадзянскае судаводства рэгулюецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь могуць устанаўлівацца асаблівасці прававога рэгулявання грамадзянскага судаводства.

3. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым змешчаныя ў заканадаўстве аб грамадзянскім судаводстве, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

**Артыкул 4. Дзеянне заканадаўства аб грамадзянскім судаводстве**

1. У Рэспубліцы Беларусь судаводства па грамадзянскіх справах вядзецца адпаведна заканадаўству аб грамадзянскім судаводстве, дзейным на яе тэрыторыі падчас разгляду справы ў судзе.

2. Заканадаўства аб грамадзянскім судаводстве, што абмяжоўвае правы ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства, адваротнай сілы не мае.

**Артыкул 5. Права на зварот па судовую абарону**

1. Зацікаўленая асоба мае права ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, звярнуцца ў суд па абарону сваіх парушаных або аспрэчваных правоў і свабод ці па абарону сваіх законных інтарэсаў.

2. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, у суд могуць звярнуцца пракурор, дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія ад уласнага імя абараняюць правы, свабоды і законныя інтарэсы іншых асоб або дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы (у тым ліку правы, свабоды і законныя інтарэсы нявызначанага кола асоб).

3. Замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, замежным юрыдычным асобам гарантуецца права на судовую абарону нароўні з грамадзянамі і юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

4. Іскавая заява, заява, скарга і іншыя дакументы могуць быць пададзены ў суд у пісьмовай форме, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, – таксама ў выглядзе электроннага дакумента.

5. Адмова ад права на зварот у суд несапраўдная.

6. Не дапускаецца адмова ў судовай абароне з матываў адсутнасці, непаўнаты, супярэчлівасці, няяснасці нарматыўнага прававога акта.

7. Па пагадненні бакоў падведамная суду спрэчка, узніклая з грамадзянскіх праваадносін, да выхаду суда ў дарадчы пакой для вынясення судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, можа быць перададзена бакамі на вырашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

8. Калі заканадаўчымі актамі або дагаворам для канкрэтнай катэгорыі спраў устаноўлены абавязковы дасудовы парадак урэгулявання спрэчкі, зацікаўленая асоба мае права звярнуцца ў суд толькі пры ўмове захавання такога парадку, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі. Асобы, указаныя ў частцы 2 гэтага артыкула, маюць права на зварот у суд без захавання абавязковага дасудовага парадку ўрэгулявання спрэчкі.

9. У выпадках калі да звароту ў суд у іскавым або загадным вядзення па спрэчцы ці патрабаванні паміж юрыдычнымі асобамі і (або) фізічнымі асобамі, якія ажыццяўляюць

індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, адпаведна заканадаўству ці дагаворам павінна быць прад'яўлена прэтэнзія (пісьмовая прапанова аб добраахвотным урэгуляванні спрэчкі), абавязковы дасудовы парадак урэгулявання спрэчкі лічыцца захаваным пасля атрымання адмовы другога боку на прэтэнзію (пісьмовую прапанову аб добраахвотным урэгуляванні спрэчкі) або неатрымання адказу ў тэрмін, указаны ў прэтэнзіі (пісьмовай прапанове аб добраахвотным урэгуляванні спрэчкі) ці ўстаноўлены заканадаўствам або дагаворам, а пры яго адсутнасці – у месячны тэрмін.

10. Калі заканадаўчымі актамі для спагнання ў бясспрэчным парадку грашовых сум (запазычанасці) з даўжніка прадугледжана здзяйсненне выканальнага надпісу, зацікаўленая асоба мае права звярнуцца ў суд у выпадку адмовы ў яго здзяйсненні.

**Артыкул 6. Спосабы судовай абароны**

Суд ажыццяўляе абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў праз:

1) прызнанне права;

2) прысуджэнне да выканання абавязку, аднаўлення парушанага права або забароны ці спынення дзеянняў, што вядуць да парушэння права;

3) забеспячэнне ўзнікнення, змянення або спынення праваадносін;

4) устанаўленне факту, які мае юрыдычнае значэнне;

5) прымяненне іншых прадугледжаных заканадаўствам спосабаў.

**Артыкул 7. Віды вядзення па грамадзянскіх справах**

Заканадаўства аб грамадзянскім судаводстве прадугледжвае наступныя віды вядзення:

1) іскавае;

2) загаднае;

3) па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін;

4) асаблівае;

5) іншыя віды вядзення, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

## ГЛАВА 2
## МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І ПРЫНЦЫПЫ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА

**Артыкул 8. Мэты грамадзянскага судаводства**

Мэтамі грамадзянскага судаводства з'яўляюцца:

1) забеспячэнне абароны парушаных або аспрэчваных правоў і свабод, абароны законных інтарэсаў грамадзян, у тым ліку тых, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, правоў і законных інтарэсаў юрыдычных асоб, іншых арганізацый, Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак;

2) забеспячэнне разгляду і вырашэння грамадзянскіх спраў кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом ва ўстаноўленыя законам тэрміны.

**Артыкул 9. Задачы і прынцыпы грамадзянскага судаводства**

1. Задачамі грамадзянскага судаводства з'яўляюцца правільны і своечасовы разгляд і вырашэнне судамі грамадзянскіх спраў, умацаванне законнасці і правапарадку, папярэджанне правапарушэнняў, фарміраванне паважлівых адносін да закону і суда, заахвочванне і развіццё супрацоўніцтва пры вырашэнні спрэчак.

2. Грамадзянскае судаводства ажыццяўляецца на аснове прынцыпаў, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў і гэтым Кодэксам.

**Артыкул 10. Ажыццяўленне правасуддзя толькі судом**

1. Правасуддзе па грамадзянскіх справах ажыццяўляецца толькі судом агульнай юрысдыкцыі, утвораным у парадку, устаноўленым Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў.

2. Справы разглядаюць суддзі, назначаныя (абраныя) на пасаду ва ўстаноўленым Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і законамі парадку.

3. Судовыя пастановы могуць быць праверань і перагледжаны толькі адпаведнымі судамі на падставах і ў парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

**Артыкул 11. Незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону**

1. Пры ажыццяўленні правасуддзя суддзі незалежныя і падпарадкоўваюцца толькі закону.

2. Суддзі разглядаюць і вырашаюць справы ва ўмовах, што выключаюць чужое ўздзеянне на свабоду фарміравання іх унутранага пераканання і волевыяўлення. Якое-небудзь умяшанне ў дзейнасць суддзяў па ажыццяўленні правасуддзя недапушчальнае і выклікае адказнасць па закону.

3. Гарантыі незалежнасці суддзі ўстанаўліваюцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў, гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 12. Законнасць грамадзянскага судаводства**

1. Законнасць грамадзянскага судаводства забяспечваецца правільным прымяненнем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судовым ладзе і статусе суддзяў, гэтага Кодэкса, іншых законаў і нарматыўных прававых актаў, прынятых у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

2. Калі пры разглядзе канкрэтнай справы ў суда ўзнікнуць сумненні ў канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, падлеглага прымяненню, суд да вынясення судовай пастановы ставіць ва ўстаноўленым законам парадку перад Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь пытанне аб праверцы канстытуцыйнасці названага нарматыўнага прававога акта.

**Артыкул 13. Роўнасць усіх перад законам і судом**

1. Правасуддзе па грамадзянскіх справах ажыццяўляецца на аснове роўнасці ўсіх перад законам і судом. Ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону.

2. У грамадзянскім судаводстве нікому з асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншых удзельнікаў працэсу не можа быць аддадзена перавага і ніхто з іх не можа падвяргацца дыскрымінацыі з матываў іх паходжання, сацыяльнага і маёмаснага становішча, расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі, палітычных і іншых перакананняў, роду і характару заняткаў, месца жыхарства, месца знаходжання юрыдычнай асобы, яго арганізацыйна-прававой формы, падпарадкаванасці, формы ўласнасці і іншых абставін.

**Артыкул 14. Спрачальнасць**

1. Разгляд грамадзянскіх спраў у судзе ажыццяўляецца на аснове спрачальнасці.

2. Бакі абгрунтоўваюць свае патрабаванні і пярэчанні, абіраюць па сваім меркаванні пазіцыю, спосабы і сродкі яе адстойвання, прадстаўляюць доказы, заяўляюць хадайніцтвы, выказваюць думкі, у тым ліку ў дачыненні да довадаў іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

3. Бакі маюць права ведаць аб аргументах адзін аднаго да пачатку судовага разбору.

4. Кожны бок павінен даказаць тыя абставіны, на якія ён спасылаецца як на падставу сваіх патрабаванняў або пярэчанняў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

5. Суд, захоўваючы незалежнасць, аб'ектыўнасць і непрадузятасць, ажыццяўляе кіраўніцтва працэсам, аказвае асобам – удзельнікам у справе, садзейнічанне ў рэалізацыі іх правоў, стварае ўмовы для ўсебаковага і поўнага даследавання доказаў, устанаўлення фактычных абставін і правільнага прымянення нормаў матэрыяльнага і працэсуальнага права пры разглядзе і вырашэнні грамадзянскіх спраў. Суд грунтуе рашэнне толькі на тых доказах, удзел у даследаванні якіх на роўных падставах быў забяспечаны ўсім асобам, якія ўдзельнічаюць у справе.

6. Суд вызваляецца ад збірання доказаў па ўласнай ініцыятыве, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам. Аднак з мэтай устанаўлення фактычных абставін справы па матываваным хадайніцтве боку суд аказвае садзейнічанне ў выпатрабаванні неабходных доказаў па справе, калі іх прадстаўленне бокам з'яўляецца немагчымым.

7. Бакі нясуць рызыку надыходу наступстваў здзяйснення або нездзяйснення імі працэсуальных дзеянняў.

**Артыкул 15. Дыспазітыўнасць (распараднасць)**

1. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права свабодна і па сваім меркаванні распараджацца прыналежнымі ім матэрыяльнымі і працэсуальнымі правамі, не парушаючы правы, свабоды і законныя інтарэсы іншых асоб, а таксама інтарэсы дзяржавы.

2. Справы ўзбуджаюцца судом толькі па заявах зацікаўленых асоб і разглядаюцца толькі ў дачыненні да заўленых патрабаванняў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 16. Добрасумленнасць удзельнікаў грамадзянскага судаводства. Недапушчальнасць злоўжывання працэсуальнымі правамі**

1. Удзельнікі грамадзянскага судаводства абавязаны добрасумленна карыстацца прыналежнымі ім працэсуальнымі правамі і выконваць працэсуальныя абавязкі. Дзеянні (бяздзейнасць) грамадзян і юрыдычных асоб, накіраваныя на зрыў судовага пасяджэння, зацягванне працэсу, перашкаджэнне поўнаму, усебаковаму і аб'ектыўнаму разгляду справы і вынясенню законнага і абгрунтаванага рашэння, а таксама злоўжыванне працэсуальнымі правамі ў іншых формах не дапускаюцца.

2. Любы ўдзельнік грамадзянскага судаводства лічыцца добрасумленным, пакуль не даказана супрацьлеглае.

**Артыкул 17. Галоснасць судовага разбору**

1. Разбор спраў у судах адкрыты.

2. Ніхто не можа быць пазбаўлены права на інфармацыю аб часе і месцы разбору сваёй справы.

3. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншыя асобы, прысутныя ў адкрытым судовым пасяджэнні, маюць права ў пісьмовай форме, а таксама з дапамогай сродкаў гуказапісу фіксаваць ход судовага разбору.

4. Кіна- і фотаздымка, відэазапіс, а таксама трансляцыя ходу судовага пасяджэння ў рэжыме рэальнага часу пры дапамозе глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт або іншых сродкаў сувязі дапускаюцца з дазволу суда з улікам меркавання асоб – удзельнікаў у справе. Гэтыя дзеянні могуць быць абмежаваны судом у часе і павінны ажыццяўляцца на ўказаных судом месцах у зале судовага пасяджэння.

5. Разгляд грамадзянскіх спраў у закрытым судовым пасяджэнні дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

6. Разгляд грамадзянскіх спраў у закрытых судовых пасяджэннях ажыццяўляецца па справах, дзе маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, таямніцай ўсынаўлення (удачарэння) дзіцяці, а таксама па іншых справах, калі гэта прадугледжана заканадаўчымі актамі.

7. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, іншыя асобы, прысутныя пры здзяйсненні працэсуальнага дзеяння, падчас якога могуць быць выяўлены звесткі, указаныя ў частцы 6 гэтага артыкула, папярэджваюцца судом аб адказнасці за іх абнародаванне.

8. Для прадухілення абнародавання інфармацыі аб прыватным жыцці грамадзяніна, спецыяльных персанальных даных або інфармацыі, што ганіць гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю грамадзяніна або дзелавую рэпутацыю юрыдычнай асобы, а таксама ў выпадках, калі гэта неабходна для аховы інтарэсаў непаўналетніх, суд мае права разглядаць справу ў цэлым або здзяйсняць асобныя працэсуальныя дзеянні ў закрытым судовым пасяджэнні. Пры задавальненні хадайніцтва асобы, якая ўдзельнічае ў справе і спасылаецца на неабходнасць абароны іншай інфармацыі, распаўсюджанне і (або) прадастаўленне якой абмежавана, справа разглядаецца таксама ў закрытым судовым пасяджэнні.

9. Асабістая перапіска, асабістыя перагаворы, асабістыя запісы грамадзян, матэрыялы кіна- і фотаздымкі, гука- і відэазапісу, паведамленні, атрыманыя пры дапамозе іншых тэхнічных сродкаў, дзе змешчана інфармацыя аб прыватным жыцці, могуць быць абвешчаны (узноўлены) і даследаваны ў адкрытым судовым пасяджэнні толькі са згоды асоб, паміж якімі адбыліся такія перапіска, перагаворы (асобы, якая зрабіла такі запіс, адпраўніка і адрасата такіх паведамленняў ці асоб, адлюстраваных (галасы якіх запісаны) на такіх матэрыялах, запісах). Пры адсутнасці згоды хаця б адной з такіх асоб указаныя доказы абвяшчаюцца (праслухваюцца) і даследуюцца ў закрытым судовым пасяджэнні.

10. Па просьбе бакоў або аднаго з іх пры адсутнасці пярэчанняў іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, суд можа з улікам канкрэтных абставін разгледзець любую грамадзянскую справу ў закрытым судовым пасяджэнні.

11. Пры разборы справы або здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў у закрытым судовым пасяджэнні прысутнічаюць толькі асобы – удзельнікі ў справе, іх прадстаўнікі, а ў неабходных выпадках – сведкі, эксперты, спецыялісты, перакладчыкі.

12. Аб разборы справы ў закрытым судовым пасяджэнні ў адносінах да ўсяго ці часткі судовага разбору суд выносіць матываванае вызначэнне.

13. Разбор справы ў закрытым судовым пасяджэнні вядзецца з захаваннем усіх правілаў грамадзянскага судаводства. Выкарыстанне сістэм відэаканферэнцсувязі, а таксама фіксацыя ходу судовага разбору асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, з дапамогай сродкаў гуказапісу ў закрытым судовым пасяджэнні не дапускаюцца.

14. Рэзалютыўная частка рашэння суда абвяшчаецца публічна, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

**Артыкул 18. Павага гонару і годнасці, дзелавой рэпутацыі ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства**

Пры вядзенні па грамадзянскай справе забараняюцца дзеянні, што зневажаюць гонар або годнасць, прыніжаюць дзелавую рэпутацыю ўдзельніка грамадзянскага судаводства.

**Артыкул 19. Права на юрыдычную дапамогу**

1. Удзельнікі грамадзянскага судаводства маюць права на атрыманне юрыдычнай дапамогі, што прадастаўляецца адвакатамі і іншымі прадстаўнікамі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства.

2. Процідзеянне аказанню юрыдычнай дапамогі ў грамадзянскім судаводстве забараняецца.

**Артыкул 20. Растлумачэнне працэсуальных правоў і абавязкаў**

Суд растлумачвае ўдзельнікам грамадзянскага судаводства іх працэсуальныя правы і абавязкі, а таксама папярэджвае аб наступствах неналежнага ажыццяўлення, адмовы ад рэалізацыі працэсуальных правоў, невыканання або неналежнага выканання працэсуальных абавязкаў.

**Артыкул 21. Мова судаводства**

1. Грамадзянскае судаводства ў Рэспубліцы Беларусь вядзецца на беларускай і (або) рускай мовах.

2. Мова судаводства вызначаецца ў залежнасці ад мовы, на якой пададзены ў суд іскавая заява, заява, скарга. Суд мае права змяніць мову судаводства з улікам меркавання асоб – удзельнікаў у справе.

3. Асобам, якія ўдзельнічаюць у справе і не валодаюць або недастакова валодаюць мовай судаводства, растлумачваюцца і забяспечваюцца права азнаямлення з усімі матэрыяламі справы, удзелу ў ажыццяўленні асобных працэсуальных дзеянняў або судовым разборы праз перакладчыка, права выступаць у судзе на мове, якой яны валодаюць. У гэтых выпадках указаныя асобы маюць права на бязвыплатнай аснове карыстацца паслугамі перакладчыка ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

4. Судовыя дакументы, што ва ўстаноўленым парадку падлягаюць уручэнню або накіраванню асобам – удзельнікам у справе, павінны быць складзены на мове судаводства.

**Артыкул 22. Аднаасобны і калегіяльны разгляд спраў**

1. Справы па першай інстанцыі разглядаюцца суддзямі ўсіх судоў аднаасобна, а ў выпадках, прадугледжаных часткамі 2 і 3 артыкула 28, часткай 2 артыкула 390 гэтага Кодэкса, – калегіяльна.

2. Суды апеляцыйнай, касацыйнай і наглядной інстанцый па скаргах і пратэстах на судовыя пастановы разглядаюць справы калегіяльна, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 3 гэтага артыкула.

3. Разгляд у судзе апеляцыйнай інстанцыі спраў па прыватных скаргах і прыватных пратэстах на вызначэнні суда першай інстанцыі, што не ўступілі ў законную сілу, ажыццяўляецца суддзёй суда апеляцыйнай інстанцыі аднаасобна, калі іншае не прадугледжана часткай 2 артыкула 557 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 23. Працэсуальная эканомія**

1. Суд выконвае задачы грамадзянскага судаводства з выкарыстаннем найбольш рацыянальных працэсуальных сродкаў у найбольш кароткія тэрміны і з мінімальнымі выдаткамі для суда і асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

2. Неабгрунтаваныя адкладанне судовага разбору і прыпыненне вядзення справы, неабгрунтаваныя перапынкі ў судовым пасяджэнні па грамадзянскай справе не дапускаюцца.

**Артыкул 24. Ацэнка доказаў па ўнутраным перакананні**

1. Пры вырашэнні справы суд ацэньвае доказы па сваім унутраным перакананні, заснаваным на непрадузятым, усебаковым і поўным даследаванні наяўных у справе доказаў у іх сукупнасці, кіруючыся пры гэтым законам.

2. Ніякія доказы не маюць для суда загадзя ўстаноўленай сілы.

**Артыкул 25. Прававыя нормы, што прымяняюцца пры разглядзе спраў**

1. Суд разглядае справы на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і прынятых у адпаведнасці з ёй іншых нарматыўных прававых актаў.

2. У выпадку калізіі нарматыўных прававых актаў прымяняюцца правілы, устаноўленыя заканадаўствам аб нарматворчай дзейнасці.

3. Пры адсутнасці нормы права, што рэгулюе спрэчныя адносіны, суд прымяняе норму права, што рэгулюе падобныя адносіны (аналогія закона), а пры адсутнасці такой нормы права суд зыходзіць з агульных асноў і сэнсу заканадаўства, галіновых, міжгаліновых і агульнаправавых прынцыпаў (аналогія права).

4. Не дапускаецца прымяненне па аналогіі норм, што абмяжоўваюць правы і ўстанаўліваюць адказнасць.

**Артыкул 26. Прымяненне нормаў замежнага права і (або) звычаяў, якія выкарыстоўваюцца ў міжнародным гандлі**

1. У выпадку прымянення замежнага права суд устанаўлівае існаванне і змест яго нормаў у адпаведнасці з іх афіцыйным тлумачэннем, практыкай прымянення і дактрынай у адпаведнай замежнай дзяржаве.

2. Суд адпаведна заканадаўству прымяняе звычаі (правілы паводзін, што склаліся і шырока прымяняюцца ў якой-небудзь сферы прадпрымальніцкай дзейнасці, але не прадугледжаны заканадаўствам, незалежна ад таго, ці зафіксаваны яны ў якім-небудзь дакуменце), аб якіх бакі ведалі або павінны былі ведаць і якія ў міжнародным гандлі шырока вядомыя і пастаянна захоўваюцца бакамі ў дагаворах такога роду ў адпаведнай сферы гандлю. Звычаі, што супярэчаць абавязковым для ўдзельнікаў адпаведных адносін палажэнням заканадаўства або дагавору, не прымяняюцца.

3. З мэтай устанаўлення існавання і зместу нормаў замежнага права і (або) звычаяў суд мае права звярнуцца па садзейнічанне і растлумачэнне ў кампетэнтныя органы і арганізацыі, якія знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, за межамі Рэспублікі Беларусь або запрасіць спецыялістаў.

4. Асобы – удзельнікі ў справе, маюць права прадстаўляць дакументы, што пацвярджаюць існаванне і змест нормаў замежнага права і (або) звычаяў, на якія яны спасылаюцца для абгрунтавання сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, і іншым чынам садзейнічаць суду ва ўстанаўленні існавання і зместу такіх нормаў.

5. Пры атрыманні судом з кампетэнтных органаў, арганізацый або ад спецыялістаў копій адпаведных нарматыўных прававых актаў, належным чынам завераных і перакладзеных на мову судаводства, і ў іншых выпадках, прадугледжаных гэтым

Кодэксам, існаванне і змест нормаў замежнага права і (або) звычаяў лічацца ўстаноўленымі.

6. Суд можа прапанаваць бакам прадставіць дакументы, што пацвярджаюць змест нормаў замежнага права і (або) звычаяў.

7. Калі існаванне і (або) змест нормаў замежнага права і (або) звычаяў, нягледзячы на прынятыя ў адпаведнасці з гэтым артыкулам меры, не ўстаноўлены, суд прымяняе адпаведныя нормы права Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 27. Абавязковасць судовых пастаноў і патрабаванняў суддзі

1. Судовыя пастановы, што ўступілі ў законную сілу, а таксама законныя распараджэнні, патрабаванні, даручэнні, выклікі і звароты судоў і суддзяў абавязковыя для ўсіх без выключэння дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, іншых юрыдычных асоб, арганізацый, што не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, грамадзян, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, службовых асоб і іншых грамадзян і падлягаюць няўхільнаму выкананню на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. Абавязковасць судовых пастаноў не пазбаўляе зацікаўленых асоб магчымасці звярнуцца ў суд па абарону сваіх правоў, свабод і законных інтарэсаў, спрэчка аб якіх судом не была разгледжана і вырашана.

3. Прызнанне і прывядзенне ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рашэнняў замежных судоў, замежных трацейскіх судоў (арбітражаў) ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і гэтым Кодэксам.

4. Невыкананне судовых пастаноў, а таксама іншае праяўленне непавагі да суда выклікаюць устаноўленую заканадаўчымі актамі адказнасць.

# РАЗДЗЕЛ II
# СУДЫ

## ГЛАВА 3
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 28. Разгляд спраў па першай інстанцыі

1. Калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам, справы ў судзе першай інстанцыі разглядаюцца аднаасобна суддзёй, які дзейнічае ад імя суда.

2. У неабходных выпадках старшыня суда можа прызначыць калегіяльны склад суда з трох суддзяў.

3. Справы па спрэчках у галіне аўтарскага права і сумежных правоў разглядаюцца ў судовай калегіі па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па першай інстанцыі суддзямі аднаасобна, справы па спрэчках, узніклых з прымянення заканадаўства, што рэгулюе адносіны, узніклыя ў сувязі са стварэннем, прававой аховай і выкарыстаннем аб'ектаў права прамысловай уласнасці, – калегіяльна ў складзе трох суддзяў.

4. Склад суда для разгляду канкрэтнай справы фарміруецца з улікам нагрузкі і спецыялізацыі суддзяў у парадку, што выключае ўплыў на яго фарміраванне асоб – удзельнікаў у справе.

**Артыкул 29. Суды, якія ажыццяўляюць перагляд судовых пастаноў у апеляцыйным, касацыйным парадку і ў парадку нагляду**

1. Перагляд судовых пастаноў па грамадзянскіх справах ажыццяўляюць суды апеляцыйнай, касацыйнай і наглядной інстанцый.

2. Судовыя калегіі па грамадзянскіх справах абласных (Мінскага гарадскога) судоў, судовая калегія Апеляцыйнага эканамічнага суда, судовая калегія па грамадзянскіх справах і судовая калегія па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, апеляцыйная інстанцыя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь правяраюць у апеляцыйным парадку законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў судоў першай інстанцыі, што не ўступілі ў законную сілу. Разгляд спраў у судзе апеляцыйнай інстанцыі праводзіцца калегіяльна ў складзе трох суддзяў, адзін з якіх старшынюе, або аднаасобна суддзёй у выпадку, прадугледжаным часткай 3 артыкула 22 гэтага Кодэкса.

3. Прэзідыумы абласных (Мінскага гарадскога) судоў, Апеляцыйнага эканамічнага суда ў калегіяльным складзе правяраюць у касацыйным парадку законнасць судовых пастаноў судоў першай і апеляцыйнай інстанцый, што ўступілі ў законную сілу.

4. Судовая калегія па грамадзянскіх справах і судовая калегія па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у калегіяльным складзе правяраюць у парадку нагляду законнасць судовых пастаноў судоў першай, апеляцыйнай, касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, – і суда наглядной інстанцыі, што ўступілі ў законную сілу. Разгляд спраў у парадку нагляду ў судовай калегіі па грамадзянскіх справах і судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь праводзіцца калегіяльна ў складзе трох суддзяў, адзін з якіх старшынюе.

**Артыкул 30. Парадак вырашэння пытанняў судом**

1. Пры аднаасобным разглядзе справы суддзёй суда першай інстанцыі пытанні, узніклыя падчас судовага разбору, вырашаюцца суддзёй суда аднаасобна.

2. Пры разглядзе справы судом у калегіяльным складзе пытанні, узніклыя падчас судовага разбору, вырашаюцца суддзямі большасцю галасоў. Галасаванне праводзіцца адкрыта пры рашэнні кожнага пытання, ніхто з суддзяў не мае права ўстрымацца ад галасавання. Асоба, якая старшынюе, галасуе апошняй.

3. Пытанні, узніклыя па-за судовым разборам, суддзя вырашае аднаасобна. Суддзя (асоба, якая старшынюе) аднаасобна аддае таксама распараджэнні па вядзенні судовага разбору і падтрыманні парадку ў зале судовага пасяджэння.

**Артыкул 31. Асаблівае меркаванне суддзі**

1. Суддзя, не згодны з рашэннем большасці, можа выкласці ў пісьмовым выглядзе сваё асаблівае меркаванне.

2. Пры выкладзе свайго асаблівага меркавання суддзя не мае права нікому паведамляць звесткі аб змесце абмеркавання падчас прыняцця судовай пастановы, аб пазіцыі асобных суддзяў, якія ўваходзяць ў склад суда, і іншым спосабам раскрываць таямніцу нарады суддзяў.

3. Аб наяўнасці асаблівага меркавання аб’яўляецца пры абвяшчэнні рашэння суда, але яго змест не абвяшчаецца.

4. Асаблівае меркаванне суддзі павінна быць выраблена ў тэрмін, што не перавышае пяці дзён пасля прыняцця судовай пастановы па справе, і далучана да матэрыялаў справы.

### Артыкул 32. Недапушчальнасць паўторнага ўдзелу суддзі ў разглядзе і вырашэнні справы

1. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе грамадзянскай справы ў судзе першай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах апеляцыйнай, касацыйнай або нагляднай інстанцый, а таксама ўдзельнічаць у новым разглядзе гэтай справы ў судзе першай інстанцыі ў выпадку адмены вынесенага ім рашэння.

2. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судах касацыйнай або нагляднай інстанцый, а таксама ўдзельнічаць у новым разглядзе гэтай справы ў судах першай або апеляцыйнай інстанцый пасля адмены вызначэння, вынесенага з яго ўдзелам.

3. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе касацыйнай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у разглядзе гэтай справы ў судзе нагляднай інстанцыі, а таксама ўдзельнічаць у новым разглядзе гэтай справы ў судах першай, апеляцыйнай або касацыйнай інстанцый пасля адмены пастановы, вынесенай з яго ўдзелам.

4. Суддзя, які прымаў удзел у разглядзе справы ў судзе нагляднай інстанцыі, не можа ўдзельнічаць у далейшым разглядзе гэтай справы ў судзе нагляднай інстанцыі, а таксама ўдзельнічаць у новым разглядзе гэтай справы ў судах першай, апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый пасля адмены судовай пастановы, вынесенай з яго ўдзелам.

### Артыкул 33. Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі

1. Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі па даручэнні суддзі выконвае наступныя дзеянні, неабходныя для падрыхтоўкі справы да папярэдняга судовага пасяджэння і разгляду ў судовым пасяджэнні:

1) паведамляе ўдзельнікам грамадзянскага судаводства аб часе і месцы правядзення судовага разбору і правярае іх яўку ў суд;

2) высвятляе прычыны няяўкі і дакладае аб гэтым суддзі;

3) забяспечвае выкарыстанне сродкаў гука- або відэазапісу для фіксавання ходу судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем і складанне сціслага пратакола, пратакола;

4) выконвае даручэнні суддзі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем судовага пасяджэння.

2. Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі аказвае суддзі дапамогу ў рэалізацыі прадастаўленых яму правоў і выкананні ўскладзеных на яго абавязкаў, па даручэнні суддзі выконвае асобныя дзеянні, не звязаныя з прыняццем судовых пастаноў.

## ГЛАВА 4
## АДВОДЫ

### Артыкул 34. Падставы для адводу (самаадводу) суддзі

1. Суддзя не можа ўдзельнічаць у разглядзе справы і падлягае адводу (самаадводу), калі:

1) з’яўляецца сваяком, мужам (жонкай), сваяком каго-небудзь з асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, іх прадстаўнікоў, а калі асобай – удзельнікам у справе з’яўляецца юрыдычная асоба, – сваяком, мужам (жонкай), сваяком службовых асоб гэтай юрыдычнай асобы, яе заснавальнікаў (удзельнікаў), уласнікаў яе маёмасці;

2) пры папярэднім разглядзе гэтай справы ўдзельнічаў у ім у якасці суддзі і яго паўторны ўдзел у разглядзе справы ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам з’яўляецца недапушчальным;

3) пры папярэднім разглядзе гэтай справы ўдзельнічаў у ім у якасці сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі, прадстаўніка аднаго з бакоў, пракурора, сведкі, эксперта, перакладчыка;

4) пры папярэднім разглядзе гэтай справы ўдзельнічаў у ім у якасці суддзі замежнага суда, трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

5) асабіста прамое або ўскосна зацікаўлены ў зыходзе справы або маюцца іншыя абставіны, што выклікаюць сумненне ў яго аб'ектыўнасці і непрадузятасці.

2. У калегіяльны склад суда, што разглядае справу, не могуць уваходзіць суддзі, якія з'яўляюцца сваякамі, сужэнцамі або сваякамі паміж сабой.

**Артыкул 35. Падставы для адводу (самаадводу) пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі**

1. Пракурор, эксперт, спецыяліст, перакладчык і сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі не могуць удзельнічаць у разглядзе справы і абавязаны заявіць самаадвод на падставах, прадугледжаных артыкулам 34 гэтага Кодэкса.

2. Эксперт, спецыяліст, перакладчык таксама не могуць удзельнічаць у судовым пасяджэнні пры разглядзе справы судом, калі:

1) яны знаходзяцца або знаходзіліся ў службовай ці іншай залежнасці ад асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або іх прадстаўнікоў;

2) яны рабілі рэвізію або праверку, матэрыялы якіх паслужылі падставай або нагодай для звароту ў суд або выкарыстоўваюцца пры разглядзе справы;

3) выявілася іх некампетэнтнасць, у тым ліку калі высвятленне абставін, што маюць значэнне для справы, выходзіць за межы іх спецыяльных ведаў.

3. Удзел пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі пры папярэднім разглядзе гэтай справы ў якасці адпаведна пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі не з'яўляецца падставай для іх адводу або самаадводу.

**Артыкул 36. Заява аб адводзе (самаадводзе)**

1. Пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных артыкуламі 34 і 35 гэтага Кодэкса, суддзя, пракурор, эксперт, спецыяліст, перакладчык і сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі абавязаны заявіць самаадвод і адмовіцца ад удзелу ў разглядзе справы. Па тых жа падставах адвод суддзі, пракурору, эксперту, спецыялісту, перакладчыку і сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі можа быць заяўлены асобамі – удзельнікамі ў справе.

2. Адвод (самаадвод) павінен быць матываваны і заяўлены пісьмова да пачатку разгляду справы па сутнасці. Падчас разгляду справы заява аб адводзе (самаадводзе) дапускаецца ў тым выпадку, калі падстава для адводу (самаадводу) стала вядомай суду або асобе, якая заяўляе адвод (самаадвод), пасля пачатку разгляду справы.

3. Паўторны адвод, заяўлены той жа асобай і па тых жа падставах, разгляду не падлягае.

**Артыкул 37. Парадак разгляду заявы аб адводзе (самаадводзе)**

1. Адвод, заяўлены суддзі, які разглядае справу аднаасобна, вырашаецца самім суддзёй. Пры разглядзе справы ў калегіяльным складзе пытанне аб адводзе суддзі вырашаецца астатнімі суддзямі ў адсутнасць таго, каму заяўлены адвод. Пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных за адвод і супраць яго, суддзя лічыцца адведзеным. Адвод,

заяўлены некалькім суддзям або ўсяму складу суда, вырашаецца гэтым жа судом у поўным складзе простай большасцю галасоў.

2. Адвод (самаадвод), заяўлены пракурору, эксперту, спецыялісту, перакладчыку, сакратару судовага пасяджэння – памочніку суддзі, разглядаецца і вырашаецца судом у тым жа судовым пасяджэнні, у якім адвод (самаадвод) заяўлены.

3. У выпадку заявы адводу суд павінен выслухаць меркаванні асоб – удзельнікаў у справе, а таксама заслухаць асобу, якой заяўлены адвод і калі яна жадае даць тлумачэнні.

4. Суддзя, сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі, якім заяўлены адвод, да рашэння пытання аб іх адводзе выконваюць толькі неадкладныя працэсуальныя дзеянні.

5. Пытанне аб адводзе вырашаецца ў дарадчым пакоі з вынясеннем вызначэння.

### Артыкул 38. Наступствы задавальнення заявы аб адводзе (самаадводзе) суддзі

1. У выпадку адводу (самаадводу) суддзі, некалькіх суддзяў або ўсяго складу суда справа разглядаецца ў тым жа судзе, але іншым складам суда.

2. Калі ў выніку задавальнення адводу (самаадводу) немагчыма ўтварыць новы склад суда для разгляду справы ў тым жа судзе, яна накіроўваецца ў суд вышэйшага ўзроўню для рашэння пытання аб перадачы ў іншы суд.

## ГЛАВА 5
## ПАДВЕДАМНАСЦЬ

### Артыкул 39. Агульныя правілы аб падведамнасці

1. Суды ў парадку грамадзянскага судаводства разглядаюць і вырашаюць справы з удзелам грамадзян, у тым ліку тых, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, юрыдычных асоб (арганізацый, што не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі, – у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі), Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, дзяржаўных органаў, службовых асоб аб абароне парушаных або аспрэчваных правоў і свабод ці аб абароне законных інтарэсаў, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі іх абарона не ажыццяўляецца іншымі органамі і арганізацыямі.

2. Судам падведамныя:

3. Адмова дзяржаўнага органа, юрыдычнай асобы, грамадзяніна ад сваёй заявы не пазбаўляе асобу, у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў якой яна была пададзена, права патрабаваць разгляду справы па сутнасці. Калі ісцец адмаўляецца ад іску, прад’яўленага дзяржаўным органам, юрыдычнай асобай, грамадзянінам, суд мае права спыніць вядзенне справы з улікам патрабаванняў часткі 5 артыкула 62 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 79. Зварот у суд у абарону дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб)**

1. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, дзяржаўныя органы і юрыдычныя асобы могуць звярнуцца ў суд у абарону дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб).

2. Дзяржаўныя органы і юрыдычныя асобы, якія звярнуліся ў суд у абарону дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб), карыстаюцца працэсуальнымі правамі і нясуць працэсуальныя абавязкі, прадугледжаныя артыкулам 57 гэтага Кодэкса.

3. Дзяржаўныя органы і юрыдычныя асобы, якія звярнуліся ў суд у абарону дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб), маюць права адмовіцца ад заяўленых патрабаванняў.

**Артыкул 80. Уступленне дзяржаўнага органа, іншай упаўнаважанай арганізацыі ў працэс для дачы заключэння**

1. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, дзяржаўныя органы, іншыя ўпаўнаважаныя арганізацыі да вынясення судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, могуць уступіць у працэс па сваёй

ініцыятыве або ініцыятыве асоб – удзельнікаў у справе для дачы заключэння па справе. У неабходных выпадках суд мае права далучыць дзяржаўны орган, іншую ўпаўнаважаную арганізацыю ў працэс па сваёй ініцыятыве.

2. Заключэнні, дадзеныя дзяржаўнымі органамі, іншымі ўпаўнаважанымі арганізацыямі, могуць датычыцца як да ўсёй справы ў цэлым, так і да асобных фактаў і пытанняў.

## ГЛАВА 9
## ІНШЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ ПРАЦЭСУ

### Артыкул 81. Сведка

1. Сведкам з’яўляецца асоба, якой вядомыя якія-небудзь звесткі пра абставіны, што маюць значэнне для справы.

2. Сведкамі не могуць быць:

1) асобы, якія з прычыны фізічных або псіхічных недахопаў не здольныя правільна ўспрымаць факты ці выкладаць звесткі аб фактах і даваць аб іх паказанні;

2) прадстаўнікі па грамадзянскай справе, медыятары, прымірэнцы і абаронцы па крымінальнай справе – адносна да абставін, якія ім сталі вядомыя ў сувязі з выкананнем абавязкаў адпаведна прадстаўніка, медыятара, прымірэнца і абаронца;

3) святары – адносна да фактаў, звесткі аб якіх яны атрымалі падчас споведзі;

4) суддзі – адносна да пытанняў, узніклых ў дарадчым пакоі ў сувязі з абмеркаваннем абставін пры вынясенні судовай пастановы па грамадзянскай або крымінальнай справе;

5) іншыя асобы – у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 82. Правы сведкі

1. Сведка мае права адмовіцца ад дачы паказанняў супраць самога сябе, членаў сваёй сям’і, блізкіх сваякоў.

2. Сведка мае права:

1) даваць паказанні на роднай мове і карыстацца паслугамі перакладчыка, заяўляць адвод перакладчыку;

2) уласнаручна выкладаць пісьмова свае паказанні для далучэння да сціслага пратакола, пратакола;

3) карыстацца дакументамі і пісьмовымі нататкамі, калі яго паказанні звязаны з якімі-небудзь лічбавымі або іншымі данымі, якія цяжка стрымаць у памяці. Гэтыя дакументы і нататкі прад’яўляюцца суду па яго патрабаванні і могуць быць далучаныя да справы;

4) атрымліваць пакрыццё панесеных ім выдаткаў, звязаных з яўкай у суд. Па заяве сведкі суд можа даць распараджэнне аб выплаце сведку авансу на ўпамянутыя выдаткі.

### Артыкул 83. Абавязкі сведкі

1. Сведка абавязаны:

1) прыбыць у суд ва ўказаны час;

2) праўдзіва і поўна расказаць суду аб усім, што яму вядома па справе, адказаць на пастаўленыя пытанні.

2. За дачу заведама лжывых паказанняў, а таксама за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў сведка нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

3. Перашкаджэнне яўцы сведкі ў суд або дачы ім паказанняў, а таксама прымус сведкі да адмовы ад дачы паказанняў або да дачы заведама лжывых паказанняў выклікаюць адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 84. Эксперт**

У якасці эксперта можа быць назначана любая асоба, якая валодае спецыяльнымі ведамі ў галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства і іншых сферах дзейнасці.

**Артыкул 85. Правы эксперта**

1. Эксперт мае права:

1) знаёміцца з матэрыяламі грамадзянскай справы ў частцы, датычнай да прадмету экспертызы, і выпісваць з іх неабходныя для яе правядзення звесткі;

2) заяўляць хадайніцтвы аб прадастаўленні яму дадатковых матэрыялаў, аб'ектаў (доступу да іх), неабходных для дачы заключэння эксперта; аб растлумачэнні зместу пастаўленых перад экспертам пытанняў; аб далучэнні да правядзення экспертызы іншых экспертаў; аб дазволе прымяняць метады, што могуць пацягнуць поўнае або частковае знішчэнне аб'ектаў экспертызы або змяненне іх знешняга выгляду ці асноўных уласцівасцей; аб адмене дазволу ўдзельнікам грамадзянскага судаводства прысутнічаць падчас правядзення экспертызы;

3) удзельнічаць у судовым разборы, а таксама з дазволу суда прысутнічаць пры вядзенні асобных працэсуальных дзеянняў, задаваць удзельнікам грамадзянскага судаводства, якія ўдзельнічаюць у гэтых дзеяннях, пытанні, датычныя да прадмету экспертызы;

4) даваць заключэнне эксперта як па пастаўленых пытаннях, так і па ўваходных у яго кампетэнцыю абставінах, выяўленых падчас правядзення экспертызы;

5) знаёміцца з гука- і відэазапісам, сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння, у якім ён удзельнічаў, і рабіць падлеглыя ўнясенню ў сціслы пратакол, пратакол заўвагі адносна да паўнаты і правільнасці запісу яго дзеянняў і заключэння эксперта;

6) карыстацца бясплатнай дапамогай перакладчыка;

7) атрымліваць пакрыццё выдаткаў, панесеных падчас правядзення экспертызы;

8) атрымліваць пакрыццё панесеных ім выдаткаў, звязаных з яўкай у суд, і ўзнагароджанне за выкананую ім работу, якая не ўваходзіць у кола яго службовых абавязкаў.

2. Эксперт, які з'яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, дзе маюцца звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля прадастаўлення допуску да дзяржаўных сакрэтаў у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

3. Эксперт не мае права:

1) весці перагаворы з удзельнікамі грамадзянскага судаводства па пытаннях, звязаных з правядзеннем экспертызы;

2) самастойна збіраць аб'екты экспертызы;

3) праводзіць даследаванні, што могуць прывесці да поўнага ці частковага знішчэння аб'ектаў экспертызы або змянення іх знешняга выгляду ці асноўных уласцівасцей, калі на гэта не было пісьмовага дазволу суда.

**Артыкул 86. Абавязкі эксперта**

1. Эксперт абавязаны:

1) даць абгрунтаванае і аб'ектыўнае заключэнне эксперта па пастаўленых перад ім пытаннях з захаваннем патрабаванняў гэтага Кодэкса;

2) скласці матываванае паведамленне аб немагчымасці дачы заключэння эксперта, калі падчас правядзення экспертызы ён установіць, што пастаўленыя пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў ці прадастаўленыя яму матэрыялы, аб'екты непрыдатныя

або недастатковыя для адказу на гэтыя пытанні і не могуць быць папоўнены, ці калі стан навукі і практыкі не дазваляе на іх адказаць;

3) прадставіць суду дакументы, што пацвярджаюць яго спецыяльную кваліфікацыю;

4) паведаміць па патрабаванні суда, а таксама бакоў у судовым пасяджэнні звесткі аб сваім прафесійным вопыце і адносінах з удзельнікамі грамадзянскага судаводства;

5) прыбыць па выкліку суда для растлумачэння і ўдакладнення зместу дадзенага ім заключэння эксперта па пытаннях, зададзеных судом, удзельнікамі грамадзянскага судаводства;

6) прадставіць па патрабаванні суда каштарыс выдаткаў на правядзенне экспертызы, а таксама справаздачу аб панесеных выдатках;

7) захоўваць парадак пры вядзенні працэсуальных дзеянняў і падчас судовага пасяджэння;

8) не абнародаваць звесткі пра абставіны грамадзянскай справы і іншыя звесткі, што сталі яму вядомыя ў сувязі з правядзеннем экспертызы, калі разгляд грамадзянскай справы праводзіцца ў закрытым судовым пасяджэнні.

2. За дачу заведама лжывага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў эксперт нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 87. Спецыяліст**

Спецыялістам з’яўляецца не зацікаўленая ў зыходзе справы асоба, якая валодае спецыяльнымі ведамі ў галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства і іншых сферах дзейнасці, далучаная судом для ўдзелу і аказання садзейнічання ў вядзенні працэсуальных дзеянняў, для высвятлення пытанняў прымянення нормаў замежнага права, а таксама іншых пытанняў, што маюць значэнне для разгляду справы. Педагагічны работнік або псіхолаг, якія ўдзельнічаюць пры допыце сведкаў ва ўзросце да шаснаццаці гадоў, таксама з’яўляюцца спецыялістамі.

**Артыкул 88. Правы і абавязкі спецыяліста**

1. Спецыяліст мае права ведаць мэту выкліку, задаваць пытанні ўдзельнікам працэсуальнага дзеяння або судовага разбору, іншымі спосабамі атрымліваць неабходную інфармацыю, з дазволу суда знаёміцца з матэрыяламі справы, заяўляць хадайніцтвы аб прадастаўленні яму дадатковых звестак і матэрыялаў, атрымліваць пакрыццё панесеных ім выдаткаў, звязаных з яўкай у суд, і ўзнагароджанне за выкананую ім работу, не ўваходную ў яго службовыя абавязкі.

2. Асоба, якая ўдзельнічае ў справе ў якасці спецыяліста, у далейшым можа быць назначана ў гэтай справе экспертам.

3. Спецыяліст, які з’яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, дзе маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля прадастаўлення допуску да дзяржаўных сакрэтаў у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

4. Асоба, выкліканая судом у якасці спецыяліста, абавязана прыбыць у суд, адказваць на пастаўленыя пытанні, даваць кансультацыі, у тым ліку ў пісьмовай форме, удзельнічаць у вядзенні асобных працэсуальных дзеянняў або судовым разборы, даваць тлумачэнні адносна да сэнсу разгляданых фактаў і ўласных дзеянняў у вобласці тых спецыяльных ведаў, якімі ён валодае, а па патрабаванні суда – і пісьмовыя тлумачэнні, а таксама адмовіцца ад дачы кансультацый, калі пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў або прадастаўленыя яму матэрыялы недастатковыя для дачы кансультацый.

5. Спецыяліст абавязаны адмовіцца ад удзелу ў вядзенні асобнага працэсуальнага дзеяння або судовым разборы, калі ён не валодае неабходнымі ведамі.

6. Выклік судом спецыяліста накладае на кіраўніка арганізацыі, дзе працуе спецыяліст, на індывідуальнага прадпрымальніка, на фізічную асобу, якая ажыццяўляе дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, у якіх працуе спецыяліст, абавязак забяспечыць яму магчымасць прыбыць у суд для выканання свайго абавязку.

**Артыкул 89. Перакладчык, яго правы і абавязкі**

1. Перакладчыкам з’яўляецца асоба, якая валодае мовамі, веданне якіх неабходнае для пісьмовага або вуснага перакладу, і далучаная судом у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам. Пераклад жэставай мовы ажыццяўляе перакладчык жэставай мовы, пацвердзіўшы сваю кваліфікацыю.

2. Асобы – удзельнікі ў справе, а таксама сведкі, эксперты, спецыялісты і панятыя не могуць выступаць у якасці перакладчыка.

3. Удзельнікі грамадзянскага судаводства маюць права прапанаваць суду кандыдатуру перакладчыка.

4. Перакладчык, які з’яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, дзе маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля прадастаўлення допуску да дзяржаўных сакрэтаў у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

5. Перакладчык мае права знаёміцца з гука- або відэазапісам, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, дзе ён удзельнічаў, і рабіць заўвагі, падлеглыя занясенню ў сціслы пратакол, пратакол.

6. Перакладчык мае права задаваць пытанні ўдзельнікам грамадзянскага судаводства з мэтай удакладнення сэнсу перакладаных слоў і выразаў, атрымліваць пакрыццё панесеных ім выдаткаў, звязаных з яўкай у суд, і ўзнагароджанне за выкананую ім работу, не ўваходную ў яго службовыя абавязкі.

7. Перакладчык абавязаны з’явіцца па выкліку суда, дакладна і поўна выканаць даручаны яму пераклад, пацвердзіць пэўнасць перакладу сваім подпісам у сціслым пратаколе, пратаколе судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, праведзеных з яго ўдзелам, а таксама на перакладзеных дакументах. Перакладчык абавязаны адмовіцца ад удзелу ў вядзенні справы, калі ён не валодае ведамі, неабходнымі для перакладу.

8. За заведама няправільны пераклад, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў перакладчык нясе адказнасць, устаноўленую Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 90. Паняты, яго правы і абавязкі**

1. У якасці панятых запрашаюцца не зацікаўленых у зыходзе справы асобы (не менш за двое) для сведчання ходу і вынікаў працэсуальнага дзеяння ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Паняты мае права:

1) рабіць з нагоды працэсуальнага дзеяння, у якім ён удзельнічаў, заявы і заўвагі, падлеглыя занясенню ў пратакол у выпадку яго складання;

2) знаёміцца з гука- або відэазапісам, са сціслым пратаколам, пратаколам здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, у якім ён удзельнічаў, і патрабаваць унясення ў сціслы пратакол, пратакол выпраўленняў і дапаўненняў;

3) атрымліваць пакрыццё панесеных ім выдаткаў, звязаных з яўкай у суд.

3. Паняты абавязаны:

1) прымаць удзел у працэсуальным дзеянні;

2) сведчыць сваім подпісам у сціслым пратаколе, пратаколе працэсуальнага дзеяння факт вядзення гэтага дзеяння, яго ход і вынікі.

4. Паняты можа быць дапытаны ў якасці сведкі пра абставіны, звязаныя з вядзеннем працэсуальнага дзеяння, удзельнікам якога ён быў.

5. Панятымі не могуць быць:

1) непаўналетнія;

2) асобы, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку недзеяздольнымі ці абмежавана дзеяздольнымі;

3) асобы, якія з прычыны фізічных або псіхічных недахопаў не здольныя правільна ўспрымаць факт вядзення працэсуальнага дзеяння, яго ход і вынікі;

4) работнікі суда, праваахоўных органаў і органаў кантролю.

## ГЛАВА 10
## ПРАДСТАЎНІЦТВА Ў СУДЗЕ

### Артыкул 91. Вядзенне спраў у судзе асабіста або праз прадстаўнікоў

1. Грамадзяне маюць права весці свае справы ў судзе асабіста або праз прадстаўнікоў. Асабісты ўдзел у справе грамадзян не пазбаўляе іх права мець па гэтай справе прадстаўнікоў.

2. Юрыдычныя асобы вядуць свае справы ў судзе праз свае органы, якія дзейнічаюць адпаведна заканадаўству, а таксама ўстаноўчым дакументам.

3. Прадстаўляць інтарэсы юрыдычных асоб у судзе маюць права кіраўнікі або работнікі юрыдычных асоб па справах гэтых асоб, адвакаты, а таксама іншыя асобы ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

4. Індывідуальны прадпрымальнік, які асабіста ажыццяўляе свае паўнамоцтвы ў судзе, прад’яўляе суду пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі яго ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і дакумент, што сведчыць яго асобу.

$4^1$. Грамадзянін, які ажыццяўляе дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, асабіста вядзе свае справы ў судзе, прад’яўляе суду копію рашэння раённага выканаўчага камітэта аб ажыццяўленні ім гэтай дзейнасці і дакумент, што сведчыць яго асобу.

$4^2$. Грамадзянін, які ажыццяўляе рамесную дзейнасць, асабіста вядзе свае справы ў судзе, прад’яўляе суду дакументы ці звесткі, што пацвярджаюць паведамленне падатковаму органу ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам аб прымяненні асобых рэжымаў падаткаабкладання для яе ажыццяўлення, і дакумент, што сведчыць яго асобу.

$4^3$. Грамадзянін, які ажыццяўляе самастойную прафесійную дзейнасць, асабіста вядзе свае справы ў судзе, прад’яўляе суду дакументы ці звесткі, што пацвярджаюць паведамленне падатковаму органу ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам аб прымяненні асобых рэжымаў падаткаабкладання для яе ажыццяўлення, і дакумент, што сведчыць яго асобу.

5. Ад імя юрыдычнай асобы (індывідуальнага прадпрымальніка), у дачыненні да якога прынята рашэнне аб ліквідацыі (спыненні дзейнасці), у судзе выступае старшыня ліквідацыйнай камісіі або ліквідатар ці ўпаўнаважаны прадстаўнік ліквідацыйнай камісіі або ліквідатара (у выпадку стварэння ліквідацыйнай камісіі, назначэння ліквідатара).

6. Ад імя юрыдычнай асобы (індывідуальнага прадпрымальніка), у дачыненні да якой у рамках узбуджанай справы аб неплацежаздольнасці ці банкруцтве адкрыта працэдура конкурснага вядзення, у судзе выступае антыкрызісны кіраўнік або ўпаўнаважаны ім адпаведна заканадаўству прадстаўнік.

7. Справы Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак вядуць у судзе ўпаўнаважаныя ва ўстаноўленым заканадаўчымі актамі парадку прадстаўнікі дзяржаўных органаў, іншых юрыдычных асоб.

**Артыкул 92. Асобы, якія могуць быць прадстаўнікамі ў судзе**

1. Прадстаўніком у судзе можа быць дзеяздольная асоба, якая мае належным чынам аформленыя паўнамоцтвы на вядзенне спраў у судзе, за выключэннем асоб, пералічаных у артыкуле 93 гэтага Кодэкса.

2. Прадстаўнікамі ў судзе могуць быць:

1) адвакаты;

2) работнікі юрыдычных асоб – па справах гэтых асоб;

3) упаўнаважаныя грамадскіх аб’яднанняў, якім заканадаўчымі актамі дадзена права прадстаўляць і абараняць у судзе правы, свабоды і законныя інтарэсы членаў гэтых грамадскіх аб’яднанняў;

4) упаўнаважаныя дзяржаўных органаў і юрыдычных асоб, якім заканадаўчымі актамі прадастаўлена права звяртацца ў суд у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб, а таксама дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб);

5) законныя прадстаўнікі;

6) блізкія сваякі, муж (жонка);

7) прадстаўнікі, назначаныя судом;

8) адзін з працэсуальных саўдзельнікаў – па даручэнні гэтых саўдзельнікаў;

9) патэнтныя паверанные;

10) іншыя асобы ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 93. Асобы, якія не могуць быць прадстаўнікамі ў судзе**

Прадстаўнікамі ў судзе не могуць быць:

1) асобы, якія не дасягнулі паўналецця, за выключэннем непаўналетніх бацькоў – па справах сваіх дзяцей;

2) асобы, прызнаныя недзеяздольнымі ці абмежавана дзеяздольнымі;

3) суддзі, следчыя, пракуроры, работнікі апарату суда, за выключэннем тых выпадкаў, калі яны ўдзельнічаюць у справе ў якасці прадстаўнікоў суда, органа папярэдняга следства, пракуратуры або законных прадстаўнікоў;

4) асобы, якія раней удзельнічалі ў справе ў якасці сведкі, эксперта, спецыяліста, перакладчыка, панятога;

5) асобы, якія з’яўляюцца сваяком, мужам (жонкай), сваяком суддзі, пракурора або сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі, якія прымалі ці прымаюць удзел у разглядзе канкрэтнай справы судом або якія з’яўляюцца сваяком, мужам (жонкай), сваяком асобы, чые інтарэсы супярэчаць інтарэсам даверніка гэтага прадстаўніка;

6) асобы, якія аказваюць або раней аказвалі юрыдычную дапамогу асобе, чые інтарэсы супярэчаць інтарэсам яго даверніка, які з’яўляецца бокам або трэцяй асобай.

**Артыкул 94. Законныя прадстаўнікі**

1. Правы, свабоды і законныя інтарэсы недзеяздольных грамадзян, грамадзян, якія не валодаюць поўнай дзеяздольнасцю, і грамадзян, прызнаных абмежавана дзеяздольнымі, абараняюць у судзе іх бацькі, усынаўляльнікі, апекуны або апекавальнікі. Законныя прадстаўнікі здзяйсняюць ад імя прадстаўляных усе працэсуальныя дзеянні, права здзяйснення якіх належыць прадстаўляным, з абмежаваннямі, прадугледжанымі заканадаўчымі актамі.

2. Па справе, у якой павінен удзельнічаць грамадзянін, прызнаны без вестак адсутным, у якасці яго прадстаўніка выступае даверны кіраўнік маёмасцю без вестак адсутнага.

3. Па справе, у якой павінен удзельнічаць спадчыннік асобы, якая памерла ці аб'яўлена памерлай, калі спадчына яшчэ нікім не прынята, у якасці прадстаўніка спадчынніка выступае асоба, назначаная для аховы і кіравання спадчыннай маёмасцю.

4. Паўнамоцтвы законных прадстаўнікоў непаўналетняга, якія прымаюць удзел у справе, спыняюцца ў выпадку, калі непаўналетні набыў грамадзянскую працэсуальную дзеяздольнасць у поўным аб'ёме падчас разгляду справы.

5. Законныя прадстаўнікі могуць даручыць вядзенне справы ў судзе іншаму прадстаўніку.

**Артыкул 95. Прадстаўнікі, назначаныя судом**

1. Суд назначае прадстаўніка боку або трэцяй асобе ў выпадку:

1) адсутнасці прадстаўніка ў недзеяздольнага боку або недзеяздольнай трэцяй асобы;

2) адсутнасці прадстаўніка ў адказчыка, месца жыхарства (месца знаходжання) якога невядомае;

3) калі прадстаўнік не мае права весці справу на падставах, прадугледжаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і;

4) у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

2. Пры наяўнасці абставін, указаных у пунктах 1 і 3 часткі 1 гэтага артыкула, прадстаўніком можа быць назначаны работнік органа апекі і апекавальніцтва, а ў выпадку, прадугледжаным пунктам 2 часткі 1 гэтага артыкула, – сваякі, іншыя грамадзяне з іх згоды.

3. Паўнамоцтвы прадстаўніка, назначанага судом, афармляюцца вызначэннем.

4. Прадстаўнікі, назначаныя судом, маюць права абскардзіць судовыя пастановы па справе.

**Артыкул 96. Афармленне паўнамоцтваў прадстаўніка**

1. Прадстаўнікі дапускаюцца судом да ўдзелу ў справе толькі пры наяўнасці адпаведных паўнамоцтваў.

2. Прадстаўнікі па даверанасці дапускаюцца судом да ўдзелу ў справе толькі пры наяўнасці належна афармленай даверанасці.

3. Даверанасць можа быць выдадзена на здзяйсненне асобных працэсуальных дзеянняў, вядзенне канкрэтнай справы, некалькіх спраў або на прадстаўленне інтарэсаў даверніка ў судзе па любой справе на працягу пэўнага тэрміну.

4. Даверанасць, выдадзеная прадстаўніку, павінна быць падпісана правамоцнай выдаваць даверанасці асобай і афармлена адпаведна заканадаўчым актам.

5. Даверанасці, выдадзеныя грамадзянамі, у тым ліку тымі, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, павінны быць засведчаны ў натарыяльным парадку або арганізацыяй, дзе давернік працуе або вучыцца; арганізацыяй, што ажыццяўляе эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) прадастаўляе жыллёва-камунальныя паслугі, па месцы жыхарства даверніка; кіраўніком (яго намеснікамі) установы сацыяльнага абслугоўвання, якая ажыццяўляе стацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне і дзе пражывае паўналетні грамадзянін; галоўным урачом (начальнікам), яго намеснікамі па медыцынскай частцы або дзяжурным урачом бальніцы (шпіталя і іншай арганізацыі аховы здароўя, што аказвае медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах), дзе давернік знаходзіцца на лячэнні; камандзірам (начальнікам) адпаведнага органа вайсковага кіравання, злучэння, вайсковай часці, арганізацыі, вайсковай навучальнай установы (у дачыненні да даверанасцей, выдадзеных вайскоўцамі, грамадзянскім персаналам органаў вайсковага кіравання, злучэнняў, вайсковых часцей, арганізацый і вайсковых навучальных устаноў або членамі іх сем'яў).

6. Даверанасць, выдадзеная прадстаўніку асобай, якая знаходзіцца ва ўстанове, што выконвае пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін, пажыццёвага пазбаўлення волі, або месцы ўтрымання пад вартай, сведчыцца

начальнікам адпаведнай установы, што выконвае пакаранне, або кіраўніком адміністрацыі месца ўтрымання пад вартай ці ў натарыяльным парадку.

7. Даверанасць ад імя юрыдычнай асобы выдаецца за подпісам яе кіраўніка або іншай асобы, упаўнаважанай на гэта ўстаноўчым дакументам юрыдычнай асобы.

8. Кіраўнік юрыдычнай асобы прад’яўляе суду дакумент, які пацвярджае статус кіраўніка, а таксама дакумент, што сведчыць яго асобу.

9. Работнік юрыдычнай асобы або іншаая асоба, якой даручана прадстаўляць інтарэсы юрыдычнай асобы ў судзе, прадстаўляюць суду даверанасць юрыдычнай асобы або іншы дакумент, што сведчыць такія паўнамоцтвы, а таксама прад’яўляюць дакумент, што сведчыць асобу.

10. Асобы, упаўнаважаныя калегіяльнымі органамі кіравання юрыдычных асоб, пацвярджаюць свае паўнамоцтвы ў судзе выпіскай з пратакола пасяджэння адпаведнага органа кіравання.

11. Адвакат прадстаўляе суду пасведчанне адваката і даверанасць або ордэр.

12. Патэнтны паверанны разам з даверанасцю прадстаўляе суду пасведчанне аб рэгістрацыі ў якасці патэнтнага паверанага.

13. Законныя прадстаўнікі прадстаўляюць суду дакументы, што пацвярджаюць іх права прадстаўляць інтарэсы падапечных.

14. Грамадзяне могуць упаўнаважваць сваіх прадстаўнікоў на ўдзел у справе вуснай або пісьмовай заявай, зробленай у судзе. Паўнамоцтвы прадстаўніка, прадугледжаныя часткай 2 артыкула 97 гэтага Кодэкса, павінны быць агавораны асоба.

15. Дзеянне даверанасці спыняецца пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных грамадзянскім заканадаўствам.

**Артыкул 97. Паўнамоцтвы прадстаўніка**

1. Паўнамоцтвы на вядзенне справы ў судзе даюць прадстаўніку права на здзяйсненне ад імя прадстаўлянага ўсіх працэсуальных дзеянняў.

2. У даверанасці, выдадзенай прадстаўляым, павінны быць спецыяльна агавораны правы прадстаўніка па даверанасці на:

1) падпісанне іскавай заявы і прад’яўленне іску;

2) падпісанне заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе, аб адмене вызначэння аб судовым загадзе;

3) перадачу спрэчкі на вырашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

4) поўная або частковая адмова ад іскавых патрабаванняў, змяненне іх памеру;

5) змяненне прадмету або падставы іску;

6) прызнанне іску;

7) падачу заявы аб прымяненні забяспечвальных мер, аб іх змяненні, замене і адмене;

8) заключэнне міравога пагаднення;

9) перадачу сваіх паўнамоцтваў іншай асобе (перадавер);

10) абскарджанне судовай пастановы;

11) падачу заявы аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах;

12) прад’яўленне патрабавання аб выдачы выканальнага дакумента, аб прымусовым выкананні судовай пастановы;

13) удзел у прымірэнчай працэдуры, заключэнне пагаднення аб прымірэнні, пагаднення аб прымяненні медыяцыі, медыятыўнага пагаднення, пагаднення аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў;

14) падпісанне хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда або замежнага трацейскага суда (арбітражу);

15) падпісанне хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

3. Прадстаўнік, які з’яўляецца замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства або грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае за межамі Рэспублікі Беларусь, мае права знаёміцца з матэрыяламі справы, дзе маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, пасля прадастаўлення допуску да дзяржаўных сакрэтаў у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 98. Парадак праверкі паўнамоцтваў прадстаўнікоў**

1. Суд абавязаны праверыць паўнамоцтвы прысутных у судзе прадстаўнікоў асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і вырашыць пытанне аб допуску іх да ўдзелу ў справе.

2. Дакументы, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы прадстаўнікоў, або іх копіі пры неабходнасці далучаюцца да матэрыялаў справы.

3. У выпадках непрадстаўлення неабходных дакументаў або прадстаўлення дакументаў, што не адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, суд адмаўляе ў прызнанні паўнамоцтваў адпаведнай асобы на ўдзел у справе.

## РАЗДЗЕЛ IV
## АРГАНІЗАЦЫЯ І ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ГРАМАДЗЯНСКАГА СУДАВОДСТВА

### ГЛАВА 11
### ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ФАКТЫ, ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ І СУДОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 99. Працэсуальныя факты, працэсуальныя і судовыя дакументы і іх форма**

1. Працэсуальныя факты выступаюць у форме працэсуальных дзеянняў і працэсуальных падзей.

2. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншыя ўдзельнікі грамадзянскага судаводства ажыццяўляюць прыналежныя ім правы, выконваюць абавязкі праз здзяйсненне працэсуальных дзеянняў. Працэсуальнымі фактамі таксама з’яўляюцца надыход або сканчэнне тэрмінаў, іншыя працэсуальныя падзеі.

3. Аб асноўных працэсуальных фактах складаюцца працэсуальныя і судовыя дакументы.

4. Форма працэсуальных дакументаў у любым выпадку надаецца прызначаным для перадачы суду заявам і хадайніцтвам бакоў, іншых асоб – удзельнікаў у справе.

5. Судовымі дакументамі з’яўляюцца судовыя пастановы і пратаколы, што складаюцца адпаведна судом або сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі.

**Артыкул 100. Змест працэсуальных дакументаў**

1. У кожным працэсуальным дакуменце павінна быць змешчана:

1) найменне суда, у які ён падаецца;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або назву і месца жыхарства (месца знаходжання) падаўца дакумента, а таксама яго прадстаўніка, калі працэсуальны дакумент падаецца прадстаўніком, нумары іх кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або назву і месца жыхарства (месца знаходжання) асоб – удзельнікаў у справе, а таксама нумары іх кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты, калі яны вядомыя падаўцу дакумента;

4) назва дакумента (іскавая заява, заява, скарга, водзыў на іскавую заяву і г.д.);

5) сутнасць заяўленага патрабавання або хадайніцтва, а таксама іх абгрунтаванне;

6) пералік дадаткаў;

7) подпіс падаўца дакумента або яго прадстаўніка і дата падачы.

2. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі актамі заканадаўства, у працэсуальных дакументах неабходна ўказаць і іншыя абавязковыя рэквізіты, а таксама дадаткі да працэсуальных дакументаў, у тым ліку якія пацвярджаюць аплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы (далей – сістэма АРІП) і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў працэсуальным дакуменце.

**Артыкул 101. Копіі працэсуальных дакументаў**

Працэсуальны дакумент падаецца ў суд з копіямі ў колькасці экземпляраў па ліку асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Суд можа ў залежнасці ад складанасці і характару справы запатрабаваць ад падаўца працэсуальнага дакумента таксама копіі дадзеных да яго дакументаў для перадачы іншым асобам – удзельнікам у справе.

**Артыкул 102. Выпраўленне недахопаў працэсуальнага дакумента**

1. Суд, устанавіўшы, што працэсуальны дакумент пададзены з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых пунктамі 1–3, 5, 7 часткі 1 і часткай 2 артыкула 100, артыкулам 101 гэтага Кодэкса, выносіць матываванае вызначэнне аб пакіданні дакумента без руху, аб чым паведамляе падаўцу дакумента і прадастаўляе яму тэрмін для выпраўлення недахопаў.

2. Дакумент, выпраўлены ў адпаведнасці з указаннямі суда, лічыцца пададзеным у дзень першапачатковага прадстаўлення яго ў суд, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам. У адваротным выпадку дакумент лічыцца непададзеным і з дадзенымі да яго дакументамі накіроўваецца падаўцу.

**Артыкул 103. Структура судовай пастановы**

1. Судовая пастанова складаецца з уводнай, апісальнай, матывіровачнай і рэзалютыўнай частак.

2. Матывіровачная частка судовай пастановы складаецца:

1) у выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам;

2) судом па ўласнай ініцыятыве.

**Артыкул 104. Фіксаванне ходу судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем**

1. Ход кожнага судовага пасяджэння суда першай інстанцыі, а таксама ход здзяйснення кожнага асобнага працэсуальнага дзеяння суда першай інстанцыі па-за пасяджэннем фіксуюцца з выкарыстаннем сродкаў гука- або відэазапісу і складаннем сціслага пратакола ў пісьмовай форме з захаваннем патрабаванняў артыкула 105 гэтага Кодэкса.

2. У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне ўсіх удзельнікаў грамадзянскага судаводства гука- або відэазапіс не вядзецца.

3. Пры адсутнасці тэхнічнай магчымасці весці гука- або відэазапіс, а таксама ў выпадку, прадугледжаным часткай 2 гэтага артыкула, ход судовага пасяджэння або

здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем фіксуецца складаннем пратакола ў пісьмовай форме з захаваннем патрабаванняў частак 2 і 4 артыкула 105 гэтага Кодэкса. У прыватнасці, у пратаколе павінны выкладацца працэсуальныя дзеянні ў тым парадку, у якім яны адбываліся, а таксама ўстаноўленыя пры іх вядзенні істотныя для справы факты і заявы асоб, якія ўдзельнічалі ў гэтых дзеяннях.

4. У судзе апеляцыйнай інстанцыі ход судовага пасяджэння фіксуецца ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

5. Па справах, разгляданых ў касацыйным парадку і ў парадку нагляду, ход судовага пасяджэння не фіксуецца.

### Артыкул 105. Змест сціслага пратакола, пратакола

1. Пры разглядзе справы ў судзе першай інстанцыі ў сціслым пратаколе ўказваюцца:

1) дата і месца правядзення судовага пасяджэння, здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем;

2) час пачатку і заканчэння судовага пасяджэння, здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем;

3) найменне суда, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) суддзі і сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі;

4) найменне справы;

5) звесткі аб выкарыстанні падчас судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем сродкаў гука- або відэазапісу, сістэм відэаканферэнцсувязі і іншых тэхнічных сродкаў;

6) звесткі аб яўцы асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, іншых удзельнікаў грамадзянскага судаводства, а таксама звесткі аб іх асобе;

7) звесткі аб папярэджанні перакладчыка аб крымінальнай адказнасці за заведама няправільны пераклад, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў; эксперта – аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывага заключэння эксперта, за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў; сведку – аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывых паказанняў, за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў;

8) звесткі аб вусных заявах і хадайніцтвах асоб, якія ўдзельнічаюць у справе;

9) звесткі аб тлумачэннях бакоў і іншых асоб – удзельнікаў у справе, аб тлумачэннях экспертаў, спецыялістаў, допыце сведкаў, аб абвяшчэнні судом даных агляду, аб праслухоўванні гуказапісу і праглядзе відэазапісу, выніках апазнання і судовага эксперыменту з указаннем часу здзяйснення гэтых дзеянняў (пры неабходнасці – назва файла, дзе змешчаны гука- або відэазапіс);

10) распараджэнні суддзі (асобы, якая старшынюе) і вызначэнні суда, вынесеныя ў судовым пасяджэнні без выхаду ў дарадчы пакой;

11) іншыя звесткі, падлеглыя абавязковаму занясенню ў сціслы пратакол у адпаведнасці з гэтым Кодэксам, за выключэннем звестак, прадугледжаных часткамі 2 і 4 гэтага артыкула;

12) дата складання сціслага пратакола.

2. У выпадку калі гука- або відэазапіс не вядзецца, складаецца пратакол у пісьмовай форме, дзе, апрача звестак, прадугледжаных пунктамі 1–8 і 10 часткі 1 гэтага артыкула, указваюцца:

1) прычыны немагчымасці вядзення гука- або відэазапісу;

2) звесткі аб растлумачэнні ўдзельнікам грамадзянскага судаводства іх працэсуальных правоў і абавязкаў;

3) тлумачэнні і меркаванні асоб – удзельнікаў у справе, паказанні сведкаў, заключэнні і тлумачэнні экспертаў, кансультацыі і тлумачэнні спецыялістаў, даныя агляду, праслухоўвання гуказапісу і прагляду відэазапісу, вынікі апазнання і судовага эксперыменту;

4) заключэнні прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, іншых упаўнаважаных арганізацый;

5) змест судовых спрэчак і меркаванне пракурора;

6) звесткі аб абвяшчэнні судовых пастаноў, аб растлумачэнні зместу, парадку і тэрміну іх абскарджання;

7) звесткі аб растлумачэнні асобам – удзельнікам у справе права на азнаямленне з пратаколам і парадку прынясення заўваг на яго;

8) іншыя звесткі, падлеглыя абавязковаму занясенню ў пратакол у адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

9) дата складання пратакола.

3. Змест сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі вызначаецца правіламі, устаноўленымі гэтым артыкулам, з улікам сутнасці апеляцыйнага вядзення.

4. У сціслым пратаколе, пратаколе здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, апрача звестак, прадугледжаных часткамі 1 і 2 гэтага артыкула, павінны таксама ўказвацца звесткі, што ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам з’яўляюцца абавязковымі для канкрэтнага працэсуальнага дзеяння.

### Артыкул 106. Парадак фіксавання ходу судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем

1. Выкарыстанне сродкаў гука- або відэазапісу для фіксавання ходу судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем і складанне сціслага пратакола, пратакола забяспечвае сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі.

2. Гука- або відэазапіс ходу судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем вядзецца непарарыўна. Электронны носьбіт інфармацыі, дзе змешчана копія гука- або відэазапісу, далучаецца да справы і з’яўляецца неад’емнай часткай сціслага пратакола.

3. Сціслы пратакол, пратакол выконваюцца рукапісным спосабам або з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў і павінны быць складзены і падпісаны не пазней за наступны дзень пасля заканчэння судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, а па складаных справах – на працягу пяці дзён. Аб тэрмінах складання сціслага пратакола, пратакола, а таксама аб праве асоб, якія ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні і (або) здзяйсненні асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, на азнаямленне з адпаведнымі сціслым пратаколам, пратаколам аб’яўляецца пры абвяшчэнні судовай пастановы.

4. Сціслы пратакол, пратакол падпісваюцца суддзёй і сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі, а сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі – асобай, якая старшынюе, і сакратаром судовага пасяджэння – памочнікам суддзі. Рознагалоссі паміж імі з нагоды зместу сціслага пратакола, пратакола вырашаюцца ў парадку, устаноўленым артыкулам 107 гэтага Кодэкса.

5. Па хадайніцтве асоб – удзельнікаў у справе за іх кошт могуць быць выкананы копіі сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння і (або) здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем. Асобы – удзельнікі ў справе, таксама маюць права атрымліваць на прадастаўленым імі электронным носьбіце інфармацыі копію гука- або відэазапісу ходу адкрытага судовага пасяджэння і (або) здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, а таксама самастойна рабіць капіяванне з выкарыстаннем электронных і іншых прылад сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння і (або) здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем.

### Артыкул 107. Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол

1. Асобы – удзельнікі ў справе маюць права знаёміцца з гука- або відэазапісам ходу судовага пасяджэння і (або) здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння і (або) здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем.

2. На працягу пяці дзён пасля падпісання сціслага пратакола, пратакола асобы – удзельнікі ў справе могуць падаць у суд пісьмовыя заўвагі на адпаведныя гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол з указаннем на іх непаўнату і наяўныя ў іх няправільнасці.

3. Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол разглядаюцца суддзёй у пяцідзённы тэрмін пасля іх паступлення ў суд. У выпадку згоды з заўвагамі суддзя выносіць вызначэнне аб далучэнні іх да сціслага пратакола, пратакола.

4. У выпадку нязгоды з заўвагамі суддзя выносіць вызначэнне аб іх адхіленні. Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол і вызначэнне суддзі аб іх адхіленні далучаюцца да сціслага пратакола, пратакола. У гэтым выпадку асобы, якія ўдзельнічаюць ў справе, матывы нязгоды з вызначэннем суддзі маюць права выкласці ў апеляцыйнай, касацыйнай або наглядней скарзе (пратэсце).

5. Заўвагі на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі разглядаюцца гэтым судом. Пры калегіяльным разглядзе такіх заўваг асоба, якая старшынюе, і хаця б адзін з суддзяў павінны быць з шэрагу суддзяў, якія ўваходзілі ў склад суда, што разглядаў справу.

6. Пры наяўнасці абставін, што выключаюць магчымасць разгляду заўваг на гука- або відэазапіс, сціслы пратакол, пратакол, такія заўвагі далучаюцца да матэрыялаў справы.

## ГЛАВА 12
## ВЫКАРЫСТАННЕ СІСТЭМ ВІДЭАКАНФЕРЭНЦСУВЯЗІ Ў ГРАМАДЗЯНСКІМ СУДАВОДСТВЕ

### Артыкул 108. Падставы і ўмовы выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі у грамадзянскім судаводстве

1. З мэтай своечасовага разгляду справы, забеспячэння ўдзелу ў судовым пасяджэнні бакоў, трэціх асоб, іншых удзельнікаў грамадзянскага судаводства і пры наяўнасці ў адпаведным судзе тэхнічнай магчымасці судовае пасяджэнне можа быць праведзена па хадайніцтве асоб – удзельнікаў у справе або па ініцыятыве суда з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі.

2. Дапускаецца выкарыстанне сістэм відэаканферэнцсувязі падчас правядзення судовага пасяджэння, у тым ліку папярэдняга судовага пасяджэння, а таксама асобнай яго часткі.

3. Сістэмы відэаканферэнцсувязі могуць таксама выкарыстоўвацца пры здзяйсненні асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем.

4. У судовым разборы, які праводзіцца з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі, могуць быць заслуханы тлумачэння асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, дапытаны сведкі, атрыманы тлумачэнні экспертаў і спецыялістаў, даследаваны пісьмовыя, электронныя і рэчавыя доказы, а таксама здзейснены іншыя працэсуальныя дзеянні.

5. Судовае пасяджэнне з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі дапускаецца ў судах першай, апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый.

6. Аб правядзенні судовага пасяджэння з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі судом выносіцца вызначэнне.

7. Суд можа адмовіць у прымяненні сістэм відэаканферэнцсувязі пры разглядзе справы ў выпадку, калі:

1) адсутнічае тэхнічная магчымасць выкарыстання сістэм відэаканферэнцсувязі;

2) разбор справы ажыццяўляецца ў закрытым судовым пасяджэнні;

3) маюцца іншыя абставіны, што перашкаджаюць выкарыстанню сістэм відэаканферэнцсувязі.

8. У выпадку ўзнікнення тэхнічных непаладак у рабоце сістэм відэаканферэнцсувязі суд можа адкласці судовы разбор.

9. Правілы, устаноўленыя гэтай главой, не выключаюць магчымасці выкарыстання са згоды асоб – удзельнікаў у справе, прысутных у судовым пасяджэнні, іншых тэхнічных сродкаў сувязі, што дазваляюць дыстанцыйна ўдзельнічаць у судаводстве, для фіксавання допыту сведкаў, тлумачэнняў бакоў, іншых асоб – удзельнікаў у справе, тлумачэнняў іншых удзельнікаў працэсу, якія знаходзяцца па-за месцам распалажэння суда, што разглядае справу.

## Артыкул 109. Парадак арганізацыі і правядзення судовага пасяджэння з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі

1. Пры наяўнасці падстаў для правядзення судовага пасяджэння з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі суд, які разглядае справу, накіроўвае ў суд, што ажыццяўляе арганізацыю відэаканферэнцсувязі, адпаведнае даручэнне з указаннем даты судовага пасяджэння, звестак аб складзе ўдзельнікаў судовага разбору, а таксама іншай неабходнай інфармацыі.

2. Асобы – удзельнікі ў справе, іншыя ўдзельнікі грамадзянскага судаводства апавяшчаюцца аб часе і месцы судовага пасяджэння, што праводзіцца з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі, судом, які разглядае справу, у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

3. У выпадках калі судовае пасяджэнне праводзіцца з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі, правілы гэтага Кодэкса, што вызначаюць парадак і ход судовага разбору, распаўсюджваюцца таксама на ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства, якія знаходзяцца па-за месцам распалажэння суда, што разглядае справу.

4. Устанаўленне асобы тых, хто з’явіўся, праверка іх яўкі і паўнамоцтваў, атрыманне падпіскі ў сведкаў, экспертаў, перакладчыкаў аб растлумачэнні ім правоў і абавязкаў і папярэджанні аб адказнасці за іх парушэнне, ажыццяўленне іншых дзеянняў, звязаных з забеспячэннем разгляду справы, здзяйсняюцца пры садзейнічанні сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі суда, які ажыццяўляе арганізацыю відэаканферэнцсувязі.

5. Даследаванне доказаў у судовым пасяджэнні, што праводзіцца з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі, ажыццяўляецца па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

6. Калі поўнае, усебаковае і аб’ектыўнае даследаванне доказаў у судовым пасяджэнні з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі з’яўляецца немагчымым або праблематычным, суд адкладае разбор справы ці абвяшчае перапынак у судовым пасяджэнні.

7. Дакументы, што пацвярджаюць паўнамоцтвы асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, атрыманыя ў сведкаў, экспертаў, перакладчыкаў падпіскі, а таксама прадстаўленыя ў судовым пасяджэнні доказы накіроўваюцца ў суд, што разглядае справу, не пазней за дзень, наступны за днём правядзення судовага пасяджэння.

8. Звесткі аб выкарыстанні судом сістэм відэаканферэнцсувязі указваюцца ў судовай пастанове, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, а таксама фіксуюцца ў сціслым пратаколе, пратаколе судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем.

# ГЛАВА 13
# СУДОВЫЯ ПАВЕДАМЛЕННІ І ВЫКЛІКІ

## Артыкул 110. Судовыя паведамленні

1. Калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, апавяшчэнне асоб – удзельнікаў у справе аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем, а таксама выклік у суд сведкаў, экспертаў, спецыялістаў і перакладчыкаў праводзяцца судовай позвай, копіяй вызначэння, тэлефанаграмай, тэлеграмай, СМС-паведамленнем, публікацыяй у сродках масавай інфармацыі, пры дапамозе факсімільнай сувязі, глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт (у тым ліку пры дапамозе электроннай пошты, размяшчэння інфармацыі на інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь), а таксама з выкарыстаннем іншых сродкаў сувязі і спосабаў дастаўкі, што забяспечваюць фіксаванне паведамлення або выкліку (судовыя паведамленні).

2. Судовае паведамленне ажыццяўляецца з такім разлікам, каб удзельнікі грамадзянскага судаводства мелі неабходны час для падрыхтоўкі да справы і своечасовай яўкі ў суд.

3. Судовае паведамленне накіроўваецца на адрас, указаны асобай, якая ўдзельнічае ў справе, або яе прадстаўніком.

4. У выпадку калі па адрасе, указаным асобай, якая ўдзельнічае ў справе, або яе прадстаўніком, ці па месцы жыхарства грамадзянін фактычна не пражывае, судовае паведамленне можа быць накіравана па месцы яго работы (службы).

5. Судовае паведамленне, адрасаванае юрыдычнай асобе, накіроўваецца па месцы яе знаходжання, указаным у статуце, іншым устаноўчым дакуменце і (або) Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Судовае паведамленне, адрасаванае юрыдычнай асобе, таксама можа быць накіравана на адрас месца знаходжання яе прадстаўніцтва або філіяла, калі яны ўказаны ў статуце юрыдычнай асобы, якая іх стварыла.

6. Замежныя асобы апавяшчаюцца па правілах, устаноўленых гэтай главой, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам або міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

7. Дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы, калі яны ўдзельнічаюць у справе, атрымаўшы першае судовае паведамленне па разгляданай справе, з іх згоды могуць апавяшчацца судом аб часе і месцы судовага пасяджэння (папярэдняга судовага пасяджэння) пры дапамозе размяшчэння адпаведнай інфармацыі на інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь у тэрмін не пазней за пяць дзён да пачатку судовага пасяджэння.

8. Асобы, указаныя ў частцы 7 гэтага артыкула, нясуць рызыку надыходу неспрыяльных наступстваў у выніку непрыняцця імі мер па атрыманні інфармацыі аб руху справы, калі суд мае звесткі аб тым, што гэтыя асобы належным чынам апавешчаны аб пачатым працэсе, за выключэннем выпадкаў, калі меры па атрыманні інфармацыі не маглі быць прыняты імі з прычыны надзвычайных і непазбежных абставін.

## Артыкул 111. Змест судовых паведамленняў

1. У судовых паведамленнях неабходна ўказаць:

1) найменне і месца знаходжання суда, адрас інтэрнэт-партала судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь, нумары кантактных тэлефонаў суда, адрасы электроннай пошты, па якіх асобы – удзельнікі ў справе могуць атрымаць інфармацыю аб разгляданай справе;

2) указанне часу і месца правядзення судовага пасяджэння або здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем;

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы, якая апавяшчаецца або выклікаецца ў суд, яе месца жыхарства або месца знаходжання;

4) указанне, у якасці каго апавяшчаецца або выклікаецца адрасат;

5) назва справы, па якой ажыццяўляюцца апавяшчэнне або выклік адрасата;

6) указанне на абавязак асобы, якая прыняла судовую позву або іншае судовае паведамленне ў сувязі з адсутнасцю адрасата, пры першай магчымасці ўручыць іх адрасату;

7) указанне на наступства няяўкі ў суд;

8) у неабходных выпадках іншыя звесткі, якія маюць значэнне.

2. У судовых паведамленнях, адрасаваных асобам – удзельнікам у справе, прапануецца прадставіць у суд усе наяўныя ў іх доказы па справе, а таксама ўказваецца на наступствы непрадстаўлення доказаў і няяўкі ў суд апавешчаных або выкліканых асоб, тлумачыцца абавязак паведамляць суду прычыны няяўкі.

3. Адначасова з судовым паведамленнем, адрасаваным адказчыку або зацікаўленай асобе, суддзя накіроўвае або ўручае копіі іскавай заявы ці заявы, якія паступілі ў суд, а пры неабходнасці – копіі дададзеных да іх дакументаў, калі ўказаныя заявы і дакументы не ўтрымліваюць звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі.

4. Адначасова з судовым паведамленнем, адрасаваным істцу або заяўніку, суддзя накіроўвае або ўручае копіі пісьмовых тлумачэнняў або водзыву на іскавую заяву адказчыка, зацікаўленай асобы, якія паступілі ў суд, а пры неабходнасці – копіі дададзеных да іх дакументаў, калі ва ўказаных тлумачэннях, водзывах і дакументах не маецца звестак, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі.

5. Азнаямленне з дакументамі або іх копіямі, дзе маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, выпіскі з іх ажыццяўляюцца з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах, аб чым указваецца ў судовым паведамленні.

**Артыкул 112. Парадак апавяшчэння**

1. Судовыя паведамленні могуць уручацца адрасатам непасрэдна ў судзе.

2. Суддзя можа са згоды асобы, якая ўдзельнічае ў справе, выдаць ёй на рукі судовае паведамленне для ўручэння іншай асобе, якую апавяшчаюць або выклікаюць у суд.

3. Судовыя паведамленні могуць накіроўвацца судом пры дапамозе паштовай сувязі, у тым ліку з выкарыстаннем нацыянальнай паштовай электроннай сістэмы, а таксама з выкарыстаннем іншых відаў сувязі і спосабаў дастаўкі, што забяспечваюць фіксаванне паведамлення або выкліку.

4. Судовае паведамленне можа размяшчацца на інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь у выпадку, прадугледжаным часткай 7 артыкула 110 гэтага Кодэкса.

5. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, судовае паведамленне можа быць апублікавана ў сродках масавай інфармацыі.

6. Да матэрыялаў справы далучаюцца дакументы, якія пацвярджаюць:

1) накіраванне судом судовага паведамлення (у тым ліку пры дапамозе тэлефанаграмы), яго атрыманне адрасатам (распіска, паведамленне аб атрыманні, іншыя дакументы);

2) адпраўленне судовага паведамлення пры дапамозе тэлеграмы, СМС-паведамлення, факсімільнай сувязі або электроннай пошты ці з выкарыстаннем іншых сродкаў сувязі і спосабаў дастаўкі (справаздача, іншыя дакументы);

3) размяшчэнне судовых паведамленняў на інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь;

4) апублікаванне судовых паведамленняў у сродках масавай інфармацыі.

**Артыкул 113. Належнае апавяшчэнне**

1. Асобы – удзельнікі ў справе і іншыя ўдзельнікі працэсу лічацца апавешчанымі належным чынам, калі да пачатку судовага пасяджэння ці здзяйснення асобнага працэсуальнага дзеяння суда па-за пасяджэннем суд мае доказы аб атрыманні адрасатам судовага паведамлення.

2. Грамадзянін таксама лічыцца апавешчаным належным чынам, калі суд мае звесткі аб тым, што судовае паведамленне ўручана адрасату асабіста, або яго прадстаўніку, або паўналетняму члену сям’і адрасата ці адміністрацыі па месцы работы (службы) адрасата.

3. Юрыдычная асоба лічыцца апавешчанай, калі суд мае звесткі аб тым, што судовае паведамленне ўручана прадстаўніку ці іншай упаўнаважанай асобе гэтай юрыдычнай асобы або яе прадстаўніцтва ці філіяла.

4. Дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы таксама лічацца апавешчанымі належным чынам у выпадку, прадугледжаным часткай 7 артыкула 110 гэтага Кодэкса.

5. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншыя ўдзельнікі працэсу таксама лічацца апавешчанымі належным чынам, калі:

1) адрасат адмовіўся ад атрымання судовага паведамлення і такая адмова дакументальна зафіксавана;

2) адрасат не прыбыў па судовае паведамленне, накіраванае яму судом ва ўстаноўленым парадку, аб чым маецца паведамленне аператара паштовай сувязі;

3) судовае паведамленне, накіраванае судом па апошнім вядомым суду месцы жыхарства грамадзяніна, месцы знаходжання юрыдычнай асобы, арганізацыі, што не з’яўляецца юрыдычнай асобай, не ўручана ў сувязі з адсутнасцю адрасата па ўказаным адрасе, аб чым маецца паведамленне аператара паштовай сувязі.

**Артыкул 114. Перамена адраса падчас вядзення справы**

1. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, абавязаны паведаміць суду аб перамене свайго адраса падчас вядзення справы. Пры адсутнасці такой інфармацыі судовае паведамленне накіроўваецца па апошнім вядомым суду месцы жыхарства або месцы знаходжання адрасата і лічыцца дастаўленым, нават калі адрасат па гэтым адрасе больш не пражывае або не знаходзіцца. Такое паведамленне з’яўляецца належным.

2. У выпадку калі асоба, якая ўдзельнічае ў справе, паведамляла суду нумары кантактных тэлефонаў і нумары факсаў, адрас электроннай пошты або аналагічную інфармацыю, яна павінна паведаміць суду аб іх змяненні падчас вядзення справы. Пры адсутнасці такога паведамлення судовае паведамленне накіроўваецца па апошніх вядомых суду звестках і лічыцца дастаўленым, нават калі адрасат больш іх не выкарыстоўвае. Такое паведамленне з’яўляецца належным.

**Артыкул 115. Невядомасць месца прысутнасці адказчыка і яго вышук**

1. У выпадку калі месца фактычнай прысутнасці адказчыка невядомае, суд прыступае да разгляду справы пасля паступлення звестак аб гэтым з апошняга вядомага месца жыхарства адказчыка або апошняга вядомага месца яго работы.

2. Калі невядомае фактычнае месца прысутнасці адказчыка паісках аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна, і па патрабаваннях, прад’яўленых з мэтай абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, суд абвяшчае вышук адказчыка праз тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў.

# ГЛАВА 14
# ПРАЦЭСУАЛЬНЫЯ ТЭРМІНЫ

## Артыкул 116. Устанаўленне і вылічэнне працэсуальных тэрмінаў

1. Працэсуальныя дзеянні здзяйсняюцца ў тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі або судом. Устаноўлены судом працэсуальны тэрмін павінен быць разумным і дастатковым для здзяйснення працэсуальнага дзеяння.

2. Тэрміны для здзяйснення працэсуальных дзеянняў вызначаюцца перыядам часу, на працягу якога працэсуальнае дзеянне павінна быць здзейснена, або дакладнай каляндарнай датай ці ўказаннем на падзею, што абавязкова павінна ўступіць.

3. Працэсуальныя тэрміны вылічваюцца гадамі, месяцамі і днямі. У тэрміны, якія вылічваюцца днямі, не ўключаюцца нерабочыя дні, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

## Артыкул 117. Пачатак і заканчэнне працэсуальных тэрмінаў

1. Працэсуальны тэрмін, які вызначаецца перыядам часу, пачынаецца на наступны дзень пасля каляндарнай даты або надыходу падзеі, якімі вызначана яго пачатак, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі. Калі працэсуальны тэрмін устаноўлены судом, яго вылічэнне пачынаецца з наступнага дня пасля ўручэння судовай пастановы аб гэтым.

2. Працэсуальны тэрмін, што вызначаецца дакладнай каляндарнай датай або ўказаннем на падзею, што абавязкова павінна надысці, сыходзіць у дзень надыходу адпаведна даты або падзеі.

3. Датай сканчэння працэсуальнага тэрміну, што вызначаецца перыядам часу, лічыцца дата, якой заканчваецца перыяд, на працягу якога працэсуальнае дзеянне павінна быць здзейснена.

4. Працэсуальны тэрмін, які вылічваецца гадамі, сыходзіць у адпаведныя месяц і число апошняга года ўстаноўленага тэрміну.

5. Працэсуальны тэрмін, які вылічваецца месяцамі, сыходзіць у адпаведнае число апошняга месяца ўстаноўленага тэрміну.

6. Калі заканчэнне працэсуальнага тэрміну, які вылічваецца месяцамі, выпадае на месяц, што не мае адпаведнага числа, тэрмін сыходзіць у апошні дзень гэтага месяца.

7. Тэрмін, які вылічваецца днямі, сыходзіць у апошні дзень устаноўленага перыяду.

8. Калі апошні дзень працэсуальнага тэрміну выпадае на нерабочы дзень, днём заканчэння тэрміну лічыцца першы наступны за ім рабочы дзень.

9. Працэсуальнае дзеянне, для здзяйснення якога ўстаноўлены тэрмін, можа быць здзейснена да дваццаці чатырох гадзін апошняга дня тэрміну. Калі іскавая заява, заява, скарга, іншыя дакументы або грашовыя сумы былі здадзены аператару паштовай сувязі да дваццаці чатырох гадзін апошняга дня працэсуальнага тэрміну, тэрмін не лічыцца прапушчаным.

10. Калі працэсуальнае дзеянне павінна быць здзейснена ў судзе або іншай арганізацыі, тэрмін сыходзіць у апошні дзень тэрміну ў тую гадзіну, калі ў судзе або арганізацыі па ўстаноўленых правілах заканчваецца работа або спыняюцца адпаведныя аперацыі.

## Артыкул 118. Прыпыненне працэсуальных тэрмінаў

1. Цячэнне ўсіх нясконччаных працэсуальных тэрмінаў прыпыняецца адначасова з прыпыненнем вядзення справы.

2. З дня аднаўлення вядзення справы цячэнне працэсуальных тэрмінаў працягваецца.

**Артыкул 119. Аднаўленне прапушчаных працэсуальных тэрмінаў**

1. Працэсуальныя тэрміны, устаноўленыя гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі, могуць быць адноўлены судом, калі яны прапушчаны з прычын, прызнаных судом уважлівымі.

2. Заява аб аднаўленні прапушчанага працэсуальнага тэрміну падаецца ў суд, у якім належала здзейсніць працэсуальнае дзеянне, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам. У заяве павінны быць указаны прычыны пропуску працэсуальнага тэрміну. Да заявы дадаюцца дакументы з пацвярджэннем уважлівасці гэтых прычын. Заява разглядаецца без апавяшчэння асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. З улікам характару і складанасці працэсуальнага пытання суд мае права выклікаць асоб – удзельнікаў у справе у судовае пасяджэнне, паведаміўшы ім аб часе і месцы яго правядзення.

3. Адначасова з падачай заявы аб аднаўленні працэсуальнага тэрміну павінна быць здзейснена працэсуальнае дзеянне, у дачыненні да якога прапушчаны тэрмін.

4. Заява аб аднаўленні працэсуальнага тэрміну не прымаецца да разгляду, калі гэты тэрмін у адпаведнасці з гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі не падлягае аднаўленню.

5. Па пытанні аднаўлення прапушчанага працэсуальнага тэрміну суд выносіць вызначэнне.

6. Вызначэнне суда аб адмове ў аднаўленні прапушчанага працэсуальнага тэрміну можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 120. Працяг і скарачэнне працэсуальнага тэрміну**

1. Па заяве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, устаноўленыя судом працэсуальныя тэрміны могуць быць працягнуты або скарочаны.

2. Вызначэнне суда аб адмове ў працягу ўстаноўленага судом працэсуальнага тэрміну можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 121. Наступствы пропуску працэсуальных тэрмінаў**

1. Сканчэнне ўстаноўленага гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі або судом працэсуальнага тэрміну пагашае права на здзяйсненне адпаведнага працэсуальнага дзеяння. Сканчэнне працэсуальнага тэрміну не вызваляе ад выканання працэсуальнага абавязку.

2. Працэсуальныя дакументы, пададзеныя пасля сканчэння працэсуальных тэрмінаў, калі не пададзены заявы аб працягу ці аб аднаўленні прапушчаных тэрмінаў, не разглядаюцца судом і вяртаюцца асобам, якімі яны былі пададзены.

**Артыкул 122. Тэрміны разгляду грамадзянскіх спраў судом першай інстанцыі**

1. Калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі, грамадзянскія справы па першай інстанцыі павінны разглядацца не пазней за два месяцы пасля ўзбуджэння вядзення справы. У выключных выпадках з улікам асаблівай складанасці справы старшынёй суда тэрмін разгляду справы можа быць працягнуты да чатырох месяцаў.

2. Справы аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна, і па патрабаваннях, якія вынікаюць з працоўных праваадносін, а таксама аб прызнанні арганізацыі, у тым ліку замежнай або міжнароднай арганізацыі, экстрэмісцкай, аб забароне яе дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, аб ліквідацыі такой арганізацыі, аб забароне выкарыстання яе сімволікі і атрыбутыкі, аб прызнанні сімволікі і атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі

экстрэміцкімі матэрыяламі павінны разглядацца судом першай інстанцыі не пазней за адзін месяц пасля ўзбуджэння вядзення справы.

3. Справы з удзелам замежных асоб, якія знаходзяцца або пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, разглядаюцца судом першай інстанцыі не пазней за адзін год пасля ўзбуджэння вядзення справы, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 15
## МЕРЫ ПРАЦЭСУАЛЬНАГА ЎЗДЗЕЯННЯ

### Артыкул 123. Меры працэсуальнага ўздзеяння і ўмовы іх прымянення

1. У выпадку злоўжывання працэсуальнымі правамі або наўмыснага невыканання працэсуальных абавязкаў удзельнікамі грамадзянскага судаводства і іншымі асобамі да вінаватага ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі могуць быць прыменены наступныя меры працэсуальнага ўздзеяння:

1) абмежаванне выступлення ўдзельніка судовага разбору або пазбаўленне ўдзельніка судовага разбору слова;

2) папярэджанне;

3) выдаленне з залы судовага пасяджэння;

4) прывод;

5) ускладанне судовых выдаткаў на нядобрасумленных удзельнікаў грамадзянскага судаводства.

2. Прымяненне да асобы мер працэсуальнага ўздзеяння не вызваляе гэту асобу ад выканання адпаведных абавязкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам або ўстаноўленых судом на падставе палажэнняў гэтага Кодэкса.

3. Пры ўчыненні правапарушэнняў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, да вінаватых могуць прымяняцца меры адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці.

### Артыкул 124. Прымяненне мер працэсуальнага ўздзеяння

1. Меры працэсуальнага ўздзеяння прымяняюцца судом неадкладна пасля ўчынення асобай адпаведнага парушэння.

2. За адно парушэнне можа быць прыменена адна мера працэсуальнага ўздзеяння.

3. Аб прымяненні мер працэсуальнага ўздзеяння, прадугледжаных пунктамі 1–4 часткі 1 артыкула 123 гэтага Кодэкса, указваецца ў сціслым пратаколе, пратаколе судовага пасяджэння. Пярэчанні асобы, у дачыненні да якой прыняты такія меры, таксама заносяцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння. Прымяненне ўказаных мер абскарджанню не падлягае, але довады аб нязгодзе з імі могуць быць указаны пры абскарджанні судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці.

### Артыкул 125. Абмежаванне выступлення ўдзельніка судовага разбору, пазбаўленне ўдзельніка судовага разбору слова

1. У выпадку парушэння ўдзельнікам судовага разбору правілаў выступлення ў судовым пасяджэнні асоба, якая старшынюе ў судовым пасяджэнні, мае права:

1) абмежаваць яго выступленне, калі ўдзельнік судовага разбору закранае пытанне, што не мае адносіны да судовага разбору;

2) пазбавіць слова, калі ўдзельнік судовага разбору самавольна парушае паслядоўнасць выступлення, двойчы не выконвае патрабаванні асобы, якая старшынюе, дапускае грубыя выразы ці зняважлівыя выказванні або заклікае да ўчынення проціпраўных дзеянняў.

2. Асоба, якая старшынюе ў судовым пасяджэнні, абавязана папярэдзіць удзельніка судовага разбору, які парушае правілы выступлення ў судовым пасяджэнні, аб магчымасці прымянення да яго мер працэсуальнага ўздзеяння, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, з растлумачэннем наступстваў іх прымянення.

**Артыкул 126. Папярэджанне і выдаленне з залы судовага пасяджэння**

1. У выпадку парушэння ўдзельнікам судовага разбору парадку ў судовым пасяджэнні асоба, якая старшынюе ў судовым пасяджэнні, мае права:

1) абвясціць яму папярэджанне;

2) выключыць яго з залы судовага пасяджэння на ўвесь час судовага пасяджэння або на яго частку.

2. Асобы, якія прысутнічаюць у судовым пасяджэнні, у выпадку паўторнага парушэння парадку ў судовым пасяджэнні выдаляюцца па распараджэнні асобы, якая старшынюе ў судовым пасяджэнні, з залы судовага пасяджэння на ўвесь час судовага пасяджэння.

**Артыкул 127. Прывод**

1. Адказчыкі, сведкі і іншыя ўдзельнікі грамадзянскага судаводства, выкліканыя ва ўстаноўленым парадку ў суд для ўдзелу ў вядзенни па грамадзянскай справе, абавязаны прыбыць ва ўказаныя месца і час.

2. У выпадку невыканання сведкамі гэтага абавязку без уважлівых прычын яны могуць быць падвергнуты да прыводу. Выкананне вызначэння суда аб прыводзе ажыццяўляецца тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў. Гэта правіла распаўсюджваецца на адказчыкаў, калі іх яўка прызнана судом абавязковай, а таксама на іншых удзельнікаў грамадзянскага судаводства ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

3. Вызначэнне суда аб прыводзе аб’яўляецца адказчыку, сведку і іншаму ўдзельніку грамадзянскага судаводства непасрэдна перад выкананнем.

4. Не падлягаюць прыводу непаўналетнія ва ўзросце да шаснаццаці гадоў, цяжарныя жанчыны, часова непрацаздольныя.

5. У выпадку немагчымасці прыводу супрацоўнік органаў унутраных спраў складае акт аб прычынах невыканання вызначэння і разам з вызначэннем накіроўвае яго ў суд, што вынес вызначэнне.

## ГЛАВА 16
## ПАКІДАННЕ ЗАЯВЫ БЕЗ РАЗГЛЯДУ. СПЫНЕННЕ ВЯДЗЕННЯ СПРАВЫ

**Артыкул 128. Падставы для пакідання заявы без разгляду**

Суд пакідае заяву без разгляду, калі пасля ўзбуджэння вядзення справы ўстановіць, што:

1) заява пададзена недзеяздольнай асобай;

2) заява падпісана і (або) пададзена асобай, якая не мае паўнамоцтваў на яе падпісанне і (або) падачу;

3) зацікаўленая асоба, якая звярнулася ў суд, не захавала ўстаноўлены заканадаўчымі актамі або дагаворам абавязковы дасудовы парадак урэгулявання спрэчкі;

4) па калектыўнай іскавай заяве не зроблена замена ўпаўнаважанай асобы ва ўстаноўлены судом тэрмін;

5) па калектыўнай іскавай заяве група асоб не адпавядае ўмовам, указаным у частцы 1 артыкула 325 гэтага Кодэкса;

6) у вядзенні суда агульнай юрысдыкцыі, трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа маецца справа па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах;

7) маецца дзейнае пісьмовае пагадненне бакоў аб перадачы спрэчкі на вырашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа і магчымасць звароту ў трацейскі суд, міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, іншы пастаянны арбітражны орган не страчана, а таксама што адказчык, які пярэчыць супраць разгляду справы ў судзе, не пазней за сваю першую заяву па сутнасці спрэчкі заявіў хадайніцтва аб перадачы спрэчкі на вырашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

8) iсцец (заяўнік), належным чынам апавешчаны аб часе і месцы судовага пасяджэння, без уважлівых прычын не прыбыў па выкліку суда або не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і ад яго не паступіла пісьмовая заява аб разборы справы ў яго адсутнасць, а адказчык не патрабуе разгляду справы па сутнасці, за выключэннем выпадкаў, калі іск прад’яўлены дзяржаўным органам з мэтай абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, а таксама пракурорам;

9) iсцец па справе аб скасаванні шлюбу, належным чынам апавешчаны аб часе і месцы судовага пасяджэння, не прыбыў без уважлівых прычын па выкліку суда або не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і ад яго не паступіла пісьмовая заява аб разборы справы ў яго адсутнасць;

10) бакі, якія не прасілі аб разборы справы ў іх адсутнасць, не прыбылі ў суд па паўторным выкліку;

11) заяўнік не прыбыў без уважлівых прычын на разгляд судом справы ў парадку асаблівага вядзення;

12) заяўлена патрабаванне, што ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі павінна быць разгледжана ў справе аб неплацежаздольнасці ці банкруцтве;

13) падчас разбору справы, узніклай з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, або справы асаблівага вядзення ўзнікла спрэчка аб праве, якая вынікае з грамадзянскіх праваадносін, падведамная суду;

14) пракурор звярнуўся ў суд у выпадку, прадугледжаным часткай 3 артыкула 71 гэтага Кодэкса, пры адсутнасці пісьмовай заявы грамадзяніна;

15) дзяржаўныя органы, а таксама юрыдычныя асобы звярнуліся ў суд у выпадку, прадугледжаным часткай 1 артыкула 78 гэтага Кодэкса, пры адсутнасці пісьмовых просьбы або згоды асоб, у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў якіх пададзена заява;

16) істцом пададзена заява аб пакіданні іскавай заявы без разгляду, а адказчык не патрабуе разбору справы па сутнасці;

17) істцом не прадстаўлены дакументы з пацвярджэннем аплаты дзяржаўнай пошліны, або ў заяве не ўказаны ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП;

18) істцом не прадстаўлены звесткі, якія пацвярджаюць даплату дзяржаўнай пошліны, або ў заяве не ўказаны ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП у памеры, устаноўленым заканадаўчымі актамі, у выпадку недасягнення бакамі прымірэння ў прымірэнчай працэдуры;

19) бакамі пададзена пісьмовая заява аб заключэнні пагаднення аб прымяненні медыяцыі, а таксама аб пакіданні іскавай заявы без разгляду ў сувязі з гэтым пагадненнем;

20) бакі, на якія ўскладзены абавязак аплаты судовых выдаткаў, у выпадку неабходнасці назначэння экспертызы адмаўляюцца ад аплаты выдаткаў па яе правядзенні;

21) падчас разбору справы аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях устаноўлена, што звесткі аб такім грамадзяніне

ўнесены ў пералік фізічных асоб, абмежаваных у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях.

**Артыкул 129. Парадак і наступствы пакідання заявы без разгляду**

1. Аб пакіданні заявы без разгляду суд выносіць вызначэнне, дзе ўказваюцца падставы для пакідання яе без разгляду. У вызначэнні аб пакіданні заявы без разгляду на падставах, прадугледжаных пунктамі 2–4, 12, 13, 17 і 18 артыкула 128 гэтага Кодэкса, суд указвае, як ліквідаваць абставіны, якія перашкаджаюць разгляду справы.

2. У неабходных выпадках суд таксама вырашае пытанне аб вяртанні дзяржаўнай пошліны і (або) аб адмене забяспечвальных мер.

3. Вызначэнне суда аб пакіданні заявы без разгляду можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

4. Пакіданне заявы без разгляду не пазбаўляе істца (заяўніка) права пасля ліквідавання абставін, якія паслужылі падставай для пакідання яе без разгляду, звярнуцца ў суд з заявай у парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

**Артыкул 130. Падставы для спынення вядзення справы**

Суд спыняе вядзенне справы, калі:

1) справа не падлягае разгляду ў судах з прычыны яе непадведамнасці;

2) іскавая заява пададзена ў абарону правоў, свабод або законных інтарэсаў іншай асобы, нявызначанага кола асоб дзяржаўным органам, юрыдычнай асобай або грамадзянінам, якім гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі не прадастаўлена такое права;

3) маецца ўступіўшае ў законную сілу вынесенае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах рашэнне суда або вызначэнне суда аб спыненні вядзення справы;

4) маецца ўступіўшае ў законную сілу рашэнне замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), прынятае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах , за выключэннем выпадкаў, калі суд адмовіў у прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

5) маецца рашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прынятае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах, за выключэннем выпадкаў, калі маецца ўступіўшае ў законную сілу вызначэнне суда аб адмове ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне гэтага рашэння ці аб яго адмене;

6) заява пададзена ў абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб і маецца рашэнне суда, прынятае па спрэчцы аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах у дачыненні да таго ж адказчыка і ўступіла ў законную сілу;

7) прад'яўленае патрабаванне вырашана натарыусам або службовай асобай дыпламатычнага прадстаўніцтва ці консульскай установы Рэспублікі Беларусь, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі яго вырашэнне аднесена да іх кампетэнцыі;

8) ісцец адмовіўся ад іску і адмова прынята судом;

9) бакі заключылі міравое пагадненне, пагадненне аб прымірэнні, пагадненне аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў і гэтыя пагадненні зацверджаны судом;

10) пасля смерці грамадзяніна, а таксама ў сувязі з ліквідацыяй юрыдычнай асобы, якія з'яўляліся адным з бакоў па справе, спрэчныя прававадносіны не дапускаюць правапераемства;

11) падчас судовага разбору ўстаноўлена наяўнасць у замежнай дзяржавы судовага імунітэту;

12) у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 131. Парадак і наступствы спынення вядзення справы**

1. У вызначэнні суда аб спыненні вядзення справы ўказваюцца падставы для яго спынення, а ў неабходных выпадках – таксама вырашаюцца пытанні аб размеркаванні паміж бакамі судовых выдаткаў, аб вяртанні дзяржаўнай пошліны і (або) аб адмене забяспечвальных мер.

2. Вызначэнне суда аб спыненні вядзення справы можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

3. У выпадку спынення вядзення справы паўторны зварот у суд па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах не дапускаецца.

## ГЛАВА 17
## ПРЫПЫНЕННЕ ВЯДЗЕННЯ СПРАВЫ. АДКЛАДАННЕ СУДОВАГА РАЗБОРУ. ПЕРАПЫНАК У СУДОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ

**Артыкул 132. Абавязак суда прыпыніць вядзенне справы**

1. Суд абавязаны прыпыніць вядзенне справы ў выпадку:

1) смерці грамадзяніна, які з'яўляўся бокам у справе, калі спрэчныя праваадносіны дапускаюць правапераемства, – да вызначэння правапераемніка памерлай асобы;

2) страты бокам дзеяздольнасці – да назначэння недзеяздольнай асобе прадстаўніка;

3) знаходжання адказчыка ў часці Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, што ўдзельнічае ў баявых дзеяннях, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў або просьбы істца, які знаходзіцца ў часці Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, што ўдзельнічае ў баявых дзеяннях, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў;

4) немагчымасці разгляду справы да прыняцця рашэння па іншай справе, якая разглядаецца ў парадку канстытуцыйнага, грамадзянскага, крымінальнага судаводства або судаводства па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях або якая знаходзіцца ў працэдуры ўрэгулявання спрэчкі з мэтай заключэння міжнароднага медыятыўнага пагаднення;

5) звароту суда ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь з запытам аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, падлеглага прымяненню пры разглядзе судом канкрэтнай справы, – да ўступлення ў законную сілу рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесенага па такім запыце;

6) заключэння бакамі пагаднення аб прымяненні медыяцыі, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай 4 артыкула 176 гэтага Кодэкса;

7) у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Калі іншая справа, якая падлягае разгляду ў парадку канстытуцыйнага, грамадзянскага, крымінальнага судаводства або судаводства па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, яшчэ не пачата, але ўзбуджэнне яе залежыць ад боку па гэтай справе, суд устанаўлівае яму тэрмін для звароту ў суд.

**Артыкул 133. Права суда прыпыніць вядзенне справы**

Суд можа па заяве асоб – удзельнікаў у справе або па сваёй ініцыятыве прыпыніць вядзенне справы ў выпадку:

1) знаходжання боку ў складзе Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і вайсковых фарміраванняў на тэрміновай вайсковай службе, вайсковай службе афіцэраў па прызыве, праходжання альтэрнатыўнай службы або далучэння яго для выканання якога-небудзь дзяржаўнага абавязку;

2) знаходжання боку ў працяглай службовай камандзіроўцы;

3) звароту ў суд або іншы кампетэнтны орган замежнай дзяржавы або ў дыпламатычнае прадстаўніцтва ці консульскую ўстанову Рэспублікі Беларусь у замежнай дзяржаве з даручэннем аб здзяйсненні асобнага працэсуальнага дзеяння па гэтай справе на тэрыторыі замежнай дзяржавы;

4) знаходжання боку на лячэнні ў арганізацыі аховы здароўя, што аказвае медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама цяжкага захворвання боку, пацверджанага медыцынскім дакументам арганізацыі аховы здароўя;

5) абвяшчэння вышуку адказчыка ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 115 гэтага Кодэкса;

6) назначэння судом экспертызы;

7) узаемнага пагаднення бакоў;

8) накіравання судом судовага даручэння ў адпаведнасці з артыкуламі 236 і 525 гэтага Кодэкса;

9) звароту зацікаўленай асобы з пярэчаннем або скаргай у Апеляцыйны савет пры патэнтным органе або заявай у антыманапольны орган;

10) рэарганізацыі ўдзельнікаў ў справе – юрыдычных асоб і (або) арганізацый, што не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі;

11) выбыцця боку са справы, у тым ліку праз уступку права патрабавання, пераводу доўгу, іншых выпадкаў перамены асоб у абавязацельсве, калі спрэчныя прававадносіны дапускаюць правапераемства;

12) разгляду замежным судом, трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, іншым пастаянным арбітражным органам іншай справы, рашэнне па якой можа мець значэнне для разгляду гэтай справы;

13) звароту суда з запытам у кампетэнтныя органы і (або) арганізацыі;

14) назначэння прымірэнца для правядзення прымірэнчай працэдуры;

15) правядзення перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў;

16) у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 134. Прававыя наступствы прыпынення вядзення справы**

Пасля прыпынення вядзення справы прыпыняецца цячэнне ўсіх устаноўленых гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі або судом тэрмінаў. Да аднаўлення вядзення справы суд не мае права здзяйсняць якія-небудзь працэсуальныя дзеянні, за выключэннем дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне іску і доказаў. Працэсуальныя дзеянні бакоў у гэты час, калі яны не датычацца да названых пытанняў, выклікаюць прававыя наступствы толькі пасля аднаўлення вядзення справы.

**Артыкул 135. Аднаўленне вядзення справы**

Суд аднаўляе вядзенне справы па заяве асоб – удзельнікаў у справе або па сваёй ініцыятыве пасля ліквідавання абставін, што паслужылі падставай для яго прыпынення.

**Артыкул 136. Парадак прыпынення і аднаўлення вядзення справы**

1. Аб прыпыненні вядзення справы, аб яго аднаўленні ці аб адмове ў яго аднаўленні суд выносіць вызначэнне.

2. Вызначэнне суда аб прыпыненні вядзення справы, аб адмове ў яго аднаўленні можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 137. Адкладанне судовага разбору**

1. Суд мае права адкласці судовы разбор у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, і пры адсутнасці падстаў для прыпынення вядзення справы.

2. У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне перакладчыка судовы разбор адкладаецца.

3. У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне асобы, якая ўдзельнічае ў справе, у дачыненні да якой у суда адсутнічаюць звесткі аб яе апавяшчэнні належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, судовы разбор адкладаецца.

4. Калі асоба, якая ўдзельнічае ў справе, была апавешчана належным чынам аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння, суд адкладае судовы разбор пры паступленні заявы такой асобы аб адкладанні судовага разбору з абгрунтаваннем неабходнасці яго адкладання пры ўмове прызнання судом прычыны няяўкі гэтай асобы ўважлівай.

5. Суд мае права адкласці судовы разбор па хадайніцтве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, у выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне яе прадстаўніка па ўважлівай прычыне.

6. Пры адкладанні судовага разбору суд мае права дапытаць сведкаў, якія з'явіліся. У новым судовым пасяджэнні па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або па ініцыятыве суда паказанні гэтых сведкаў аднаўляюцца (агалошваюцца). Паўторны выклік тых жа сведкаў у новае судовае пасяджэнне праводзіцца судом толькі ў выпадку неабходнасці.

7. Пры адкладанні судовага разбору судом прызначаюцца час і месца новага судовага пасяджэння, аб чым прысутным у судзе асобам аб'яўляецца пад распіску. Асобам, не прысутным у судзе, а таксама нанава далучаным да ўдзелу ў справе, паведамляецца аб часе і месцы новага судовага пасяджэння ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

8. Пасля адкладання судовы разбор пачынаецца спачатку. Калі бакі не настойваюць на паўтарэнні дадзеных раней тлумачэнняў удзельнікаў судовага разбору і склад суда не змяніўся, суд мае права прадаставіць магчымасць удзельнікам судовага разбору пацвердзіць дадзеныя раней тлумачэнні без іх паўтарэння.

**Артыкул 138. Перапынак у судовым пасяджэнні**

1. Суд па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або па сваёй ініцыятыве мае права абвясціць перапынак у судовым пасяджэнні для адпачынку, у сувязі з неабходнасцю прадстаўлення дадатковых доказаў, а таксама ў іншых неабходных выпадках.

2. Пры абвяшчэнні перапынку ў судовым пасяджэнні судом прызначаюцца час і месца яго працягу.

3. Пасля заканчэння перапынку судовае пасяджэнне працягваецца, аб чым асоба, якая старшынюе, абвяшчае ў судовым пасяджэнні. Пры гэтым паўторны разгляд даследаваных да перапынку доказаў не праводзіцца.

## ГЛАВА 18
## СУДОВЫЯ ВЫДАТКІ

**Артыкул 139. Склад судовых выдаткаў**

Судовыя выдаткі складаюцца з дзяржаўнай пошліны і выдаткаў, звязаных з разглядам справы.

**Артыкул 140. Дзяржаўная пошліна**

Парадак аплаты або спагнання, звароту (заліку) дзяржаўнай пошліны, а таксама ільготы па дзяржаўнай пошліне ўстанаўліваюцца падатковым заканадаўствам.

**Артыкул 141. Цана іску**

1. Цана іску вызначаецца:

1) паісках аб спагнанні грашовых сум – спаганянай сумай;

2) паісках аб выпатрабаванні маёмасці – коштам выпатрабаванай маёмасці;

3) па ісках аб спагнанні аліментаў – сукупнасцю ўсіх выплат, але не больш чым за адзін год;

4) па ісках аб тэрміновых выплатах і выдачах – сукупнасцю ўсіх выплат ці выдач, але не больш чым за тры гады;

5) па ісках аб бестэрміновых або пажыццёвых выплатах і выдачах – сукупнасцю выплат ці выдач за тры гады;

6) па ісках аб змяншэнні або павелічэнні выплат ці выдач – сумай, на якую змяншаюцца або павялічваюцца выплаты ці выдачы, але не больш чым за адзін год;

7) па ісках аб спыненні выплат ці выдач – сукупнасцю выплат ці выдач якія засталіся, але не больш чым за адзін год;

8) па ісках аб праве ўласнасці на капітальную пабудову (будынак, збудаванне), незавершаную закансерваваную капітальную пабудову, ізаляванае памяшканне, машына-месца, прыналежныя фізічным асобам на праве ўласнасці, – зыходзячы з ацэначнага кошту ўказаных аб’ектаў; для такіх аб’ектаў, прыналежных юрыдычным асобам, – іх коштам, але не ніжэй за астаткавы кошт;

9) па ісках аб праве ўласнасці на зямельныя ўчасткі – зыходзячы з кадастравага кошту зямельнага ўчастка, а пры яго адсутнасці – па рыначным кошце;

10) па ісках аб прымусе да выканання дагаворных абавязнасцей, што маюць грашовую ацэнку, – зыходзячы з кошту нявыкананай абавязнасці;

11) па ісках аб прызнанні не падлеглым выкананню выканальнага або іншага дакумента, па якім спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным парадку, у тым ліку выканальнага надпісу натарыуса, – зыходзячы з аспрэчванай сумы.

2. У цану іску ўключаюцца ўказаныя ў іскавай заяве сумы няўстойкі (штрафу, пені) і працэнты.

3. Цана іску, які складаецца з некалькіх самастойных патрабаванняў, вызначаецца сумай усіх патрабаванняў.

4. Цана іску ўказваецца істцом.

**Артыкул 142. Даплата дзяржаўнай пошліны**

1. Пры павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў разгляд справы ў частцы павялічаных патрабаванняў працягваецца пасля прадстаўлення істцом доказу даплаты дзяржаўнай пошліны ў тэрмін, установлены судом.

2. У выпадку непрадстаўлення доказу даплаты дзяржаўнай пошліны ў тэрмін, установлены судом, справа разглядаецца і вырашаецца ў межах першапачаткова заяўленых патрабаванняў з указаннем аб гэтым у рашэнні суда. Заява аб павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў вяртаецца істцу. Довады аб нязгодзе з вывадамі суда па пытанні даплаты дзяржаўнай пошліны могуць быць выкладзены ў апеляцыйнай скарзе.

**Артыкул 143. Вызваленне ад дзяржаўнай пошліны**

1. У выпадках, прадугледжаных Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь, суд мае права поўнасцю або часткова вызваліць ад дзяржаўнай пошліны пры звароце ў суд фізічных асоб.

2. Заява аб вызваленні ад дзяржаўнай пошліны падаецца ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента ў суд, якому падсудная справа. Да заявы аб вызваленні ад дзяржаўнай пошліны грамадзянін абавязаны дадаць дакументы, якія пацвярджаюць абставіны, што з'яўляюцца падставай для вызвалення ад дзяржаўнай пошліны.

3. Суд адмяняе вызначэнне аб вызваленні ад дзяржаўнай пошліны, калі пераканаецца, што абставіны, пакладзеныя ў аснову гэтага вызначэння, не адпавядаюць рэчаіснасці. У такіх выпадках дзяржаўная пошліна падлягае аплаце ў парадку, устаноўленым падатковым заканадаўствам.

4. Па пытаннях вызвалення ад дзяржаўнай пошліны судом выносіцца вызначэнне.

**Артыкул 144. Выдаткі, звязаныя з разглядам справы**

Да выдаткаў, звязаных з разглядам справы, адносяцца:

1) сумы, падлеглыя выплаце сведкам, судова-экспертным арганізацыям, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам і панятым;

2) выдаткі, звязаныя з вядзеннем агляду на месцы;

3) выдаткі па вышуку адказчыка ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

4) выдаткі бакоў, панесеныя імі ў сувязі з яўкай у суд;

5) выдаткі па аплаце дапамогі прадстаўнікоў;

6) кампенсацыя бакам за страту рабочага часу;

7) выдаткі, звязаныя з захоўваннем рэчавых доказаў;

8) выдаткі, звязаныя з публікацыямі па справе;

9) іншыя выдаткі, прызнаныя судом неабходнымі.

**Артыкул 145. Сумы, падлеглыя выплаце сведкам, судова-экспертным арганізацыям, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам і панятым**

1. За асобай, выкліканай у якасці сведкі, эксперта, спецыяліста, перакладчыка або панятога, захоўваецца сярэдні заробак па месцы яго работы адпаведна заканадаўству. Указаным асобам, якія не маюць пастаяннага заробку, асноўнага месца работы або не з'яўляюцца рабочымі ці службоўцамі, за адцягненне іх ад звычайных заняткаў выплачваецца ўзнагароджанне зыходзячы з сярэдняй заработнай платы ў гэтай мясцовасці.

2. Сведкам, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам і панятым кампенсуюцца выдаткі па праездзе, найме жылога памяшкання, панесеныя імі ў сувязі з яўкай у суд, і выплачваюцца сутачныя ў памерах, устаноўленых заканадаўствам для асоб, накіраваных ў службовыя камандзіроўкі.

3. Эксперт, спецыяліст і перакладчык маюць права на ўзнагароджанне за выкананую імі работу, не ўваходную ў іх службовыя абавязкі.

4. Сумы, падлеглыя выплаце сведкам, судова-экспертным арганізацыям, экспертам, спецыялістам і панятым або неабходныя для аплаты выдаткаў па вядзенні агляду на месцы, уносяцца папярэдне на дэпазітны рахунак суда бокам, які заявіў адпаведную просьбу. Калі ўказаная просьба заяўлена абодвума бакамі ці выклік сведкаў, экспертаў, спецыялістаў, агляд на месцы, працэсуальнае дзеянне, што патрабуе ўдзелу панятых, праводзяцца па ініцыятыве суда, то патрэбныя сумы ўносяцца бакамі пароўну.

5. Сумы, падлеглыя выплаце судова-экспертнай арганізацыі, пасля вынясення вызначэння аб назначэнні экспертызы могуць па рашэнні суда ўносіцца бакамі на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак гэтай арганізацыі, аб чым указваецца ў гэтым вызначэнні.

Парадак звароту сум, залішне ўнесеных бакамі на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак судова-экспертнай арганізацыі, устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

6. Бок, які выступае ў судзе ад імя Рэспублікі Беларусь або яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, у абавязкі якога ўваходзіць выплата сум, належных судова-экспертнай арганізацыі і экспертам, уносіць адпаведныя сумы на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак гэтай арганізацыі ці на дэпазітны рахунак суда пасля вынясення судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці.

7. Прадугледжаныя гэтым артыкулам сумы не ўносяцца бокам, вызваленым ад аплаты судовых выдаткаў.

**Артыкул 146. Выплата сум, належных сведкам, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам і панятым**

1. Сумы, належныя сведкам, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам і панятым, вызначаюцца судом пасля выканання імі сваіх абавязкаў. Выплата сум, належных перакладчыкам у сувязі з яўкай у суд, ажыццяўляецца са сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

2. Парадак выплаты і памеры сум, падлеглых выплаце сведкам, экспертам, спецыялістам, перакладчыкам і панятым, устанаўліваюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана артыкулам 145 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 147. Пакрыццё выдаткаў па аплаце дапамогі прадстаўніка**

1. Боку, на карысць якога адбылася судовая пастанова, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, суд прысуджае пакрыццё панесеных ім выдаткаў па аплаце дапамогі прадстаўніка за кошт другога боку зыходзячы са складанасці справы і часу, затрачанага на яе разгляд.

2. У выпадку калі ў адпаведнасці з устаноўленым парадкам дапамога адваката была аказана боку, на карысць якога адбылася судовая пастанова, за кошт сродкаў калегіі адвакатаў або рэспубліканскага бюджэту, указаная сума спаганяецца з другога боку на карысць калегіі адвакатаў або рэспубліканскага бюджэту.

**Артыкул 148. Вызваленне ад аплаты выдаткаў, звязаных з разглядам справы**

1. Ад аплаты выдаткаў, звязаных з разглядам справы, вызваляюцца пракурор, дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія звярнуліся з заявай у суд у абарону дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб), правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб, у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Суд або суддзя маюць права поўнасцю або часткова вызваліць ад аплаты звязаных з разглядам справы выдаткаў у даход дзяржавы фізічных асоб зыходзячы з іх маёмаснага становішча, калі спрэчка не звязана з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці.

**Артыкул 149. Размеркаванне судовых выдаткаў паміж асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе**

1. Боку, на карысць якога адбылася судовая пастанова, вынесеная па выніках разгляду справы па сутнасці, суд прысуджае за кошт другога боку пакрыццё ўсіх панесеных ім судовых выдаткаў па справе, нават калі гэты бок і быў вызвалены ад аплаты іх у даход дзяржавы. Калі іск задаволены часткова, то ўказаныя ў гэтым артыкуле сумы прысуджаюцца істцу прапарцыянальна памеру задаволеных судом іскавых патрабаванняў, а адказчыку – прапарцыянальна той частцы іскавых патрабаванняў, у якой істцу адмоўлена.

2. Працэсуальныя саўдзельнікі нясуць судовыя выдаткі па справе ў роўных долях, калі іншае не абумоўлена адрозненнем у цане іх патрабаванняў.

3. Калі салідарная адказнасць вынікае з прыроды спрэчных матэрыяльных праваадносін, суд спаганяе з суадказчыкаў судовыя выдаткі салідарна.

4. Судовыя выдаткі, панесеныя ў сувязі з працэсуальнымі дзеяннямі, што былі здзейснены па патрабаванні працэсуальнага саўдзельніка толькі ў яго інтарэсах, іншымі працэсуальнымі саўдзельнікамі не кампенсуюцца.

5. Калі суд вышэйшага ўзроўню зменіць ажыццёўленую судовую пастанову або вынесе новую, не перадаючы справу на новы разгляд, ён адпаведна змяняе размеркаванне судовых выдаткаў або перадае гэта пытанне на разгляд суда першай інстанцыі.

6. Судовыя выдаткі, панесеныя бакамі ў сувязі з разглядам справы ў апеляцыйным, касацыйным парадку і ў парадку нагляду, размяркоўваюцца паміж істцом і адказчыкам у адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтым артыкулам.

7. Пры наяўнасці пагаднення бакоў аб размеркаванні судовых выдаткаў суд мае права прыняць рашэнне ў адпаведнасці з гэтым пагадненнем, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

8. Вызваленне боку ад дзяржаўнай пошліны не вызваляе яго ад абавязку кампенсаваць другому боку, на карысць якога адбылася судовая пастанова, панесеныя ім выдаткі, звязаныя з разглядам справы.

9. Выдаткі, звязаныя з разглядам справы, панесеныя трэцімі асобамі, якія не заяўляюць самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі і ўдзельнічалі ў справе на баку, на карысць якога адбылася судовая пастанова, могуць быць кампенсаваны ім, калі іх фактычныя паводзіны як асоб – удзельнікаў у справе садзейнічалі прыняццю канкрэтай судовай пастановы.

10. Калі трэцяя асоба, якая не заяўляе самастойных патрабаванняў на прадмет спрэчкі, рэалізавала права на абскарджанне судовай пастановы і яе скарга была пакінута без задавальнення, выдаткі, звязаныя з разглядам справы, панесеныя асобамі, якія ўдзельнічалі ў справе, у сувязі з разглядам гэтай скаргі, могуць быць спагнаныя з гэтай трэцяй асобы.

11. У выпадках калі судовыя выдаткі ўскладаюцца на арганізацыі, што не валодаюць правамі юрыдычнай асобы, гэтыя абавязкі па рашэнні суда нясе юрыдычная асоба, у структуру якой яны ўваходзяць.

**Артыкул 150. Размеркаванне судовых выдаткаў пры адмове ад іску, заключэнні міравога пагаднення, пагаднення аб прымірэнні, пагаднення аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў**

1. Пры адмове істца ад іску панесеныя ім судовыя выдаткі адказчык не кампенсуе. Пры гэтым адказчык мае права патрабаваць ад істца пакрыцця панесеных ім судовых выдаткаў.

2. Калі ісцец адмовіўся ад іску ў сувязі з добраахвотным задавальненнем іскавых патрабаванняў адказчыкам пасля прад’яўлення іску, ён мае права патрабаваць з адказчыка пакрыцця панесеных ім судовых выдаткаў.

3. У выпадку заключэння міравога пагаднення, пагаднення аб прымірэнні, пагаднення аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў судовыя выдаткі па справе ўзаемна пагашаюцца, калі бакі не дамовіліся аб іншым.

**Артыкул 151. Пакрыццё дзяржаве судовых выдаткаў**

1. Судовыя выдаткі, ад аплаты якіх ісцец быў вызвалены, спаганяюцца з адказчыка ў даход дзяржавы прапарцыянальна задаволенай частцы іскавых патрабаванняў. Пры адмове ў іску выдаткі, звязаныя з разглядам справы, спаганяюцца з істца ў даход дзяржавы. Калі ісцец, вызвалены ад аплаты судовых выдаткаў, адмовіўся ад іску ў сувязі

з добраахвотным задавальненнем іскавых патрабаванняў адказчыкам пасля прад’яўлення іску, судовыя выдаткі спаганяюцца з адказчыка ў даход дзяржавы.

2. Калі іск задаволены часткова, а адказчык вызвалены ад аплаты судовых выдаткаў, выдаткі, звязаныя з разглядам справы, спаганяюцца ў даход дзяржавы з істца, не вызваленага ад аплаты судовых выдаткаў, прапарцыянальна той частцы іскавых патрабаванняў, у задавальненні якіх адмоўлена.

3. Калі абодва бакі вызвалены ад аплаты судовых выдаткаў, то выдаткі, звязаныя з разглядам справы, адносяцца на кошт дзяржавы.

4. Пры абвяшчэнні вышуку ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 115 гэтага Кодэкса, суд пры разглядзе справы спаганяе з адказчыка, якога вышукваюць, выдаткі па вядзенні вышуку ў даход дзяржавы.

**Артыкул 152. Пакрыццё бакам судовых выдаткаў са сродкаў бюджэту**

1. Пры адмове поўнасцю або часткова ў іску пракурору, які звярнуўся ў суд у абарону дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб) або ў абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзяніна ў выпадках, прадугледжаных часткай 2 артыкула 71 гэтага Кодэкса, а таксама пры адмове поўнасцю або часткова ў іску дзяржаўным органам, вызваленым адпаведна заканадаўчым актам ад дзяржаўнай пошліны пры ўзбуджэнні справы ў абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб, адказчыку кампенсуюцца са сродкаў бюджэту панесеныя ім судовыя выдаткі поўнасцю або прапарцыянальна той частцы іскавых патрабаванняў, у якой істцу адмоўлена.

2. У выпадку задавальнення іску аб вызваленні маёмасці ад арышту, праведзенага з мэтай выканання выканальнага дакумента на карысць дзяржавы, істцу кампенсуюцца са сродкаў бюджэту панесеныя ім судовыя выдаткі.

**Артыкул 153. Вырашэнне пытанняў аб судовых выдатках пасля вынясення рашэння**

1. Заява па пытанні аб судовых выдатках, панесеных у сувязі з разглядам справы ў судах першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, разглядам справы ў парадку нагляду, не вырашанаму пры разглядзе справы ў адпаведным судзе, можа быць пададзена ў суд, які разглядаў справу ў якасці суда першай інстанцыі, на працягу трох месяцаў пасля ўступлення ў законную сілу апошняй судовай пастановы, вынясеннем якой скончыўся разгляд справы. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін падачы такой заявы можа быць адноўлены судом.

2. Вызначэнне аб спагнанні судовых выдаткаў можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 154. Ускладанне судовых выдаткаў на нядобрасумленных удзельнікаў грамадзянскага судаводства**

1. Незалежна ад вынікаў разгляду справы суд можа абавязаць нядобрасумленны бок, трэцюю асобу кампенсаваць судовыя выдаткі другому боку або ў даход дзяржавы, калі яны выкліканы ўхіленнем ад дачы тлумачэнняў, дачай заведама лжывых тлумачэнняў, скрываннем доказаў, а таксама прадстаўленнем доказаў з парушэннем тэрміну іх прадстаўлення, устаноўленага судом, ці іншымі нядобрасумленнымі дзеяннямі.

2. Суд можа ўскласці на нядобрасумленны бок аплату на карысць другога боку кампенсацыі за фактычную страту рабочага часу. Памер кампенсацыі вызначаецца судом у разумных межах і з улікам канкрэтных абставін.

3. У выпадку ўхілення адказчыка ад яўкі ў суд, несвоечасовага накіравання ў суд пярэчанняў супраць іску або сустрэчнага іску судовыя выдаткі па першапачатковым

і паўторным разглядзе справы ўскладаюцца на адказчыка, нават калі яго скарга была поўнасцю задаволена. Адказчык вызваляецца ад судовых выдаткаў, калі дакажа, што не вінаваты ў няяўцы ці што своечасова накіраваў суду пярэчанні супраць іску або сустрэчны іск, што не былі далучаныя да справы.

4. Суд можа спагнаць са сведкі, судова-экспертнай арганізацыі, эксперта, спецыяліста, перакладчыка ці прадстаўніка на карысць боку або ў даход дзяржавы выдаткі, звязаныя з разглядам справы, узніклыя па іх віне.

**Артыкул 155. Абскарджанне (апратэставанне) судовых пастаноў па пытаннях, звязаных з судовымі выдаткамі**

Судовыя пастановы па пытаннях, звязаных з судовымі выдаткамі, могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

## ГЛАВА 19
## ЗАБЯСПЕЧВАЛЬНЫЯ МЕРЫ

**Артыкул 156. Падставы для прымянення забяспечвальных мер**

1. Суд па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, ці па ўласнай ініцыятыве мае права прымяніць меры па забеспячэнні іску, заявы (забяспечвальныя меры). Забяспечвальныя меры прымяняюцца судом першай інстанцыі і дапускаюцца на любым этапе справы, калі іх непрымяненне можа ўскладніць або зрабіць немагчымым выкананне рашэння суда.

2. Па правілах, устаноўленых гэтай главой, меры па забеспячэнні іску, разглядалага трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, могуць быць прыменены судом па заяве боку трацейскага (арбітражнага) разбору або складу міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда.

**Артыкул 157. Падставы для забеспячэння выканання міжнароднага медыятыўнага пагаднення**

Эканамічны суд вобласці (горада Мінска), у чыім вядзенні знаходзіцца хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь міжнароднага медыятыўнага пагаднення, па хадайніцтве боку міжнароднага медыятыўнага пагаднення мае права абавязаць другі бок прадаставіць належнае забеспячэнне выканання міжнароднага медыятыўнага пагаднення па правілах, устаноўленых гэтай главой.

**Артыкул 158. Меры па забеспячэнні іску, заявы**

1. Да мер па забеспячэнні іску, заявы адносяцца:

1) накладанне арышту на грашовыя сродкі (электронныя грошы) (у тым ліку грашовыя сродкі (электронныя грошы), якія будуць паступаць на банкаўскі рахунак (у электронны кашалёк)) або іншую маёмасць, што належаць адказчыку і знаходзяцца ў яго ці ў іншых асоб;

2) забарона адказчыку здзяйсняць пэўныя дзеянні;

3) ускладанне на адказчыка і іншых асоб абавязку здзейсніць пэўныя дзеянні;

4) забарона іншым асобам перадаваць маёмасць адказчыку або выконваць у дачыненні да яго іншыя абавязацельствы;

5) забарона іншым асобам здзяйсняць пэўныя дзеянні, датычныя да прадмету спрэчкі;

6) прыпыненне рэалізацыі маёмасці ў выпадку прад'яўлення іску аб вызваленні яе ад арышту;

7) прыпыненне спагнання па выканальным або іншым дакуменце, па якім спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным парадку, у выпадку прад'яўлення патрабаванняў аб прызнанні такога дакумента не падлеглым выкананню;

8) часовае абмежаванне права адказчыка на выезд з Рэспублікі Беларусь на тэрмін, устаноўлены судом, але не больш чым да заканчэння вядзення справы;

9) іншыя меры, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Суд можа дапусціць адначасова некалькі забяспечвальных мер.

3. Забяспечвальныя меры павінны быць суразмернымі заяўленаму патрабаванню.

4. Ісцец мае права патрабаваць пакрыцця страт, прычыненых яму невыкананнем вызначэння суда аб прымяненні забяспечвальных мер.

5. Пры забеспячэнні іску аб спагнанні грашовай сумы адказчык мае права замест прымененых забяспечвальных мер унесці на дэпазітны рахунак суда выпатрабаваную істцом суму.

**Артыкул 159. Заява аб прымяненні забяспечвальных мер**

1. Заява аб прымяненні забяспечвальных мер можа быць пададзена ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента ў суд адначасова з іскавай заявай, заявай або ў працэсе вядзення справы да прыняцця судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці. Хадайніцтва аб прымяненні забяспечвальных мер можа быць выкладзена ў іскавай заяве, заяве.

2. У заяве аб прымяненні забяспечвальных мер павінны быць указаны:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) (найменне) істца і адказчыка, іх месца жыхарства (месца прысутнасці) або месца знаходжання, а таксама вядомыя нумары кантактных тэлефонаў і (або) нумары факсаў;

3) абставіны, на якіх заснаваны патрабаванні аб забеспячэнні іску, заявы;

4) пры маёмасных патрабаваннях – іх памер;

5) абгрунтаванне прычыны звароту з заявай аб прымяненні забяспечвальных мер;

6) забяспечвальная мера, якую просяць прымяніць ісцец, заяўнік;

7) пры просьбе аб накладанні арышту на маёмасць – аб'ект забеспячэння іску з указаннем яго месца знаходжання;

8) пералік дадзеных дакументаў.

3. Заява аб прымяненні забяспечвальных мер падпісваецца заяўнікам або яго прадстаўніком.

4. У выпадку калі хадайніцтва аб прымяненні забяспечвальных мер выкладзена ў іскавай заяве, заяве, у гэтым хадайніцтве павінны быць указаны звесткі, прадугледжаныя пунктамі 5–7 часткі 2 гэтага артыкула.

5. Да заявы боку трацейскага разбору аб прымяненні забяспечвальных мер па справе, разгляданай трацейскім судом, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, дадаецца вызначэнне гэтага трацейскага суда аб узбуджэнні трацейскага разбору.

6. Да заявы боку арбітражнага разбору аб прымяненні забяспечвальных мер па справе, разгляданай міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, дадаецца дакумент, які пацвярджае згоду складу гэтага міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда на зварот боку ў суд з заявай аб прымяненні забяспечвальных мер.

**Артыкул 160. Парадак разгляду заявы аб прымяненні забяспечвальных мер**

1. Заява аб прымяненні забяспечвальных мер разглядаецца судом, у чыім вядзенні знаходзіцца справа, без апавяшчэння асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не пазней як у тры дні пасля яе паступлення ў суд.

2. Заява аб прымяненні забяспечвальных мер па справе, разгляданай трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, разглядаецца судом па месцы трацейскага (арбітражнага) разбору або па месцы знаходжання маёмасці, у дачыненні да якога могуць быць прыменены забяспечвальныя меры. У неабходных выпадках з улікам абставін справы суд можа вырашыць гэта пытанне ў судовым пасяджэнні з выклікам бакоў.

3. Па выніках разгляду заявы аб прымяненні забяспечвальных мер суд выносіць вызначэнне.

4. Пры падачы заявы аб прымяненні забяспечвальных мер з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых артыкуламі 100 і 159 гэтага Кодэкса, суд вяртае яе. Асоба – падавец заявы пасля ліквідавання выяўленых парушэнняў мае права нанава звярнуцца ў суд з заявай аб прымяненні забяспечвальных мер.

5. Пры задавальненні заявы аб прымяненні забяспечвальных мер суд прымяняе меры, прадугледжаныя артыкулам 158 гэтага Кодэкса.

6. У прымяненні забяспечвальных мер можа быць адмоўлена, калі суд прызнае недастатковым абгрунтаванне прычын прымянення забяспечвальных мер або калі іх прымяненне можа істотна парушыць правы, свабоды і законныя інтарэсы іншых асоб, звязаныя з аб’ектам забеспячэння.

7. Вызначэнне суда аб прымяненні забяспечвальных мер ці аб адмове ў прымяненні забяспечвальных мер накіроўваецца (уручаецца) бакам, а таксама іншым асобам, на якіх судом ускладзены абавязак прымянення забяспечвальных мер, не пазней за наступны дзень пасля яго вынясення.

**Артыкул 161. Замена адной забяспечвальнай меры іншай, змяненне або адмена забяспечвальнай меры**

1. Па заяве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, боку трацейскага (арбітражнага) разбору або складу міжнароднага трацейскага (арбітражнага) суда дапускаецца замена адной забяспечвальнай меры іншай у парадку, устаноўленым артыкулам 160 гэтага Кодэкса.

2. Забяспечвальныя меры могуць быць зменены або адменены судом па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або па ўласнай ініцыятыве. Забеспячэнне іску, разгляданага трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, па заяве боку трацейскага (арбітражнага) разбору можа быць адменена судом, што вынес вызначэнне аб прымяненні забяспечвальных мер.

3. Пытанні аб змяненні або адмене забяспечвальнай меры, а таксама аб замене адной забяспечвальнай меры іншай разглядаюцца судом без выкліку асоб – удзельнікаў у справе. У неабходных выпадках асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, могуць быць апавешчаны аб часе і месцы разгляду пытання, аднак іх няяўка не з’яўляецца перашкодай для яе разгляду.

4. У выпадку адмовы ў задавальненні іску, заявы, пакідання іску, заявы без разгляду, спынення вядзення справы забяспечвальныя меры захоўваюцца да ўступлення ў законную сілу адпаведнай судовай пастановы. Аднак суд можа адначасова з рашэннем або пасля яго пастановы вынесці вызначэнне аб адмене забяспечвальных мер.

**Артыкул 162. Выкананне вызначэння суда аб прымяненні забяспечвальнай меры**

1. Вызначэнне суда аб прымяненні забяспечвальнай меры прыводзіцца ў выкананне неадкладна ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

2. У выпадку калі пры выкананні вызначэння суда аб прымяненні забяспечвальнай меры ў выглядзе накладання арышту на грашовыя сродкі (электронныя грошы) або іншая маёмасць, прыналежныя адказчыку, адказчык прадаставіў сустрэчнае забеспячэнне праз унясенне на дэпазітны рахунак суда выпатрабаванай істцом сумы, ён мае права звярнуцца ў суд, што разглядае справу, з заявай аб замене, змяненні або адмене забяспечвальнай меры.

3. Выкананне вызначэння суда аб прымяненні забяспечвальнай меры, прадугледжанай пунктам 8 часткі 1 артыкула 158 гэтага Кодэкса, па хадайніцтве адказчыка можа быць прыпынена на тэрмін, устаноўлены судом. У гэтым выпадку вызначэнне суда аб прыпыненні выканання вызначэння аб прымяненні забяспечвальнай меры ці аб адмове ў яго прыпыненні прымаецца ў парадку, устаноўленым артыкулам 161 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 163. Пакрыццё страт, прычыненых прымяненнем забяспечвальных мер

1. Суд, дапускаючы забеспячэнне іску, заявы, можа запатрабаваць ад істца прадастаўлення забеспячэння магчымых для адказчыка страт.

2. Адказчык пасля ўступлення ў законную сілу рашэння, якім у іску адмоўлена, мае права патрабаваць ад істца пакрыцця страт, прычыненых яму забяспечвальнымі мерамі, прымененымі судом па заяве істца.

3. Іск аб пакрыцці страт прад'яўляецца ў суд, што разглядаў справу, па якой прымяняліся забяспечвальныя меры.

### Артыкул 164. Абскарджанне вызначэнняў па пытаннях прымянення забяспечвальных мер

Вызначэнні суда па пытаннях прымянення забяспечвальных мер, іх змянення або адмены, замены адной забяспечвальнай меры іншай могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў апеляцыйным парадку. Падача прыватнай скаргі або прыватнага пратэсту на вызначэнне суда аб прымяненні забяспечвальных мер не прыпыняе выканання гэтага вызначэння. Падача прыватнай скаргі або прыватнага пратэсту на вызначэнне аб змяненні або адмене забяспечвальных мер, а таксама аб замене адной забяспечвальнай меры іншай прыпыняе выкананне гэтага вызначэння.

## ГЛАВА 20
## ПРЫМІРЭННЕ Ў ГРАМАДЗЯНСКІМ СУДАВОДСТВЕ

### Артыкул 165. Прымірэнне бакоў

1. Суд прымае меры для прымірэння бакоў, садзейнічае ім ва ўрэгуляванні спрэчкі на ўсіх стадыях грамадзянскага судаводства.

2. Прымірэнне бакоў ажыццяўляецца на аснове прынцыпаў добраахвотнасці, супрацоўніцтва, раўнапраўя, добрасумленнасці і канфідэнцыйнасці.

3. Урэгуляванне спрэчкі праз прымірэнне можа ажыццяўляцца па заяве бакоў або па ініцыятыве суда па любой справе іскавага вядзення, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі або не вынікае з сутнасці адпаведных праваадносін.

4. Спрэчкі могуць быць урэгуляваны ў поўным аб'ёме ўзаемных патрабаванняў або ў іх частцы праз правядзенне перагавораў бакоў па выпрацоўцы ўмоў міравога пагаднення, перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, прымірэнчай працэдуры, медыяцыі. Па выніках перагавораў могуць быць заключаны міравое пагадненне, пагадненне аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, а па выніках прымірэнчай працэдуры – пагадненне аб прымірэнні.

5. Вынікамі прымірэння бакоў могуць быць, у прыватнасці, частковая або поўная адмова ад іску, частковае або поўнае прызнанне іску, прызнанне абставін, на якіх другі бок грунтуе свае патрабаванні або пярэчанні.

6. Прымірэнне бакоў ажыццяўляецца ў тэрмін, устаноўлены судом. Пры недасягненні бакамі прымірэння або сканчэнні ўстаноўленага судом тэрміну для прымірэння бакоў вядзенне справы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

**Артыкул 166. Міравое пагадненне**

1. Міравым пагадненнем з’яўляецца пагадненне бакоў аб спыненні спрэчкі на аснове ўзаемных уступак, што можа быць заключана бакамі на любой стадыі грамадзянскага судаводства або ў выканаўчым вядзенні. Трэція асобы, якія заяўляюць самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, маюць права ўдзельнічаць у заключэнні міравога пагаднення ў якасці боку.

2. Міравое пагадненне заключаецца бакамі ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента і падпісваецца бакамі або іх прадстаўнікамі (пры наяўнасці ў іх паўнамоцтваў на заключэнне міравога пагаднення).

3. Міравое пагадненне заключаецца ў дачыненні да прад’яўленых у суд іскавых патрабаванняў, а ў выпадку заключэння міравога пагаднення ў выканаўчым вядзенні – у нявыкананай частцы патрабаванняў, змешчаных у выканальным дакуменце.

4. У міравым пагадненні павінны быць звесткі аб узгодненых бакамі ўмовах, памеры і тэрмінах выканання абавязнасцей адзін перад другім або адным бокам перад другім, а таксама аб парадку яго выканання.

5. У міравым пагадненні могуць змяшчацца ўмовы аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання абавязнасцей адказчыкам, аб поўным або частковым прызнанні доўгу, аб размеркаванні судовых выдаткаў, іншыя ўмовы, якія не супярэчаць заканадаўству.

6. Заключэнне міравога пагаднення пад умовай адтэрміноўкі не дапускаецца.

7. Міравое пагадненне зацвярджаецца судом.

**Артыкул 167. Зацвярджэнне судом міравога пагаднення**

1. Заява аб зацвярджэнні міравога пагаднення разглядаецца судом у судовым пасяджэнні з апавяшчэннем асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

2. Пры разглядзе заявы аб зацвярджэнні міравога пагаднення суд правярае, ці з’яўляецца міравое пагадненне свабодным волевыяўленнем бакоў, ці адпавядаюць яго ўмовы заканадаўству і ці не парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы іншых асоб.

3. Суд не зацвярджае міравое пагадненне, калі яно супярэчыць заканадаўству або парушае правы, свабоды і законныя інтарэсы іншых асоб. Суд не мае права выдаляць з міравога пагаднення якія-небудзь умовы, узгодненыя бакамі, змяняць яго.

4. Па выніках разгляду пытання аб зацвярджэнні міравога пагаднення суд выносіць вызначэнне.

5. У вызначэнні суда аб зацвярджэнні міравога пагаднення ўказваецца аб яго зацвярджэнні судом, выкладаюцца ўмовы міравога пагаднення, парадак размеркавання судовых выдаткаў, парадак спагнання дзяржаўнай пошліны пры невыкананні міравога пагаднення добраахвотна. Зацвярджэнне міравога пагаднення цягне за сабой спыненне вядзення справы поўнасцю або ў частцы.

6. Вызначэнне суда аб зацвярджэнні міравога пагаднення ці аб адмове ў яго зацвярджэнні можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

7. Калі міравое пагадненне заключана пры пераглядзе судовых пастаноў у апеляцыйным, касацыйным парадку або ў парадку нагляду, заява аб яго зацвярджэнні разглядаецца ў судовым пасяджэнні суда, у чыім вядзенні знаходзіцца справа, з апавяшчэннем асоб – удзельнікаў у справе.

8. Зацвярджэнне міравога пагаднення ў судах апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый па прадмеце заяўленых патрабаванняў цягне за сабой адмену судовай пастановы і спыненне вядзення справы. У такім выпадку законнасць і абгрунтаванасць судовай пастановы не правяраюцца.

9. Міравое пагадненне, заключанае на стадыі выканання судовай пастановы, прадстаўляецца на зацвярджэнне суду першай інстанцыі, які прыняў судовую пастанову. Міравое пагадненне, заключанае на стадыі выканання выканальнага дакумента,

выдадзенага іншым упаўнаважаным органам (асобай), прадстаўляецца на зацвярджэнне суду па месцы выканання выканальнага дакумента. Заява разглядаецца ў судовым пасяджэнні з апавяшчэннем бакоў выканаўчага вядзення ў тэрмін не больш за адзін месяц пасля яе паступлення ў суд. Заява аб зацвярджэнні міравога пагаднення, пададзеная да ўзбуджэння выканаўчага вядзення, разгляду не падлягае і вяртаецца заяўніку.

10. У вызначэнні суда аб зацвярджэнні міравога пагаднення, заключанага на стадыі выканаўчага вядзення, указваецца, што судовая пастанова, на падставе якой выдадзены выканальны дакумент, не падлягае выкананню.

**Артыкул 168. Выкананне міравога пагаднення**

1. Міравое пагадненне выконваецца асобамі, якія яго заключылі, добраахвотна ў парадку і тэрміны, прадугледжаныя гэтым міравым пагадненнем.

2. Калі міравое пагадненне не выконваецца добраахвотна, судом па заяве зацікаўленай асобы выдаецца выканальны ліст на яго прымусовае выкананне.

**Артыкул 169. Урэгуляванне спрэчкі праз перагаворы бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў**

1. Пасля ўзбуджэння судом справы іскавага вядзення бакі могуць заявіць хадайніцтва аб урэгуляванні спрэчкі праз правядзенне імі перагавораў пры садзейнічанні іх адвакатаў, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі. Тэрмін правядзення такіх перагавораў вызначаецца судом з улікам меркавання асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. На тэрмін правядзення перагавораў суд мае права прыпыніць вядзенне справы.

2. Перагаворы бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў праводзяцца без удзелу суда ў парадку, вызначаным самімі ўдзельнікамі перагавораў.

3. Па спрэчках, узніклых у сувязі са стварэннем, прававой аховай і выкарыстаннем аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам для ўрэгулявання спрэчкі праз перагаворы бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, прымяняюцца таксама для ўрэгулявання спрэчкі праз перагаворы бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў і (або) патэнтных павераных.

**Артыкул 170. Пагадненне аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў**

1. Па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў можа быць заключана пагадненне, дзе змешчаны ўмовы і парадак урэгулявання спрэчкі, якое падпісваецца бакамі, іх прадстаўнікамі і падлягае зацвярджэнню судом.

2. Да ўмоў, формы і зместу, а таксама да парадку заключэння, зацвярджэння і выканання пагаднення аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў прымяняюцца правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам для міравога пагаднення, прызнання іску або адмовы ад іску.

**Артыкул 171. Урэгуляванне спрэчкі ў прымірэнчай працэдуры**

1. Па справах іскавага вядзення спрэчка ў эканамічных судах першай і апеляцыйнай інстанцый па заяве аднаго ці абодвух бакоў або па ініцыятыве суда можа быць урэгулявана з удзелам прымірэнца ў прымірэнчай працэдуры, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

2. Для прымірэння і ўрэгулявання спрэчкі ў прымірэнчай працэдуры бакі маюць права:

1) выбіраць прымірэнца;

2) уносіць прапановы аб парадку правядзення прымірэнчай працэдуры;

3) далучаць па пагадненні з другім бокам і прымірэнцам іншых асоб (трэціх асоб, экспертаў, спецыялістаў) для ўдзелу ў прымірэнчай працэдуры, калі гэта неабходна для ўрэгулявання спрэчкі;

4) прадстаўляць другому боку доказы, інфармацыю, неабходныя для праяснення пазіцыі і ўрэгулявання спрэчкі;

5) задаваць другому боку і прымірэнцу ўдакладняльныя пытанні;

6) удзельнічаць у правядзенні індывідуальных перагавораў з прымірэнцам;

7) уносіць прапановы аб урэгуляванні спрэчкі;

8) заключаць пагадненні па фактычных абставінах справы;

9) выпрацоўваць умовы пагаднення аб прымірэнні;

10) хадайнічаць перад судом аб працягу тэрміну прымірэнчай працэдуры ў выпадку яго сканчэння;

11) адмовіцца на любой стадыі перагавораў ад далейшага правядзення прымірэнчай працэдуры.

3. У прымірэнчай працэдуры бакі абавязаны:

1) выконваць прынцыпы прымірэння бакоў;

2) прадстаўляць прымірэнцу дакументы, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы іх прадстаўнікоў на ўдзел у прымірэнчай працэдуры і заключэнне пагаднення аб прымірэнні;

3) з’яўляцца па выкліку прымірэнца для ўдзелу ў прымірэнчай працэдуры;

4) выконваць узгоднены з другім бокам і прымірэнцам парадак правядзення прымірэнчай працэдуры;

5) выконваць пагадненне аб прымірэнні ў добраахвотным парадку;

6) не абнародаваць інфармацыю, атрыманую падчас прымірэнчай працэдуры, без згоды другога боку.

**Артыкул 172. Прымірэнец**

1. Для правядзення прымірэнчай працэдуры суд назначае прымірэнца з шэрагу асоб, якія займаюць дзяржаўную грамадзянскую пасаду ў судзе.

2. Прымірэнец мае права:

1) правяраць паўнамоцтвы прадстаўнікоў бакоў на ўдзел у прымірэнчай працэдуры і заключэнне пагаднення аб прымірэнні;

2) знаёміцца з матэрыяламі справы;

3) вывучаць дакументы, прадстаўленыя бакамі;

4) прапанаваць бакам прадставіць дадатковыя дакументы;

5) садзейнічаць бакам у паслядоўным абмене дакументамі, звесткамі і паведамленнямі па пытаннях, якія абмяркоўваюцца;

6) даваць бакам рэкамендацыі аб найхутчэйшым урэгуляванні ўзніклых пытанняў і захаванні паміж імі дзелавых сувязей;

7) праводзіць індывідуальныя перагаворы з кожным бокам;

8) ініцыяваць завяршэнне прымірэнчай працэдуры.

3. Прымірэнец не мае права здзяйсняць якія-небудзь працэсуальныя дзеянні, даваць заключэнне аб перспектыве вырашэння спрэчкі ў судовым пасяджэнні, парушаць прынцыпы прымірэння бакоў.

**Артыкул 173. Назначэнне прымірэнца**

1. Прымірэнец можа быць назначаны для правядзення прымірэнчай працэдуры ў судах першай і апеляцыйнай інстанцый па хадайніцтве аднаго ці абодвух бакоў або па ініцыятыве суда.

2. Аб назначэнні прымірэнца для правядзення прымірэнчай працэдуры суд выносіць вызначэнне. Пытанне аб назначэнні прымірэнца вырашаецца судом без апавяшчэння бакоў аб часе і месцы судовага пасяджэння.

3. Пры назначэнні прымірэнца па ініцыятыве суда бакі на працягу сямі дзён з моманту вынясення вызначэння маюць права прадставіць пярэчанні. Пры наяўнасці пярэчанняў аднаго з бакоў суд выносіць вызначэнне аб адмене вызначэння аб назначэнні прымірэнца для правядзення прымірэнчай працэдуры. Далейшае вядзенне справы ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

4. Прымірэнец не можа ўдзельнічаць у правядзенні прымірэнчай працэдуры пры наяўнасці падстаў, прадугледжаных часткай 1 артыкула 34 гэтага Кодэкса, і абавязаны заявіць аб гэтым суду. Суд па заяве боку або прымірэнца выносіць вызначэнне аб назначэнні новага прымірэнца ці аб завяршэнні прымірэнчай працэдуры не пазней як у тры дні з моманту паступлення заявы боку або прымірэнца.

**Артыкул 174. Правядзенне прымірэнчай працэдуры**

1. Тэрмін прымірэнчай працэдуры не павінен перавышаць аднаго месяца, а ў судзе апеляцыйнай інстанцыі – тэрмінаў разгляду справы, устаноўленых гэтым Кодэксам. На тэрмін правядзення такой працэдуры суд мае права прыпыніць вядзенне справы.

2. Для правядзення прымірэнчай працэдуры справа перадаецца назначанаму судом прымірэнцу, які вызначае дзень правядзення прымірэнчай працэдуры і паведамляе боку аб часе і месцы яе правядзення.

3. Па хадайніцтве бакоў прымірэнец мае права адкласці правядзенне прымірэнчай працэдуры ў межах тэрмінаў, устаноўленых часткай 1 гэтага артыкула.

4. Прымірэнчая працэдура завяршаецца заключэннем пагаднення аб прымірэнні або апавяшчэннем суда аб недасягненні прымірэння ці сканчэннем тэрміну прымірэнчай працэдуры.

**Артыкул 175. Пагадненне аб прымірэнні**

1. Пры дасягненні ў прымірэнчай працэдуры прымірэння па ўсіх або асобных патрабаваннях бакі заключаюць пагадненне аб прымірэнні, дзе фіксуюцца ўзгодненыя пазіцыі бакоў. Пагадненне аб прымірэнні падпісваецца бакамі або іх прадстаўнікамі і зацвярджаецца судом.

2. Да ўмоў, формы і зместу, а таксама да парадку заключэння, зацвярджэння і выканання пагаднення аб прымірэнні прымяняюцца правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам для міравога пагаднення, адмовы ад іску, прызнання іску.

**Артыкул 176. Урэгуляванне спрэчкі праз правядзенне медыяцыі**

1. Падведамная суду спрэчка, што ўзнікае з грамадзянскіх, сямейных, працоўных і іншых праваадносін, можа быць урэгулявана бакамі з удзелам медыятара (медыятараў), калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі або не вынікае з сутнасці адпаведных праваадносін.

2. Пасля ўзбуджэння судом вядзення справы і да выхаду суда ў дарадчы пакой для вынясення судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, у судах першай і апеляцыйнай інстанцый спрэчка можа быць урэгулявана бакамі праз правядзенне медыяцыі.

3. У выпадку заключэння пагаднення аб прымяненні медыяцыі суд устанаўлівае тэрмін правядзення медыяцыі ў межах тэрміну, прадугледжанага заканадаўчымі актамі. На тэрмін правядзення медыяцыі суд прыпыняе вядзенне справы.

4. У выпадку калі суду першай інстанцыі бакамі пададзена пісьмовая заява аб заключэнні пагаднення аб прымяненні медыяцыі і пакіданні іскавай заявы без разгляду ў сувязі з гэтым пагадненнем, суд першай інстанцыі пакідае іскавую заяву без разгляду.

**Артыкул 177. Наступствы заключэння бакамі медыятыўнага пагаднення па справе, якая знаходзіцца ў вядзенні суда**

У выпадку заключэння бакамі медыятыўнага пагаднення па справе, якая знаходзіцца ў вядзенні суда, і паступлення ў сувязі з гэтым у суд заявы аб зацвярджэнні міравога пагаднення, аб адмове істца ад іску, аб прызнанні іску адказчыкам суд аднаўляе прыпыненае вядзенне справы і разглядае атрыманую заяву аб зацвярджэнні міравога пагаднення, аб адмове істца ад іску, аб прызнанні іску адказчыкам.

## РАЗДЗЕЛ V
## ДОКАЗЫ І ДАКАЗВАННЕ

### ГЛАВА 21
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 178. Доказы і сродкі даказвання**

1. Доказамі з’яўляюцца любыя звесткі аб фактах, што ўваходзяць у прадмет даказвання, атрыманыя ў выніку выкарыстання ва ўстаноўленым гэтым Кодэксам і іншымі законамі парадку сродкаў даказвання.

2. Да сродкаў даказвання адносяцца тлумачэнні асоб – удзельнікаў у справе, паказанні сведкаў, пісьмовыя, электронныя і рэчавыя доказы, заключэнні эксперта, заключэнні дзяржаўных органаў, іншых упаўнаважаных арганізацый, кансультацыі спецыяліста, гука- і відэазапісы, а таксама іншыя носьбіты інфармацыі, калі з іх дапамогай можна атрымаць звесткі аб фактах, што маюць значэнне для правільнага вырашэння справы.

**Артыкул 179. Прадмет даказвання. Размеркаванне цяжару даказвання**

1. Прадметам даказвання з’яўляюцца ўсё факты, што маюць значэнне для правільнага разгляду і вырашэння справы.

2. Кожная асоба, якая ўдзельнічае ў справе, павінна даказаць тыя факты, на якія яна спасылаецца як на падставу сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам. Факты, што ў адпаведнасці з законам лічацца ўстаноўленымі, не падлягаюць даказванню.

3. Даказванне пры разглядзе спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, ажыццяўляецца з улікам асаблівасцей, прадугледжаных артыкулам 361 гэтага Кодэкса, і сутнасці адпаведных праваадносін.

4. Абставіны, што маюць значэнне для правільнага разгляду і вырашэння справы, вызначаюцца судом на падставе патрабаванняў і пярэчанняў бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, з улікам падлеглых прымяненню нормаў права.

5. Кожная асоба, якая ўдзельнічае ў справе, павінна раскрыць факты, на якія яна спасылаецца як на падставу сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, і доказы, з дапамогай якіх яны могуць быць устаноўлены, перад іншымі асобамі – удзельнікамі ў справе да завяршэння падрыхтоўкі справы да судовага разбору або ў межах устаноўленага судом тэрміну, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

**Артыкул 180. Прадстаўленне і выпатрабаванне доказаў**

1. Доказы прадстаўляюцца суду асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

2. Калі доказаў, прадстаўленых асобамі – удзельнікамі ў справе, недастакова, суд мае права прапанаваць ім прадставіць дадатковыя доказы. Аднак калі для названых асоб прадстаўленне дадатковых доказаў немагчымае, суд на падставе іх хадайніцтваў садзейнічае ў выпатрабаванні такіх доказаў.

3. У хадайніцтве аб выпатрабаванні доказу павінен быць адзначаны доказ, а таксама ўказана, якія абставіны, што маюць значэнне для справы, могуць быць пацверджаны ці абвергнуты гэтым доказам, указаны прычыны, што перашкаджаюць самастойнаму атрыманню доказу, і месца яго знаходжання.

4. Пры неабходнасці суд выдае боку або іншай асобе, якая ўдзельнічае ў справе, запыт на атрыманне доказу. Асоба, у якой знаходзіцца выпатрабаваны судом доказ, накіроўвае яго непасрэдна ў суд або выдае на рукі асобе, якая мае адпаведны запыт, для прадстаўлення ў суд.

5. Службовыя асобы і грамадзяне, якія не маюць выпатрабаванага доказу або не маюць магчымасці прадставіць яго ва ўстаноўлены судом тэрмін, абавязаны паведаміць аб гэтым суду у пяцідзённы тэрмін пасля атрымання запыту суда з указаннем прычын.

**Артыкул 181. Адноснасць доказаў**

1. Суд прымае і даследуе толькі тыя доказы, што маюць значэнне для справы.

2. Асоба, якая прадстаўляе доказы або хадайнічае аб іх выпатрабаванні, павінна ўказаць, якія факты, што маюць значэнне для справы, могуць быць устаноўлены гэтымі доказамі.

**Артыкул 182. Дапушчальнасць доказаў**

Факты, што па закону павінны быць пацверджаны з дапамогай канкрэтных сродкаў даказвання, не могуць пацвярджацца ніякімі іншымі сродкамі даказвання.

**Артыкул 183. Пэўнасць доказаў**

Доказ лічыцца пэўным, калі ў выніку праверкі высветліцца, што ён адпавядае рэчаіснасці.

**Артыкул 184. Даказванне падложнасці доказаў**

1. Падложнасць доказаў можа даказвацца з дапамогай любых сродкаў даказвання, уключаючы паказанні сведкі.

2. Асобам, якія прадставілі доказы, падложнасць якіх устаноўлена падчас разгляду справы, прадастаўляецца права даказвання без выкарыстання гэтых доказаў.

**Артыкул 185. Падставы для вызвалення ад даказвання**

1. Факты, прызнаныя судом агульнавядомымі, не падлягаюць даказванню. Такімі прызнаюцца факты з прычыны іх шырокай вядомасці на канкрэтнай тэрыторыі, у тым ліку суду і асобам, якія ўдзельнічаюць у справе.

2. Факты, устаноўленыя ўступіўшай у законную сілу судовай пастановай па раней разгледжанай судом грамадзянскай справе, абавязковыя для суда і не падлягаюць даказванню нанава пры разглядзе судом іншай справы, у якой удзельнічаюць тыя ж асобы або іх правапераемнікі (прэюдыцыя судовай пастановы па грамадзянскай справе).

3. Уступіўшыя ў законную сілу прыгавор суда па крымінальнай справе, іншыя судовыя пастановы па гэтай справе і пастановы суда па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні абавязковыя для суда, які разглядае справу аб грамадзянска-прававых наступствах дзеянняў (бяздзейнасці) асобы, у дачыненні да якой яны вынесены, па пытаннях, ці мелі месца гэтыя дзеянні (бяздзейнасць) і ці ўчыннены яны названай асобай (прэюдыцыя судовай пастановы па крымінальнай справе і па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні).

**Артыкул 186. Вызваленне ад доказвання абставін справы, прызнаных бакамі**

1. Абставіны справы, прызнаныя бакамі ў выніку дасягнутага паміж імі ў судовым пасяджэнні або па-за судовым пасяджэннем пагаднення па фактычных абставінах, прымаюцца судом у якасці фактаў, што не патрабуюць далейшага доказвання.

2. Дасягнутае бакамі пагадненне па фактычных абставінах сведчыцца іх заявамі ў пісьмовай форме.

3. Прызнанне бокам абставін, на якіх другі бок грунтуе свае патрабаванні або пярэчанні, вызваляе другі бок ад неабходнасці доказвання такіх абставін. Абставіны, на якія спасылаецца бок у абгрунтаванне сваіх патрабаванняў або пярэчанняў, лічацца прызнанымі другім бокам, калі яны ім прама не аспрэчаны ці нязгода з такімі абставінамі не вынікае з іншых доказаў, што абгрунтоўваюць прадстаўленыя пярэчанні адносна да сутнасці заяўленых патрабаванняў. Прызнанне бокам фактычных абставін таксама можа быць выкладзена ў пісьмовай форме.

4. Заявы аб дасягненні бакамі пагаднення па фактычных абставінах, а таксама выкладзенае ў пісьмовай форме прызнанне бокам абставін далучаюцца да матэрыялаў справы.

5. У выпадку калі ў суда маюцца падставы меркаваць, што бакамі дасягнута пагадненне па фактычных абставінах або зроблена прызнанне з мэтай скрывання сапраўдных абставін або пад уплывам падману, гвалту, пагрозы, аблуды, суд не прымае пагадненне бакоў па фактычных абставінах або прызнанне, аб чым выносіцца пратакольнае вызначэнне або вызначэнне ў выглядзе асобнага дакумента. У гэтым выпадку ўказанныя абставіны падлягаюць доказванню на агульных падставах.

6. Калі абставіны, прызнаныя і засведчаныя бакамі ў парадку, устаноўленым гэтым артыкулам, прыняты судом, яны не падлягаюць праверцы падчас далейшага вядзення справы.

## ГЛАВА 22
## СРОДКІ ДОКАЗВАННЯ

### § 1. Тлумачэнні бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе

**Артыкул 187. Змест тлумачэнняў бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе**

1. Бакі і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, паведамляюць суду звесткі аб прадмеце доказвання, аб кожным факце, што ўваходзяць у прадмет доказвання, аб доказах, з дапамогай якіх можна пацвердзіць ці абвергнуць існаванне гэтых фактаў.

2. Тлумачэнні ўказаных асоб могуць быць дадзены ў вуснай або пісьмовай форме. Тлумачэнні ў пісьмовай форме далучаюцца да матэрыялаў справы. Доказнае значэнне маюць таксама тлумачэнні бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, змешчаныя ў заявах і іншых працэсуальных дакументах.

3. Тлумачэнні бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, аб вядомых ім абставінах, што маюць значэнне для справы, падлягаюць праверцы і ацэнцы нароўні з іншымі доказамі.

4. Суд мае права лічыць устаноўленымі абставіны, якія маюць значэнне для справы, на падставе звестак, што паведамляюцца адным бокам, калі другі бок утрымлівае ў сябе доказы і не прадстаўляе іх па патрабаванні суда.

**Артыкул 188. Асобы, якія даюць тлумачэнні ў якасці боку і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе**

1. Калі бокам, трэцяй асобай або заяўнікам з’яўляецца юрыдычная асоба, тлумачэнні ў якасці боку, трэцяй асобы або заяўніка дае кіраўнік гэтай юрыдычнай асобы або іншая асоба, упаўнаважаная прадстаўляць інтарэсы юрыдычнай асобы.

2. Калі бокам, трэцяй асобай або заяўнікам з’яўляецца непаўналетні, суд з улікам абставін атрымлівае тлумачэнні ад самога непаўналетняга, яго законнага прадстаўніка ці іх абодвух.

## § 2. Паказанні сведкі

**Артыкул 189. Прадмет допыту сведкі**

1. Сведка можа быць дапытаны аб вядомыхых яму фактах, падлеглых даказванню па справе.

2. Паведамленыя сведкам звесткі не з’яўляюцца дапушчальным доказам, калі сведка не можа назваць крыніцу сваёй асвядомленасці.

3. Асоба, якая хадайнічае аб выкліку сведкі, абавязана ўказаць суду факты, што сведка можа пацвердзіць ці абвергнуць, а таксама паведаміць яго прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), месца жыхарства і іншыя вядомыя ёй звесткі, неабходныя для выкліку сведкі ў суд.

**Артыкул 190. Парадак допыту сведкі**

1. Перад допытам сведкі суд упэўніваецца ў асобе сведкі, растлумачвае сведку яго правы і абавязкі і папярэджвае яго аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывых паказанняў, а таксама за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў.

2. Кожны сведка дапытваецца асобна. Сведкі, якія яшчэ не далі паказанняў, не могуць знаходзіцца ў зале судовага пасяджэння падчас разбору справы. Дапытаныя сведкі застаюцца ў зале пасяджэння да заканчэння разбору справы, калі суд не дазваляе ім выйсці раней, выслухаўшы аб гэтым меркаванні асоб – удзельнікаў у справе.

3. Сведка можа быць дапытаны судом на месцы сваёй прысутнасці, калі ён з прычыны хваробы, узросту, інваліднасці або іншых уважлівых прычын не ў стане прыбыць па выкліку суда.

4. Суд высвятляе адносіны сведкі да асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і прапануе сведку паведаміць суду ўсё, што яму вядома па справе. Пасля гэтага сведку могуць быць зададзены пытанні судом, асобай, па ініцыятыве якой ён выкліканы, і іншымі асобамі – удзельнікамі ў справе.

5. Сведка можа быць паўторна дапытаны ў тым жа або новым пасяджэнні па ініцыятыве суда або па яго ўласнай заяве, а таксама па просьбе асоб – удзельнікаў у справе.

**Артыкул 191. Допыт непаўналетняга сведкі**

1. Пры допыце сведкаў ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, а па меркаванні суда і пры допыце сведкаў ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў павінен прысутнічаць педагагічны работнік з вышэйшай адукацыяй. У выпадку неабходнасці ў суд выклікаюцца таксама законныя прадстаўнікі непаўналетняга. Педагагічны работнік з вышэйшай адукацыяй і законныя прадстаўнікі могуць з дазволу суда задаваць непаўналетняму сведку пытанні.

2. У выключных выпадках, калі гэта трэба для ўстанаўлення ісціны, на час допыту непаўналетняга сведкі з залы судовага пасяджэння па вызначэнні суда можа быць

выдалены той ці іншы ўдзельнік грамадзянскага судаводства (акрамя пракурора). Пасля вяртання гэтай асобы ў залу пасяджэння ёй павінны быць паведамлены паказанні непаўналетняга сведкі і прадастаўлена магчымасць задаць гэтаму сведку пытанні.

3. Сведка, які не дасягнуў шаснаццаці гадоў, па заканчэнні допыту выходзіць з залы судовага пасяджэння, за выключэннем выпадкаў, калі суд прызнае неабходнай прысутнасць гэтага сведкі ў зале пасяджэння.

**Артыкул 192. Абвяшчэнне паказанняў сведкі**

Паказанні сведкаў, атрыманыя ў парадку выканання судовага даручэння, забеспячэння доказаў, а таксама допыту сведкаў па месцы іх прысутнасці, падлягаюць абвяшчэнню (узнаўленню) у судовым пасяджэнні, пасля чаго асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права даць па іх тлумачэнні.

## § 3. Пісьмовыя доказы

**Артыкул 193. Пісьмовыя доказы**

1. Пісьмовымі доказамі з’яўляюцца пісьмовыя дакументы і матэрыялы, у тым ліку дагаворы, даведкі, асабістая перапіска, дзелавая карэспандэнцыя, афіцыйныя дакументы, у якіх змешчаны звесткі аб фактах, што маюць значэнне для правільнага разгляду і вырашэння справы.

2. Дакументы, якія прадстаўляюцца ў суд, павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым для гэтага віду дакументаў.

3. Пісьмовыя доказы прадстаўляюцца ў арыгінале або ў форме яго належным чынам заверанай копіі. Калі да разгляданай справы мае адносіны толькі частка дакумента, прадстаўляецца завераная выпіска з яго.

4. Арыгіналы дакументаў прадстаўляюцца ў суд, калі адпаведна заканадаўству абставіны справы падлягаюць пацвярджэнню толькі арыгіналамі дакументаў, а таксама па патрабаванні суда, калі немагчыма вырашыць справу без арыгіналаў дакументаў або прадстаўленыя копіі аднаго і таго ж дакумента розныя па сваім змесце.

**Артыкул 194. Афіцыйныя і прыватныя дакументы**

1. Афіцыйныя дакументы выдаюць дзяржаўныя органы, іншыя органы, арганізацыі, службовыя асобы, надзеленыя асобнымі дзяржаўнымі або іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, у межах іх кампетэнцыі з захаваннем устаноўленых правіл. Калі афіцыйны дакумент аспрэчваецца бокам ці іншай асобай, якая ўдзельнічае ў справе, дзяржаўныя органы, іншыя органы, арганізацыі, службовыя асобы, надзеленыя асобнымі дзяржаўнымі або іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, прадстаўляюць суду наяўныя ў іх доказы правамернасці выдачы дакумента і праўдзівасці яго зместу. Пакуль не даказана супрацьлеглае, змест афіцыйнага дакумента лічыцца праўдзівым.

2. Прыватны дакумент пацвярджае, што грамадзянін ці кіраўнік юрыдычнай асобы, які падпісаў яго, сапраўды зрабіў заяву, змешчаную ў гэтым дакуменце. Адпаведнасць заявы рэчаіснасці падлягае праверцы з дапамогай іншых доказаў у выпадку яе аспрэчвання.

**Артыкул 195. Дакументы, якімі афармляюць здзяйсненне здзелкі**

1. Да дакументаў, якімі афармляюць здзяйсненне здзелкі, адносяцца дакументы, падпісаныя яе бакамі, а таксама дакументы, якімі абмяняліся бакі і якія падпісаны бакамі ўласнаручна або з выкарыстаннем сродкаў сувязі і іншых тэхнічных сродкаў, камп’ютарных праграм, інфармацыйных сістэм ці інфармацыйных сетак, калі такі спосаб

падпісання дазваляе пэўна ўстанавіць, што адпаведны тэкставы дакумент падпісаны бакамі здзелкі, і не супярэчыць заканадаўству і пагадненню бакоў.

2. Незахаванне пісьмовай формы здзелкі, калі такая форма ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, пазбаўляе бакі права ў выпадку спрэчкі спасылацца ў пацвярджэнне здзелкі і яе ўмоў на паказанні сведкаў, але не пазбаўляе іх права прыводзіць пісьмовыя і іншыя доказы.

**Артыкул 196. Абвяшчэнне і прад'яўленне пісьмовых доказаў**

Пісьмовыя доказы або пратаколы іх агляду, складзеныя падчас падрыхтоўкі справы да судовага разбору, у парадку выканання судовага даручэння ці забеспячэння доказаў, абвяшчаюцца ў судовым пасяджэнні і прад'яўляюцца асобам – удзельнікам у справе, а ў выпадку неабходнасці – таксама сведкам, экспертам, спецыялістам. Пасля гэтага суд выслухвае тлумачэнні ўпамянутых асоб, паказанні сведкаў, тлумачэнні экспертаў, меркаванні спецыялістаў.

**Артыкул 197. Абвяшчэнне і даследаванне асабістай перапіскі, асабістых перагавораў і асабістых запісаў грамадзян**

Асабістая перапіска і асабістыя перагаворы грамадзян, у тым ліку ажыццёўленыя з дапамогай тэлефоннай, электроннай і іншых сродкаў сувязі, могуць быць абвешчаны (узноўлены) у адкрытым судовым пасяджэнні толькі са згоды асоб, паміж якімі гэтыя перапіска або перагаворы адбыліся. У адваротным выпадку такія перапіска або перагаворы абвяшчаюцца (узнаўляюцца) і даследуюцца ў закрытым судовым пасяджэнні. Гэта правіла прымяняецца і пры абвяшчэнні (праслухванні) і даследаванні асабістых запісаў грамадзян.

**Артыкул 198. Вяртанне пісьмовых доказаў**

1. Пісьмовыя доказы, змешчаныя ў справе, па заявах асоб, якія іх прадставілі, могуць быць ім вернуты пасля ўступлення судовай пастановы ў законную сілу. У гэтым выпадку ў справе пакідаюцца засведчаныя суддзёй копіі пісьмовых доказаў.

2. Да ўступлення судовай пастановы ў законную сілу пісьмовыя доказы могуць быць вернуты асобам, якія іх прадставілі, калі суд палічыць гэта магчымым.

## § 4. Электронныя доказы

**Артыкул 199. Электронныя доказы**

Электроннымі доказамі з'яўляюцца звесткі аб фактах, што маюць значэнне для правільнага разгляду і вырашэння справы, змешчаныя на электронных носьбітах інфармацыі, у тым ліку электронныя дакументы, тэкставыя, мультымедыйныя і галасавыя паведамленні, базы даных і іншыя звесткі ў электроннай (лічбавай) форме, а таксама інфармацыя, размешчаная ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт.

**Артыкул 200. Прадстаўленне і выпатрабаванне электронных доказаў**

1. Электронныя доказы прадстаўляюцца ў арыгінале або ў копіі, засведчанай у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

2. Асобы, якія прадстаўляюць электронныя доказы, абавязаны ўказаць звесткі пра фармат запісу на электронным носьбіце інфармацыі, а таксама пра абсталяванне і праграмнае забеспячэнне, неабходныя для яе ўзнаўлення. Асобы, якія прадстаўляюць гука- і відэазапісы ці хадайнічаюць аб іх выпатрабаванні, абавязаны дадаткова ўказаць, калі, кім і ў якіх умовах ажыццяўляўся адпаведны запіс.

3. Электронныя доказы з зафіксаванай на іх тэкставай або графічнай інфармацыяй павінны суправаджацца выявай запісу на папяровым носьбіце. Відэазапісы могуць суправаджацца тлумачэннямі адносна да зместу відэазапісу. У дачыненні да інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, павінен быць указаны адрас у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, па якім такая інфармацыя размешчана.

4. Асоба, якая прадставіла копію электроннага доказу, павінна ўказаць аб наяўнасці ў яе або іншай асобы арыгінала электроннага доказу. Суд па хадайніцтве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, ці па сваёй ініцыятыве можа выпатрабаваць у адпаведнай асобы арыгінал электроннага доказу. Калі арыгінал электроннага доказу не прадстаўлены, а пэўнасць прадстаўленай копіі аспрэчваецца асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, і (або) выклікае сумненні ў суда, такі доказ не можа быць прыняты судом у якасці доказу, што пацвярджае ці абвяргае факты, падлеглыя даказванню па справе.

**Артыкул 201. Асаблівасці даследавання электронных доказаў**

1. Электронныя доказы даследуюцца судом у зале судовага пасяджэння або іншым памяшканні, спецыяльна абсталяваным для гэтых мэт. У неабходных выпадках даследаванне электронных доказаў можа праводзіцца на месцы іх знаходжання. Пры гэтым асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права ўдзельнічаць у даследаванні электронных доказаў, даваць суду неабходныя тлумачэнні, заяўляць хадайніцтвы.

2. Пры адсутнасці ў суда неабходных для даследавання электроннага доказу абсталявання і (або) праграмнага забеспячэння суд прапануе асобе, якая прадставіла электронны доказ ці заявіла хадайніцтва аб яго выпатрабаванні ці аб даследаванні інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, прадаставіць такія абсталяванне і (або) праграмнае забеспячэнне.

3. Пры даследаванні электронных доказаў, што патрабуюць увядзення пароляў, кодаў, графічных ключоў і іншых спосабаў ідэнтыфікацыі, аперацыі па доступе да электроннага доказу ажыццяўляюцца асобай, якая прадставіла гэты доказ, аб чым робіцца запіс у сціслым пратаколе, пратаколе судовага пасяджэння, без абвяшчэння ідэнтыфікацыйных звестак у судовым пасяджэнні і без іх занясення ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння.

4. Электронныя доказы, дзе змешчана асабістая перапіска, асабістыя перагаворы і асабістыя запісы грамадзян, а таксама іншыя электронныя доказы, дзе маецца інфармацыя аб прыватным жыцці, абвяшчаюцца (праслухваюцца) і даследуюцца па правілах, устаноўленых артыкулам 197 гэтага Кодэкса.

5. Па хадайніцтве бакоў або аднаго з іх і пры адсутнасці пярэчанняў асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, суд можа даследаваць выяву электроннага доказу на папяровым носьбіце без выкарыстання адпаведных абсталявання і (або) праграмнага забеспячэння.

6. У выпадку неабходнасці для ўдзелу ў даследаванні электронных доказаў суд мае права запрасіць спецыяліста.

**Артыкул 202. Захоўванне і вяртанне электронных доказаў**

1. Электронныя доказы ў выглядзе запісу на электронных носьбітах інфармацыі захоўваюцца ў судзе пры справе. Суд прымае меры па захаванні запісаў і тэхнічных носьбітаў інфармацыі ў нязменным стане.

2. Пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, тэхнічныя носьбіты інфармацыі з зафіксаванымі на іх запісамі могуць быць вернуты па хадайніцтве асоб, ад каго яны атрыманы. У гэтым выпадку да матэрыялаў справы далучаецца тэхнічны носьбіт, дзе змешчана копія адпаведнага запісу.

3. Электронныя доказы, зафіксаваныя на абсталяванні, прадастаўленым асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, пасля даследавання іх судом могуць быць вернуты ўказаным асобам разам з такім абсталяваннем да ўступлення судовай пастановы ў законную сілу.

## § 5. Рэчавыя доказы. Агляды. Асведчанне. Апазнанне. Судовы эксперымент

### Артыкул 203. Рэчавыя доказы

Рэчавымі доказамі з'яўляюцца прадметы, якія дзякуючы не страчаным на іх слядам уздзеяння, форме, іншым уласцівасцям і якасцям або месцу знаходжання могуць служыць сродкам устанаўлення фактаў, што маюць значэнне для справы.

### Артыкул 204. Захоўванне рэчавых доказаў

1. Рэчавыя доказы захоўваюцца ў справе або асобна ад яе ў памяшканні суда.

2. Прадметы, якія з прычыны іх грувасткасці або па іншых прычынах не могуць быць дастаўлены ў суд, пакідаюцца па іх месцы знаходжання і перадаюцца на захоўванне ўладальнікам або іншым асобам. Усе рэчавыя доказы павінны быць падрабязна апісаны ў пратаколе агляду, апячатаны, а пры неабходнасці – зафіксаваны пры дапамозе фота- і відэаздымкі.

3. Выдаткі па захоўванні рэчавых доказаў размяркоўваюцца паміж бакамі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

4. Суд і ахоўнік прымаюць меры па захаванні рэчавых доказаў у нязменным стане.

5. Асобы, якія не забяспечылі захавання рэчавых доказаў, нясуць адказнасць адпаведна заканадаўству.

### Артыкул 205. Даследаванне рэчавых доказаў

1. Рэчавыя доказы аглядаюцца ў судовым пасяджэнні судом, прад'яўляюцца для агляду асобам – удзельнікам у справе, а ў выпадку неабходнасці – таксама экспертам, спецыялістам і сведкам.

2. Асобы, якім прад'яўлены рэчавыя доказы, могуць выказваць свае заўвагі аб тых або іншых асаблівасцях і ўласцівасцях указаных доказаў і даваць неабходныя тлумачэнні. Гэтыя заўвагі і тлумачэнні заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння ў выпадку яго складання.

3. Асобы – удзельнікі ў справе выказваюць свае заўвагі і даюць тлумачэнні таксама пасля абвяшчэння пратаколаў агляду рэчавых доказаў, складзеных падчас падрыхтоўкі справы да судовага разбору, у парадку выканання судовага даручэння або забеспячэння доказаў.

### Артыкул 206. Агляд і даследаванне рэчавых доказаў, што хутка псуюцца

1. Рэчавыя доказы, што хутка псуюцца, неадкладна аглядаюцца і даследуюцца судом па месцы іх знаходжання, пасля чаго вяртаюцца асобе, якая прадставіла іх для агляду. Калі вяртанне такіх рэчавых доказаў немагчыма, яны здаюцца ў адпаведныя ўстановы для выкарыстання па прызначэнні, рэалізацыі або ўтылізацыі ў парадку, што ўстанаўліваецца судом.

2. Аб месцы і часе агляду і даследавання рэчавых доказаў, што хутка псуюцца, апавяшчаюцца асобы – удзельнікі ў справе, калі яны могуць прыбыць на месца знаходжання рэчавых доказаў да моманту іх агляду. Няяўка апавешчаных асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не перашкаджае агляду і даследаванню такіх рэчавых доказаў. Даныя агляду і даследавання рэчавых доказаў, што хутка псуюцца, заносяцца ў пратакол.

### Артыкул 207. Вяртанне рэчавых доказаў

1. Пасля ўступлення ў законную сілу судовай пастановы рэчавыя доказы вяртаюцца асобам, ад каго яны былі атрыманы, або перадаюцца асобам, за якімі суд прызнаў права

на гэтыя прадметы, або перадаюцца ў адпаведныя ўстановы для выкарыстання па прызначэнні, рэалізацыі ці ўтылізацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

2. У асобных выпадках рэчавыя доказы пасля агляду і даследавання іх судом могуць быць вернуты асобам, ад каго яны былі атрыманы, яшчэ да ўступлення судовай пастановы ў законную сілу, калі ўказаныя асобы аб гэтым хадайнічаюць і задавальненне такога хадайніцтва магчыма без шкоды для разгляду справы або выканання рашэння.

3. Дакументы, якія з'яўляюцца рэчавыя доказамі, застаюцца ў справе на працягу ўсяго тэрміну яе захоўвання, але могуць таксама перадавацца зацікаўленым грамадзянам і юрыдычным асобам з пакіданнем у справе іх копій.

**Артыкул 208. Агляд на месцы**

Суд па заяве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, або па ўласнай ініцыятыве можа зрабіць агляд мясцовасці, памяшкання, транспартнага сродку, а таксама агляд прадмета, калі ён не можа быць дастаўлены ў суд. Аб вядзенні агляду на месцы суд выносіць вызначэнне.

**Артыкул 209. Асаблівасці агляду памяшканняў**

Пры неабходнасці агляду жылога, службовага, вытворчага або іншага памяшкання суд выносіць аб гэтым вызначэнне, якое прад'яўляецца грамадзяніну або кіраўніку ці прадстаўніку юрыдычнай асобы. Агляд месцаў, дзе захоўваюцца матэрыяльныя каштоўнасці, праводзіцца ў прысутнасці матэрыяльна адказных асоб.

**Артыкул 210. Парадак вядзення агляду**

1. Аб часе і месцы агляду паведамляецца асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, аднак іх няяўка не перашкаджае агляду.

2. У неабходных выпадках для ўдзелу ў аглядзе далучаюцца эксперты, спецыялісты, перакладчыкі і панятыя. Спецыялісты пры аглядзе могуць рабіць вымярэнні, фатаграфаванне, кіназдымку, відэазапіс, складаць планы і схемы, а таксама здзяйсняць іншыя неабходныя дзеянні.

3. У выпадку неабходнасці агляданыя прадметы канфіскуюцца, пакуюцца і апячатваюцца.

**Артыкул 211. Асведчанне**

1. Суд мае права зрабіць асведчанне боку або трэцяй асобы для ўстанаўлення на іх целе слядоў правапарушэння, наяўнасці асаблівых прыкмет і таму падобнага, калі пры гэтым не патрабуецца судова-медыцынская экспертыза. Асведчанне сведкі магчыма толькі для праверкі пэўнасці яго паказанняў.

2. Вызначэнне суда аб вядзенні асведчання з'яўляецца абавязковым для асобы, у дачыненні да якой яно вынесена.

3. Асведчанне праводзіцца ў прысутнасці панятых, а ў неабходных выпадках – і з удзелам урача. Калі асведчанне суправаджаецца агаленнем асобы, якую трэба асведчыць, яно праводзіцца ў прысутнасці панятых таго ж полу. Суддзя не можа прысутнічаць пры асведчанні асоб іншага полу, калі для асведчання патрабуецца агаленне. У такім выпадку асведчанне робіць урач у прысутнасці панятых.

4. Пры асведчанні не дапускаюцца дзеянні, якія зневажаюць гонар і годнасць асобы, якую трэба асведчыць, або небяспечныя для яе жыцця і здароўя.

**Артыкул 212. Сціслы пратакол, пратакол агляду або асведчання**

1. Аб вядзенні агляду або асведчання складаюцца сціслы пратакол, пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 105 і 106 гэтага Кодэкса.

2. У сціслым пратаколе, пратаколе апісваюцца ўмовы агляду або асведчання, усе працэсуальныя дзеянні суда, а таксама ўсё выяўленае пры аглядзе і асведчанні ў той паслядоўнасці, у якой яны праводзіліся, і ў тым выглядзе, у якім выяўленае назіралася ў момант агляду або асведчання. У сціслым пратаколе, пратаколе пералічваецца і апісваецца таксама ўсё канфіскаванае пры аглядзе або асведчанні.

3. Удзельнікі агляду або асведчання могуць патрабаваць, каб у сціслы пратакол, пратакол былі ўнесены іх заўвагі.

4. Пасля абвяшчэння сціслы пратакол, пратакол падпісваюцца ўсімі асобамі, якія ўдзельнічалі ў аглядзе або асведчанні.

5. Да сціслага пратакола, пратакола дадаюцца складзеныя, зробленыя або звераныя пры аглядзе або асведчанні планы, чарцяжы, фотаздымкі і да т.п.

**Артыкул 213. Прад'яўленне для апазнання**

1. У выпадку неабходнасці суд можа прад'явіць для апазнання сведку ці боку асобу, прадмет або жывёлу.

2. Апазнавальнікі папярэдне апытваюцца пра абставіны, пры якіх яны назіралі адпаведных асобу, прадмет або жывёлу, а таксама аб прыкметах і асаблівасцях, па якіх яны могуць правесці апазнанне.

**Артыкул 214. Парадак прад'яўлення для апазнання**

1. Асоба, апазнанне якой праводзіцца, прад'яўляецца апазнавальніку разам з іншымі асобамі, падобнымі з выгляду з апазнаваным. Агульная колькасць асоб, якія прад'яўляюцца для апазнання, павінна быць не менш за тры.

2. Перад пачаткам працэсуальнага дзеяння апазнаванаму ў адсутнасць апазнавальніка прапануецца заняць любое месца сярод прад'яўленых асоб, што адзначаецца ў пратаколе ў выпадку яго складання.

3. Пры немагчымасці прад'яўлення асобы апазнанне можа быць праведзена па яе фатаграфіі, што прад'яўляецца адначасова з фатаграфіямі не менш як трох іншых асоб, падобных з выгляду.

4. Прадмет або жывёла прад'яўляюцца ў групе аднародных прадметаў, жывёл.

5. Калі апазнавальнікам з'яўляецца сведка, ён перад апазнаннем папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывых паказанняў, а таксама за адмову або ўхіленне ад дачы паказанняў. Сведку, які ўжо папярэджаны аб адказнасці, суддзя нагадвае аб гэтым.

6. Апазнавальніку прапануецца ўказаць асобу, прадмет або жывёлу, аб якіх ён даў паказанні. Навадныя пытанні не дапускаюцца.

7. Калі апазнавальнік указаў на адну з прад'яўленых яму асоб або адзін з прадметаў ці адну з жывёл, яму прапануецца растлумачыць, па якіх прыкметах або асаблівасцях ён пазнаў гэтыя асобу, прадмет ці жывёлу.

8. У выпадку няяўкі бакоў прад'яўленне для апазнання праводзіцца ў прысутнасці панятых.

9. У выключных выпадках з мэтай забеспячэння асабістай бяспекі апазнавальніка ён можа апазнаваць, з'яўляючыся нябачным для апазнаванага.

**Артыкул 215. Сціслы пратакол, пратакол прад’яўлення для апазнання**

Аб прад’яўленні для апазнання складаюцца сціслы пратакол, пратакол, дзе ўказваюцца звесткі пра асобу апазнавальніка, пра асоб, прадметы ці жывёл, прад’яўленых для апазнання, пра панятых, якія прынялі ўдзел у працэсуальным дзеянні, і па магчымасці даслоўна выкладаюцца паказанні апазнавальніка, а таксама іншыя звесткі, прадугледжаныя артыкуламі 104 і 105 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 216. Мэты і падставы правядзення судовага эксперыменту**

Судовы эксперымент праводзіцца судом з мэтай праверкі і ўдакладнення фактаў, што маюць значэнне для справы. Ён праводзіцца па патрабаванні асоб – удзельнікаў у справе або па ініцыятыве суда праз узнаўленне абставін, калі адбывалася канкрэтная падзея, і дзеянняў, з якіх гэта падзея складалася.

**Артыкул 217. Парадак правядзення судовага эксперыменту**

1. У выпадку няяўкі бакоў судовы эксперымент праводзіцца ў прысутнасці панятых. Да ўдзелу ў судовым эксперыменце могуць быць далучаны спецыялісты і асобы, якія імітуюць дзеянні ўдзельнікаў падзеі.

2. Да ўзнаўлення дзеянняў павінны быць адноўлены абставіны, калі па кожнай з версій, што трэба праверыць, адбывалася падзея. Кожнаму ўдзельніку судовага эксперыменту суддзя прапануе самастойна ўзнавіць абставіны падзеі і здзейсніць дзеянні, удзельнікам або сведкам якіх ён быў.

3. Правядзенне судовага эксперыменту магчыма толькі пры ўмове, што пры гэтым не будуць зняважаны гонар і годнасць удзельнікаў і прысутных асоб і не ўзнікне небяспека для іх жыцця і здароўя.

4. Калі судовы эксперымент можа пацягнуць прычыненне маёмаснай шкоды грамадзянам або юрыдычным асобам, суддзя вызначае, за чый кошт гэта шкода будзе кампенсавана.

5. Аб правядзенні судовага эксперыменту і яго выніках складаюцца сціслы пратакол, пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 105 і 106 гэтага Кодэкса.

**§ 6. Заключэнне эксперта. Кансультацыя спецыяліста**

**Артыкул 218. Падставы для назначэння экспертызы**

Экспертыза назначаецца судом для растлумачэння пытанняў, што ўзнікаюць пры разглядзе справы і патрабуюць спецыяльных ведаў у галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства або іншых сферах дзейнасці, па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або па сваёй ініцыятыве. Экспертыза можа быць назначана ў парадку забеспячэння доказаў, пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору або падчас судовага разбору. Пытанні, пастаўленыя эксперту, і яго заключэнне не могуць выходзіць за межы спецыяльных ведаў эксперта.

**Артыкул 219. Камісійная экспертыза**

Складаная экспертыза можа праводзіцца камісіяй экспертаў адной спецыяльнасці. У такіх выпадках заключэнне падпісваюць усе эксперты разам. Пры рознагалоссях паміж экспертамі кожны з іх дае асобнае заключэнне па ўсіх пытаннях, што выклікалі рознагалоссі.

**Артыкул 220. Комплексная экспертыза**

1. Комплексная экспертыза назначаецца, калі зрабіць які-небудзь вывад, што мае значэнне для справы, можна толькі праз правядзенне некалькіх даследаванняў з выкарыстаннем розных галін ведаў або розных навуковых дысцыплін у межах адной галіны ведаў.

2. Кожны эксперт праводзіць даследаванне самастойна, нясе за яго адказнасць і дае заключэнне толькі ў межах сваёй кампетэнцыі.

3. Эксперт не мае права падпісваць тую частку заключэння комплекснай экспертызы, што не адносіцца да яго кампетэнцыі.

**Артыкул 221. Правы асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, у сувязі з экспертызай**

Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права:

1) хадайнічаць аб назначэнні экспертызы;

2) заяўляць адводы экспертам;

3) прадстаўляць пытанні для пастаноўкі іх перад экспертам;

4) прадстаўляць для экспертнага даследавання дадатковыя дакументы і іншыя матэрыялы;

5) знаёміцца з вызначэннем суда аб назначэнні экспертызы і заключэннем эксперта;

6) з дазволу суда прысутнічаць падчас правядзення экспертызы і даваць тлумачэнні экспертам, за выключэннем выпадкаў, калі такая прысутнасць па-за судовым пасяджэннем можа перашкодзіць нармальнай рабоце экспертаў.

**Артыкул 222. Парадак назначэння экспертызы**

1. Экспертыза праводзіцца па-за судом. Аднак калі дазваляе характар даследавання, яна можа быць праведзена і непасрэдна ў судовым пасяджэнні. Экспертыза праводзіцца асобным экспертам або групай экспертаў.

2. Пры назначэнні экспертызы суд растлумачвае бакам і іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, правы, прадугледжаныя артыкулам 221 гэтага Кодэкса, і прадастаўляе ім магчымасць заявіць адпаведнае хадайніцтва.

3. Права канчатковага рашэння ўсіх пытанняў, звязаных з назначэннем экспертызы, належыць суду. Адхіленне адпаведных хадайніцтваў, заяўленых асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, павінна быць матывавана ў вызначэнні суда.

4. Аб назначэнні экспертызы суд выносіць вызначэнне, дзе ўказваюцца падставы для правядзення экспертызы, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) эксперта (экспертаў) або назва судова-экспертнай арганізацыі (падраздзялення), дзе павінна быць праведзена экспертыза, пытанні, пастаўленыя перад экспертам, і матэрыялы, аб'екты, прадастаўленыя ў распараджэнне эксперта. Правядзенне экспертызы юрыдычнай асобай, якая не з'яўляецца судова-экспертнай арганізацыяй, не дапускаецца.

5. Вызначэнне суда аб назначэнні экспертызы і неабходныя матэрыялы, аб'екты суд накіроўвае эксперту або ў судова-экспертную арганізацыю (падраздзяленне).

6. Калі экспертыза праводзіцца па-за судова-экспертнай арганізацыяй (падраздзялення), суд высвятляе неабходныя даныя аб спецыяльнасці і кампетэнтнасці асобы, якой даручаецца правядзенне экспертызы.

7. Калі бок па справе адмаўляецца ад удзелу ў правядзенні экспертызы або стварае перашкоды яе правядзенню (не з'яўляецца на экспертызу, не прадстаўляе экспертам неабходныя прадметы даследавання, не ўносіць грашовыя сродкі для аплаты правядзення экспертызы ва ўстаноўлены судом тэрмін і да т.п.), а па абставінах справы без удзелу гэтага боку або без прадстаўленыя ёю прадметаў даследавання экспертызу правесці немагчыма, суд у залежнасці ад таго, які з бакоў ухіляецца ад экспертызы і якое значэнне для боку

экспертыза мае, мае права прызнаць факт, для высвятлення якога экспертыза назначалася, устаноўленым ці абвергнутым.

8. Вызначэнне суда аб назначэнні экспертызы і заключэнне эксперта не прадастаўляюцца для азнаямлення асобе, у дачыненні да якой праводзіцца судова-псіхіятрычная экспертыза, калі яе псіхічны стан робіць гэты немагчымым.

**Артыкул 223. Узоры і матэрыялы для экспертнага даследавання**

1. Суд мае права атрымаць ад бакоў па справе і перадаць эксперту або судова-экспертнай арганізацыі (падраздзяленню) узоры почырку або іншыя ўзоры, неабходныя для экспертнага даследавання.

2. Узяцце ў асоб, для даследавання біялагічных узораў (крыві, сліны і да т.п.) дапускаецца толькі з іх згоды, а калі яны недзеяздольныя – са згоды або па хадайніцтве іх законных прадстаўнікоў і праводзіцца экспертамі ў судова-экспертных падраздзяленнях органаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз або арганізацыях аховы здароўя.

3. Суд прадстаўляе эксперту ў неабходных выпадках матэрыялы справы, далучае яго да ўдзелу ў допыце сведкаў, да агляду рэчавых доказаў і да т.п.

**Артыкул 224. Правядзенне экспертызы ў судова-экспертнай арганізацыі (падраздзяленні)**

1. Пры даручэнні правядзення экспертызы судова-экспертнай арганізацыі (падраздзяленню) суд накіроўвае ў гэту судова-экспертную арганізацыю (падраздзяленне) сваё вызначэнне разам з неабходнымі матэрыяламі і аб’ектамі.

2. Пасля атрымання вызначэння суда кіраўнік судова-экспертнай арганізацыі (падраздзялення) даручае правядзенне экспертызы аднаму або некалькім экспертам гэтай судова-экспертнай арганізацыі (падраздзялення), растлумачвае ім правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 85 і 86 гэтага Кодэкса, і папярэджвае іх аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў, што сведчыцца подпісамі экспертаў у заключэнні эксперта.

**Артыкул 225. Змяшчэнне асобы для даследавання ў арганізацыю аховы здароўя або судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар**

1. Калі пры назначэнні або правядзенні судова-медыцынскай ці судова-псіхіятрычнай экспертызы ўзнікае неабходнасць у стацыянарным назіранні за асобай для даследавання, суд са згоды гэтай асобы змяшчае яе адпаведна ў дзяржаўную арганізацыю аховы здароўя або судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар, аб чым указвае ў вызначэнні суда аб назначэнні экспертызы.

2. Без згоды асобы для даследавання суд можа змясціць яе для стацыянарнага назірання ў адпаведныя арганізацыю аховы здароўя або судова-псіхіятрычны экспертны стацыянар у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

**Артыкул 226. Правядзенне экспертызы па-за судова-экспертнай арганізацыяй**

1. Калі экспертыза праводзіцца па-за судова-экспертнай арганізацыяй, суддзя выклікае да сябе асобу, якой можа быць даручана правядзенне экспертызы, упэўніваецца ў яго асобе, спецыяльнасці і кваліфікацыі, устанаўлівае яго адносіны да бакоў, а таксама правярае, ці няма падстаў для адводу, пасля чаго выносіць вызначэнне аб назначэнні экспертызы.

2. Пасля вынясення вызначэння аб назначэнні экспертызы суддзя ўручае вызначэнне эксперту, растлумачвае яму правы і абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 85 і 86 гэтага

Кодэкса, папярэджвае яго аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў. Аб здзяйсненні гэтых дзеянняў суддзя робіць запіс, які сведчыцца подпісам эксперта, у вызначэнні суда аб назначэнні экспертызы.

3. Калі эксперт робіць якія-небудзь заявы або хадайніцтвы, складаюцца сціслы пратакол, пратакол з захаваннем патрабаванняў артыкулаў 105 і 106 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 227. Заключэнне эксперта**

1. Заключэнне эксперта – працэсуальны дакумент, які сведчыць факт і ход даследавання экспертам матэрыялаў, аб’ектаў экспертызы, прадастаўленых судом, і ў якім змешчаны вывады па пастаўленых перад экспертам пытаннях, заснаваныя на спецыяльных ведах эксперта ў галіне навукі, тэхнікі, мастацтва, рамяства і іншых сферах дзейнасці.

2. Пасля правядзення даследавання з улікам яго вынікаў эксперт (эксперты) ад свайго імя складае і падпісвае заключэнне эксперта.

3. Заключэнне эксперта павінна складацца з уводнай, даследчай частак і матываваных вывадаў.

4. Ва ўводнай частцы заключэння эксперта ўказваюцца:

1) звесткі аб судова-экспертнай арганізацыі (падраздзяленні), эксперце (прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), пасада службоўцы, адукацыя, стаж экспертнай работы па экспертнай спецыяльнасці, вучоная ступень, вучонае званне, іншыя звесткі);

2) даты пачатку і заканчэння правядзення экспертызы (пры неабходнасці – час);

3) падстава для правядзення экспертызы, дата вынясення вызначэння суда аб назначэнні экспертызы;

4) адзнака, засведчаная подпісам эксперта, аб тым, што ён папярэджаны аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў;

5) звесткі аб асобах, якія прысутнічалі падчас правядзення экспертызы;

6) пытанні, пастаўленыя перад экспертам;

7) звесткі аб матэрыялах і аб’ектах, прадастаўленых для правядзення экспертызы;

8) звесткі аб хадайніцтвах эксперта.

5. У доследнай частцы заключэння эксперта змяшчаюцца наступныя звесткі:

1) апісанне аб’ектаў і іх упакоўкі;

2) умовы правядзення экспертызы, што маюць значэнне для экспертнага даследавання;

3) прымененыя сродкі, метады, праведзеныя эксперыменты, выяўленыя істотныя ўласцівасці (прыкметы) аб’ектаў, атрыманыя вынікі;

4) звесткі аб выдаткаваных (знішчаных) аб’ектах з указаннем іх назваў і колькасці;

5) тлумачэнні асоб, якія прысутнічалі падчас правядзення экспертызы;

6) спасылкі на выкарыстаныя метадычныя матэрыялы або іншыя матэрыялы з навукова-практычным абгрунтаваннем прымененых метадаў;

7) іншыя звесткі, што маюць значэнне для правядзення экспертызы.

6. Матываваныя вывады ў заключэнні эксперта фармулююцца на аснове аб’ектыўнага, усебаковага і поўнага аналізу вынікаў, атрыманых пры даследаванні матэрыялаў, аб’ектаў экспертызы. Калі падчас правядзення экспертызы эксперт установіць абставіны, што маюць значэнне для справы, па якіх яму не былі пастаўлены пытанні, ён мае права ўказаць на іх у сваім заключэнні.

7. Да заключэння эксперта неабходна дадаць аб’екты, узоры, якія былі атрыманы эксперыментальным шляхам, выкарыстаны для параўнання і засталіся пасля даследавання, а таксама фатаграфіі, схемы, графікі, табліцы і іншыя матэрыялы, што пацвярджаюць вывады, электронныя носьбіты адпаведнай інфармацыі. Дадатак да заключэння эксперта на папяровых носьбітах падпісваецца экспертам, на электронных носьбітах – пакуецца і апячатваецца.

8. Калі эксперт установіць, што пастаўленыя пытанні выходзяць за межы яго спецыяльных ведаў або прадастаўленыя яму матэрыялы, аб’екты непрыдатныя ці недастатковыя для адказу на гэтыя пытанні і не могуць быць папоўнены, або калі стан навукі і практыкі не дазваляе адказаць на пастаўленыя пытанні, ён складае матываванае паведамленне аб немагчымасці дачы заключэння эксперта і накіроўвае яго ў суд, які назначыў экспертызу.

**Артыкул 228. Даследаванне заключэння эксперта**

1. Суд можа абмежавацца абвяшчэннем пісьмовага заключэння эксперта, не выклікаючы яго ў судовае пасяджэнне.

2. У выпадку выкліку эксперта ў суд ён абавязаны даць неабходныя тлумачэнні па сваім заключэнні, а таксама адказаць на пытанні суда і асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

3. Пытанні эксперту задаюць суд, асоба, па чыёй заяве была назначана экспертыза, і іншыя асобы – удзельнікі ў справе.

4. Бакі і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць таксама права непасрэдна азнаёміцца з заключэннем эксперта або матываваным паведамленнем аб немагчымасці дачы заключэння эксперта і даць свае тлумачэнні па заключэнні эксперта.

5. Заключэнне эксперта не з’яўляецца абавязковым для суда і ацэньваецца нароўні з іншымі доказамі. Нязгода з гэтым заключэннем павінна быць матывавана ў судовай пастанове.

**Артыкул 229. Дадатковая і паўторная экспертызы**

1. У выпадку недастатковай яснасці ці непаўнаты заключэння эксперта, а таксама ў выпадку ўзнікнення неабходнасці рашэння дадатковых пытанняў, звязаных з папярэднім даследаваннем, суд мае права прызначыць дадатковую экспертызу, даручыўшы яе правядзенне таму ж або іншаму эксперту (экспертам).

2. У выпадку ўзнікнення сумненняў у правільнасці ці абгрунтаванасці заключэння эксперта ці наяўнасці супярэчнасцей у вывадах эксперта (экспертаў) або ў выпадку, калі былі парушаны правілы правядзення экспертызы, суд можа назначыць па тых жа пытаннях паўторную экспертызу, правядзенне якой даручаецца іншаму эксперту (экспертам).

**Артыкул 230. Кансультацыя спецыяліста**

1. Для атрымання кансультацый па пытаннях, што патрабуюць спецыяльных ведаў і маюць значэнне для разгляду справы, суд па хадайніцтве асоб – удзельнікаў у справе або па сваёй ініцыятыве мае права запрасіць спецыяліста.

2. Спецыяліст дае кансультацыі добрасуленна і непрадузята, зыходзячы з прафесійных ведаў і ўнутранага пераканання. Кансультацыі могуць быць дадзены спецыялістам без правядзення спецыяльных даследаванняў.

3. Спецыялісту могуць быць зададзены пытанні судом і асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

4. Кансультацыі спецыяліста, дадзеныя ў пісьмовай форме, абвяшчаюцца ў судовым пасяджэнні і далучаюцца да матэрыялаў справы. Кансультацыі спецыяліста, дадзеныя ў вуснай форме, заносяцца ў пратакол судовага пасяджэння, калі ён складаецца.

### § 7. Іншыя сродкі даказвання

**Артыкул 231. Гука-, відэазапіс, кіна- і відэафільмы і іншыя носьбіты інфармацыі**

1. Суд з улікам абставін справы можа дапусціць у якасці сродкаў даказвання гука-, відэазапіс, кіна- і відэафільмы, а таксама запісы на іншых носьбітах інфармацыі. Іх даследаванне праводзіцца па правілах, устаноўленых для даследавання пісьмовых і рэчавых доказаў. Асобы, якія хадайнічаюць аб допуску такіх сродкаў даказвання, абавязаны ўказаць тэхнічныя даныя аб сістэмах запісу і ўзнаўлення, што дазваляюць суду ўспрыняць інфармацыю.

2. Атрыманыя з дапамогай указаных у частцы 1 гэтага артыкула запісаў і фільмаў звесткі ацэньваюцца ў сукупнасці з іншымі доказамі па справе.

3. Не можа быць выкарыстана ў якасці доказы гука- або відэазапіс, атрыманы скрытым шляхам, за выключэннем выпадкаў, калі такі запіс дапускаецца законам.

**Артыкул 232. Заключэнні дзяржаўных органаў, іншых упаўнаважаных арганізацый**

Сродкамі даказвання з'яўляюцца заключэнні і звязаныя з імі акты, іншыя дакументы ўдзельнікаў у справе – дзяржаўных органаў, іншых упаўнаважаных арганізацый у частцы, у якой змешчана інфармацыя аб фактах, што маюць значэнне для справы. Такія заключэнні і акты, іншыя дакументы абвяшчаюцца ў судовым пасяджэнні, пасля чаго суд і асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, могуць задаваць прадстаўнікам дзяржаўных органаў, іншых упаўнаважаных арганізацый пытанні з мэтай растлумачэння і дапаўнення ўказанай інфармацыі.

**Артыкул 233. Пратаколы працэсуальных дзеянняў як сродку даказвання**

Пратаколы, якія сведчаць факты і абставіны, устаноўленыя пры аглядзе, асведчанні, прад'яўленні для апазнання і судовым эксперыменце, з'яўляюцца крыніцамі інфармацыі для даказвання, калі яны складзены ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

## ГЛАВА 23
## ЗБІРАННЕ, ПРАВЕРКА І АЦЭНКА ДОКАЗАЎ

**Артыкул 234. Збіранне доказаў**

1. Доказы збіраюцца і прадстаўляюцца суду бакамі і іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе.

2. Бакі і іншыя асобы – удзельнікі ў справе, могуць заяўляць хадайніцтвы аб забеспячэнні доказаў, збіранні іх з дапамогай судовых даручэнняў, аб здзяйсненні іншых працэсуальных дзеянняў, накіраваных на збор доказаў, калі прадстаўленне такіх доказаў самастойна бакамі і іншымі асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, немагчыма. Па выніках разгляду хадайніцтва суд выносіць матываванае вызначэнне.

**Артыкул 235. Забеспячэнне доказаў**

1. Асобы, якія маюць падставы непакоіцца, што прадстаўленне неабходных для іх доказаў стане ў далейшым немагчымым або складаным, могуць хадайнічаць перад судом аб забеспячэнні гэтых доказаў як да, так і пасля ўзбуджэння вядзення справы ў судзе. Забеспячэнне пісьмовых і электронных доказаў як да, так і пасля ўзбуджэння вядзення справы ў судзе можа праводзіцца натарыусамі ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

2. Заява аб забеспячэнні доказаў падаецца ў суд, у якім разглядаецца справа ці па месцы дзейнасці якога павінны быць здзейснены працэсуальныя дзеянні па забеспячэнні доказаў.

3. У заяве аб забеспячэнні доказаў павінны быць указаны доказы, што патрэбна забяспечыць, абставіны справы, для пацвярджэння ці абвяржэння якіх патрэбна такое забеспячэнне, прычыны, што прымусілі заяўніка падаць заяву аб забеспячэнні доказаў.

4. Склад міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда ці бок з яго згоды таксама могуць звяртацца ў суд па месцы арбітражнага разбору або па месцы знаходжання маёмасці, у дачыненні да якой могуць быць прыняты меры па забеспячэнні доказаў, з заявай аб забеспячэнні доказаў.

5. З мэтай забеспячэння доказаў суд здзяйсняе працэсуальныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, накіраваныя на замацаванне і захаванне гэтых доказаў (выпатрабаванне доказаў ад іншых асоб і арганізацый, агляд рэчавых доказаў, накіраванне судовага даручэння і да т.п.).

6. Суд разглядае заяву аб забеспячэнні доказаў без выкліку бакоў. У неабходных выпадках заяўнік і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, могуць быць апавешчаны аб часе і месцы разгляду заявы, аднак іх няяўка не з’яўляецца перашкодай для разгляду заявы аб забеспячэнні доказаў і здзяйснення неабходных працэсуальных дзеянняў.

7. Па выніках разгляду заявы аб забеспячэнні доказаў суд выносіць вызначэнне аб забеспячэнні доказаў ці аб адмове ў задавальненні гэтай заявы.

8. Вызначэнне суда па пытанні забеспячэння доказаў можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку. Падача прыватнай скаргі ці прыватнага пратэсту на вызначэнне суда аб забеспячэнні доказаў не прыпыняе яго выканання.

### Артыкул 236. Судовыя даручэнні

1. Суд, які разглядае справу, у выпадку немагчымасці атрымання доказаў, што знаходзяцца на тэрыторыі іншай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Рэспублікі Беларусь, даручае адпаведнаму суду здзйсніць пэўныя працэсуальныя дзеянні.

2. У вызначэнні аб судовым даручэнні коратка выкладаецца сутнасць разгляданай справы, указваюцца факты, падлеглыя высвятленню, доказы, якія павінен сабраць суд, што выконвае даручэнне. Гэта вызначэнне абавязковае для суда, якому яно адрасавана, і павінна быць выканана ў тэрмін да дваццаці дзён пасля яго атрымання.

3. Выкананне судовага даручэння праводзіцца ў судовым пасяджэнні. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца аб часе і месцы правядзення пасяджэння, аднак іх няяўка не з’яўляецца перашкодай для выканання даручэння.

4. Пратаколы і ўсе сабраныя пры выкананні судовага даручэння матэрыялы неадкладна перасылаюцца ў суд, які разглядае справу.

### Артыкул 237. Праверка і ацэнка доказаў

1. У аснову рашэння па справе могуць быць пакладзены толькі доказы, усебакова і аб’ектыўна правераныя. Звесткі, атрыманыя з парушэннем парадку, устаноўленага гэтым Кодэксам, не могуць служыць доказам па справе.

2. Суд ацэньвае доказы па сваім унутраным перакананні, заснаваным на ўсебаковым, поўным, аб’ектыўным і непасрэдным даследаванні доказаў, якія ёсць у справе.

3. Ні адзін з доказаў не мае для суда загадзя ўстаноўленай сілы.

4. Кожны доказ ацэньваецца з пункту гледжання адноснысці, дапушчальнасці, пэўнасці, а ўсе доказы ў сукупнасці – таксама з пункту гледжання дастатковасці для вырашэння справы.

5. Матывы, па якіх адны доказы пакладзены судом у абгрунтаванне сваіх вывадаў, а іншыя адхілены, указваюцца ў судовай пастанове.

# АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

# РАЗДЗЕЛ VI
# ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

## ПАДРАЗДЗЕЛ 1
## ІСКАВАЕ ВЯДЗЕННЕ

## ГЛАВА 24
## УЗБУДЖЭННЕ ВЯДЗЕННЯ СПРАВЫ

### Артыкул 238. Форма і змест іскавай заявы

1. Іскавая заява падаецца ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента.

2. Змест іскавай заявы павінен адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 100 гэтага Кодэкса. У іскавай заяве таксама павінны быць указаны:

1) цана іску, калі іск падлягае ацэнцы;

2) абставіны, на якіх заснаваны іскавыя патрабаванні;

3) доказы, што пацвярджаюць падставы іскавых патрабаванняў;

4) разлік грашовай сумы, што спаганяецца або аспрэчваецца;

5) патрабаванні істца, а пры прад'яўленні іску да некалькіх адказчыкаў – патрабаванні да кожнага з іх;

6) банкаўскія рэквізіты, калі істцом або адказчыкам з'яўляецца юрыдычная асоба;

7) спасылка на акты заканадаўства, якімі абгрунтоўваюцца прад'яўленыя патрабаванні;

8) звесткі аб захаванні абавязковага дасудовага парадку ўрэгулявання спрэчкі, калі такі парадак устаноўлены заканадаўчымі актамі або дагаворам.

3. У выпадку падачы адначасова з іскавай заявай узгодненага бакамі хадайніцтва аб назначэнні прымірэнца для правядзення прымірэнчай працэдуры, прадугледжанай артыкулам 171 гэтага Кодэкса, у іскавай заяве могуць не ўказвацца доказы, што пацвярджаюць падставы іскавых патрабаванняў.

4. У іскавай заяве могуць змяшчацца хадайніцтвы аб забеспячэнні іску, аб здзяйсненні судом дзеянняў, неабходных для падрыхтоўкі справы да судовага разбору, аб разглядзе справы ў адсутнасць істца, аб назначэнні прымірэнца; звесткі аб прадпрынятых бокам (бакамі) дзеяннях, накіраваных на прымірэнне, калі такія дзеянні прадпрымаліся, і іншыя звесткі і хадайніцтвы, неабходныя для правільнага вырашэння спрэчкі.

5. У іскавай заяве пракурора ці асоб, указаных у артыкулах 75 і 76 гэтага Кодэкса, якія звярнуліся ў суд у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, з мэтай абароны дзяржаўных і (або) грамадскіх інтарэсаў ці правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб, павінна быць указана, у чым заключаецца дзяржаўны і (або) грамадскі інтарэс, якія правы, свабоды і законныя інтарэсы іншых асоб парушаны, а таксама павінна быць прыведзена спасылка на акты заканадаўства, на якіх заснаваны патрабаванні.

6. Іскавая заява павінна быць падпісана істцом або яго прадстаўніком (пры наяўнасці ў яго паўнамоцтваў на падпісанне заявы і прад'яўленне яе ў суд). Пры падачы іскавай заявы ў выглядзе электроннага дакумента яна падпісваецца электронным лічбавым подпісам істца або яго прадстаўніка.

### Артыкул 239. Дакументы, што дадаюцца да іскавай заявы

1. Да іскавай заявы дадаюцца копіі іскавай заявы ў колькасці экземпляраў па ліку адказчыкаў і трэціх асоб, а таксама:

1) дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны ва ўстаноўленых парадку і памеры, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы;

2) дакументы, што пацвярджаюць захаванне абавязковага дасудовага парадку ўрэгулявання спрэчкі з адказчыкам, калі такі парадак устаноўлены заканадаўчымі актамі або дагаворам;

3) дакументы, што пацвярджаюць дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці юрыдычнай асобы або індывідуальнага прадпрымальніка, а для істцоў, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, – дакументы, што пацвярджаюць іх юрыдычны статус, калі іск прад’яўлены юрыдычнай асобай або індывідуальным прадпрымальнікам;

4) даверанасць або іншы дакумент, што пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка, які падпісаў іскавую заяву, на яе падпісанне і прад’яўленне ў суд;

5) копія рашэння раённага выканаўчага камітэта аб ажыццяўленні грамадзянінам дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму для істцоў, якія ажыццяўляюць дзейнасць па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму;

6) дакументы або звесткі, што пацвярджаюць паведамленне падатковаму органу ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам аб прымяненні асобых рэжымаў падаткаабкладання для істцоў, якія ажыццяўляюць рамесную дзейнасць ці самастойную прафесійную дзейнасць.

2. Да іскавай заявы аб прымусе заключыць, змяніць дагавор дадаецца праект дагавора.

3. Да іскавай заявы, што падаецца ў выглядзе электроннага дакумента, дадаюцца копіі дакументаў, указаных у пунктах 2–4 часткі 1 і частцы 2 гэтага артыкула.

**Артыкул 240. Узбуджэнне вядзення справы**

1. Іскавую заяву разглядае суддзя на працягу пяці дзён пасля паступлення яе ў суд.

2. Пры адсутнасці падстаў для адмовы ва ўзбуджэнні вядзення справы, пакідання іскавай заявы без руху або яе вяртання суддзя ва ўказаны ў частцы 1 гэтага артыкула тэрмін, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі, выносіць вызначэнне аб узбуджэнні вядзення справы і падрыхтоўцы справы да судовага разбору. Вызначэнне аб падрыхтоўцы справы да судовага разбору можа быць вынесена ў выглядзе асобнага дакумента.

**Артыкул 241. Адмова ва ўзбуджэнні вядзення справы**

1. Суддзя адмаўляе ва ўзбуджэнні вядзення справы, калі:

1) іскавая заява не падлягае разгляду ў судах з прычыны непадведамнасці справы;

2) іскавая заява пададзена ў абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў іншай асобы, нявызначанага кола асоб дзяржаўным органам, юрыдычнай асобай або грамадзянінам, якім гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі не прадастаўлена такое права;

3) пасля смерці грамадзяніна, а таксама ў сувязі з ліквідацыяй юрыдычнай асобы, якія з’яўляюцца адным з бакоў па справе, спрэчныя праваадносіны не дапускаюць правапераемства;

4) маецца вынесенае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах рашэнне суда або вызначэнне суда аб спыненні вядзення справы, што ўступіла ў законную сілу;

5) маюцца рашэнні замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), што прынятыя па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах і ўступілі ў законную сілу, за выключэннем выпадкаў, калі суд адмовіў у прызнанні

і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

6) маецца рашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прынятае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах, за выключэннем выпадкаў, калі маецца вызначэнне суда аб адмове ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне гэтага рашэння ці аб яго адмене, што ўступіла ў законную сілу;

7) прад'яўленае патрабаванне вырашана натарыусам ці службовай асобай дыпламатычнага прадстаўніцтва або консульскай установы Рэспублікі Беларусь, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі яго вырашэнне аднесена да іх кампетэнцыі;

8) заява пададзена ў абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб і маецца рашэнне суда, што прынятае па спрэчцы аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах у дачыненні да таго ж адказчыка і ўступіла ў законную сілу;

9) у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. На падставах, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, суддзя адмаўляе таксама ва ўзбуджэнні вядзення па справах, узніклых з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін; па справах асаблівага вядзення, іншых відаў вядзення, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам.

**Артыкул 242. Наступствы адмовы ва ўзбуджэнні вядзення справы**

1. Аб адмове ва ўзбуджэнні вядзення справы суддзя выносіць вызначэнне, дзе ўказвае падставу для такой адмовы. У вызначэнні аб адмове ва ўзбуджэнні вядзення справы ў сувязі з яе непадведамнасцю суду ўказваецца, у які орган варта звярнуцца істцу.

2. Копія вызначэння суда аб адмове ва ўзбуджэнні вядзення справы накіроўваецца істцу не пазней за наступны рабочы дзень пасля яго вынясення. Іскавая заява і даданыя да яе дакументы накіроўваюцца істцу пасля сканчэння тэрміну апеляцыйных абскарджання і (або) апратэставання вызначэння.

3. Вызначэнне суда аб адмове ва ўзбуджэнні вядзення справы можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

4. Адмова ва ўзбуджэнні вядзення справы (за выключэннем адмовы на падставе, прадугледжанай пунктам 2 часткі 1 артыкула 241 гэтага Кодэкса) пазбаўляе істца права нанава падаць у суд іскавую заяву да таго ж адказчыка, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах.

**Артыкул 243. Пакіданне іскавай заявы без руху**

1. Суддзя, устанавіўшы, што іскавая заява пададзена з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых пунктамі 1–3, 5 і 7 часткі 1 артыкула 100, пунктамі 1–5 і 8 часткі 2 артыкула 238, артыкулам 239 гэтага Кодэкса, выносіць матываванае вызначэнне аб пакіданні іскавай заявы без руху.

2. У вызначэнні суддзя ўказвае падставы для пакідання іскавай заявы без руху і ўстанаўлівае тэрмін, на працягу якога ісцец павінен ліквідаваць абставіны, што паслужылі падставай для пакідання іскавай заявы без руху.

3. Копія вызначэння суда аб пакіданні іскавай заявы без руху накіроўваецца істцу не пазней за наступны рабочы дзень пасля яго вынясення.

4. Іскавая заява, выпраўленая ў адпаведнасці з указаннямі суддзі, лічыцца пададзенай у дзень першапачатковага прадстаўлення яе ў суд. Тэрмін разгляду справы ў гэтым выпадку вылічваецца пасля ўзбуджэння вядзення справы. У адваротным выпадку іскавая заява лічыцца непададзенай і з даданымі да яе дакументамі накіроўваецца істцу.

5. Вызначэнне суда аб пакіданні іскавай заявы без руху можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 244. Вяртанне іскавай заявы**

1. Суддзя вяртае істцу іскавую заяву і дадзеныя да яе дакументы з прычыны парушэння ўстаноўленага парадку звароту ў суд, калі:

1) справа непадсудная гэтаму суду;

2) істцом не выкананы ўстаноўлены заканадаўчымі актамі або дагаворам абавязковы дасудовы парадак урэгулявання спрэчкі з адказчыкам;

3) іскавая заява пададзена недзеяздольнай асобай;

4) іскавая заява падпісана і (або) пададзена асобай, якая не мае паўнамоцтваў на яе падпісанне і (або) прад’яўленне ў суд;

5) справа па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах маецца ў вядзенні гэтага або іншага суда агульнай юрысдыкцыі, трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа;

6) заяўлена патрабаванне, што ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі павінна быць разгледжана ў справе аб неплацежаздольнасці ці банкруцтве;

7) да вынясення судом вызначэння аб узбуджэнні вядзення справы ад істца паступіла заява аб вяртанні іскавай заявы;

8) пракурор звярнуўся ў суд у выпадку, прадугледжаным часткай 3 артыкула 71 гэтага Кодэкса, пры адсутнасці пісьмовай заявы грамадзяніна;

9) дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы звярнуліся ў суд у выпадку, прадугледжаным часткай 1 артыкула 78 гэтага Кодэкса, пры адсутнасці пісьмовых просьбы або згоды асоб, у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў якіх пададзена іскавая заява;

10) не выкананы ўмовы для сумеснага разгляду сустрэчнага і першапачатковага іскаў, прадугледжаныя артыкулам 248 гэтага Кодэкса;

11) маюцца іншыя падставы, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Аб вяртанні іскавай заявы суддзя выносіць вызначэнне, дзе ўказвае, у які суд варта звярнуцца істцу, калі справа непадсудная гэтаму суду, а таксама якія абставіны перашкаджаюць узбуджэнню справы і які парадак іх ліквідавання.

3. Копія вызначэння суда аб вяртанні іскавай заявы накіроўваецца істцу не пазней за наступны рабочы дзень пасля яго вынясення. Іскавая заява і дадзеныя да яе дакументы накіроўваюцца істцу пасля сканчэння тэрміну апеляцыйных абскарджання і (або) апратэставання вызначэння.

4. Вызначэнне суда аб вяртанні іскавай заявы можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

5. Вяртанне іскавай заявы не пазбаўляе істца права пасля ліквідавання парушэнняў, што паслужылі падставай для яе вяртання, нанава падаць у суд іскавую заяву ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

**Артыкул 245. Злучэнне і раз’яднанне некалькіх патрабаванняў**

1. Ісцец мае права злучыць у адной іскавай заяве некалькі ўзаемазвязаных патрабаванняў.

2. У адной іскавай заяве могуць быць злучаны патрабаванні некалькіх асоб, якія звярнуліся ў суд, а таксама патрабаванні, накіраваныя да некалькіх адказчыкаў.

3. Злучэнне некалькіх іскавых патрабаванняў для іх сумеснага разгляду ў адным іскавым вядзенні можа быць праведзена таксама судом, калі такое злучэнне патрэбна для больш хуткага і правільнага разгляду спраў.

4. Дапускаецца злучэнне толькі такіх патрабаванняў, што адносяцца да аднаго віду вядзення.

5. Пры злучэнні іскавых патрабаванняў, для разгляду якіх устаноўлены скарочаныя і агульныя тэрміны, прымяняюцца агульныя тэрміны.

6. Пры злучэнні некалькіх іскавых патрабаванняў для іх сумеснага разгляду ў адным іскавым вядзенні тэрмін разгляду справы, устаноўлены гэтым Кодэксам, вылічваецца зыходзячы з больш позняй даты ўзбуджэння вядзення справы.

7. Суд мае права выдзеліць са злучаных іскавых патрабаванняў адно або некалькі ў асобнае вядзенне, калі прызнае неабходным падзельны разгляд іскавых патрабаванняў, а ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках абавязаны здзейсніць гэта працэсуальнае дзеянне.

8. Суд можа аб’яднаць у адно вядзенне некалькі аднародных спраў, што знаходзяцца ў вядзенні суда, у якіх удзельнічаюць адны і тыя ж асобы, для іх сумеснага разгляду.

9. Аб аб’яднанні спраў у адно вядзенне і аб выдзяленні аднаго або некалькіх злучаных патрабаванняў у асобнае вядзенне суд выносіць вызначэнне.

**Артыкул 246. Абарона супраць іску**

1. Адказчыку належыць права на абарону супраць іску.

2. Сродкамі абароны з’яўляюцца пярэчанні супраць іску, што могуць быць выкладзены ў водзыве на іскавую заяву, і сустрэчны іск.

**Артыкул 247. Водзыў на іскавую заяву**

1. Пасля атрымання копіі іскавай заявы адказчык мае права прадставіць суду водзыў на іскавую заяву ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента з даданнем дакументаў, якія пацвярджаюць пярэчанні супраць іску (калі яны ёсць), а таксама накіраванне істцу копіі водзыву.

2. У водзыве на іскавую заяву павіннны змяшчацца звесткі і рэквізіты, прадугледжаныя артыкулам 100 гэтага Кодэкса.

3. Пры наяўнасці ў адказчыка пярэчанняў супраць іску ў водзыве на іскавую заяву ўказваюцца адпаведныя довады і матывы са спасылкай на акты заканадаўства і доказы, што абгрунтоўваюць пярэчанні, а ў выпадку поўнага або частковага прызнання іскавых патрабаванняў – патрабаванні, якія прызнаюцца адказчыкам.

4. У водзыве на іскавую заяву могуць быць указаны іншыя звесткі, неабходныя для правільнага і своечасовага разгляду справы, а таксама наяўныя ў адказчыка хадайніцтва.

5. Па складаных справах, а таксама па справах, звязаных са значным аб’ёмам разлікаў, суд можа абавязаць адказчыка прадставіць водзыў на іскавую заяву ў тэрмін, устаноўлены судом.

**Артыкул 248. Прад’яўленне сустрэчнага іску**

1. Адказчык мае права да заканчэння судовага даследавання доказаў прад’явіць да істца сустрэчны іск для разгляду яго сумесна з першапачатковым іскам. Прад’яўленне сустрэчнага іску праводзіцца па агульных правілах прад’яўлення іскаў з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым артыкулам.

2. Сумесны разгляд сустрэчнага іску з першапачатковым з’яўляецца абавязковым, калі:

1) сустрэчны іск накіраваны ў залік першапачатковага іску;

2) задавальненне сустрэчнага іску выключае поўнасцю або ў частцы задавальненне першапачатковага іску;

3) паміж сустрэчным і першапачатковым іскамі маецца ўзаемная сувязь і іх сумесны разгляд прывядзе да больш хуткага і правільнага разгляду спрэчак.

3. У выпадку прад’яўлення сустрэчнага іску па справе, якая разглядаецца па правілах спрошчанага іскавага вядзення, суд пераходзіць да разгляду справы па агульных правілах іскавага вядзення, аб чым выносіць вызначэнне.

## ГЛАВА 25
## ПАДРЫХТОЎКА СПРАВЫ ДА СУДОВАГА РАЗБОРУ

**Артыкул 249. Задачы падрыхтоўкі справы да судовага разбору**

1. Задачамі падрыхтоўкі справы да судовага разбору з’яўляюцца:

1) удакладненне прадмету даказвання;

2) прававая кваліфікацыя адносін бакоў і вызначэнне нормаў права, падлеглых прымяненню пры вырашэнні справы;

3) вызначэнне складу асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншых удзельнікаў працэсу;

4) вызначэнне кола неабходных доказаў і аказанне садзейнічання асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, у прадстаўленні неабходных доказаў;

5) прыняцце мер да прымірэння бакоў;

6) здзяйсненне распарадчых дзеянняў, неабходных для правільнага разгляду і вырашэння справы.

2. Для рэалізацыі названых задач суддзя здзяйсняе дзеянні, указаныя ў артыкуле 251 гэтага Кодэкса, а таксама іншыя неабходныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

**Артыкул 250. Дзеянні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору**

1. Пры падрыхтоўцы справы да судовага разборуісцец, трэцяя асоба на баку істца або іх прадстаўнікі:

1) прадстаўляюць суду доказы ў пацвярджэнне сваіх патрабаванняў;

2) маюць права ўручыць або накіраваць адказчыку копіі пісьмовых доказаў, што пацвярджаюць падставы іскавых патрабаванняў;

3) заяўляюць хадайніцтвы аб выпатрабаванні доказаў, якія яны не могуць атрымаць самастойна без садзейнічання суда.

2. Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору адказчык, трэцяя асоба на баку адказчыка або іх прадстаўнікі:

1) удакладняюць прад’яўленыя да іх іскавыя патрабаванні і падставы гэтых патрабаванняў;

2) прадстаўляюць суду водзыў на іскавую заяву ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента, калі суд абавязаў прадставіць такі водзыў, і доказы, што пацвярджаюць падставы пярэчанняў супраць іску;

3) уручаюць або накіроўваюць істцу, трэцяй асобе на баку істца або іх прадстаўнікам копіі водзыву на іскавую заяву, прадстаўленне якога суд палічыў абавязковым, і доказаў, што абгрунтоўваюць пярэчанні супраць іску;

4) заяўляюць хадайніцтвы аб выпатрабаванні доказаў, якія яны не могуць атрымаць самастойна без садзейнічання суда.

**Артыкул 251. Дзеянні суддзі пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору**

1. Пасля ўзбуджэння вядзення справы, а таксама перад разглядам справы пасля адмены раней вынесенай судовай пастановы суд першай інстанцыі праводзіць падрыхтоўку справы да судовага разбору ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, аб чым указвае ў вызначэнні аб узбуджэнні вядзення справы або выносіць асобнае вызначэнне.

2. Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору з мэтай забеспячэння своечасовага і правільнага вырашэння справы суддзя здзяйсняе наступныя дзеянні:

1) пры неабходнасці выклікае бакі і (або) іх прадстаўнікоў і апытвае іх з мэтай высвятлення абставін, датычных да сутнасці заяўленых патрабаванняў і пярэчанняў супраць іску, прапануе раскрыць доказы, якія іх пацвярджаюць, і прадставіць дадатковыя

доказы, калі гэта неабходна, растлумачвае бакам наступствы здзяйснення або нездзяйснення працэсуальных дзеянняў ва ўстаноўлены тэрмін;

2) растлумачвае бакам іх працэсуальныя правы і абавязкі, у тым ліку права на добраахвотнае ўрэгуляванне спрэчкі праз правядзенне перагавораў бакоў па выпрацоўцы ўмоў мiравога пагаднення, перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, прымірэнчай працэдуры, медыяцыі, растлумачвае ўмовы і парадак рэалізацыі гэтага права, а таксама растлумачвае бакам іх права звярнуцца за вырашэннем спрэчкі ў трацейскі суд, міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, іншы пастаянны арбітражны орган і наступствы такіх дзеянняў;

3) вырашае пытанне аб складзе асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, у тым ліку аб уступленні ў справу трэціх асоб;

4) па складаных справах абавязвае асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, прадставіць пісьмовыя тлумачэнні па справе;

5) вырашае пытанне аб выкліку сведкаў у судовае пасяджэнне або пастанаўляе дапытаць іх на месцы прысутнасці. Пры вырашэнні пытання аб выкліку ў судовае пасяджэнне непаўналетняга сведкі таксама рашае пытанне аб выкліку ў судовае пасяджэнне педагагічнага работніка з вышэйшай адукацыяй, бацькоў або іншых законных прадстаўнікоў гэтага непаўналетняга;

6) у выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, выпатрабуе пісьмовыя, электронныя і рэчавыя доказы, пры неабходнасці праводзіць агляд доказаў на месцы, прымае іншыя меры да іх замацавання;

7) накіроўвае іншым судам судовыя даручэнні;

8) вырашае пытанне аб правядзенні экспертызы, а таксама аб выкліку спецыяліста, перакладчыка;

9) растлумачвае бакам устаноўленыя гэтым Кодэксам прававыя наступствы ўхілення ад дачы тлумачэнняў, дачы заведама лжывых тлумачэнняў, скрывання, а таксама ад вельмі позняга прадстаўлення доказаў або іншых нядобрасумленных дзеянняў;

10) вырашае пытанне аб неабходнасці правядзення папярэдняга судовага пасяджэння, яго часу і месцы праз вынясенне вызначэння;

11) накіроўвае або ўручае адказчыку копію іскавай заявы, у неабходных выпадках – і копіі дададзеных да іскавай заявы дакументаў, а таксама прапануе прадставіць ва ўстаноўлены ім тэрмін доказы ў абгрунтаванне сваіх пярэчанняў;

12) вырашае пытанне аб назначэнні прымірэнца для правядзення прымірэнчай працэдуры;

13) вырашае пытанне аб прымяненні сістэм відэаканферэнцсувязі і іншых тэхнічных сродкаў;

14) апавяшчае аб часе і месцы судовага разбору асоб, якія ўдзельнічаюць у справе;

15) вырашае пытанне аб пераходзе да разгляду справы ў парадку спрошчанага вядзення;

16) прымае меры па забеспячэнні іску;

17) вырашае пытанне аб правядзенні выязнога судовага пасяджэння;

18) паведамляе адказчыку аб прад'яўленні да яго іску без накіравання копій іскавай заявы і дададзеных да яе дакументаў, калі ва ўказаных заяве і дакументах маюцца звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі. Азнаямленне з такімі іскавай заявай і дададзенымі да яе дакументамі, выпіскі з іх ажыццяўляюцца з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах;

19) здзяйсняе іншыя неабходныя працэсуальныя дзеянні.

**Артыкул 252. Папярэдняе судовае пасяджэнне**

1. Папярэдняе судовае пасяджэнне праводзіцца з мэтай удакладнення абставін, што маюць значэнне для правільнага разгляду і вырашэння справы, вызначэння дастатковасці доказаў па справе, працэсуальнага замацавання распарадчых дзеянняў суда, бакоў і іншых

асоб – удзельнікаў у справе, здзейсненых пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору, даследавання фактаў пропуску тэрмінаў іскавай даўнасці і тэрмінаў звароту ў суд, высвятлення магчымасці ўрэгулявання спрэчкі да судовага разбору, у тым ліку праз прымірэнне бакоў.

2. Папярэдняе судовае пасяджэнне праводзіцца суддзёй па правілах судовага разбору з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым артыкулам.

3. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца аб часе і месцы папярэдняга судовага пасяджэння. Няяўка ў папярэдняе судовае пасяджэнне апавешчаных належным чынам асоб – удзельнікаў у справе або іх прадстаўнікоў не перашкаджае яго правядзенню.

4. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, у папярэднім судовым пасяджэнні маюць правы і нясуць абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 57 і 58 гэтага Кодэкса.

5. Пры наяўнасці абставін, прадугледжаных артыкуламі 128, 130 і 132 гэтага Кодэкса, іскавая заява ў папярэднім судовым пасяджэнні пакідаецца без разгляду або вядзенне справы спыняецца або прыпыняецца. Вядзенне справы ў папярэднім судовым пасяджэнні можа быць прыпынена пры наяўнасці абставін, прадугледжаных артыкулам 133 гэтага Кодэкса.

6. У папярэднім судовым пасяджэнні могуць разглядацца заявы бакоў аб прымяненні тэрміну звароту ў суд ці тэрміну іскавай даўнасці ў дачыненні да патрабаванняў істца аб абароне парушанага права.

7. Пры ўстанаўленні факту пропуску без уважлівых прычын тэрміну звароту ў суд або тэрміну іскавай даўнасці суд прымае рашэнне аб адмове ў іску без даследавання іншых фактычных абставін па справе.

8. Пры падрыхтаванасці справы да судовага разбору суд мае права завяршыць папярэдняе судовае пасяджэнне і са згоды бакоў перайсці да разгляду справы па сутнасці, калі ў папярэднім судовым пасяджэнні прысутнічаюць асобы – удзельнікі ў справе або асобы – удзельнікі ў справе адсутнічаюць у папярэднім судовым пасяджэнні, але яны апавешчаны аб часе і месцы яго правядзення і просяць разгледзець справу па сутнасці ў іх адсутнасць.

9. Ход папярэдняга судовага пасяджэння фіксуецца па правілах, устаноўленых артыкулам 104 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 253. Назначэнне справы да судовага разбору**

Суд, прызнаўшы справу падрыхтаванай, выносіць вызначэнне аб назначэнні яе да судовага разбору, апавяшчае асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, аб часе і месцы разгляду справы.

## ГЛАВА 26
## СУДОВЫ РАЗБОР

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 254. Мэта судовага разбору**

1. Судовы разбор па справе праводзіцца з мэтай забеспячэння вынясення законнай і абгрунтаванай судовай пастановы.

2. Для дасягнення мэты падчас судовага разбору неабходна канчаткова:

1) вызначыць склад і пазіцыі асоб, якія ўдзельнічаюць у справе;

2) устанавіць прадмет доказвання, а таксама атрымаць, даследаваць і правільна ацаніць усе неабходныя доказы;

3) правільна выбраць і прымяніць адпаведную норму права.

### Артыкул 255. Прынцыпы судовага разбору

1. Кожная справа павінна быць разгледжана непрадузятым судом у адным і тым жа складзе пры строгім захаванні прынцыпаў непасрэднасці, вуснасці і неперарыўнасці судовага разбору. У выпадку замены суддзі ў працэсе разгляду справы разбор павінен быць праведзены з самага пачатку.

2. Суд пры разглядзе справы непасрэдна заслухвае тлумачэнні бакоў і трэціх асоб, паказанні сведкаў, заключэнні і тлумачэнні экспертаў, кансультацыі і тлумачэнні спецыялістаў, заключэнні дзяржаўных органаў, іншых упаўнаважаных арганізацый, аглядае рэчавыя доказы, абвяшчае пісьмовыя доказы, праслухвае гуказапісы і праглядае відэазапісы, даследуе іншыя доказы.

3. Суд забяспечвае роўныя магчымасці асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, для непасрэднага ўдзелу ў даследаванні доказаў.

4. Судовае пасяджэнне па справе адбываецца неперарыўна, за выключэннем перапынкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

### Артыкул 256. Судовае пасяджэнне

1. Разбор грамадзянскай справы судом адбываецца ў адкрытым судовым пасяджэнні.

2. Час і месца правядзення судовага пасяджэння прызначае суддзя ў межах тэрміну на разгляд справы. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца аб часе і месцы правядзення судовага пасяджэння.

3. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права хадайнічаць аб разглядзе справы ў іх адсутнасць.

4. Справы аб скасаванні шлюбу з асобамі, прызнанымі ва ўстаноўленым парадку без вестак адсутнымі, недзеяздольнымі, разглядаюцца без выкліку адказчыка ў суд.

5. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, разбор справы або яе часткі можа быць праведзены ў закрытым судовым пасяджэнні.

6. З мэтай абароны звестак, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі або іншай ахаванай законам таямніцай, змешчаных у матэрыялах справы, суд папярэджвае асоб, якія ўдзельнічаюць у закрытым судовым пасяджэнні, аб адказнасці за абнародаванне такіх звестак, аб чым у іх бярэцца падпіска.

7. У выпадку неабходнасці выкарыстання падчас судовага пасяджэння сродкаў гука- або відэазапісу, сістэм відэаканферэнцсувязі і іншых тэхнічных сродкаў суд папярэджвае аб гэтым асоб, якія ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні.

8. Справа разглядаецца ў памяшканні суда. Правядзенне судовага пасяджэння або яго часткі па-за будынкам адпаведнага суда дапускаецца ў выпадках, калі гэта неабходна для павышэння выхаваўчага ўздзеяння судовага разбору, істотнага зніжэння судовых выдаткаў, дасягнення іншай працэсуальнай эканоміі, а таксама калі здзяйсненне працэсуальнага дзеяння звязана з пэўным месцам.

### Артыкул 257. Асоба, якая старшынюе ў судовым пасяджэнні

1. Суддзя, які разглядае справу аднаасобна, выконвае абавязкі асобы, якая старшынюе.

2. Асоба, якая старшынюе, забяспечвае рэалізацыю мэт судовага разбору, каардынуе дзейнасць усіх удзельнікаў грамадзянскага судаводства, стварае ўмовы для ўсебаковага і поўнага даследавання доказаў і абставінаў справы, выдаляе з судовага разбору ўсё, што не мае адносін да разгляданай справы. Асоба, якая старшынюе, прымае неабходныя меры па забеспячэнні належнага парадку ў судовым пасяджэнні.

3. У выпадку пярэчанняў удзельнікаў грамадзянскага судаводства адносна да дзеянняў старшыні гэтыя пярэчанні фіксуюцца ў сціслым пратаколе, пратаколе судовага пасяджэння.

**Артыкул 258. Парадак у судовым пасяджэнні**

1. Пры ўваходзе суда ў залу судовага пасяджэння і пры выхадзе яго ў дарадчы пакой асобы, прысутныя ў зале, устаюць. Абвяшчэнне судовай пастановы ўсе прысутныя ў зале судовага пасяджэння выслухваюць стоячы.

2. Удзельнікі грамадзянскага судаводства звяртаюцца да суда са словамі «Высокі суд», даюць тлумачэнні, паказанні і робяць заявы стоячы. Адступленне ад апошняга правіла дапускаецца толькі з дазволу асобы, якая старшынюе.

3. Удзельнікі грамадзянскага судаводства, а таксама ўсе прысутныя ў зале судовага пасяджэння грамадзяне абавязаны захоўваць у судовым пасяджэнні ўстаноўлены парадак і беспярэчна падпарадкоўвацца адпаведным распараджэнням асобы, якая старшынюе.

4. Грамадзяне ва ўзросце да шаснаццаці гадоў у залу судовага пасяджэння не дапускаюцца, за выключэннем выпадкаў, калі яны асабіста звярнуліся ў суд з заявай аб абароне правоў, свабод і законных інтарэсаў або выкліканы судом ці калі іх прысутнасць суд прызнае неабходнай.

5. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, і іншыя асобы, якія прысутнічаюць у адкрытым судовым пасяджэнні, маюць права фіксаваць у пісьмовай форме, а таксама з дапамогай сродкаў гуказапісу ход судовага разбору. Кіна- і фотаздымка, відэазапіс, а таксама трансляцыя ходу судовага пасяджэння ў рэжыме рэальнага часу пры дапамозе глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт або іншых сродкаў сувязі дапускаюцца з дазволу суда і з улікам меркавання асоб – удзельнікаў у справе. Гэтыя дзеянні павінны ажыццяўляцца на ўказаных судом месцах у зале судовага пасяджэння, не павінны перашкаджаць нармальнаму ходу судовага пасяджэння і могуць быць абмежаваны судом па часе. Звесткі аб фіксаванні ходу судовага пасяджэння (кіна- і фотаздымка, відэазапіс, трансляцыя судовага пасяджэння) падлягаюць занясенню ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння.

**Артыкул 259. Меры, якія прымяняюцца да парушальнікаў парадку ў судовым пасяджэнні**

1. Асоба, якая старшынюе, ад імя суда робіць папярэджанне асобе, якая парушае парадак падчас судовага пасяджэння.

2. Пры паўторным парушэнні парадку ў судовым пасяджэнні ўдзельнікі грамадзянскага судаводства могуць быць выдалены з залы судовага пасяджэння па вызначэнні суда, а грамадзяне, прысутныя пры разборы справы, – па распараджэнні асобы, якая старшынюе.

3. Пры парушэнні парадку ў судовым пасяджэнні асобамі, якія ўдзельнічаюць у справе, суд можа таксама адкласці судовы разбор.

4. У выпадку выдалення з залы судовага пасяджэння асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не на ўвесь час судовага разбору асоба, якая старшынюе, знаёміць асобу, нанава дапушчаную ў залу судовага пасяджэння, з працэсуальнымі дзеяннямі, здзейсненымі ў яе адсутнасць.

5. Пры парушэнні парадку ў судовым пасяджэнні пракурорам або адвакатам суд таксама мае права адкласці судовы разбор і паведаміць аб гэтым адпаведна пракурору больш высокага ўзроўню, тэрытарыяльнай (Беларускай рэспубліканскай) калегіі адвакатаў.

6. Праяўленне непавагі да суда ўдзельнікамі грамадзянскага судаводства (акрамя пракурора і адваката) і грамадзянамі, прысутнымі ў судовым пасяджэнні, што выявілася ў непадпарадкаванні распараджэнню асобы, якая старшынюе, або ў парушэнні парадку падчас судовага пасяджэння, а таксама ўчыненне любой асобай іншых дзеянняў, якія сведчаць аб яўнай непавазе да суда, выклікаюць прымяненне мер, прадугледжаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**Артыкул 260. Межы судовага разбору**

Суд разглядае справу толькі ў межах заяўленага іскавага патрабавання. У адпаведных выпадках суд растлумачвае істцу яго права заявіць дадатковыя патрабаванні. Аднак праводзіць па ўласнай ініцыятыве судовы разбор у дачыненні да незаяўленага патрабавання суд можа толькі ў выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

## § 2. Падрыхтоўчая частка судовага разбору

**Артыкул 261. Адкрыццё судовага пасяджэння**

У прызначаны для разгляду справы час асоба, якая старшынюе, адкрывае судовае пасяджэнне і абвяшчае, якая справа падлягае разгляду.

**Артыкул 262. Праверка яўкі і ўстанаўленне асобы ўдзельнікаў грамадзянскага судаводства**

1. Сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі дакладвае суду, хто з выкліканых па канкрэтнай справе асоб прыбыў, ці апавешчаны тыя, хто не з'явіліся, і якія маюцца звесткі аб прычынах іх няяўкі.

2. Асоба, якая старшынюе, устанаўлівае асобы тых, хто з'явіўся ў судовае пасяджэнне, правярае дакументы, што сведчаць іх асобу, паўнамоцтвы кіраўнікоў юрыдычных асоб і іх прадстаўнікоў.

**Артыкул 263. Праверка своечасовасці атрымання адказчыкам копіі іскавай заявы**

1. Пасля ўстанаўлення асобы адказчыка асоба, якая старшынюе, высвятляе, ці атрымана ім і калі канкрэтна копія іскавай заявы, а ў адпаведных выпадках – і копіі дакументаў, дадазеных да гэтай заявы.

2. У выпадку калі адказчыкам копіі дакументаў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, не былі атрыманы ці былі атрыманы ў тэрмін, недастатковы для падрыхтоўкі яго да судовага разбору, судовы разбор адкладаецца. Разгляд справы ў гэтым пасяджэнні можа быць працягнуты толькі са згоды адказчыка.

**Артыкул 264. Растлумачэнне перакладчыку яго абавязкаў**

1. Асоба, якая старшынюе, растлумачвае перакладчыку яго абавязак перакладаць тлумачэнні, паказанні, заявы асоб, якія не валодаюць мовай, на якой вядзецца судаводства, а гэтым асобам – змест тлумачэнняў, паказанняў, заяў асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і сведкаў, змест наяўных у справе і абвяшчаных дакументаў, гуказапісаў, заключэнняў эксперта, кансультацый спецыяліста, а таксама распараджэнняў асобы, якая старшынюе, судовых пастаноў.

2. Перакладчык папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за заведама няправільны пераклад, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў. Падпіска перакладчыка аб гэтым далучаецца да матэрыялаў справы.

**Артыкул 265. Выдаленне сведкаў з залы судовага пасяджэння**

1. Прысутныя ў судзе сведкі выходзяць з залы судовага пасяджэння пасля ўстанаўлення іх асобы.

2. Асоба, якая старшынюе, прымае меры да таго, каб дапытаныя сведкі не мелі зносін з недапытанымі сведкамі.

**Артыкул 266. Абвяшчэнне складу суда, удзельнікаў грамадзянскага судаводства і растлумачэнне права адводу**

1. Асоба, якая старшынюе, абвяшчае склад суда, паведамляе, хто ўдзельнічае ў судовым пасяджэнні ў якасці пракурора, эксперта, спецыяліста, перакладчыка, сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі, і растлумачвае асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, іх права заяўляць адводы.

2. Заяўленыя адводы вырашаюцца па правілах, устаноўленых артыкулам 37 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 267. Растлумачэнне асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, экспертам і спецыялістам іх працэсуальных правоў і абавязкаў**

1. Асоба, якая старшынюе, растлумачвае бакам іх права заключыць міравое пагадненне, пагадненне аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, пагадненне аб прымірэнні, медыятыўнае пагадненне або звярнуцца за вырашэннем спрэчкі ў трацейскі суд, міжнародны (арбітражны) трацейскі суд, іншы пастаянны арбітражны орган і наступствы такіх дзеянняў. Затым асоба, якая старшынюе, растлумачвае ўдзельнікам у справе іх працэсуальныя правы і абавязкі, а таксама высвятляе, ці маюцца ў іх хадайніцтвы. Асоба, якая заявіла хадайніцтва, абавязана ўказаць, для ўстанаўлення якіх канкрэтна фактаў неабходныя дадатковыя доказы ці для вырашэння якіх пытанняў заяўлена хадайніцтва.

2. Эксперту і спецыялісту растлумачваюцца правы і абавязкі ў працэсе. Эксперт папярэджваецца аб крымінальнай адказнасці за дачу заведама лжывага заключэння эксперта, а таксама за адмову або ўхіленне без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на яго абавязкаў.

**Артыкул 268. Вырашэнне судом хадайніцтваў асоб, якія ўдзельнічаюць у справе**

Суд выслухвае па заяўленых хадайніцтвах меркаванні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, і выносіць адпаведнае вызначэнне.

**Артыкул 269. Наступствы няяўкі ў судовае пасяджэнне асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, іх прадстаўнікоў, сведкаў, экспертаў, спецыялістаў, перакладчыкаў**

1. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, абавязаны паведаміць суду аб прычынах няяўкі і прадставіць доказы ўважлівасці гэтых прычын.

2. У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне каго-небудзь з асоб – удзельнікаў у справе, у дачыненні да якіх адсутнічаюць звесткі аб іх апавяшчэнні, судовы разбор адкладаецца.

3. Калі асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, належным чынам апавешчаны аб часе і месцы судовага пасяджэння, суд адкладае судовы разбор у выпадку прызнання прычын іх няяўкі ўважлівымі.

4. Суд мае права разгледзець справу ў выпадку няяўкі каго-небудзь з асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, належным чынам апавешчаных аб часе і месцы судовага пасяджэння, калі імі не прадстаўлены звесткі аб прычынах няяўкі або калі суд прызнае прычыны няяўкі няўважлівымі.

5. Бакі маюць права прасіць суд аб разглядзе справы ў іх адсутнасць.

6. Суд мае права разгледзець справу ў адсутнасць адказчыка (адказчыкаў) у парадку завочнага вядзення па правілах, устаноўленых главой 29 гэтага Кодэкса.

7. Суд пакідае заяву без разгляду, калі ісцец, належным чынам апавешчаны аб часе і месцы судовага пасяджэння, не прыбыў без уважлівых прычын па выкліку суда або не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і ад яго не паступіла пісьмовая заява аб разборы справы ў яго адсутнасць, а адказчык не патрабуе разгляду справы па сутнасці, за выключэннем выпадкаў, калі іск прад'яўлены дзяржаўным органам з мэтай абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў (у тым ліку правоў, свабод і законных інтарэсаў нявызначанага кола асоб), а таксама пракурорам. Па справе аб скасаванні шлюбу іск пакідаецца без разгляду ў выпадку няяўкі без уважлівых прычын істца, належным чынам апавешчанага аб часе і месцы судовага пасяджэння, або калі ён не паведаміў суду аб наяўнасці ўважлівых прычын няяўкі і ад яго не паступіла пісьмовая заява аб разборы справы ў яго адсутнасць.

8. У выпадку няяўкі перакладчыка ў суд судовы разбор ва ўсіх выпадках адкладаецца.

9. У выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне сведкаў, экспертаў або спецыялістаў суд выслухвае меркаванні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, аб магчымасці разгляду справы ў іх адсутнасць і выносіць вызначэнне аб працягу судовага разбору ці аб адкладанні судовага разбору.

10. Аб няяўцы пракурора без уважлівых прычын суд паведамляе пракурору больш высокага ўзроўню.

**Артыкул 270. Допыт сведкаў, эксперта або спецыяліста пры адкладанні судовага разбору**

1. Пры адкладанні судовага разбору суд можа дапытаць прысутных у судзе сведкаў, эксперта або спецыяліста, калі ў судовым пасяджэнні прысутнічаюць абодва бакі.

2. Калі пасля адкладання судовага разбору справа разглядаецца тым жа складам суда, паўторны выклік дапытаных сведкаў, эксперта або спецыяліста праводзіцца толькі ў выпадку неабходнасці.

## § 3. Разгляд справы па сутнасці

**Артыкул 271. Пачатак разгляду справы па сутнасці**

Разгляд справы па сутнасці пачынаецца сціслым дакладам асобы, якая старшынюе, або каго-небудзь з суддзяў. У дакладзе называюцца ісцец і адказчык, выкладаюцца сутнасць заяўленых патрабаванняў, факты, на якіх заснаваны патрабаванні, указваюцца пярэчанні (калі яны ёсць), сутнасць патрабаванняў па заяўленым сустрэчным іску. Затым асоба, якая старшынюе, высвятляе, ці падтрымлівае ісцец свае патрабаванні, ці прызнае адказчык патрабаванні істца і ці не жадаюць бакі закончыць справу прымірэннем.

**Артыкул 272. Адмова ад іску, прызнанне іску, урэгуляванне спрэчкі праз прымірэнне**

1. Адмова істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам, умовы міравога пагаднення бакоў, пагадненне аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў або пагадненне аб прымірэнні павінны быць выказаны ў пісьмовых заявах, адрасаваных суду. Гэтыя заявы далучаюцца да справы, аб чым указваецца ў сціслым пратаколе, пратаколе судовага пасяджэння. З дазволу суда заява істца аб адмове ад іску або адказчыка аб прызнанні іску ці заява бакоў аб заключэнні міравога пагаднення і яго ўмовы могуць быць паведамлены суду вусна. У гэтым выпадку яны заносяцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння і падпісваюцца адпаведна істцом, адказчыкам ці бакамі, а таксама іх прадстаўнікамі, калі яны ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні.

2. Кіруючыся часткай 5 артыкула 62 гэтага Кодэкса, суд вырашае пытанне аб прыняцці адмовы істца ад іску, прызнанні іску адказчыкам або зацвярджэнні міравога пагаднення, пагаднення аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, пагаднення аб прымірэнні і растлумачвае бакам наступствы гэтых распарадчых дзеянняў.

3. Калі суд не палічыць магчымым прыняць адмову істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам або зацвердзіць міравое пагадненне бакоў, пагадненне аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, пагадненне аб прымірэнні, ён выносіць аб гэтым вызначэнне і працягвае разгляд справы па сутнасці.

4. Нягледзячы на прызнанне іску адказчыкам, любая асоба, якая ўдзельнічае ў справе, мае права запатрабаваць правядзенне даследавання доказаў. Даследаванне доказаў можа быць праведзена таксама па ініцыятыве суда.

5. Прыняцце судом прызнання іску адказчыкам вызваляе суд ад абавязку даследавання доказаў і з'яўляецца падставай для вынясення рашэння аб задавальненні іску.

**Артыкул 273. Тлумачэнні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе**

1. З мэтай высвятлення пазіцый бакоў і трэціх асоб суд заслухвае тлумачэнні істца і трэцяй асобы, якая ўдзельнічае на яго баку, іх прадстаўнікоў; адказчыка і трэцяй асобы, якая ўдзельнічае на яго баку, іх прадстаўнікоў, а таксама тлумачэнні іншых асоб – ўдзельнікаў у справе. Пракурор, а таксама дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія звярнуліся ад уласнага імя ў суд з заявай у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб, даюць тлумачэнні першымі.

2. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, з дазволу суда маюць права задаваць адзін аднаму пытанні. Асоба, якая старшынюе, па ўласнай ініцыятыве або па вусным хадайніцтве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, можа зняць пытанне, не датычнае да прадмету спрэчкі.

3. У выпадку няяўкі асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, іх прадстаўнікоў у судовае пасяджэнне іх пісьмовыя тлумачэнні абвяшчаюцца асобай, якая старшынюе.

4. Пры неабходнасці ўдакладнення пазіцыі боку суд можа прызнаць яго яўку абавязковай.

5. У выпадку аднаўлення прыпыненага вядзення справы або працягу судовага разбору пасля абвяшчэння перапынку суд мае права прадаставіць асобам – удзельнікам у справе магчымасць пацвердзіць у новым судовым пасяджэнні дадзеныя раней тлумачэнні без іх паўторнага заслухвання, дапоўніць іх і задаць дадатковыя пытанні, калі асобы – удзельнікі ў справе не заяўляюць аб паўторным заслухванні ўсіх іх тлумачэнняў, знаёмыя з матэрыяламі справы, у тым ліку з тлумачэннямі асоб – удзельнікаў у справе, дадзенымі раней, і склад суда не змяніўся.

**Артыкул 274. Дзеянні суда ў судовым разборы па ўрэгуляванні спрэчкі бакоў**

Суд падчас судовага разбору павінен садзейнічаць бакам у дасягненні імі згоды ў пошуках узаемапрымальнага вырашэння па ўсіх патрабаваннях, змешчаных у іскавай заяве.

**Артыкул 275. Парадак даследавання доказаў**

1. Асоба, якая старшынюе, заслухаўшы тлумачэнні бакоў і іншых асоб – ўдзельнікаў у справе, з улікам іх меркаванняў устанаўлівае парадак допыту сведкаў, экспертаў і парадак даследавання доказаў.

2. Доказы прадстаўляюцца і даследуюцца па правілах, установленых главой 22 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 276. Процідзеянне злоўжыванню правамі ў працэсе доказвання**

Асоба, якая старшынюе, адхіляе хадайніцтвы аб даследаванні доказаў, калі яны не адносяцца да справы, з'яўляюцца недапушчальнымі або калі спрэчныя факты ўжо ўстаноўлены з дапамогай іншых доказаў, а бакі настойваюць на іх даследаванні толькі з мэтай зацягвання працэсу па справе.

**Артыкул 277. Заканчэнне судовага даследавання доказаў**

Пасля даследавання ўсіх доказаў асоба, якая старшынюе, растлумачвае асобам – удзельнікам у справе, іх права заявіць хадайніцтвы аб дапаўненні матэрыялаў справы. Пры адсутнасці такіх хадайніцтваў суддзя абвяшчае даследаванне доказаў па справе закончаным і пераходзіць да заслухвання судовых спрэчак.

**§ 4. Заключная частка судовага разбору**

**Артыкул 278. Судовыя спрэчкі і судовыя рэплікі**

1. У судовых спрэчках бакі і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, падводзяць вынікі даследавання фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне, доказаў у іх пацвярджэнне, нормаў права, падлеглых прымяненню, і даюць ім сваю ацэнку. Пры гэтым яны маюць права спасылацца на факты і доказы, разгледжаныя ў судовым пасяджэнні, і ўказваць на недаследаванасць, на іх меркаванне, асобных фактаў і доказаў.

2. Спачатку ў судовых спрэчках выступаюць ісцец і яго прадстаўнік, затым – адказчык і яго прадстаўнік. Трэцяя асоба, якая заяўляе самастойныя патрабаванні на прадмет спрэчкі, і яе прадстаўнік выступаюць пасля бакоў па першапачатковым іску. Трэцяя асоба, якая не заяўляе самастойных патрабаванняў, і яе прадстаўнік выступаюць пасля істца і яго прадстаўніка або адказчыка і яго прадстаўніка, на баку якіх гэта трэцяя асоба ўдзельнічае ў справе.

3. Пракурор, дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія звярнуліся ад уласнага імя ў суд з заявай у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб, выступаюць у судовых спрэчках першымі.

4. Прадстаўнікі дзяржаўных органаў, іншых упаўнаважаных арганізацый, далучаныя судом да ўдзелу ў працэсе для дачы заключэння па справе, а таксама пракурор, які ўступіў у пачаты працэс, выступаюць у судовых спрэчках апошнімі.

5. Асоба, якая старшынюе, не можа абмежаваць працягласць судовых спрэчак пэўным часам, але абавязаны перапыняць асоб, якія ўдзельнічаюць у спрэчках, калі яны закранаюць акалічнасці, што не маюць адносін да разгляданай справы.

6. Пасля завяршэння судовых спрэчак кожная асоба, якая ўдзельнічае ў справе, і (або) яе прадстаўнік маюць права выступіць са сціслай вуснай рэплікай у дачыненні да абгрунтаванняў, выказаных у выступленнях іншых асоб – удзельнікаў у справе.

**Артыкул 279. Аднаўленне разгляду справы па сутнасці**

1. Калі суд падчас ці пасля судовых спрэчак або пасля выхаду ў дарадчы пакой для прыняцця рашэння па справе прызнае неабходным высветліць новыя факты, што маюць значэнне для справы, ці даследаваць новыя доказы, ён выносіць вызначэнне аб аднаўленні разгляду справы па сутнасці.

2. Судовае пасяджэнне пасля аднаўлення разгляду справы па сутнасці працягваецца са стадыі даследавання доказаў. Пасля заканчэння даследавання доказаў па справе судовыя спрэчкі і судовыя рэплікі праводзяцца нанава ў агульным парадку.

**Артыкул 280. Выхад суда для вынясення рашэння**

Пасля судовых спрэчак і судовых рэплік разбор справы заканчваецца і суд выходзіць у дарадчы пакой для вынясення рашэння па справе, аб чым асоба, якая старшынюе ў судовым пасяджэнні, абвяшчае прысутным у зале судовага пасяджэння.

## ГЛАВА 27
## СУДОВЫЯ ПАСТАНОВЫ СУДА ПЕРШАЙ ІНСТАНЦЫІ

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 281. Віды судовых пастаноў суда першай інстанцыі**

1. Суд першай інстанцыі падчас вядзення справы прымае судовыя пастановы ў выглядзе рашэнняў і вызначэнняў.
2. Пастанова суда першай інстанцыі, якім справа вырашаецца па сутнасці, выносіцца ў выглядзе рашэння.
3. Суд выносіць рашэнне імем Рэспублікі Беларусь.
4. Вызначэннямі з’яўляюцца судовыя пастановы суда першай інстанцыі, якімі вырашаюцца асобныя пытанні, узніклыя падчас вядзення справы, а ў прадугледжаных гэтым Кодэксам выпадках заканчваецца вядзенне справы без вынясення рашэння.
5. Вызначэнні выносяцца ад імя суда.

**Артыкул 282. Законнасць і абгрунтаванасць судовых пастаноў**

1. Судовыя пастановы павінны быць законнымі і абгрунтаванымі.
2. Суд грунтуе рашэнне і вызначэнне толькі на тых доказах, якія былі даследаваны ў судовым пасяджэнні.

### § 2. Парадак вынясення і змест рашэння суда першай інстанцыі

**Артыкул 283. Абавязак суда не выходзіць за межы іскавых патрабаванняў**

1. Пры вынясенні рашэння суд не мае права па сваёй ініцыятыве без згоды істца змяніць прадмет або падставу іску, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.
2. Суд можа ў залежнасці ад высветленых абставін справы выйсці за межы памеру заяўленых патрабаванняў, калі гэта трэба для поўнага і правільнага вырашэння спрэчкі.

**Артыкул 284. Таямніца нарады суддзяў**

1. Суд выносіць рашэнне па справе ў дарадчым пакоі. Падчас прыняцця рашэння ў дарадчым пакоі можа знаходзіцца толькі суддзя (суддзі), які разглядае справу. Прысутнасць іншых асоб не дапускаецца.
2. Па заканчэнні рабочага часу, а таксама на працягу рабочага часу дапускаецца перапынак для адпачынку з выхадам з дарадчага пакоя. Абнародаванне меркаванняў, якія агучваліся у дарадчым пакоі, не дапускаецца.

**Артыкул 285. Пытанні, якія вырашаюцца пры вынясенні рашэння**

Пры вынясенні рашэння суд павінен разгледзець наступныя пытанні:
1) якія факты ўваходзяць у прадмет даказвання па справе;
2) якія з гэтых фактаў устаноўлены з дапамогай пэўных доказаў і якія не ўстаноўлены;
3) чаму адхіляюцца тыя або іншыя доказы;

4) чые патрабаванні ці пярэчанні ў выніку аказаліся абгрунтаванымі поўнасцю або часткова;

5) якія акты заканадаўства павінны быць прыменены па гэтай справе;

6) як павінна быць вырашана справа.

**Артыкул 286. Змест рашэння**

Рашэнне па справе складаецца з уводнай, апісальнай, матывіровачнай і рэзалютыўнай частак. Матывіровачная частка рашэння складаецца ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 289 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 287. Уводная частка рашэння**

1. Ва ўводнай частцы рашэнні ўказваюцца дата і месца вынясення рашэння, найменне суда, што вынес рашэнне, склад суда, сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі, асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, і іх прадстаўнікі, прадмет спрэчкі.

2. Працэсуальнае становішча асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, указваецца па стане на момант выхаду суда ў дарадчы пакой.

**Артыкул 288. Апісальная частка рашэння**

1. У апісальнай частцы рашэння павінны змяшчацца ўказанні на тое, што патрабуюць або супраць чаго пярэчаць бакі і іншыя асобы – удзельнікі ў справе, і на якіх падставах.

2. У апісальнай частцы рашэння ўказваецца аб змяненні істцом прадмета, памеру ці падставы іску, аб прызнанні або непрызнанні іску адказчыкам.

**Артыкул 289. Матывіровачная частка (абгрунтаванне) рашэння**

1. У матывіровачнай частцы (абгрунтаванні) рашэння павінны змяшчацца адказы на пытанні, прадугледжаныя пунктамі 1–5 артыкула 285 гэтага Кодэкса.

2. Матывіровачная частка рашэння складаецца:

1) па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, у тым ліку пракурора;

2) па заяве пракурора па справах, што закранаюць дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы (у тым ліку правы, свабоды і законныя інтарэсы нявызначанага кола асоб), правы і законныя інтарэсы юрыдычных асоб дзяржаўнай формы ўласнасці або юрыдычных асоб, што маюць у статутным фондзе долю дзяржаўнай уласнасці, а таксама правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзяніна, які па стане здароўя, узросце, з прычыны недзеяздольнасці ці па іншых уважлівых прычынах не можа самастойна абараніць іх, незалежна ад удзелу пракурора ў такой справе;

3) у сувязі з абскарджаннем і (або) апратэставаннем рашэння ў апеляцыйным парадку;

4) калі гэтым Кодэксам устаноўлена, што рашэнне не падлягае апеляцыйным абскарджанню і (або) апратэставанню;

5) у выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам.

3. Заява аб складанні матывіровачнай часткі рашэння можа быць пададзена асобамі, указанымі ў пунктах 1 і 2 часткі 2 гэтага артыкула, на працягу дзесяці дзён пасля абвяшчэння рашэння. Матывіровачная частка рашэння можа быць складзена судом па ўласнай ініцыятыве.

4. Пры складанні матывіровачнай часткі рашэння не ў дарадчым пакоі яна павінна быць выкладзена ў выглядзе асобнага дакумента і змяшчаць указанне на рашэнне, у дачыненні да якога яна складзена.

5. Матывіровачная частка рашэння складаецца на працягу сямі дзён пасля паступлення ў суд заявы, указанай у частцы 3 гэтага артыкула, ці прыняцця да разгляду

апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту на рашэнне, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам.

6. Матывіровачная частка рашэння падпісваецца суддзёй, які вынес рашэнне, а ў выпадку разгляду справы калегіяльным складам суда – усімі суддзямі, якія ўдзельнічалі ў прыняцці рашэння, у тым ліку суддзёй, які мае асаблівае меркаванне.

7. Рашэнні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесеныя па першай інстанцыі, павінны быць матываванымі.

**Артыкул 290. Рэзалютыўная частка рашэння**

1. У рэзалютыўнай частцы рашэння павінны змяшчацца вывады суда па кожным заяўленым патрабаванні аб іх задавальненні ці аб адмове ў іх задавальненні поўнасцю або ў частцы, указанне на размеркаванне судовых выдаткаў (калі аб гэтым заяўлена бакамі), на пакрыццё судовых выдаткаў дзяржаве, а таксама на тэрмін і парадак абскарджання рашэння.

2. У неабходных выпадках у рэзалютыўнай частцы рашэння ўказваюцца тэрмін і парадак выканання рашэння, а таксама аб дапушчэнні неадкладнага выканання ці забеспячэння выканання рашэння, аб паварoце выканання рашэння.

3. Умоўныя і альтэрнатыўныя рашэнні не дапускаюцца.

**Артыкул 291. Рэзалютыўная частка рашэння па справах, што вынікаюць са шлюбных і сямейных адносін**

1. Рэзалютыўная частка рашэння па справе аб скасаванні шлюбу павінна адпавядаць агульным патрабаванням артыкула 290 гэтага Кодэкса, а таксама змяшчаць указанне на памер дзяржаўнай пошліны, падлеглай аплаце адным ці абодвума сужэнцамі пры выдачы копіі рашэння суда аб скасаванні шлюбу.

2. У рэзалютыўнай частцы рашэння аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў ці аб адабранні дзіцяці без пазбаўлення бацькоўскіх правоў, калі дзіця знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні, вырашаюцца пытанні спагнання выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзіцяці, якое знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні, а таксама пытанні працаўладкавання асоб, якія абавязаны кампенсаваць такія выдаткі і не працуюць або працуюць, але не ў поўным аб’ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуюць у добраахвотным парадку па іх заяве ўказаныя выдаткі.

**Артыкул 292. Рашэнне аб спагнанні грашовых сум**

Пры задавальненні іску аб спагнанні грашовых сум у рэзалютыўнай частцы рашэння суд указвае памер спаганянай грашовай сумы з падзельным вызначэннем асноўнай запазычанасці, страт, няўстойкі (штрафу, пені), працэнтаў, перыяду спагнання.

**Артыкул 293. Рашэнне аб прысуджэнні маёмасці**

Пры прысуджэнні маёмасці ў натуры суд указвае ў рэзалютыўнай частцы рашэння назву падлеглай перадачы маёмасці, яе адметныя прыкметы, месца знаходжання і кошт, падлеглы спагнанню з адказчыка, калі пры выкананні рашэння прысуджанай маёмасці не акажацца ў наяўнасці.

**Артыкул 294. Рашэнне аб прызнанні не падлеглым выкананню выканальнага або іншага дакумента**

Пры задавальненні іску па спрэчцы аб прызнанні не падлеглым выкананню выканальнага або іншага дакумента, па якім спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным

парадку, у рэзалютыўнай частцы рашэння суд указвае назву, нумар і дату выдачы дакумента, не падлеглага выкананню, і грашовую суму, не падлеглую спагнанню.

**Артыкул 295. Рашэнне аб заключэнні ці аб змяненні дагавора**

Па спрэчках, узніклых пры заключэнні ці змяненні дагавора, у рэзалютыўнай частцы рашэння ўказваецца вывад суда па кожнай спрэчнай умове дагавора.

**Артыкул 296. Рашэнне, што абавязвае адказчыка здзейсніць пэўныя дзеянні**

1. Пры вынясенні рашэння, што абавязвае адказчыка здзейсніць пэўныя дзеянні, не звязаныя са спагнаннем грашовых сродкаў або перадачай маёмасці, у рэзалютыўнай частцы рашэння суд указвае, хто, дзе і ў які тэрмін абавязаны гэтыя дзеянні здзейсніць. У рашэнні таксама можа быць указана, што калі адказчык не выканае гэта рашэнне на працягу ўстаноўленага тэрміну, то істец мае права здзейсніць гэтыя дзеянні за кошт адказчыка са спагнаннем з яго неабходных выдаткаў.

2. Калі дзеянні, указаныя ў частцы 1 гэтага артыкула, могуць быць здзейснены толькі адказчыкам, суд устанаўлівае ў рашэнні тэрмін, на працягу якога рашэнне павінна быць выканана.

3. Пры вынясенні рашэння аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, і працаўладкаванні асобы, якая абавязана кампенсаваць такія выдаткі і якая не працуе або працуе, але не ў поўным аб'ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку па яе заяве ўказаныя выдаткі, суд у рэзалютыўнай частцы рашэння абавязвае адказчыка на працягу шасці рабочых дзён пасля вынясення рашэння прыбыць у камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы яго жыхарства для працаўладкавання.

**Артыкул 297. Рашэнне на карысць некалькіх істцоў або супраць некалькіх адказчыкаў**

1. Пры вынясенні рашэння на карысць некалькіх істцоў суд указвае, у якой частцы (долі) яно адносіцца да кожнага з іх, або указвае, што права спагнання з'яўляецца салідарным.

2. Пры вынясенні рашэння супраць некалькіх адказчыкаў суд указвае, у якой частцы (долі) кожны з адказчыкаў павінен выканаць рашэнне, ці указвае, што адпаведна заканадаўству або згодна дагавору іх адказнасць з'яўляецца салідарнай.

**Артыкул 298. Выклад рашэння**

Рашэнне выкладаецца ў пісьмовай форме ў выглядзе асобнага судовага дакумента на мове судовага разбору і падпісваецца суддзёй (суддзямі), які яго вынес.

**Артыкул 299. Абвяшчэнне рашэння**

1. Непасрэдна пасля прыняцця і падпісання рашэння суд вяртаецца ў залу судовага пасяджэння і абвяшчае яго рэзалютыўную частку, а таксама выкладае вуснае абгрунтаванне рашэння. Адсутнасць у зале судовага пасяджэння каго-небудзь з асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не перашкаджае абвяшчэнню рашэння. Выклад абгрунтавання рашэння не абавязковы, калі справа разглядалася ў закрытым судовым пасяджэнні.

2. Суд высвятляе ў прысутных пры абвяшчэнні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, ці зразумелы ім змест рашэння, дае неабходныя растлумачэнні па парадку абскарджання

і (або) апратэставання рашэння, азнаямлення са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння і абвяшчае судовае пасяджэнне па бягучай справе закрытым.

**Артыкул 300. Накіраванне копій рашэння**

1. Асобам, якія ўдзельнічаюць у справе і ў іх адсутнасць разгледжана справа, суд у пяцідзённы тэрмін пасля вынясення рашэння, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены гэтым Кодэксам, накіроўвае яго копіі з выкарыстаннем сродкаў сувязі, што забяспечваюць фіксаванне іх атрымання, ці ўручае ім пад распіску.

2. У выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам, копіі рашэння суда накіроўваюцца іншым зацікаўленым асобам.

3. Па грамадзянскіх справах, у матэрыялах якіх змяшчаюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, асобам, указаным у частках 1 і 2 гэтага артыкула, накіроўваецца або ўручаецца выпіска з рашэння, што складаецца з уводнай і рэзалютыўнай частак, дзе не маецца звестак, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі. Азнаямленне з апісальнай і матывіровачнай часткамі рашэння ажыццяўляецца з захаваннем патрабаванняў заканадаўства аб дзяржаўных сакрэтах.

**§ 3. Неадкладнае выкананне і законная сіла рашэння**

**Артыкул 301. Рашэнні, падлеглыя неадкладнаму выкананню**

Неадкладнаму выкананню падлягаюць рашэнні:

1) аб прысуджэнні аліментаў;

2) аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні;

3) аб прысуджэнні перыядычных выплат на пакрыццё шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна;

4) аб выплаце работніку заработнай платы, але не больш як за адзін месяц;

5) аб аднаўленні на рабоце незаконна звольненага ці пераведзенага работніка;

6) аб прызнанні забастоўкі незаконнай;

7) аб працаўладкаванні асобы, абавязанай кампенсаваць выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, калі такая асоба не працуе ці працуе, але не ў поўным аб’ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку па яе заяве ўказаныя выдаткі;

8) аб прызнанні неправадзейнымі ненарматыўных прававых актаў, незаконнымі дзеянняў (бяздзейнасці) дзяржаўных органаў, іншых органаў (камісій), арганізацый, службовых асоб, надзеленых асобнымі дзяржаўнымі або іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, што не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзяніна, правы і законныя інтарэсы юрыдычнай асобы;

9) аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці суб’екта (арганізацыі, яе адасобленага падраздзялення, што мае ўліковы нумар плацежніка, прадстаўніцтва замежнай арганізацыі, індывідуальнага прадпрымальніка, натарыуса, асобы, якая ажыццяўляе рамесную дзейнасць, асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць у сферы аграэкатурызму, часовага (антыкрызіснага) кіраўніка, які не з’яўляецца юрыдычнай асобай або індывідуальным прадпрымальнікам), яго цэхаў, вытворчых участкаў, аб’екта будаўніцтва, абсталявання (далей – устанаўленне прыпынення (забароны) дзейнасці);

10) аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), эксплуатацыі транспартных сродкаў (далей – працяг прыпынення (забароны) вытворчасці);

11) аб прызнанні даўжніка неплацежаздольным і ўвядзенні санацыі;

12) аб прызнанні даўжніка – юрыдычнай асобы банкрутам і адкрыцці ліквідацыйнага вядзення;

13) аб прызнанні даўжніка – індывідуальнага прадпрымальніка банкрутам са спыненнем прадпрымальніцкай дзейнасці і аб адкрыцці ліквідацыйнага вядзення;

14) аб завяршэнні санацыі, прызнанні даўжніка – юрыдычнай асобы банкрутам і адкрыцці ліквідацыйнага вядзення;

15) у іншых выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам або іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 302. Права суда дапусціць неадкладнае выкананне рашэння**

Суд можа дапусціць неадкладнае выкананне рашэння поўнасцю або ў частцы, калі з прычыны асаблівых абставін замаруджванне ў выкананні рашэння можа прывесці да значнай шкоды для спагнанніка ці зрабіць немагчымым само выкананне.

**Артыкул 303. Забеспячэнне інтарэсаў адказчыка пры дапушчэнні неадкладнага выканання рашэння**

1. Пры дапушчэнні неадкладнага выканання рашэння суд можа запатрабаваць ад істца забеспячэння павароту яго выканання на выпадак адмены рашэння суда, у тым ліку праз унясенне на адпаведны рахунак суда грашовых сродкаў у памеры прысуджанай сумы або прадастаўлення банкаўскай гарантыі ці іншага фінансавага забеспячэння на тую ж суму.

2. Забеспячэнне інтарэсаў адказчыка пры неадкладным выкананні рашэння можа заключацца таксама ў адкладанні перадачы істцу спагнаных грашовых сум або іншай маёмасці да ўступлення рашэння ў законную сілу.

**Артыкул 304. Забеспячэнне выканання рашэння, не накіраванага на неадкладнае выкананне**

Суд можа да ўступлення рашэння ў законную сілу забяспечыць выкананне рашэння, не накіраванага на неадкладнае выкананне, па правілах, устаноўленых главой 19 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 305. Уступленне рашэння суда ў законную сілу**

Калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі, рашэнне суда ўступае ў законную сілу пасля сканчэння тэрміну на апеляцыйныя абскарджанне і (або) апратэставанне ў выпадку, калі яно не было абскарджана і (або) апратэставана. У выпадку падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту рашэнне суда, калі яно не адменена, уступае ў законную сілу пасля разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі.

**Артыкул 306. Наступствы ўступлення рашэння суда ў законную сілу**

1. З моманту ўступлення рашэння суда ў законную сілу бакі і іншыя асобы – удзельнікі ў справе, а таксама іх правапераемнікі не могуць нанава заяўляць у судзе тыя ж іскавыя патрабаванні, на той жа падставе, а таксама аспрэчваць у судаводстве па іншай справе ўстаноўленыя судом факты і праваадносіны.

2. Калі з моманту ўступлення ў законную сілу рашэння суда па праваадносінах бакоў, што доўжацца (прысуджэнне перыядычных выплат і да т.п.), мяняюцца абставіны, на якіх заснавана гэта рашэнне, кожны бок мае права праз прад'яўленне новага іску патрабаваць вынясення новага рашэння.

### Артыкул 307. Судовая пастанова аб працаўладкаванні

1. Судовая пастанова аб працаўладкаванні асобы, абавязанай кампенсаваць выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, калі такая асоба не працуе ці працуе, але не ў поўным аб’ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку па яе заяве ўказаныя выдаткі або скончыла знаходжанне ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, ці вызвалена з месцаў пазбаўлення волі і падлягае працаўладкаванню, выносіцца адзін раз, далучацца да выканальнага дакумента і з’яўляецца яго неад’емнай часткай.

2. Судовая пастанова аб працаўладкаванні на працягу трох рабочых дзён пасля яе вынясення накіроўваецца ў орган унутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства асобы, указанай у частцы 1 гэтага артыкула, а ў выпадку, калі звесткі аб яе месцы жыхарства адсутнічаюць, – па апошнім вядомым месцы жыхарства для падбору арганізацыі (арганізацый) з мэтай працаўладкавання гэтай асобы.

### Артыкул 308. Выкананне рашэння суда

Рашэнне суда прыводзіцца ў выкананне пасля ўступлення яго ў законную сілу, за выключэннем выпадкаў неадкладнага выканання, у парадку, установленым заканадаўчымі актамі.

## § 4. Дадатковае рашэнне. Растлумачэнне і выпраўленне рашэння суда першай інстанцыі. Індэксацыя прысуджаных грашовых сум

### Артыкул 309. Дадатковае рашэнне

1. Пытанне аб вынясенні дадатковага рашэння можа быць пастаўлена да ўступлення рашэння ў законную сілу па ініцыятыве суда, што вынес рашэнне, або па заяве асобы, якая ўдзельнічае ў справе. Дадатковае рашэнне выносіцца па патрабаванні, разгледжаным у судовым пасяджэнні, але не вырашанаму судом ці вырашанаму не поўнасцю, а таксама ў дачыненні да судовых выдаткаў.

2. Дадатковае рашэнне выносіцца тым жа судом, што вынес рашэнне, па правілах, установленых гэтай главой, і павінна быць матывавана.

3. Дадатковае рашэнне можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

4. У выпадку адмовы ў прыняцці дадатковага рашэння суд выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

### Артыкул 310. Растлумачэнне рашэння

1. У выпадку няяснасці рашэння суд, што вынес рашэнне па справе, мае права па сваёй ініцыятыве або па заяве асобы, якая ўдзельнічае ў справе, судовага выканаўцы растлумачыць рашэнне, не змяняючы яго зместу.

2. Растлумачэнне рашэння дапускаецца, калі яно яшчэ не прыведзена ў выкананне і не скончыўся тэрмін, установлены для прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання.

### Артыкул 311. Выпраўленне апісак, памылак друку і яўных падліковых памылак у рашэнні

Суд, што вынес рашэнне, можа па сваёй ініцыятыве або па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, выправіць допушчаныя ў рашэнні апіскі, памылкі друку і яўныя падліковыя памылкі.

**Артыкул 312. Адтэрміноўка і растэрміноўка выканання рашэння, змяненне спосабу і парадку выканання рашэння**

1. Зыходзячы з маёмаснага становішча бакоў або іншых абставін, суд, што вынес рашэнне, па заяве боку, пададзенай у межах тэрміну, устаноўленага заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні для прад'яўлення выканальнага дакумента да выканання, мае права адтэрмінаваць або растэрмінаваць яго выкананне.

2. У выпадку неабходнасці суд, што вынес рашэнне, мае права змяніць спосаб і парадак выканання рашэння.

**Артыкул 313. Індэксацыя прысуджаных грашовых сум**

1. Па заяве спагнанніка, пададзенай у межах тэрміну, устаноўленага заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні для прад'яўлення выканальнага дакумента да выканання, суд, што разгледзеў справу, можа зрабіць індэксацыю прысуджаных судом на карысць грамадзяніна грашовых сум на дзень выканання судовай пастановы.

2. Калі іншае не прадугледжана актамі заканадаўства, для індэксацыі выкарыстоўваецца афіцыйная статыстычная інфармацыя аб індэксе спажывецкіх цэн.

**Артыкул 314. Парадак вынясення дадатковага рашэння, растлумачэння рашэння, выпраўлення апісак, памылак друку і яўных падліковых памылак, адтэрміноўкі і растэрміноўкі выканання рашэння, змянення спосабу і парадку выканання рашэння, а таксама індэксацыі прысуджаных грашовых сум**

1. Пытанні вынясення дадатковага рашэння, адтэрміноўкі і растэрміноўкі выканання рашэння, змянення спосабу і парадку выканання рашэння разглядаюцца судом у судовым пасяджэнні. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца аб часе і месцы судовага пасяджэння, аднак іх няяўка не перашкаджае разгляду і вырашэнню судом пытанняў вынясення дадатковага рашэння, адтэрміноўкі і растэрміноўкі выканання рашэння, змянення спосабу і парадку выканання рашэння.

2. Пытанні растлумачэння рашэння, выпраўлення апісак, памылак друку і яўных падліковых памылак, а таксама індэксацыі прысуджаных грашовых сум разглядаюцца судом без правядзення судовага пасяджэння і без апавяшчэння асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. У выпадку неабходнасці суд можа выклікаць асоб – удзельнікаў у справе у судовае пасяджэнне, паведаміўшы ім аб часе і месцы яго правядзення.

3. Вызначэнні суда аб адмове ў вынясенні дадатковага рашэння, па пытаннях адтэрміноўкі і растэрміноўкі выканання рашэння, змянення спосабу і парадку выканання рашэння, растлумачэння рашэння, выпраўлення апісак, памылак друку і яўных падліковых памылак, а таксама індэксацыі прысуджаных грашовых сум могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**§ 5. Парадак вынясення і змест вызначэння суда першай інстанцыі**

**Артыкул 315. Парадак вынясення вызначэння**

1. Судовая пастанова суда першай інстанцыі, якой справа не вырашаецца па сутнасці, выносіцца ў форме вызначэння ў выглядзе асобнага судовага дакумента або пратакольнага вызначэння.

2. Вызначэнне ў выглядзе асобнага судовага дакумента суд выносіць пры вырашэнні складаных пытанняў (аб узбуджэнні вядзення справы, аб падрыхтоўцы справы да судовага разбору, аб назначэнні экспертызы і інш.), а таксама калі прадугледжана магчымасць абскарджання і (або) апратэставання вызначэння ў апеляцыйным парадку. У іншых

выпадках суд мае права вынесці вызначэнне як у выглядзе асобнага судовага дакумента, так і ў выглядзе пратакольнага вызначэння.

3. Па складаных пытаннях, узніклых падчас судовага разбору, вызначэнне выносіцца ў дарадчым пакоі.

4. Пратакольнае вызначэнне можа быць вынесена судом без выхаду ў дарадчы пакой. Яно аб'яўляецца вусна і заносіцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння.

**Артыкул 316. Змест вызначэння**

1. У вызначэнні, якое выносіцца ў выглядзе асобнага судовага дакумента, павінны быць указаны:

1) дата і месца вынясення вызначэння;

2) найменне суда, склад суда, што вынес вызначэнне, сакратар судовага пасяджэння – памочнік суддзі;

3) асобы – ўдзельнікі ў справе і прадмет спрэчкі;

4) пытанне, па якім выносіцца вызначэнне;

5) матывы, па якіх суд прыйшоў да сваіх вывадаў, і спасылка на акты заканадаўства, якімі суд кіраваўся;

6) вывад па разгляданым пытанні (пастанове суда);

7) парадак і тэрмін абскарджання і (або) апратэставання вызначэння.

2. Вызначэнне, што выносіцца ў выглядзе асобнага судовага дакумента, падпісваецца суддзёй або калегіяльным складам суда, якія яго вынеслі.

3. У пратакольным вызначэнні павінны змяшчацца звесткі, прадугледжаныя пунктамі 4 і 6 часткі 1 гэтага артыкула.

**Артыкул 317. Накіраванне копій вызначэння**

Копіі вызначэння, што можа быць абскарджана і (або) апратэставана асобна ад рашэння, суд у пяцідзённы тэрмін пасля вынясення вызначэння, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены гэтым Кодэксам, накіроўвае асобам, якія ўдзельнічаюць у справе і не прысутнічалі ў судовым пасяджэнні, з выкарыстаннем сродкаў сувязі, што забяспечваюць фіксаванне іх атрымання, або ўручае ім пад распіску.

**Артыкул 318. Законная сіла вызначэння суда**

Вызначэнні суда, акрамя падлеглых абскарджанню і (або) апратэставанню асобна ад рашэнняў, уступаюць у законную сілу пасля абвяшчэння, а калі вызначэнне не апавяшчалася – пасля падпісання яго суддзёй (суддзямі).

**Артыкул 319. Вызначэнні, падлеглыя неадкладнаму выкананню**

Неадкладнаму выкананню падлягаюць вызначэнні:

1) па пытаннях прымянення забяспечвальных мер і забеспячэння выканання выканальных дакументаў, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі;

2) аб дазволе судоваму выканаўцу зрабіць агляд зямельнага ўчастка, жылога, нежылога памяшканняў без згоды даўжніка;

3) аб прыняцці заявы, узбуджэнні вядзення справы аб неплацежаздольнасці і ўвядзенні абароннага перыяду;

4) аб прыняцці заявы, узбуджэнні вядзення справы аб банкруцтве і ўвядзенні абароннага перыяду;

5) аб прыняцці заявы, узбуджэнні вядзення справы аб неплацежаздольнасці і адкрыцці конкурснага вядзення;

6) аб прыняцці заявы, узбуджэнні вядзення справы аб банкруцтве і адкрыцці конкурснага вядзення;

7) аб адкрыцці конкурснага вядзення;

8) у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 320. Прымяненне да вызначэння нормаў аб рашэнні**

Да вызначэння прымяняюцца нормы, што рэгулююць змест, парадак і наступствы вынясення рашэння, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Кодэксам або не супярэчыць сутнасці вызначэння.

**Артыкул 321. Прыватнае вызначэнне суда**

1. У выпадку выяўлення пры разглядзе справы парушэння юрыдычнымі асобамі, грамадзянамі, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, дзяржаўнымі органамі, службовымі асобамі або іншымі грамадзянамі законнасці або істотных недахопаў у дзейнасці юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, дзяржаўных органаў суд мае права вынесці прыватнае вызначэнне.

2. Прыватнае вызначэнне суда накіроўваецца адпаведным юрыдычным асобам, грамадзянам, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, дзяржаўным органам, службовым асобам або іншым грамадзянам, якія абавязаны ў тэрмін не больш за адзін месяц пасля яго атрымання паведаміць суду аб прынятых мерах рэагавання.

3. Калі пры разглядзе справы суд выявіць прыкметы злачынства ў дзеяннях (бяздзейнасці) грамадзяніна, ён паведамляе аб гэтым пракурору прыватым вызначэннем.

4. Прыватнае вызначэнне суда можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

5. За пакіданне без разгляду прыватнага вызначэння суда або непрыняцце мер да ліквідавання ўказананых у ім парушэнняў, а таксама за несвоечасовы адказ на прыватнае вызначэнне суда службовыя асобы нясуць адказнасць, устаноўленую Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**§ 6. Перагляд судом першай інстанцыі вынесеных ім судовых пастаноў**

**Артыкул 322. Права суда перагледзець вынесеную ім судовую пастанову**

Суд, што вынес судовую пастанову па першай інстанцыі, можа адмяніць або змяніць яе, а таксама вынесці новую судовую пастанову толькі ў выпадках, прама прадугледжаных гэтым Кодэксам.

**Артыкул 323. Вынясенне новага рашэння пасля змянення абставін**

Калі пасля ўступлення ў законную сілу рашэння па праваадносінах бакоў, што доўжацца (прысуджэнне перыядычных выплат і да т.п.), мяняюцца абставіны, на якіх заснавана рашэнне, суд па новым іску любога боку выносіць новае рашэнне без адмены ранейшага.

**Артыкул 324. Адмена або змяненне вызначэння судом, што вынес яго**

Вызначэнні суда (за выключэннем тых, што могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны) могуць адмяняцца або змяняцца судом, што вынес іх, як у выпадку памылковасці, так і ў сувязі са змяненнем абставін справы. Адмена або змяненне вызначэння ў такіх выпадках ажыццяўляецца па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

## ГЛАВА 28
## ВЯДЗЕННЕ ПА КАЛЕКТЫЎНАЙ ІСКАВАЙ ЗАЯВЕ

### Артыкул 325. Права на зварот у суд з калектыўнай іскавай заявай

1. Грамадзяне, юрыдычныя асобы маюць права звярнуцца ў суд з калектыўнай іскавай заявай, калі маецца агульны ў дачыненні да кожнага члена групы асоб адказчык, прадметам спрэчкі з'яўляюцца агульныя або аднародныя правы і законныя інтарэсы членаў групы асоб, а правы і законныя інтарэсы членаў групы асоб і абавязкі адказчыка заснаваны на падобных фактычных абставінах і ўсімі членамі групы асоб выкарыстоўваецца аднолькавы спосаб судовай абароны.

2. Членамі групы асоб прызнаюцца грамадзяне і юрыдычныя асобы, якія адпавядаюць усім умовам, указаным у частцы 1 гэтага артыкула, незалежна ад іх далучэння да калектыўнай іскавай заявы. Права на зварот у суд з калектыўнай іскавай заявай прызнаецца за грамадзянамі ці юрыдычнымі асобамі, якія з'яўляюцца членамі групы асоб.

3. Дзяржаўны орган, юрыдычная асоба могуць звярнуцца ў суд з калектыўнай іскавай заявай у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў іншых асоб у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

4. Разгляд справы ажыццяўляецца па правілах, устаноўленых гэтай главой, калі на момант узбуджэння вядзення справы калектыўную іскавую заяву падпісалі або да яе далучыліся не менш як дзесяць асоб.

5. Далучэнне да калектыўнай іскавай заявы ажыццяўляецца праз падачу ў пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента заявы аб гэтым у суд пасля ўзбуджэння вядзення справы і дапускаецца да пераходу суда да судовых спрэчак.

6. Правілы гэтай главы прымяняюцца таксама пры разглядзе спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, калі гэта не супярэчыць сутнасці такога віду вядзення.

### Артыкул 326. Патрабаванні, якія прад'яўляюцца да калектыўнай іскавай заявы

1. Калектыўная іскавая заява павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 238 гэтага Кодэкса. У калектыўнай іскавай заяве таксама ўказваюцца:

1) звесткі аб правах і законных інтарэсах групы асоб, у абарону якіх яно прад'яўлена;

2) звесткі аб членах групы асоб і аб падставах аднясення асоб да гэтай групы;

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) кожнага грамадзяніна, які далучыўся да калектыўнай іскавай заявы, яго месца жыхарства (месца прысутнасці), а для юрыдычных асоб – поўнае найменне, месца знаходжання і банкаўскія рэквізіты.

2. Да калектыўнай іскавай заявы дадаюцца дакументы, прадугледжаныя артыкулам 239 гэтага Кодэкса, а таксама дакументы, што пацвярджаюць далучэнне асоб, указаных у пункце 3 часткі 1 гэтага артыкула, да калектыўнай іскавай заявы і іх прыналежнасць да групы асоб.

3. У калектыўнай іскавай заяве, прад'яўленай у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, дзяржаўным органам, юрыдычнай асобай, якія не з'яўляюцца членамі групы асоб, апрача адпаведнасці патрабаванням, выкладзеным у частках 1 і 2 гэтага артыкула, таксама павінны змяшчацца спасылкі на заканадаўчы акт, што прадастаўляе права на зварот у суд з калектыўнай іскавай заявай.

### Артыкул 327. Вядзенне справы, узбуджанай па калектыўнай іскавай заяве

1. У калектыўнай іскавай заяве ўказваецца з шэрагу заяўнікаў (істцоў) асоба, якой даручана вядзенне справы ў інтарэсах групы асоб (далей – упаўнаважаная асоба). Такая

асоба дзейнічае ад імя групы асоб без даверанасці на падставе заяў аб далучэнні асоб да калектыўнай іскавай заявы.

2. Упаўнаважаная асоба карыстаецца ўсімі працэсуальнымі правамі і нясе ўсе працэсуальныя абавязкі істца, у тым ліку абавязкі па аплаце судовых выдаткаў. Такая асоба абавязана добрасумленна абараняць правы і законныя інтарэсы групы асоб.

3. Удзел упаўнаважанай асобы ў справе спыняецца ў выпадках адмовы такой асобы ад іску або падачы хадайніцтва большасцю асоб, якія далучыліся да калектыўнай іскавай заявы. У такіх выпадках дапускаецца замена ўпаўнаважанай асобы.

4. Пры паступленні ў суд заявы ўпаўнаважанай асобы аб адмове ад іску суд адкладае судовы разбор і ўстанаўлівае тэрмін да аднаго месяца, на працягу якога павінна быць зроблена замена ўказанай асобы. У вызначэнні аб адкладанні судовага разбору суд указвае на абавязак упаўнаважанай асобы паведаміць аб сваёй адмове ад іску асоб, якія далучыліся да калектыўнай іскавай заявы, і растлумачыць наступствы, прадугледжаныя часткай 7 гэтага артыкула. Доказы паведамлення аб адмове ад іску накіроўваюцца ўпаўнаважанай асобай у суд.

5. Доказы, што пацвярджаюць зробленую замену ўпаўнаважанай асобы, прадстаўляюцца ў суд на працягу тэрміну, устаноўленага судом.

6. Суд не прымае адмовы ўпаўнаважанай асобы ад іску, калі на момант сканчэння тэрміну, устаноўленага судом, адсутнічаюць звесткі аб апавяшчэнні асоб, якія далучыліся да калектыўнай іскавай заявы, і замене ўпаўнаважанай асобы. Па пытанні замены ўпаўнаважанай асобы іншай асобай суд выносіць вызначэнне.

7. У выпадку калі ўпаўнаважаная асоба – падавец заявы аб адмове ад іску, здзейсніць усе неабходныя дзеянні па апавяшчэнні асоб, якія далучыліся да калектыўнай іскавай заявы, але ўказаныя асобы на працягу ўстаноўленага судом тэрміну не зробяць замену такой асобы, суд пакідае калектыўную іскавую заяву без разгляду ў адпаведнасці з пунктам 4 артыкула 128 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 328. Правы асобы, якая далучылася да калектыўнай іскавай заявы**

Асоба, якая далучылася да калектыўнай іскавай заявы, ажыццяўляе свае правы праз упаўнаважаную асобу, а таксама мае права:

1) знаёміцца з матэрыяламі справы, рабіць выпіскі з іх, за свой кошт здымаць копіі з дакументаў;

2) хадайнічаць у судзе аб замене ўпаўнаважанай асобы;

3) прысутнічаць у судовым пасяджэнні, у тым ліку калі яно аб'яўлена закрытым;

4) адмовіцца ад пададзенай ёй заявы аб далучэнні да калектыўнай іскавай заявы.

**Артыкул 329. Падрыхтоўка справы да судовага разбору**

1. Апрача дзеянняў, прадугледжаных артыкулам 251 гэтага Кодэкса, пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы, узбуджанай па калектыўнай іскавай заяве, суддзя таксама:

1) вырашае пытанні аб складзе групы асоб і аб магчымасці ўстанаўлення іншых асоб – удзельнікаў спрэчных праваадносін;

2) прапануе прадставіць доказы, што пацвярджаюць прыналежнасць канкрэтнай асобы да групы асоб.

2. У вызначэнні аб падрыхтоўцы справы да судовага разбору суд устанаўлівае тэрмін, на працягу якога ўпаўнаважаная асоба павінна прапанаваць іншым асобам з гэтай групы далучыцца да калектыўнай іскавай заявы.

3. Прапанова аб далучэнні да калектыўнай іскавай заявы павінна быць апублікавана ў друкаваных рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі, а таксама размешчана на інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь.

4. Па хадайніцтве ўпаўнаважанай асобы суд мае права выпатрабаваць інфармацыю, на падставе якой можна вызначыць іншых членаў групы асоб і іх месца жыхарства (месца прысутнасці) або месца знаходжання для накіравання ім прапановы аб далучэнні да калектыўнай іскавай заявы.

5. У прапанове аб далучэнні да калектыўнай іскавай заявы павінна быць указана:

1) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне адказчыка;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы, якая звярнулася ў суд з калектыўнай іскавай заявай, і (або) упаўнаважанай асобы;

3) патрабаванне групы асоб;

4) найменне суда, у чыім вядзенні знаходзіцца справа;

5) тэрмін, на працягу якога іншыя асобы, якія з'яўляюцца членамі групы асоб, могуць далучыцца да калектыўнай іскавай заявы праз накіраванне заявы ў суд;

6) іншая вызначаная судом інфармацыя.

6. Упаўнаважаная асоба да заканчэння падрыхтоўкі справы да судовага разбору паведамляе суду прадугледжаныя пунктам 3 часткі 1 артыкула 326 гэтага Кодэкса звесткі аб іншых асобах, якія далучыліся да калектыўнай іскавай заявы, а таксама прадстаўляе дакументы з пацвярджэннем далучэння ўказаных асоб да названай заявы і іх прыналежнасці да групы асоб.

7. Па справе, узбуджанай па калектыўнай іскавай заяве, праводзіцца папярэдняе судовае пасяджэнне. У папярэднім судовым пасяджэнні суддзя вырашае пытанне аб адпаведнасці групы асоб умовам, указаным у частцы 1 артыкула 325 гэтага Кодэкса. У выпадку калі група асоб не адпавядае ўказаным умовам, суд пакідае калектыўную іскавую заяву без разгляду. Пры гэтым істцам растлумачваецца права на зварот у суд з самастойнымі патрабаваннямі ў агульным парадку.

**Артыкул 330. Разгляд справы па калектыўнай іскавай заяве**

1. Справы па калектыўных іскавых заявах разглядаюцца ў тэрмін не пазней шасці месяцаў пасля ўзбуджэння вядзення справы па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

2. У выпадку звароту ў суд асобы, якая з'яўляецца членам групы асоб, але не далучылася да калектыўнай іскавай заявы, з самастойным іскам да таго ж адказчыка, аб тым жа прадмеце суд растлумачвае ёй права далучыцца да калектыўнай іскавай заявы ў парадку, устаноўленым часткай 5 артыкула 325 гэтага Кодэкса.

3. У выпадку далучэння да калектыўнай іскавай заявы асобы, якая звярнулася з самастойным іскам да таго ж адказчыка, аб тым жа прадмеце, суд, у які звярнулася гэта асоба, выносіць вызначэнне аб перадачы матэрыялаў справы ў суд, што разглядае справу па калектыўнай іскавай заяве.

4. Калі асоба, якая звярнулася з самастойным іскам да таго ж адказчыка, аб тым жа прадмеце, не скарыстаецца правам далучыцца да калектыўнай іскавай заявы, суд прыпыняе вядзенне справы ўказанай асобы да ўступлення ў законную сілу рашэння суда па калектыўнай іскавай заяве. Вядзенне справы асобы, якая звярнулася з самастойным іскам да таго ж адказчыка, аб тым жа прадмеце, прыпыняецца і ў тым выпадку, калі калектыўная іскавая заява пададзена пазней звароту ў суд указанай асобы.

**Артыкул 331. Рашэнне суда**

1. Рашэнне па справе, узбуджанай па калектыўнай іскавай заяве, выносіцца па правілах, устаноўленых главой 27 гэтага Кодэкса.

2. Абставіны, устаноўленыя рашэннем суда па раней разгледжанай калектыўнай іскавай заяве, што ўступіла ў законную сілу, не даказваюцца нанава пры разглядзе судом іншай справы па заяве члена гэтай групы асоб, які раней не далучыўся ці адмовіўся ад заявы аб далучэнні да калектыўнай іскавай заявы, прад'ўленай да таго ж адказчыка, аб тым жа

прадмеце, за выключэннем выпадкаў, калі ўказаныя абставіны аспрэчваюцца гэтым членам групы асоб.

3. У рэзалютыўнай частцы рашэння па справе, узбуджанай па калектыўнай іскавай заяве, павінны змяшчацца вывады ў адносінах да кожнага з членаў групы асоб, якія далучыліся да калектыўнай іскавай заявы.

4. Права на зварот у органы (арганізацыі), што ажыццяўляюць выкананне судовых пастаноў і выканальных дакументаў, мае любая асоба, у дачыненні да якой суд вынес рашэнне аб задавальненні калектыўнай іскавай заявы.

## ГЛАВА 29
## ЗАВОЧНАЕ ВЯДЗЕННЕ

### Артыкул 332. Падставы для завочнага вядзення

1. Справа можа быць разгледжана судом у парадку завочнага вядзення ў выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне адказчыка, а пры ўдзеле ў справе некалькіх адказчыкаў – у выпадку няяўкі ў судовае пасяджэнне ўсіх адказчыкаў, калі яны былі належным чынам апавешчаны аб часе і месцы судовага пасяджэння, але не паведамілі аб уважлівых прычынах няяўкі і не прасілі разгледзець справу ў іх адсутнасць або суд прызнае, што адказчыкі ўхіляюцца ад яўкі ў суд ці зацягваюць вядзенне справы.

2. Аб разглядзе справы ў парадку завочнага вядзення суд выносіць вызначэнне.

3. У выпадку калі ісцец, які з’явіўся ў судовае пасяджэнне, не згодны на разгляд справы ў парадку завочнага вядзення, суд адкладае судовы разбор і прызначае дзень новага судовага пасяджэння.

4. Пры змяненні істцом прадмету або падставы іску, павелічэнні памеру іскавых патрабаванняў суд не мае права разглядаць справу ў гэтым судовым пасяджэнні ў парадку завочнага вядзення.

### Артыкул 333. Парадак завочнага вядзення, змест завочнага рашэння суда

1. Пры разглядзе справы ў парадку завочнага вядзення суд праводзіць судовы разбор у адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі главой 26 гэтага Кодэкса.

2. Па выніках разгляду справы суд выносіць рашэнне, якое называецца завочным.

3. Змест завочнага рашэння суда вызначаецца артыкуламі 286–290 гэтага Кодэкса. Пры гэтым у рэзалютыўнай частцы завочнага рашэння суда ўказваюцца тэрмін і парадак падачы заявы аб яго адмене.

### Артыкул 334. Накіраванне копій завочнага рашэння суда

Копіі завочнага рашэння суда накіроўваюцца адказчыку, істцу і іншым асобам, якія ўдзельнічаюць у справе, якія не прысутнічалі ў судовым пасяджэнні, не пазней за пяць дзён пасля вынясення гэтага рашэння з выкарыстаннем сродкаў сувязі, што забяспечваюць фіксаванне іх атрымання.

### Артыкул 335. Заява адказчыка аб адмене завочнага рашэння суда

1. Адказчык мае права падаць у суд, што вынес завочнае рашэнне, заяву аб адмене гэтага рашэння на працягу дзесяці дзён пасля атрымання ім копіі рашэння.

2. Заява аб адмене завочнага рашэння суда павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкуламі 100 і 101 гэтага Кодэкса.

3. У заяве аб адмене завочнага рашэння суда павінны быць таксама ўказаны абставіны, што сведчаць аб уважлівасці прычын няяўкі адказчыка ў судовае пасяджэнне, аб якіх адказчык не меў магчымасці своечасова паведаміць суду, і доказы, якія

пацвярджаюць гэтыя абставіны, а таксама доказы, што могуць паўплываць на змест рашэння суда, або хадайніцтва аб выпатрабаванні такіх доказаў, калі іх прадстаўленне для адказчыка немагчымае.

4. Да заявы таксама дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць змешчаныя ў ёй довады.

**Артыкул 336. Разгляд заявы аб адмене завочнага рашэння суда**

1. Заява аб адмене завочнага рашэння суда разглядаецца ў судовым пасяджэнні не пазней дзесяці дзён пасля яе паступлення ў суд з апавяшчэннем асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Няяўка гэтых асоб у судовае пасяджэнне не перашкаджае разгляду заявы.

2. Па выніках разгляду заявы суд выносіць матываванае вызначэнне аб адмове ў задавальненні заявы ці аб адмене завочнага рашэння суда і аб аднаўленні разгляду справы гэтым жа або іншым суддзёй.

3. Завочнае рашэнне суда падлягае адмене, калі суд установіць, што няяўка адказчыка ў судовае пасяджэнне была выклікана ўважлівымі прычынамі, аб якіх адказчык не меў магчымасці своечасова паведаміць суду, і пры гэтым адказчык прадставіў доказы, што могуць паўплываць на змест рашэння суда, або заявіў хадайніцтва аб выпатрабаванні такіх доказаў, калі іх прадстаўленне для адказчыка немагчымае.

**Артыкул 337. Аднаўленне разгляду справы**

1. Пасля вынясення вызначэння аб адмене завочнага рашэння суда і аб аднаўленні разгляду справы справа разглядаецца судом па агульных правілах іскавага вядзення.

2. У выпадку няяўкі адказчыка пры новым разглядзе справы яна не можа быць разгледжана ў парадку завочнага вядзення.

## ГЛАВА 30
## СПРОШЧАНАЕ ВЯДЗЕННЕ

**Артыкул 338. Парадак спрошчанага вядзення**

Справы ў парадку спрошчанага вядзення разглядаюцца судом без правядзення судовага пасяджэння і выкліку бакоў у месячны тэрмін пасля ўзбуджэння вядзення справы па агульных правілах іскавага вядзення з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

**Артыкул 339. Справы, што разглядаюцца ў парадку спрошчанага вядзення**

1. У парадку спрошчанага вядзення могуць быць разгледжаны справы па іскавых заявах аб спагнанні грашовых сродкаў ці аб выпатрабаванні маёмасці пры цане іску, прад’яўленага:

1) да грамадзян, у тым ліку тых, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, – не больш за 300 базавых велічынь;

2) да юрыдычных асоб, – не больш за 1000 базавых велічынь.

2. Іншыя справы іскавага вядзення па хадайніцтве аднаго з бакоў і пры згодзе другога боку або па ініцыятыве суда пры згодзе бакоў таксама могуць быць разгледжаны судом у парадку, устаноўленым гэтай главой.

3. Не падлягаюць разгляду ў парадку спрошчанага вядзення справы па калектыўных іскавых заявах, справы, дзе маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, справы аб пакрыцці шкоды, прычыненай жыццю або здароўю грамадзяніна, а таксама справы, што закранаюць правы непаўналетніх, за выключэннем спраў аб спагнанні аліментаў.

4. У выпадку калі істец і (або) адказчык пярэчаць супраць разгляду справы ў парадку спрошчанага вядзення, а таксама калі прад’яўлены сустрэчны іск, задаволена хадайніцтва

аб далучэнні да ўдзелу ў справе трэцяй асобы, узнікла неабходнасць высвятлення дадатковых абставін праз допыт сведкаў ці здзяйсненне іншых працэсуальных дзеянняў або ўзніклі іншыя абставіны, якія перашкаджаюць разгляду справы ў парадку спрошчанага вядзення, справа разглядаецца судом па агульных правілах іскавага вядзення.

**Артыкул 340. Асаблівасці разгляду спраў у парадку спрошчанага вядзення**

1. Іскавая заява і дадзеныя да яе дакументы па справе, разглядаемай у парадку спрошчанага вядзення, падаюцца ў суд па правілах падсуднасці, устаноўленых гэтым Кодэксам.

2. У выпадках, прадугледжаных часткай 1 артыкула 339 гэтага Кодэкса, суд у вызначэнні аб узбуджэнні вядзення справы ўказвае аб яе разглядзе ў парадку спрошчанага вядзення і ўстанаўлівае тэрмін не больш за дзесяць дзён, на працягу якога бакі прадстаўляюць у суд і накіроўваюць адзін аднаму доказы, пярэчанні супраць іску (водзыў на іскавую заяву) і пісьмовыя тлумачэнні адносна да прад'яўленых патрабаванняў, пярэчанні супраць разгляду справы ў парадку спрошчанага вядзення. Пры неабходнасці суд можа прызначыць дадатковы тэрмін не больш за дзесяць дзён для прадстаўлення доказаў і іншых дакументаў,. У вызначэнні аб узбуджэнні вядзення справы таксама ўказваецца аб магчымасці ўрэгуляваць спрэчку праз прымірэнне. Вызначэнне аб узбуджэнні вядзення справы з копіяй іскавай заявы не пазней за наступны дзень пасля яго вынясення накіроўваецца адказчыку.

3. Падчас разгляду справы па агульных правілах іскавага вядзення суд з захаваннем патрабаванняў часткі 2 артыкула 339 гэтага Кодэкса мае права вынесці вызначэнне аб пераходзе да разгляду справы ў парадку спрошчанага вядзення. У такім выпадку суд пры неабходнасці ўстанаўлівае бакам тэрмін, прадугледжаны часткай 2 гэтага артыкула.

4. Калі доказы і іншыя дакументы паступілі ў суд да прыняцця рашэння па справе, але пасля сканчэння ўстаноўленых у адпаведнасці з часткай 2 гэтага артыкула тэрмінаў, суд прымае гэтыя доказы і іншыя дакументы пры ўмове, што тэрміны іх прадстаўлення прапушчаны па ўважлівых прычынах.

5. Суд даследуе выкладзеныя ў прадстаўленых бакамі дакументах тлумачэнні і довады бакоў і выносіць рашэнне на падставе доказаў, прадстаўленых на працягу тэрміну, устаноўленага судом у адпаведнасці з часткай 2 гэтага артыкула.

**Артыкул 341. Рашэнне па справе, што разглядаецца ў парадку спрошчанага вядзення**

1. Суд выносіць рашэнне па справе, што разглядаецца ў парадку спрошчанага вядзення, без складання яго матывіровачнай часткі. Копіі рашэння накіроўваюцца асобам – удзельнікам у справе не пазней за наступны дзень пасля дня яго вынясення.

2. Па заяве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або ў выпадку падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту на рашэнне суда па справе, разгледжанай у парадку спрошчанага вядзення, суд складае матывіровачную частку рашэння.

# ПАДРАЗДЗЕЛ 2
# ЗАГАДНАЕ ВЯДЗЕННЕ

## ГЛАВА 31
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 342. Справы загаднага вядзення

1. Загадным вядзеннем з’яўляецца вядзенне пасля разгляду судом патрабаванняў, прадугледжаных часткамі 3 і 4 гэтага артыкула, без выкліку спагнанніка і даўжніка і без правядзення судовага пасяджэння.

2. Заява аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе падаецца ў суд па правілах падсуднасці, устаноўленых главой 6 гэтага Кодэкса, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым артыкулам.

3. Раённыя (гарадскія) суды разглядаюць у загадным вядзенні патрабаванні аб спагнанні грашовых сродкаў або выпатрабаванні рухомай маёмасці:

1) заснаваныя на натарыяльна засведчанай здзелцы, за выключэннем натарыяльна засведчанай здзелкі, на падставе якой узнікае абавязнасць па выплаце грашовых сродкаў;

2) заснаваныя на здзелцы, заключанай у простай пісьмовай форме;

3) аб спагнанні на непаўналетніх дзяцей аліментаў, не звязаных з устанаўленнем мацярынства і (або) бацькоўства ці неабходнасцю далучэння да ўдзелу трэціх асоб;

4) аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, з асобы, якая абавязана кампенсаваць такія выдаткі і не працуе або працуе, але не ў поўным аб’ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку па яе заяве ўказаныя выдаткі. У выпадках калі месца жыхарства (месца прысутнасці) названай асобы невядомае, спагнанне з яе такіх выдаткаў ажыццяўляецца ў парадку іскавага вядзення.

4. Эканамічныя суды абласцей (горада Мінска) разглядаюць у загадным вядзенні патрабаванні аб спагнанні грашовых сродкаў, выпатрабаванні маёмасці ці накіраванні спагнання на маёмасць даўжніка, заснаваныя на дакументах, што пацвярджаюць запазычанасць даўжніка, або прызнаюцца ці не аспрэчваюцца даўжніком, але не выконваюцца. Не падлягаюць разгляду ў эканамічных судах абласцей (горада Мінска) у парадку загаднага вядзення патрабаванні аб выпатрабаванні нерухомай маёмасці ўласнікам або іншым законным уладальнікам, а таксама аб выкананні гарантыйнай абавязнасці, за выключэннем банкаўскай гарантыі.

5. Не падлягаюць разгляду судом у парадку загаднага вядзення патрабаванні, спагнанне па якіх адпаведна заканадаўчым актам ажыццяўляецца праз здзяйсненне выканальнага надпісу.

6. Загаднае вядзенне заканчваецца вынясеннем вызначэння аб судовым загадзе, якое абскарджанню і (або) апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае.

### Артыкул 343. Форма і змест заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе

1. Заява аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе і дадзеныя да заявы дакументы могуць быць пададзены ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента.

2. У заяве аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе ўказваюцца:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне спагнанніка і даўжніка, іх месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання, банкаўскія рэквізіты, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

3) патрабаванні спагнанніка;

4) спасылкі на акты заканадаўства, якімі абгрунтоўваюцца прад'яўленыя патрабаванні;

5) абставіны, на якіх заснаваны патрабаванні, і доказы, што пацвярджаюць іх;

6) разлік спаганянай сумы;

7) кошт рухомай маёмасці, пацверджаны адпаведнымі дакументамі, калі патрабаванні звязаны з яе выпатрабаваннем;

8) звесткі аб захаванні абавязковага дасудовага парадку ўрэгулявання спрэчкі, калі ён устаноўлены заканадаўчымі актамі або дагаворам;

9) пералік дадзеных дакументаў.

3. Заява аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе падпісваецца спагнаннікам або яго прадстаўніком, які мае адпаведныя паўнамоцтвы.

4. Пры падачы заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе ў выглядзе электроннага дакумента яна падпісваецца электронным лічбавым подпісам спагнанніка або яго прадстаўніка.

5. Да заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе дадаюцца:

1) дакументы, што пацвярджаюць заяўленыя патрабаванні;

2) дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны ва ўстаноўленых парадку і памеры, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы указаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы;

3) доказы захавання абавязковага дасудовага парадку ўрэгулявання спрэчкі, калі ён устаноўлены заканадаўчымі актамі або дагаворам;

4) даверанасць або іншы дакумент, што пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка, які падпісаў заяву аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе, на яго падпісанне.

**Артыкул 344. Падставы для адмовы ў прыняцці заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе**

1. Суд адмаўляе ў прыняцці заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе, калі маюцца падставы, прадугледжаныя часткай 1 артыкула 241 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадках, калі:

1) заяўленыя патрабаванні не падлягаюць разгляду ў парадку загаднага вядзення;

2) месца жыхарства або месца знаходжання даўжніка знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь;

3) бачыцца наяўнасць спрэчкі аб праве, якую немагчыма вырашыць на падставе прадстаўленых дакументаў.

2. Адмова ў прыняцці заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе не перашкаджае магчымасці прад'яўлення іску па тых жа патрабаваннях у парадку іскавага вядзення, калі іншы парадак не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі.

3. Аб адмове ў прыняцці заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе суд у пяцідзённы тэрмін пасля яе паступлення ў суд выносіць вызначэнне. Копія вызначэння разам з заявай аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе і дадзенымі да яе дакументамі накіроўваецца спагнанніку не пазней за наступны дзень пасля вынясення вызначэння.

**Артыкул 345. Падставы для вяртання заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе**

1. Суд вяртае заяву аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе, калі яна пададзена з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых часткай 1, пунктамі 1–3, 5–9 часткі 2 і часткамі 3–5 артыкула 343 гэтага Кодэкса, а таксама калі маюцца падставы, прадугледжаныя артыкулам 244 гэтага Кодэкса.

2. Вяртанне заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе не пазбаўляе спагнанніка права пасля ліквідавання абставін, што паслужылі падставай для вяртання, нанава звярнуцца ў суд з заявай аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

3. Аб вяртанні заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе суд у пяцідзённы тэрмін пасля яе паступлення ў суд выносіць вызначэнне. Копія вызначэння разам з заявай аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе і дадзенымі да яе дакументамі накіроўваецца спагнанніку не пазней за наступны дзень пасля вынясення вызначэння.

## ГЛАВА 32
## ВЫЗНАЧЭННЕ АБ СУДОВЫМ ЗАГАДЗЕ

### Артыкул 346. Парадак вынясення і змест вызначэння аб судовым загадзе

1. Вызначэнне аб судовым загадзе выносіцца ў пяцідзённы тэрмін пасля паступлення ў суд заявы аб выдачы вызначэння аб судовым загадзе, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі.

2. У вызначэнні аб судовым загадзе ўказваюцца:

1) нумар загаднага вядзення і дата вынясення вызначэння, звесткі аб уступленні вызначэння ў законную сілу;

2) найменне суда, склад суда, што вынес вызначэнне;

3) звесткі аб даўжніку і спагнанніку ў дачыненні да грамадзяніна – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), ідэнтыфікацыйны нумар, а пры адсутнасці ідэнтыфікацыйнага нумара – даныя дакумента, які сведчыць асобу (серыя (калі яна ёсць), нумар, дата выдачы, назва або код органа, які выдаў дакумент), яго месца жыхарства (месца прысутнасці), дата і месца яго нараджэння (пры наяўнасці звестак аб месцы нараджэння), а ў дачыненні да грамадзяніна, які ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, апрача ўказанага, – таксама ўліковы нумар плацежніка. У дачыненні да даўжніка – грамадзяніна, у тым ліку таго, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, таксама павінна быць указана месца работы (службы) (калі яно вядомае);

4) звесткі аб даўжніку і спагнанніку ў дачыненні да юрыдычнай асобы, арганізацыі, што не з’яўляецца юрыдычнай асобай, – іх найменне і месца знаходжання, уліковы нумар плацежніка або іншы аналагічны нумар, прысвоены ў замежнай дзяржаве;

5) звесткі аб даўжніку і спагнанніку ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Рэспублікі Беларусь – найменне, месца знаходжання і ўліковы нумар плацежніка органа, упаўнаважанага выступаць ад іх імя бокам выканаўчага вядзення;

6) нормы права, на падставе якіх задаволены патрабаванні;

7) памер падлеглых спагнанню грашовых сродкаў ці абазначэнне рухомай маёмасці, падлеглай выпатрабаванню, з указаннем яе кошту;

8) памер няўстойкі (штрафу, пені), працэнтаў, калі іх спагнанне прадугледжана заканадаўствам або дагаворам, перыяд спагнання;

9) сумы судовых выдаткаў, падлеглыя спагнанню з даўжніка ў бюджэт ці на карысць спагнанніка;

10) пералік дакументаў, якія пацвярджаюць патрабаванні спагнанніка.

3. У вызначэнні аб судовым загадзе аб спагнанні аліментаў на непаўналетніх дзяцей, апрача звестак, прадугледжаных пунктамі 1–4, 6, 7 і 9 часткі 2 гэтага артыкула, таксама ўказваюцца дата і месца нараджэння даўжніка, месца яго работы (службы), прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) і дата нараджэння кожнага дзіцяці, на ўтрыманне якога прысуджаны аліменты, памер выплат, спаганяных штомесяц з даўжніка, у тым ліку мінімальны памер аліментаў (калі ён устаноўлены), і тэрмін іх спагнання.

4. У вызначэнні аб судовым загадзе аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, павінны быць вырашаны пытанні працаўладкавання асобы, якая абавязана кампенсаваць такія выдаткі, не працуе або працуе, але не ў поўным аб'ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку па яе заяве ўказаныя выдаткі.

**Артыкул 347. Накіраванне даўжніку копіі вызначэння аб судовым загадзе**

1. У трохдзённы тэрмін пасля вынясення вызначэння аб судовым загадзе яго копія накіроўваецца даўжніку з выкарыстаннем сродкаў сувязі, што забяспечваюць фіксаванне яе атрымання.

2. Копія вызначэння аб судовым загадзе аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, накіроўваецца даўжніку па апошнім вядомым месцы яго жыхарства, што лічыцца належным апавяшчэннем.

**Артыкул 348. Заява аб адмене вызначэння аб судовым загадзе**

1. Даўжнік мае права не пазней як у дзесяць дзён пасля атрымання копіі вызначэння аб судовым загадзе падаць у той жа суд заяву аб адмене вызначэння аб судовым загадзе.

2. Іншая асоба, чые правы і (або) законныя інтарэсы закранаюцца вызначэннем аб судовым загадзе (далей у гэтай главе – іншая асоба), у дзесяцідзённы тэрмін пасля таго, калі гэтай асобе стала вядома аб вынясенні такога вызначэння, мае права падаць у той жа суд матываваную заяву аб яго адмене з даданнем пацвярджальных дакументаў.

3. Калі вызначэннем аб судовым загадзе эканамічнага суда вобласці (горада Мінска) спагнаныя грашовыя сродкі, даўжнік ці іншая асоба мае права падаць заяву аб яго адмене ў частцы.

4. Заява аб адмене вызначэння аб судовым загадзе і даданыя да заявы дакументы могуць быць пададзены ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента.

5. У заяве аб адмене вызначэння аб судовым загадзе павінны быць указаны пярэчанні супраць задаволеных патрабаванняў спагнанніка. Акрамя таго, у заяве іншай асобы павінны быць указаны звесткі аб тым, якія правы і (або) законныя інтарэсы гэтай асобы закрануты вызначэннем аб судовым загадзе, а таксама абгрунтаванне захавання ўстаноўленага часткай 2 гэтага артыкула тэрміну на падачу заявы.

**Артыкул 349. Адмена вызначэння аб судовым загадзе**

1. Заява аб адмене вызначэння аб судовым загадзе разглядаецца на працягу пяці дзён пасля яе паступлення ў суд без апавяшчэння бакоў, іншай асобы.

2. Па выніках разгляду заявы аб адмене вызначэння аб судовым загадзе, пададзенай даўжніком, суд выносіць вызначэнне аб адмене вызначэння аб судовым загадзе.

3. Пры разглядзе заявы аб адмене вызначэння аб судовым загадзе, пададзенай іншай асобай, суд даследуе выкладзеныя ў гэтай матываванай заяве і даданых да яе дакументах пярэчанні, звесткі і на падставе прадстаўленых дакументаў выносіць вызначэнне аб адмене вызначэння аб судовым загадзе ці аб адмове ў адмене вызначэння аб судовым загадзе.

4. У выпадку, прадугледжаным часткай 3 артыкула 348 гэтага Кодэкса, эканамічны суд вобласці (горада Мінска) па выніках разгляду заявы даўжніка або пры задавальненні заявы іншай асобы выносіць вызначэнне аб адмене вызначэння аб судовым загадзе. Па патрабаваннях аб спагнанні грашовых сродкаў, супраць якіх даўжнік ці іншая асоба не заявілі пярэчанняў, эканамічны суд вобласці (горада Мінска) выносіць вызначэнне аб судовым загадзе.

5. Пры адмене вызначэння аб судовым загадзе патрабаванні спагнанніка могуць быць прад'яўлены ў парадку іскавага вядзення, калі іншы парадак не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі.

6. Копіі вызначэння аб адмене вызначэння аб судовым загадзе ці аб адмове ў адмене вызначэння аб судовым загадзе накіроўваюцца спагнанніку, даўжніку, а таксама іншай асобе, які падала матываваную заяву аб адмене вызначэння аб судовым загадзе, не пазней як у тры дні пасля яго вынясення.

### Артыкул 350. Выкананне вызначэння аб судовым загадзе

1. Вызначэнне аб судовым загадзе ўступае ў законную сілу пасля сканчэння дзесяці дзён пасля атрымання яго копіі даўжніком, калі ім не пададзена заява аб адмене вызначэння аб судовым загадзе. Вызначэнне аб судовым загадзе прыводзіцца ў выкананне пасля ўступлення яго ў законную сілу ў парадку, устаноўленым для выканання судовых пастаноў.

2. Вызначэнне аб судовым загадзе з указаннем даты ўступлення яго ў законную сілу выдаецца спагнанніку, калі ва ўстаноўлены тэрмін ад даўжніка не паступіла ў суд заява аб адмене вызначэння аб судовым загадзе, а таксама ў выпадку, прадугледжаным часткай 4 артыкула 349 гэтага Кодэкса.

3. Для спагнання дзяржаўнай пошліны з даўжніка ў бюджэт асобны экземпляр вызначэння аб судовым загадзе з указаннем даты ўступлення яго ў законную сілу накіроўваецца ў падатковы орган.

4. Вызначэнне аб судовым загадзе аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, дзе вырашаны пытанні працаўладкавання асобы, якая абавязана кампенсаваць такія выдаткі, не працуе або працуе, але не ў поўным аб'ёме на працягу шасці месяцаў кампенсуе ў добраахвотным парадку па яе заяве ўказаныя выдаткі, на працягу трох рабочых дзён пасля яго вынясення накіроўваецца ў орган унутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства гэтай асобы для падбору арганізацыі (арганізацый) з мэтай яе працаўладкавання.

5. Вызначэнне аб судовым загадзе, выдадзенае судом, падпісваецца суддзёй і завяраецца пячаткай з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

## ПАДРАЗДЗЕЛ 3
## ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ, ШТО ЎЗНІКАЮЦЬ З АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ І ІНШЫХ ПУБЛІЧНЫХ ПРАВААДНОСІН

## ГЛАВА 33
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 351. Агульныя правілы падведамнасці суду спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін

1. Суды разглядаюць справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, аб абскарджанні (прызнанні неправадзейнымі) ненарматыўных прававых актаў (далей у гэтай главе і главе 34 гэтага Кодэкса, калі не ўказана іншае, – абскарджанне ненарматыўнага прававога акта) дзяржаўных органаў, іншых органаў (камісій), арганізацый (далей у гэтай главе і главе 34 гэтага Кодэкса – органы), службовых асоб, надзеленых дзяржаўнымі або іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, што не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзяніна, правы і законныя інтарэсы юрыдычнай асобы, у тым ліку аб абскарджанні:

1) ненарматыўных прававых актаў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання;

2) рашэнняў Цэнтральнай выбарчай камісіі, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, рашэнняў органаў (органа) – утваральнікаў адпаведнай камісіі;

3) рашэнняў дзяржаўнага органа Рэспублікі Беларусь аб спыненні разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і аб прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў працягу тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь;

4) пастаноў аб прымяненні мер спагнання да грамадзян, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі;

5) пастаноў аб прымяненні дысцыплінарных спагнанняў да адміністрацыйна арыштаваных;

6) рашэнняў (пастаноў) аб прымяненні мер спагнання да асоб, асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін, да пажыццёвага пазбаўлення волі, да непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, да асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай;

7) пастаноў службовых асоб органаў прымусовага выканання;

8) заключэнняў Вышэйшай кваліфікацыйнай калегіі суддзяў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, кваліфікацыйных калегій суддзяў абласных (Мінскага гарадскога) судоў, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска).

2. Суды разглядаюць справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, аб абскарджанні (прызнанні незаконнымі) дзеянняў (бяздзейнасці) (далей у гэтай главе і главе 34 гэтага Кодэкса, калі не ўказана іншае, – абскарджанне дзеянняў (бяздзейнасці)) органаў, службовых асоб, надзеленых дзяржаўнымі або іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, што не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзяніна, правы і законныя інтарэсы юрыдычнай асобы, у тым ліку аб абскарджанні:

1) адміністрацыйных рашэнняў органаў рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, аб адмове ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запісе актаў грамадзянскага стану;

2) папярэджанняў аб магчымасці накіравання грамадзян у лячэбна-працоўны прафілакторый;

3) дзеянняў аб прымяненні дысцыплінарных спагнанняў да адміністрацыйна арыштаваных;

4) дзеянняў (бяздзейнасці) службовых асоб органаў прымусовага выканання;

5) натарыяльных дзеянняў, дзеянняў па сведчанні завяшчанняў і даверанасцей, прыроўненых да натарыяльна засведчаных, або адмовы ў здзяйсненні такіх дзеянняў.

3. Суды разглядаюць справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, па патрабаваннях юрыдычных асоб, грамадзян, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, і іншых грамадзян:

1) аб прызнанні не падлеглым выкананню выканальнага ці іншага дакумента ўпаўнаважанага дзяржаўнага органа або ўпаўнаважанай арганізацыі (службовай асобы), па якім спагнанне праводзіцца ў бясспрэчным парадку, у тым ліку выканальнага надпісу натарыуса, здзейсненага па патрабаваннях у сферы адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін;

2) аб вяртанні з бюджэту грашовых сродкаў, спісаных у бясспрэчным парадку.

4. Суды разглядаюць справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, па патрабаваннях органаў, службовых асоб, надзеленых дзяржаўнымі або

іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, у тым ліку:

1) аб прызнанні неправадзейнай дзяржаўнай рэгістрацыі юрыдычнай асобы, індывідуальнага прадпрымальніка, ажыццёўленай на падставе заведама лжывых звестак, прадстаўленых у орган рэгістрацыі;

2) аб прызнанні неправадзейнай дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі, калі яна ажыццёўлена з парушэннем патрабаванняў актаў заканадаўства;

3) аб прызнанні арганізацыі тэрарыстычнай, датычнай да гандлю людзьмі, экстрэмісцкай, а таксама аб прызнанні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка экстрэмісцкай;

4) аб забароне дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь арганізацыі, прызнанай судом тэрарыстычнай, датычнай да гандлю людзьмі, экстрэмісцкай;

5) аб забароне выкарыстання сімволікі і атрыбутыкі арганізацыі, прызнанай судом экстрэмісцкай, індывідуальнага прадпрымальніка, дзейнасць якога прызнана судом экстрэмісцкай;

6) аб прыпыненні дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама прафесійных саюзаў, іх аб’яднанняў;

7) аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці;

8) аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці;

9) аб спыненні дзейнасці прафесійных саюзаў, іх аб’яднанняў;

10) аб спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка;

11) аб спыненні дзейнасці размешчанага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі, прызнанай судом тэрарыстычнай, датычнай да гандлю людзьмі, экстрэмісцкай;

12) аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі;

13) аб ліквідацыі грамадскіх аб’яднанняў, іх саюзаў (асацыяцый), а таксама мясцовых, рэспубліканскіх, міжнародных фондаў, створаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб’яднанняў, рэлігійных арганізацый;

14) аб ліквідацыі арганізацый, што аказваюць садзейнічанне арганізаванай групе, злачыннай арганізацыі ці створаных на сродкі арганізаванай групы, злачыннай арганізацыі;

15) аб ліквідацыі арганізацыі, прызнанай судом тэрарыстычнай, датычнай да гандлю людзьмі, экстрэмісцкай;

16) аб ліквідацыі юрыдычных асоб у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі;

17) аб спыненні ліцэнзіі, спыненні дзеяння або ануляванні спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі);

18) аб спагнанні з юрыдычных асоб, грамадзян, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, і іншых грамадзян запазычанасці па падатках, зборах (пошлінах), іншых абавязковых плацяжах у рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты і бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама пені, працэнтаў за карыстанне адтэрміноўкай і (або) растэрміноўкай, падатковым крэдытам, калі іншы парадак іх спагнання не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі.

5. Суды разглядаюць іншыя справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 352. Парадак узбуджэння вядзення, разгляду і вырашэння спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін

1. Вядзенне справы, якая ўзнікае з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, узбуджаецца ў судзе па заяве.

2. Разгляд і вырашэнне спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, ажыццяўляюцца па агульных правілах іскавага вядзення з улікам

асаблівасцей, прадугледжаных гэтым падраздзелам, і сутнасці вядзення па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін.

**Артыкул 353. Форма і змест заявы па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, і дакументы, даданыя да яе**

1. Заява па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, і дакументы, што дадаюцца да яе, павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкуламі 238 і 239 гэтага Кодэкса.

2. У заяве па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, павінны быць таксама ўказаны звесткі аб тым, якія правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка або якія дзяржаўныя ці грамадскія інтарэсы парушаны.

**Артыкул 354. Падача заявы па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін**

1. Заява па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, падаецца ў суд пасля захавання абавязковага дасудовага парадку абскарджання, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі для такой катэгорыі спраў.

2. Заява па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, падаецца ў суд па правілах падсуднасці, устаноўленых гэтым Кодэксам, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 355. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, і якія маюць непасрэдны інтарэс у іх зыходзе**

1. Асобамі, якія ўдзельнічаюць у справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, якія маюць непасрэдны інтарэс у іх зыходзе, з’яўляюцца:

1) бакі – заяўнікі і зацікаўленыя асобы;

2) іншыя асобы, правы і абавязкі якіх могуць быць закрануты пры вырашэнні справы.

2. Заяўнікамі ў справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, з’яўляюцца:

1) грамадзянін, юрыдычная асоба, якія звярнуліся ў суд у абарону сваіх правоў і свабод, што парушаны ці аспрэчваюцца, або ў абарону сваіх законных інтарэсаў;

2) грамадзянін, юрыдычная асоба, у абарону правоў, свабод і законных інтарэсаў якіх пададзена заява пракурорам, дзяржаўным органам, юрыдычнай асобай, грамадзянінам, іншай асобай у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі;

3) пракурор, орган або службовая асоба, надзеленыя асобнымі дзяржаўнымі ці іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, якія звярнуліся ў суд для рэалізацыі ўскладзеных на іх паўнамоцтваў у сферы адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін.

3. Зацікаўленымі асобамі ў справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, з’яўляюцца:

1) орган або службовая асоба, надзеленыя асобнымі дзяржаўнымі ці іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, да якіх прад’яўлена патрабаванне па справе, што ўзнікае з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін;

2) грамадзянін, юрыдычная асоба, у дачыненні да якіх заяўнік, які ажыццяўляе паўнамоцтвы ў сферы адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, звярнуўся ў суд.

4. Іншыя асобы, правы і абавязкі якіх могуць быць закрануты пры вырашэнні справы, па іх заяве, хадайніцтве бакоў ці па ініцыятыве суда могуць быць далучаны да ўдзелу

ў справе на баку заяўніка або зацікаўленай асобы да прыняцця судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, калі яна можа паўплываць на іх правы ці абавязкі ў дачыненні да аднаго з бакоў, па правілах, прадугледжаных артыкулам 68 гэтага Кодэкса.

5. У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, асобай, якая ўдзельнічае у справе, што ўзнікае з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, якая мае непасрэдны інтарэс у яе зыходзе, можа быць і арганізацыя, што не з'яўляецца юрыдычнай асобай.

### Артыкул 356. Правы і абавязкі заяўнікаў, зацікаўленых асоб, іншых асоб, правы і абавязкі якіх могуць быць закрануты пры вырашэнні справы

1. Заяўнікі, зацікаўленыя асобы, іншыя асобы, правы і абавязкі якіх могуць быць закрануты пры вырашэнні справы, карыстаюцца правамі і нясуць абавязкі, прадугледжаныя артыкуламі 57, 62 і 68 гэтага Кодэкса, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым падраздзелам.

2. Заяўнік мае права злучыць у адной заяве некалькі ўзаемазвязаных патрабаванняў. У адной заяве таксама могуць быць злучаны патрабаванні некалькіх заяўнікаў і (або) патрабаванні, накіраваныя да некалькіх зацікаўленых асоб. Злучэнне патрабаванняў па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, ажыццяўляецца па правілах, устаноўленых артыкулам 245 гэтага Кодэкса.

3. Зацікаўленая асоба можа прад'явіць заяўніку сустрэчную заяву для разгляду яе сумесна з першапачатковай заявай у парадку, устаноўленым артыкулам 248 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 357. Прымяненне забяспечвальных мер па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін

1. Прымяненне забяспечвальных мер па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з главой 19 гэтага Кодэкса з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтым падраздзелам.

2. Да забяспечвальных мер па справах аб абскарджанні ненарматыўных прававых актаў, дзеянняў (бяздзейнасці) органаў, службовых асоб, надзеленых дзяржаўнымі ці іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, таксама адносіцца прыпыненне поўнасцю або ў частцы дзеяння ненарматыўнага прававога акта, што абскарджваецца, выканання дзеянняў, якія абскарджваюцца.

### Артыкул 358. Перагаворы бакоў па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін

1. Пры разглядзе спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, бакі могуць праводзіць перагаворы, калі гэта не супярэчыць сутнасці заяўленых патрабаванняў. Перагаворы могуць датычыцца толькі правоў і абавязкаў бакоў як суб'ектаў спрэчных адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, не могуць выходзіць за межы кампетэнцыі адпаведных органа, службовай асобы, якія надзелены дзяржаўнымі ці іншымі публічнымі паўнамоцтвамі і ўдзельнічаюць у справе.

2. Вынікамі перагавораў бакоў могуць быць, у прыватнасці:

1) адмова ад патрабаванняў поўнасцю або ў частцы, прызнанне патрабаванняў поўнасцю або ў частцы ў адпаведнасці з артыкулам 272 гэтага Кодэкса;

2) прызнанне бокам абставін, на якіх другі бок грунтуе свае патрабаванні ці пярэчанні, пагадненне бакоў па фактычных абставінах справы, прадугледжаныя артыкулам 186 гэтага Кодэкса;

3) пагадненне бакоў аб размеркаванні судовых выдаткаў, прадугледжанае часткай 7 артыкула 149 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 359. Падставы для адмовы ва ўзбуджэнні вядзення па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін**

Суд адмаўляе ва ўзбуджэнні вядзення па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, калі маюцца падставы, прадугледжаныя пунктамі 1–4 і 7 часткі 1 артыкула 241 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку, калі з заявы аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) не вынікае, што гэтымі актам, дзеяннямі (бяздзейнасцю) парушаюцца або іншым чынам закранаюцца правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка.

**Артыкул 360. Падставы для вяртання заявы па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін**

Суд вяртае заяву па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, калі маюцца падставы, прадугледжаныя часткай 1 артыкула 244 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадках, калі:

1) заява звязана са спрэчкай аб праве, што вынікае з грамадзянскіх праваадносін, падведамнай суду;

2) патрабаванне не падлягае разгляду ў парадку вядзення па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін.

**Артыкул 361. Абавязак доказвання**

1. Пры разглядзе спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, кожны бок павінен даказаць тыя абставіны, на якія ён спасылаецца як на падставы сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, калі іншы парадак размеркавання абавязкаў доказвання не ўстаноўлены гэтым падраздзелам.

2. Абавязак доказвання законнасці абскарджваных ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органаў, службовых асоб, надзеленых дзяржаўнымі або іншымі публічнымі паўнамоцтвамі, ускладаецца на орган, арганізацыю ці асобу, якія яго прынялі (выдалі), іх здзейснілі.

**Артыкул 362. Тэрмін разгляду спраў, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін**

Справы, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, разглядаюцца судом не пазней за два месяцы пасля ўзбуджэння вядзення справы, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 363. Падставы для пакідання заявы па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, без разгляду**

Суд пакідае заяву па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, без разгляду, калі маюцца падставы, прадугледжаныя пунктамі 1–5, 8, 10 і 13–17 артыкула 128 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадках, калі:

1) у вядзенні суда агульнай юрысдыкцыі маецца справа па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах;

2) патрабаванне не падлягае разгляду ў парадку вядзення па справах, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін.

**Артыкул 364. Падставы для спынення вядзення справы, што ўзнікае з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін**

1. Суд спыняе вядзенне справы, што ўзнікае з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, калі маюцца падставы, прадугледжаныя пунктамі 1–3, 6–8, 10 і 12 артыкула 130 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку, калі абскарджванымі ненарматыўным прававым актам, дзеяннямі (бяздзейнасцю) не парушаюцца або іншым чынам не закранаюцца правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка.

2. Суд таксама мае права спыніць вядзенне справы, што ўзнікае з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, калі ў пазасудовым парадку абскарджваныя ненарматыўны прававы акт, дзеянні (бяздзейнасць) адменены або перагледжаны, парушэнні ліквідаваны і перасталі закранаць правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка.

## ГЛАВА 34
## ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ АБСКАРДЖАННІ НЕНАРМАТЫЎНЫХ ПРАВАВЫХ АКТАЎ, ДЗЕЯННЯЎ (БЯЗДЗЕЙНАСЦІ) ОРГАНАЎ, СЛУЖБОВЫХ АСОБ, НАДЗЕЛЕНЫХ АСОБНЫМІ ДЗЯРЖАЎНЫМІ АБО ІНШЫМІ ПУБЛІЧНЫМІ ПАЎНАМОЦТВАМІ

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 365. Падача заявы**

1. Грамадзянін, юрыдычная асоба маюць права падаць у суд заяву аб абскарджанні (прызнанні неправадзейным) ненарматыўнага прававога акта, аб абскарджанні (прызнанні незаконнымі) дзеянняў (бяздзейнасці) органа, службовай асобы, надзеленай дзяржаўнымі або іншымі публічнымі паўнамоцтвамі (далей у гэтай главе, калі не ўказана іншае, – органы, службовыя асобы), калі гэтыя грамадзянін, юрыдычная асоба лічаць, што абскарджваныя ненарматыўны прававы акт, дзеянні (бяздзейнасць) не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзяніна, правы і законныя інтарэсы юрыдычнай асобы або перашкаджаюць іх ажыццяўленню ці незаконна ўскладаюць на заяўніка якія-небудзь абавязак.

2. Пракурор у парадку, устаноўленым гэтай главой, мае права звярнуцца ў суд з заявай, указанай у частцы 1 гэтага артыкула, у выпадках, прадугледжаных артыкулам 71 гэтага Кодэкса.

3. Да ненарматыўнага прававога акта, што можа быць абскарджаны ў адпаведнасці з гэтай главой, адносіцца афіцыйны дакумент устаноўленай формы, прыняты (выдадзены) органам, службовай асобай, дзе не маецца нормаў права, і які з мэтай прымянення дзейных нормаў права ўстанаўлівае абавязковыя прадпісанні распарадчага і (або) арганізацыйнага характару, у тым ліку ў дачыненні да індывідуальна вызначаных асоб (змяняе ці спыняе дзеянне гэтых прадпісанняў), і (або) разлічаны на аднаразовае прымяненне. Паўнамоцтвы на прыняцце, парадак прыняцця (выдання) і форма ненарматыўнага прававога акта ўстанаўліваюцца заканадаўствам.

4. Да дзеянняў (бяздзейнасці), якія могуць быць абскарджаны ў адпаведнасці з гэтай главой, адносяцца калегіяльныя, аднаасобныя дзеянні (бяздзейнасць) органа, службовай асобы, што не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка або перашкаджаюць іх ажыццяўленню ці незаконна ўскладаюць на заяўніка які-небудзь абавязак.

5. Заява, указаная ў частцы 1 гэтага артыкула, калі заканадаўствам не ўстаноўлены іншы парадак, падаецца ў суд пасля абскарджання адпаведных ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасцей) органу або службовай асобе больш высокага ўзроўню у парадку падпарадкаванасці, якія абавязаны разгледзець скаргу і аб выніках разгляду

паведаміць грамадзяніну, юрыдычнай асобе ў месячны тэрмін, калі іншы тэрмін не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі.

6. Калі іншая не ўстаноўлена гэтай главой або заканадаўчымі актамі для адпаведнай катэгорыі спраў, заява аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органа падаецца ў суд па месцы жыхарства (знаходжання) заяўніка ці па месцы знаходжання гэтага органа, а ў выпадку абскарджання ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) службовай асобы – па месцы жыхарства (знаходжання) заяўніка або па месцы знаходжання органа, дзе службовая асоба выконвае свае абавязкі.

### Артыкул 366. Тэрміны для звароту ў суд з заявай аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці)

1. Заява аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органа, службовай асобы можа быць пададзена ў месячны тэрмін пасля атрымання грамадзянінам, юрыдычнай асобай адмовы органа або службовай асобы больш высокага ўзроўню ў парадку падпарадкаванасці ў задавальненні скаргі ці з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі, калі грамадзянінам, юрыдычнай асобай не быў атрыманы на яе адказ, а пры адсутнасці абавязковага дасудовага парадку абскарджання – з дня, калі грамадзяніну стала вядома аб парушэнні яго правоў, свабод, законных інтарэсаў, юрыдычнай асобе стала вядома аб парушэнні яго правоў, законных інтарэсаў, калі іншы тэрмін і (або) парадак не ўстаноўлены гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі для асобных відаў праваадносін.

2. Прапушчаны па ўважлівых прычынах тэрмін для падачы заявы аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органа, службовай асобы можа быць адноўлены судом па заяве заяўніка.

3. Пропуск тэрміну для звароту ў суд (адмова ў задавальненні заявы аб яго аднаўленні) з'яўляецца падставай для адмовы ў задавальненні заявы аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці).

### Артыкул 367. Змест заявы і дакументы, даданыя да яе

1. Заява аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органа, службовай асобы і даданыя да заявы дакументы павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 353 гэтага Кодэкса.

2. У заяве таксама ўказваюцца:

1) якім органам або службовай асобай прыняты (выдадзены) абскарджваны ненарматыўны прававы акт ці здзейснены абскарджваныя дзеянні (бяздзейнасць);

2) назва, нумар, дата прыняцця (выдання), іншыя неабходныя рэквізіты абскарджванага ненарматыўнага прававога акта і звесткі аб органе, што яго прыняў (выдаў);

3) звесткі аб тым, у чым заключаецца абскарджваная бяздзейнасць (ад прыняцця якіх рашэнняў або ад здзяйснення якіх дзеянняў у адпаведнасці з абавязкамі, ускладзенымі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, ухіляюцца орган, службовая асоба);

4) іншыя вядомыя звесткі ў дачыненні да абскарджваных ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці);

5) звесткі аб тым, якія правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка парушаны абскарджванымі ненарматыўным прававым актам, дзеяннямі (бяздзейнасцю);

6) акты заканадаўства, якім, па меркаванні заяўніка, не адпавядаюць абскарджваныя ненарматыўны прававы акт, дзеянні (бяздзейнасць);

7) патрабаванне заяўніка аб прызнанні ненарматыўнага прававога акта несапраўдным, дзеянняў (бяздзейнасці) незаконнымі.

3. Да заявы дадаецца (пры наяўнасці) копія адмовы органа або службовай асобы больш высокага ўзроўню ў парадку падпарадкаванасці ў задавальненні скаргі па тым жа

прадмеце, указаным у пададзенай заяве, калі абавязковы дасудовы парадак абскарджання ўстаноўлены гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі для гэтай катэгорыі спраў.

**Артыкул 368. Разгляд справы**

1. Пры разглядзе справы аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органа, службовай асобы суд у судовым пасяджэнні правярае:

1) ці парушаны правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка;

2) ці захаваны тэрміны звароту ў суд;

3) ці захаваны патрабаванні заканадаўства, што ўстанаўліваюць паўнамоцтвы органа або службовай асобы, якія прынялі (выдалі) абскарджваны ненарматыўны прававы акт, здзейснілі абскарджваныя дзеянні (бяздзейнасць), на яго прыняцце (выданне), іх здзяйсненне;

4) ці захаваны патрабаванні заканадаўства, якія ўстанаўліваюць парадак прыняцця (выдання) абскарджванага ненарматыўнага прававога акта, здзяйснення абскарджваных дзеянняў (бяздзейнасці) у выпадку, калі такі парадак устаноўлены;

5) ці захаваны патрабаванні заканадаўства, якія ўстанаўліваюць падставы для прыняцця (выдання) абскарджванага ненарматыўнага прававога акта, здзяйснення абскарджваных дзеянняў (бяздзейнасці), калі такія падставы прадугледжаны заканадаўствам;

6) ці адпавядае змест абскарджванага ненарматыўнага прававога акта, ажыццёўленых абскарджваных дзеянняў (бяздзейнасці) заканадаўству, што рэгулюе спрэчныя адносіны.

2. Суд не звязаны падставамі і довадамі, выкладзенымі ў заяве аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органа, службовай асобы.

3. Пры разглядзе справы на орган, службовую асобу, якія прынялі (выдалі) абскарджваны ненарматыўны прававы акт, здзейснілі абскарджваныя дзеянні (бяздзейнасць), ускладаецца абавязак даказвання:

1) адпаведнасці ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) заканадаўству;

2) наяўнасці паўнамоцтваў у органа, службовай асобы, якія прынялі (выдалі) абскарджваны ненарматыўны прававы акт, здзейснілі абскарджваныя дзеянні (бяздзейнасць), на яго прыняцце (выданне), іх здзяйсненне;

3) абставін, што паслужылі падставай для прыняцця (выдання) абскарджванага ненарматыўнага прававога акта, ажыццяўлення абскарджваных дзеянняў (бяздзейнасці).

4. У выпадку непрадстаўлення органам або службовай асобай, якія прынялі (выдалі) абскарджваны ненарматыўны прававы акт, здзейснілі абскарджваныя дзеянні (бяздзейнасць), доказаў, неабходных для разгляду справы і прыняцця рашэння, суд можа выпатрабаваць іх па сваёй ініцыятыве.

**Артыкул 369. Рашэнне суда па справе**

1. Па выніках разгляду справы аб абскарджанні ненарматыўнага прававога акта, дзеянняў (бяздзейнасці) органа, службовай асобы суд выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні заявы ці аб задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы.

2. Суд, устанавіўшы, што абскарджваныя ненарматыўны прававы акт, дзеянні (бяздзейнасць) органа, службовай асобы прыняты (выдадзены), здзейснены адпаведна заканадаўству, у межах паўнамоцтваў органа, службовай асобы, выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні заявы.

3. Суд, устанавіўшы, што абскарджваныя ненарматыўны прававы акт, дзеянні (бяздзейнасць) органа, службовай асобы поўнасцю або ў частцы не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка, выносіць рашэнне аб задавальненні заявы поўнасцю ці ў частцы, прызнанні ненарматыўнага прававога акта несапраўдным, дзеянняў (бяздзейнасці) незаконнымі поўнасцю або ў

частцы, а таксама абавязвае зацікаўленую асобу ў межах яе паўнамоцтваў спосабам, адпаведным заканадаўству, ліквідаваць у поўным аб’ёме дапушчаныя парушэнні правоў, свабод і законных інтарэсаў заяўніка або перашкоды ў іх ажыццяўленні.

4. Суд можа прызнаць ненарматыўны прававы акт неправадзейным, дзеянні (бяздзейнасць) незаконнымі з моманту яго прыняцця (выдання), іх здзяйснення ці з іншай вызначанай ім даты.

5. Калі ў пазасудовым парадку абскарджваныя ненарматыўны прававы акт, дзеянні (бяздзейнасць) былі адменены або зменены ці парушэнні былі ліквідаваны, але не перасталі закранаць правы, свабоды і законныя інтарэсы заяўніка, суд можа прызнаць такі ненарматыўны прававы акт неправадзейным, такія дзеянні (бяздзейнасць) незаконнымі ў перыяд часу да іх адмены або змянення ці да ліквідавання парушэнняў.

6. Калі гэтым Кодэксам не прадугледжана іншае, у рэзалютыўнай частцы рашэння суда аб прызнанні ненарматыўнага прававога акта неправадзейным, дзеянняў (бяздзейнасці) незаконнымі ўказваюцца:

1) орган, службовая асоба, якія прынялі (выдалі) ненарматыўны прававы акт і (або) здзейснілі дзеянні (бяздзейнасць), нумар (пры наяўнасці) і дата прыняцця (выдання) ненарматыўнага прававога акта, дата і месца здзяйснення дзеянняў (бяздзейнасці), іншыя неабходныя рэквізіты і звесткі;

2) аб прызнанні ненарматыўнага прававога акта неправадзейным, дзеянняў (бяздзейнасці) незаконнымі поўнасцю або ў частцы;

3) з якога моманту (у які перыяд часу) ненарматыўны прававы акт прызнаны неправадзейным, дзеянні (бяздзейнасць) прызнаны незаконнымі, а таксама аб абавязку ліквідаваць дапушчаныя парушэнні або перашкоды ў іх ажыццяўленні.

7. Рашэнне суда аб задавальненні заяўленага патрабавання на працягу пяці дзён пасля яго ўступлення ў законную сілу накіроўваецца зацікаўленай асобе ці больш высокага ўзроўню у парадку падпарадкаванасці органу або службовай асобе для ліквідавання дапушчаных парушэнняў правоў, свабод і законных інтарэсаў заяўніка ці перашкод у іх ажыццяўленні.

8. Аб выкананні рашэння суда павінна быць паведамлена ў суд і заяўніку ў тэрмін не больш за адзін месяц пасля атрымання рашэння.

## § 2. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні пастаноў, дзеянняў (бяздзейнасці) службовых асоб органаў прымусовага выканання

### Артыкул 370. Падача заявы

1. Бакі выканаўчага вядзення, іншыя асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны пры выкананні выканальнага дакумента, а таксама пракурор у выпадках, прадугледжаных артыкулам 71 гэтага Кодэкса, маюць права падаць у суд заяву аб абскарджанні пастановы і (або) дзеянняў (бяздзейнасці) судовага выканаўцы, іншага работніка органа прымусовага выканання, на каго ўскладзены функцыі па непасрэдным выкананні выканальных дакументаў (далей – судовы выканаўца), аб абскарджанні пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання, вынесенага па выніках разгляду ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, скаргі (пратэсту) на пастанову, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы (далей – пастанова кіраўніка органа прымусовага выканання), у выпадку прызнання скаргі (пратэсту) абгрунтаванай поўнасцю або ў частцы.

2. Заява, указаная ў частцы 1 гэтага артыкула, падаецца ў суд па месцы знаходжання органа прымусовага выканання, дзе адпаведны судовы выканаўца або кіраўнік выконвае свае абавязкі. Заява падаецца ў эканамічны суд вобласці (горада Мінска) у выпадку выканання выканальных дакументаў, выдадзеных эканамічнымі судамі, а таксама іншых выканальных дакументаў у дачыненні да юрыдычнай асобы, грамадзяніна, які ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую ці іншую дзейнасць, па справах, звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці. Калі разгляд заявы

не аднесены да падсуднасці эканамічных судоў вобласці (горада Мінска), яна падаецца ў раённы (гарадскі) суд.

3. Заява аб абскарджанні пастановы, дзеянняў (бяздзейнасці) судовага выканаўцы (за выключэннем пастановы, дзеянняў (бяздзейнасці) Галоўнага судовага выканаўцы Рэспублікі Беларусь) можа быць пададзена ў суд пасля абскарджання іх у дасудовым парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, на працягу дзесяці дзён пасля атрымання пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання.

4. Заява аб абскарджанні пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання аб прызнанні скаргі (пратэсту) абгрунтаванай можа быць пададзена непасрэдна ў суд на працягу дзесяці дзён пасля атрымання адпаведнай пастановы.

5. Заява аб абскарджанні пастановы, дзеянняў (бяздзейнасці) Галоўнага судовага выканаўцы Рэспублікі Беларусь можа быць пададзена непасрэдна ў суд на працягу дзесяці дзён пасля атрымання адпаведнай пастановы, або з дня здзяйснення гэтых дзеянняў (устанаўлення факту гэтай бяздзейнасці), ці з дня, калі асоба – падавец заявы, не апавешчаная належным чынам аб часе і месцы здзяйснення гэтых дзеянняў, даведалася або павінна было даведацца аб іх здзяйсненні.

**Артыкул 371. Змест заявы**

1. Заява аб абскарджанні пастановы, дзеянняў (бяздзейнасці) судовага выканаўцы, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання і дадаsuccessful да заявы дакументы павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 353 гэтага Кодэкса.

2. У заяве таксама ўказваюцца:

1) назва выканальнага дакумента, у сувязі з выкананнем якога абскарджваюцца пастанова, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, пастанова кіраўніка органа прымусовага выканання, нумар выканальнага дакумента і дата яго выдачы, патрабаванні, змешчаныя ў выканальным дакуменце;

2) найменне суда, іншага ўпаўнаважанага органа, прозвішча і ініцыялы службовай асобы, якія выдалі выканальны дакумент;

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або назву бакоў выканаўчага вядзення, іх месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання, банкаўскія рэквізіты, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці).

**Артыкул 372. Разгляд справы**

1. Справы аб абскарджанні пастановы, дзеянняў (бяздзейнасці) судовага выканаўцы, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання разглядаюцца не пазней за адзін месяц пасля ўзбуджэння вядзення справы.

2. Аб часе і месцы разгляду справы апавяшчаюцца заяўнік, зацікаўленая асоба, а таксама іншыя асобы, правы і абавязкі якіх могуць быць закрануты пры вырашэнні справы. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам, не перашкаджае разгляду справы.

**Артыкул 373. Рашэнне суда па справе**

1. Па выніках разгляду заявы аб абскарджанні пастановы, дзеянняў (бяздзейнасці) судовага выканаўцы, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання суд выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні заявы ці аб задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы.

2. Суд, устанавіўшы, што абскарджваныя пастанова, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, пастанова кіраўніка органа прымусовага выканання прыняты (выдадзены), здзейснены адпаведна заканадаўству, у межах паўнамоцтваў судовага выканаўцы, кіраўніка органа прымусовага выканання, выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні заявы.

3. Суд, устанавіўшы, што абскарджваныя пастанова, дзеянні (бяздзейнасць) судовага выканаўцы, пастанова кіраўніка органа прымусовага выканання поўнасцю ці ў частцы не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы і законныя інтарэсы заяўніка, выносіць рашэнне аб задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы, прызнанні пастановы неправадзейнай ці дзеянняў (бяздзейнасці) незаконнымі поўнасцю або ў частцы, а таксама вызначае меры, што павінны быць прыняты зацікаўленай асобай для ліквідавання дапушчаных парушэнняў правоў і законных інтарэсаў заяўніка ці перашкод у іх ажыццяўленні.

4. Рашэнне суда аб задавальненні заяўленага патрабавання на працягу пяці дзён пасля яго ўступлення ў законную сілу накіроўваецца зацікаўленай асобе ці больш высокага ўзроўню у парадку падпарадкаванасці кіраўніку органа прымусовага выканання для ліквідавання дапушчаных парушэнняў правоў і законных інтарэсаў заяўніка або перашкод у іх ажыццяўленні.

5. Аб выкананні рашэння суда павінна быць паведамлена ў суд і заяўніку ў тэрмін не больш за адзін месяц пасля атрымання рашэння.

## § 3. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні натарыяльных дзеянняў, дзеянняў па сведчанні завяшчанняў і даверанасцей, прыроўненых да натарыяльна засведчаных, або адмовы ў здзяйсненні такіх дзеянняў

### Артыкул 374. Падача і разгляд заявы

1. Асоба, якая звярнулася за здзяйсненнем натарыяльнага дзеяння, дзеяння па сведчанні завяшчання ці даверанасці, прыроўненых да натарыяльна засведчаных, і якая лічыць няправільным здзейсненае дзеянне або неправамерным адмову ў яго здзясненні, а таксама асоба, чые інтарэсы парушаны ў сувязі са здзясненнем такога дзеяння, маюць права падаць заяву аб абскарджанні натарыяльнага дзеяння, дзеяння па сведчанні завяшчання ці даверанасці, прыроўненых да натарыяльна засведчаных, або адмовы ў яго здзясненні.

2. Заява, указаная ў частцы 1 гэтага артыкула, падаецца ў суд па месцы знаходжання натарыяльнай канторы, дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, службовым асобам якіх адпаведна заканадаўчым актам прадастаўлена права здзясняць натарыяльныя дзеянні, дзеянні па сведчанні завяшчання ці даверанасці, прыроўненых да натарыяльна засведчаных, калі іншае не ўстаноўлена часткай 3 гэтага артыкула.

3. Заява аб абскарджанні дзеяння па сведчанні завяшчання або адмовы ў здзясненні гэтага дзеяння капітанам марскога судна ці судна ўнутранага плавання, якое плавае пад Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь, падаецца ў суд па месцы прыпіскі судна або па месцы ўліку судна ў Рэспубліцы Беларусь.

4. Заява аб абскарджанні дзеянняў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, або адмовы ў здзясненні такіх дзеянняў падаецца ў суд у дзесяцідзённы тэрмін з дня, калі заяўніку стала вядома аб здзейсненым дзеянні ці аб адмове ў яго здзясненні.

5. Заява разглядаецца судом з удзелам заяўніка і зацікаўленай асобы – натарыуса або іншай службовай асобы, якая здзейсніла абскарджванае дзеянне ці адмовіла ў яго здзясненні. Няяўка ўказаных асоб не перашкаджае вырашэнню справы.

### Артыкул 375. Рашэнне суда па справе

1. Па выніках разгляду заявы аб абскарджанні натарыяльнага дзеяння, дзеяння па сведчанні завяшчання ці даверанасці, прыроўненых да натарыяльна засведчаных, або адмовы ў здзясненні такіх дзеянняў суд выносіць матываванае рашэнне аб адмове ў задавальненні заявы ці аб задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы.

2. Суд, устанавіўшы, што абскарджваныя дзеянне або адмова ў яго здзясненні адпавядаюць заканадаўству, здзейснены ў межах паўнамоцтваў зацікаўленай асобы, выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні заявы.

3. Суд, устанавіўшы, што абскарджваныя дзеянне ці адмова ў яго здзясненні поўнасцю або ў частцы не адпавядаюць заканадаўству і парушаюць правы і законныя інтарэсы заяўніка, выносіць рашэнне аб задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы, прызнанні натарыяльнага дзеяння, дзеяння па сведчанні завяшчання ці даверанасці, прыроўненых да натарыяльна засведчаных, або адмовы ў здзясненні такога дзеяння незаконнымі поўнасцю ці ў частцы, а таксама адмяняе здзейсненае дзеянне поўнасцю або ў частцы ці абавязвае зацікаўленую асобу выканаць пэўныя дзеянні або ўнесці выпраўленні ў здзейсненае дзеянне, ліквідаваўшы дапушчаныя пры здзясненні гэтага дзеяння парушэнні.

## § 4. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні рашэнняў Цэнтральнай выбарчай камісіі, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, рашэнняў органаў (органа) – утваральнікаў адпаведнай камісіі

### Артыкул 376. Падача заявы

1. Асоба, не згодная з рашэннем Цэнтральнай выбарчай камісіі, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата (далей у гэтым параграфе – камісія), мае права падаць у суд заяву аб абскарджанні гэтага рашэння ў выпадках і парадку, прадугледжаных законам.

2. У выпадку калі законам устаноўлены папярэдні зварот з заявай у камісію і гэты парадак заяўнікам не выкананы, суд накіроўвае заяву ў адпаведную камісію.

3. Суб’екты, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі, маюць права падаць заяву аб абскарджанні рашэння органаў (органа) – утваральнікаў адпаведнай камісіі ў суд у трохдзённы тэрмін, вылічаны ў каляндарных днях, з дня прыняцця рашэння ў парадку, устаноўленым законам.

4. Заява аб абскарджанні рашэння камісіі, рашэння органаў (органа) – утваральнікаў камісіі падаецца ў суд па месцы знаходжання камісіі, органаў (органа) – утваральнікаў камісіі з захаваннем правілаў радавой падсуднасці, устаноўленых артыкуламі 43, 44 і 46 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 377. Разгляд заявы

1. Заява аб абскарджанні рашэння камісіі павінна быць разгледжана судом не пазней чым у пяцідзённы тэрмін, вылічаны ў каляндарных днях, з дня яе падачы, калі іншае не прадугледжана законам, а заява аб абскарджанні рашэння органаў (органа) – утваральнікаў камісіі – у трохдзённы тэрмін, вылічаны ў каляндарных днях, з дня яе падачы.

2. Заява разглядаецца судом з выклікам заяўніка, а таксама прадстаўніка адпаведнай камісіі, прадстаўнікоў органаў (органа) – утваральнікаў камісіі. Няяўка ўказаных асоб не з’яўляецца перашкодай для вырашэння справы.

3. Справу па заяве аб абскарджанні рашэння камісіі, рашэння органаў (органа) – утваральнікаў камісіі суд разглядае з удзелам пракурора.

### Артыкул 378. Рашэнне суда па справе

1. Па выніках разгляду заявы аб абскарджанні рашэння камісіі, рашэння органаў (органа) – утваральнікаў камісіі суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

1) аб адмове ў задавальненні заявы і пакіданні абскарджванага рашэння без змянення;

2) аб задавальненні заявы, прызнанні абскарджванага рашэння неправадзейным поўнасцю або ў частцы і аб ускладанні на зацікаўленую асобу абавязку ліквідаваць дапушчаныя парушэнні.

2. Рашэнне суда па справе аб абскарджанні рашэння камісіі, рашэння органаў (органа) – утваральнікаў камісіі уступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння і абскарджанню і (або) апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае. Пасля вынясення рашэння суд неадкладна накіроўвае копіі гэтага рашэння ўсім асобам, якія ўдзельнічаюць у справе.

### § 5. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні адміністрацыйных рашэнняў органаў рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, аб адмове ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запісе актаў грамадзянскага стану

**Артыкул 379. Падсуднасць**

Заява аб абскарджанні адміністрацыйных рашэнняў органаў рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, аб адмове ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запісе актаў грамадзянскага стану пры адсутнасці спрэчкі аб праве разглядае суд па месцы жыхарства заяўніка.

**Артыкул 380. Змест заявы**

1. У заяве павінна быць указана:

1) якім органам быў зроблены запіс акта грамадзянскага стану;

2) у чым заключаецца няправільнасць запісу акта грамадзянскага стану і якімі доказамі гэта пацвярджаецца;

3) па якіх прычынах было адмоўлена ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запіс акта грамадзянскага стану.

2. Да заявы неабходна дадаць:

1) пасведчанне аб рэгістрацыі акта грамадзянскага стану, выдадзенае на падставе абскарджванага запісу акта грамадзянскага стану;

2) адміністрацыйнае рашэнне органа, які рэгіструе акты грамадзянскага стану, аб адмове ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запіс акта грамадзянскага стану;

3) іншыя неабходныя па справе дакументы.

**Артыкул 381. Рашэнне суда па справе**

1. Па выніках разгляду заявы аб абскарджанні адміністрацыйных рашэнняў органаў рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, аб адмове ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запісе актаў грамадзянскага стану суд выносіць рашэнне аб адмове ў задавальненні заявы ці аб задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы.

2. У рашэнні суда, якім задаволена заява аб абскарджанні адмовы ва ўнясенні змяненняў, дапаўненняў, выпраўленняў у запіс акта грамадзянскага стану, указваецца, у які запіс (якім органам, што рэгіструе акты грамадзянскага стану, і ў дачыненні да якіх асоб складзены, яго нумар і дата) і якія канкрэтна змяненні, дапаўненні, выпраўленні неабходна ўнесці.

3. Рашэнне суда, якім устаноўлена няправільнасць звестак, указаных у запісе акта грамадзянскага стану, служыць падставай для змянення і (або) выпраўлення гэтых звестак у такім запісе адпаведным органам, што рэгіструе акты грамадзянскага стану.

## § 6. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні рашэнняў (пастаноў) аб прымяненні мер спагнання да асоб, асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін, да пажыццёвага пазбаўлення волі, да непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, да асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, аб абскарджанні пастаноў, дзеянняў аб прымяненні дысцыплінарных спагнанняў да адміністрацыйна арыштаваных

### Артыкул 382. Падсуднасць

Заявы асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін, да пажыццёвага пазбаўлення волі, да непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, да асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, аб абскарджанні рашэнняў (пастаноў) аб прымяненні да іх мер спагнання і заявы адміністрацыйна арыштаваных аб абскарджанні пастаноў, дзеянняў аб прымяненні да іх дысцыплінарных спагнанняў разглядае суд па месцы знаходжання (месцы прысутнасці) заяўніка.

### Артыкул 383. Падача і разгляд заявы

1. Заява можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін з дня, калі асуджанаму да папраўчых работ, абмежавання волі, арышту, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін, да пажыццёвага пазбаўлення волі, непаўналетняму, асуджанаму з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, асобе, якая ўтрымліваецца пад вартай, адміністрацыйна арыштаванаму стала вядома аб парушэнні іх права, ці пасля абскарджання рашэння (пастановы) аб прымяненні меры спагнання або пастановы, дзеянняў аб прымяненні дысцыплінарнага спагнання службовай асобе больш высокага ўзроўню з дня атрымання адмовы ў задавальненні скаргі ці з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі службовай асобе больш высокага ўзроўню, калі заяўнікам не быў атрыманы на яе адказ.

2. Па заявах асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, суд неадкладна пасля ўзбуджэння вядзення справы выпатрабуе ў органа, службовай асобы, якія маюць права накладаць спагнанне, усе неабходныя дакументы, што характарызуюць асобу такіх асуджаных, а таксама копіі матэрыялаў па аспрэчваных спагнаннях. Па заявах асуджаных да арышту, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін, да пажыццёвага пазбаўлення волі, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, адміністрацыйна арыштаваных такія матэрыялы дадаюцца да заяў тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў, адміністрацыяй устаноў, што выконваюць пакаранне, месцаў утрымання пад вартай, месцаў адбывання адміністрацыйнага арышту.

3. Падача заявы асобамі, указанымі ў частцы 1 гэтага артыкула, не прыпыняе выканання абскарджваных рашэння (пастановы) або дзеянняў да вырашэння заявы.

4. Заявы асуджаных да арышту, пазбаўлення волі на пэўны тэрмін, да пажыццёвага пазбаўлення волі, асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, аб абскарджанні рашэння (пастановы) аб прымяненні да іх мер спагнання і заявы адміністрацыйна арыштаваных аб абскарджанні пастановы, дзеянняў аб прымяненні да іх дысцыплінарных спагнанняў разглядаюцца судом не пазней дзесяці каляндарных дзён пасля паступлення іх у суд. Заявы асуджаных да папраўчых работ, абмежавання волі, непаўналетніх, асуджаных з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, аб абскарджанні рашэння (пастановы) аб прымяненні да іх мер спагнанні разглядаюцца судом не пазней дзесяці дзён пасля паступлення ў суд выпатрабаваных дакументаў і матэрыялаў, указаных у частцы 2 гэтага артыкула.

5. Заява разглядаецца з удзелам заяўніка ў выпадку прызнання судом яго яўкі ў судовае пасяджэнне абавязковай, прадстаўніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, установы, што выконвае пакаранне, спецыяльнай выхаваўчай установы, дзе знаходзіцца

непаўналетні, асуджаны з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, або месца адбывання адміністрацыйнага арышту. Заяўнікі, асуджаныя да папраўчых работ, абмежавання волі, непаўналетнія, асуджаныя з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, апавяшчаюцца аб часе і месцы судовага пасяджэння, але іх няяўка пры ўмове належнага паведамлення не перашкаджае разгляду справы.

**Артыкул 384. Рашэнне суда па справе**

1. Па выніках разгляду заявы аб абскарджанні рашэння (пастановы) аб прымяненні меры спагнання або пастановы, дзеянняў аб прымяненні дысцыплінарнага спагнання суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

1) аб адмове ў задавальненні заявы і пакіданні без змянення абскрджваных рашэння, пастановы ці дзеянняў;

2) аб задавальненні заявы, прызнанні абскрджваных рашэння, пастановы неправадзейнымі або дзеянняў незаконнымі, а таксама аб адмене адпаведных рашэння, пастановы ці дзеянняў.

2. Рашэнне суда аб задавальненні заявы падлягае неадкладнаму выкананню.

## § 7. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні папярэджанняў аб магчымасці накіравання грамадзян у лячэбна-працоўны прафілакторый, пастаноў аб прымяненні мер спагнання да грамадзян, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі

**Артыкул 385. Падсуднасць**

1. Заяву грамадзяніна аб абскарджанні вынесенага ў дачыненні да яго папярэджання аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядае суд па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) заяўніка.

2. Заяву грамадзяніна, які знаходзіцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб абскарджанні пастановы аб прымяненні да яго мер спагнання разглядае суд па месцы знаходжання лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

**Артыкул 386. Падача і разгляд заявы**

1. Заява, указаная ў частцы 1 артыкула 385 гэтага Кодэкса, можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін пасля абвяшчэння грамадзяніну папярэджання аб магчымасці накіравання яго ў лячэбна-працоўны прафілакторый, або з дня атрымання адмовы ў задавальненні скаргі пры абскарджанні папярэджання службовай асобе (пракурору) больш высокага ўзроўню, ці з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі службовай асобе (пракурору) больш высокага ўзроўню, калі заяўнікам не быў атрыманы на яе адказ. Да заявы грамадзянінам дадаецца копія папярэджання аб магчымасці накіравання яго ў лячэбна-працоўны прафілакторый.

2. Заява, указаная ў частцы 2 артыкула 385 гэтага Кодэкса, можа быць пададзена ў суд у месячны тэрмін з дня азнаямлення грамадзяніна, які знаходзіцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, з пастановай аб прымяненні да яго меры спагнання, або з дня атрымання адмовы ў задавальненні скаргі пры абскарджанні пастановы службовай асобе (пракурору) больш высокага ўзроўню, ці з дня сканчэння месячнага тэрміну пасля падачы скаргі службовай асобе (пракурору) больш высокага ўзроўню, калі заяўнікам не быў атрыманы на яе адказ. Заява падаецца праз адміністрацыю лячэбна-працоўнага прафілакторыя. Да заявы лячэбна-працоўным прафілакторыем дадаюцца дакументы, што характарызуюць асобу грамадзяніна, які знаходзіцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, яго паводзіны

падчас знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, копіі дакументаў па матэрыялах абскарджванай пастановы. Падача заявы не прыпыняе выканання абскарджванай пастановы да вырашэння заявы. Заява павінна быць разгледжана судом не пазней дзесяці каляндарных дзён пасля паступлення яе ў суд. Заява разглядаецца судом з удзелам заяўніка ў выпадку прызнання судом яго яўкі ў судовае пасяджэнне абавязковай, прадстаўніка лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

**Артыкул 387. Рашэнне суда па справе**

1. Па выніках разгляду заявы суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

1) аб адмове ў задавальненні заявы і пакіданні без змянення абскарджваных папярэджання або пастановы;

2) аб задавальненні заявы, прызнанні абскарджваных папярэджання ці пастановы неправадзейнымі, а таксама аб адмене адпаведных папярэджання або пастановы.

2. Рашэнне суда аб задавальненні заявы падлягае неадкладнаму выкананню.

## § 8. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні рашэнняў аб спыненні разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і аб прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў працягу тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь

**Артыкул 388. Падача і разгляд заявы**

1. Асоба, не згодная з рашэннем дзяржаўнага органа Рэспублікі Беларусь аб спыненні разгляду яе хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і аб прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў працягу тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца ці дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, мае права падаць заяву аб абскарджанні гэтага рашэння ў суд па месцы знаходжання дзяржаўнага органа Рэспублікі Беларусь, рашэнне якога абскарджваецца.

2. Заява аб абскарджанні рашэння аб спыненні разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь у выпадку разгляду хадайніцтва аб прадастаўленні статусу бежанца, дадатковай абароны або прытулку ў Рэспубліцы Беларусь у паскораным парадку падаецца ў суд у сямідзённы тэрмін, вылічаны ў каляндарных днях, з дня азнаямлення заяўніка з адпаведным рашэннем.

3. Заява аб абскарджанні рашэння аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і аб прадастаўленні дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб адмове ў прадастаўленні статусу бежанца і дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай 2 гэтага артыкула, аб адмове ўпрацягу тэрміну прадастаўлення дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь, аб страце, ануляванні статусу бежанца ці дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь падаецца ў суд у пятнаццацідзённы тэрмін, вылічаны ў каляндарных днях, з дня азнаямлення заяўніка з такім рашэннем.

4. Заява разглядаецца судом з удзелам заяўніка або яго прадстаўніка і кіраўніка дзяржаўнага органа Рэспублікі Беларусь, дзеянні якога абскарджваюцца, ці іншага

прадстаўніка гэтага дзяржаўнага органа, аднак іх няяўка не з’яўляецца перашкодай для вырашэння справы.

**Артыкул 389. Рашэнне суда па справе**

1. Па выніках разгляду заявы аб абскарджанні рашэнняў дзяржаўнага органа, указаных у частцы 1 артыкула 388 гэтага Кодэкса, суд выносіць адно з наступных матываваных рашэнняў:

1) аб адмове ў задавальненні заявы і пакіданні без змянення абскарджванага рашэння;

2) аб задавальненні заявы, прызнанні абскарджванага рашэння неправадзейным і абавязку ліквідаваць дапушчаныя парушэнні.

2. Рашэнне, прынятае па выніках разгляду заявы, указанай у частцы 2 артыкула 388 гэтага Кодэкса, уступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння і абскарджанню і (або) апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае.

## § 9. Асаблівасці разгляду спраў аб абскарджанні рашэнняў патэнтнага органа, Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе

**Артыкул 390. Падача і разгляд заявы**

1. Асоба, не згодная з рашэннем патэнтнага органа, рашэннем Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе, мае права падаць заяву аб іх абскарджанні ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

2. Заява разглядаецца судовай калегіяй па справах інтэлектуальнай уласнасці Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у складзе трох суддзяў.

**Артыкул 391. Рашэнне суда па справе**

Па выніках разгляду заявы аб абскарджанні рашэння патэнтнага органа, рашэння Апеляцыйнага савета пры патэнтным органе суд прымае адно з наступных рашэнняў:

1) аб пакіданні без змянення абскарджванага рашэння;

2) аб адмене абскарджванага рашэння поўнасцю або ў частцы і ў выпадку неабходнасці аб ускладанні на патэнтны орган ці Апеляцыйны савет пры патэнтным органе абавязку ліквідаваць дапушчаныя парушэнні.

# ГЛАВА 35
# ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВАХ ОРГАНАЎ КАНТРОЛЮ (НАГЛЯДУ), АБ УСТАНАЎЛЕННІ ПРЫПЫНЕННЯ (ЗАБАРОНЫ) ДЗЕЙНАСЦІ, АБ ПРАЦЯГУ ПРЫПЫНЕННЯ (ЗАБАРОНЫ) ВЫТВОРЧАСЦІ

**Артыкул 392. Падача заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці**

1. У выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, дзяржаўныя органы (іх структурныя падраздзяленні з правамі юрыдычнай асобы, тэрытарыяльныя органы, падпарадкаваныя арганізацыі) і іншыя арганізацыі, упаўнаважаныя заканадаўчымі актамі або нарматыўнымі прававымі актамі Урада Рэспублікі Беларусь на ажыццяўленне дзяржаўнага кантролю (нагляду) за дзейнасцю суб’ектаў (арганізацый, іх адасобленых падраздзяленняў, што маюць уліковы нумар плацежніка, прадстаўніцтваў замежных арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, натарыусаў, а таксама асоб, якія ажыццяўляюць рамесную дзейнасць, дзейнасць у сферы аграэкатурызму, часовых (антыкрызісных) кіраўніках, якія не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі ці індывідуальнымі прадпрымальнікамі) (далей у гэтай главе – органы кантролю (нагляду)), пры ўзнікненні неабходнасці ва ўстанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, працягу прыпынення

(забароны) вытворчасці падаюць адпаведную заяву ў эканамічны суд вобласці (горада Мінска).

2. Заява аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці падаецца ў суд да сканчэння тэрміну прыпынення (забароны) вытворчасці, указанага ў патрабаванні (прадпісанні) органа кантролю (нагляду).

3. Да заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці неабходна дадаць доказы накіравання суб'екту копій адпаведнай заявы і даданых да яе дакументаў, накіраваных у суд.

**Артыкул 393. Змест заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці**

Заява аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 353 гэтага Кодэкса, а таксама змяшчаць:

1) назву суб'екта;

2) абгрунтаванне неабходнасці ўстанаўлення прыпынення (забароны) дзейнасці, працягу прыпынення (забароны) вытворчасці з пацвярджэннем стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю гэтымі дзейнасцю, вытворчасцю;

3) тэрмін, на які прапануецца ўстанавіць прыпыненне (забарону) дзейнасці, працягнуць прыпыненне (забарону) вытворчасці;

4) пералік цэхаў, вытворчых участкаў, аб'ектаў будаўніцтва, абсталявання, устанаўленне прыпынення (забароны) дзейнасці якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю, – пры ўстанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці цэхаў, вытворчых участкаў, аб'ектаў будаўніцтва, абсталявання;

5) указанне відаў тавараў (работ, паслуг), працяг прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі якіх накіраваны на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю, – пры працягу прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі тавараў (работ, паслуг);

6) указанне пераліку транспартных сродкаў, працяг прыпынення (забароны) эксплуатацыі якіх накіраваны на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю, – пры працягу прыпынення (забароны) эксплуатацыі транспартных сродкаў.

**Артыкул 394. Тэрмін разгляду заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці**

Заява аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці (у тым ліку і ў тых выпадках, калі суб'ектам з'яўляецца прадстаўніцтва замежнай арганізацыі) павінна быць разгледжана судом не пазней за адзін месяц пасля ўзбуджэння вядзення справы.

**Артыкул 395. Разгляд заявы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці**

1. Суд у судовым пасяджэнні правярае:

1) кампетэнцыю органа кантролю (нагляду), што вынес прапанову аб прыпыненні (забароне) дзейнасці, патрабаванне (прадпісанне) аб прыпыненні (забароне) вытворчасці;

2) падставы для вынясення прапановы аб прыпыненні (забароне) дзейнасці, патрабавання (прадпісання) аб прыпыненні (забароне) вытворчасці;

3) наяўнасць дакументальнага пацвярджэння падстаў для ўстанаўлення прыпынення (забароны) дзейнасці, працягу прыпынення (забароны) вытворчасці.

2. Суд не звязаны падставамі і довадамі, выкладзенымі ў заяве аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці.

3. Абавязак доказвання наяўнасці паўнамоцтваў і падстаў для вынясення прапановы аб прыпыненні (забароне) дзейнасці, патрабавання (прадпісання) аб прыпыненні (забароне) вытворчасці ўскладаецца на орган кантролю (нагляду), што вынес такія прапанову, патрабаванне (прадпісанне).

**Артыкул 396. Рашэнне суда па справе аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці**

1. Па выніках разгляду справы аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці суд выносіць рашэнне.

2. Суд, прызнаўшы заяву аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці абгрунтаванай, выносіць рашэнне аб устанаўленні прыпынення (забароны) дзейнасці, дзе ўказвае назву суб’екта, пералік яго цэхаў, вытворчых участкаў, аб’ектаў будаўніцтва, абсталявання, устанаўленне прыпынення (забароны) дзейнасці якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю.

3. Суд, прызнаўшы заяву аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці абгрунтаванай, выносіць рашэнне аб працягу прыпынення (забароны) вытворчасці, дзе указвае назву суб’екта, віды тавараў (работ, паслуг), пералік транспартных сродкаў, працяг прыпынення (забароны) вытворчасці і (або) рэалізацыі, эксплуатацыі якіх накіравана на прадухіленне стварэння пагрозы нацыянальнай бяспецы, прычынення шкоды жыццю і здароўю насельніцтва, навакольнаму асяроддзю.

## ГЛАВА 36
## ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ СПАГНАННІ ЗАПАЗЫЧАНАСЦІ ПА ПАДАТКАХ, ЗБОРАХ (ПОШЛІНАХ), ІНШЫХ АБАВЯЗКОВЫХ ПЛАЦЯЖАХ У РЭСПУБЛІКАНСКІ І (АБО) МЯСЦОВЫ БЮДЖЭТЫ, БЮДЖЭТЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗАБЮДЖЭТНЫХ ФОНДАЎ, ПЕНІ, ПРАЦЭНТАЎ ЗА КАРЫСТАННЕ АДТЭРМІНОЎКАЙ І (АБО) РАСТЭРМІНОЎКАЙ, ПАДАТКОВЫМ КРЭДЫТАМ

**Артыкул 397. Права на зварот у суд з заявай аб спагнанні запазычанасці па падатках, зборах (пошлінах), іншых абавязковых плацяжах у рэспубліканскі і (або) мясцовы бюджэты і бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў, а таксама пені, працэнтаў за карыстанне адтэрміноўкай і (або) растэрміноўкай, падатковым крэдытам**

1. Справы аб спагнанні з юрыдычных асоб, грамадзян, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, і іншых грамадзян запазычанасці па падатках, зборах (пошлінах), іншых абавязковых плацяжах у рэспубліканскі і (або) мясцовы бюджэты і бюджэты дзяржаўных пазабюджэтных фондаў (далей – абавязковыя плацяжы), а таксама пені, працэнтаў за карыстанне адтэрміноўкай і (або) растэрміноўкай, падатковым крэдытам (далей – працэнты) у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, разглядаюцца судом, калі іншы парадак іх спагнання не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі.

2. Справы па спрэчках аб спагнанні з зацікаўленых асоб (юрыдычных асоб, грамадзян, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, іншых грамадзян) запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт іх маёмасці праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць, узбуджаюцца ў судзе на падставе заяў

заяўнікаў – падатковых органаў, мытных органаў, органаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, а таксама іншых дзяржаўных органаў і арганізацый у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

3. Заява аб спагнанні запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў падаецца ў суд па правілах падсуднасці, устаноўленых главой 6 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 398. Змест заявы аб спагнанні запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў і дакументы, дададзеныя да яе

1. Заява аб спагнанні запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт маёмасці зацікаўленай асобы праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць, і дададзеныя да заявы дакументы павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 353 гэтага Кодэкса.

2. У заяве таксама ўказваюцца:

1) назва абавязковага плацяжу, падлеглага спагнанню, памер, перыяд, за які ён спаганяецца, нормы права, што прадугледжваюць аплату абавязковага плацяжу;

2) памер і разлік пені, перыяд, за які яна спаганяецца, нормы права, што ўстанаўліваюць пеню;

3) памер і разлік працэнтаў, перыяд, за які яны спаганяюцца, нормы права, што ўстанаўліваюць працэнты;

4) звесткі аб захаванні абавязковага дасудовага парадку, калі такі парадак устаноўлены заканадаўчымі актамі;

5) звесткі аб маёмасці зацікаўленай асобы, калі заява пададзена аб спагнанні запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт маёмасці зацікаўленай асобы праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць.

3. Да заявы таксама дадаюцца дакументы, што пацвярджаюць указаныя ў ёй абставіны.

### Артыкул 399. Разгляд справы

1. Пры разглядзе справы аб спагнанні запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт маёмасці зацікаўленай асобы праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць, суд у судовым пасяджэнні:

1) высвятляе, ці выкананы тэрмін для спагнання сум запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, калі такі тэрмін устаноўлены заканадаўчымі актамі;

2) устанаўлівае, ці маюцца падставы для спагнання сум запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт маёмасці зацікаўленай асобы праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць;

3) правярае правільнасць памеру і разліку спаганяных сум абавязковага плацяжу, пені, працэнтаў, перыяд спагнання.

2. Абавязак даказвання абставін, якія з’яўляюцца падставай для спагнання абавязковых плацяжоў, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт маёмасці зацікаўленай асобы праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць, ускладаецца на заяўніка.

3. У выпадку непрадстаўлення заяўнікам доказаў, неабходных для разгляду справы і прыняцця рашэння, суд мае права выпатрабаваць іх па сваёй ініцыятыве.

### Артыкул 400. Рашэнне суда па справе

1. Па выніках разгляду справы аб спагнанні запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт маёмасці зацікаўленай асобы праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць, суд выносіць рашэнне аб задавальненні заявы ці аб адмове ў задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы.

2. Пры задавальненні заявы аб спагнанні запазычанасці па абавязковых плацяжах, пені, працэнтаў, у тым ліку за кошт маёмасці зацікаўленай асобы праз накіраванне спагнання на гэту маёмасць, рэзалютыўная частка рашэння суда павінна адпавядаць патрабаванням артыкулаў 290 і 292 гэтага Кодэкса, змяшчаць перыяд спагнання, а таксама ў ёй павінны быць указаны звесткі аб зацікаўленай асобе:

1) у дачыненні да грамадзяніна – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), ідэнтыфікацыйны нумар, а пры адсутнасці ідэнтыфікацыйнага нумара – даныя дакумента, які сведчыць асобу (серыя (калі яна ёсць), нумар, дата выдачы, назва або код дзяржаўнага органа, які выдаў дакумент), яго месца жыхарства (месца прысутнасці), дата і месца яго нараджэння (пры наяўнасці звестак аб месцы нараджэння), месца работы (калі яно вядомае), а ў дачыненні да грамадзяніна, які ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, апрача ўказанага, – таксама ўліковы нумар плацежніка;

2) у дачыненні да юрыдычнай асобы – назва і месца знаходжання, уліковы нумар плацежніка або іншы аналагічны нумар, прысвоены ў замежнай дзяржаве.

## ГЛАВА 37
## ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ ЛІКВІДАЦЫІ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ (СПЫНЕННІ ДЗЕЙНАСЦІ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ)

### Артыкул 401. Парадак разгляду спраў аб ліквідацыі юрыдычных асоб (спыненні дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў)

1. У парадку, устаноўленым гэтай главой, судом разглядаюцца справы аб ліквідацыі юрыдычных асоб (спыненні дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў) у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі і не звязаных з банкруцтвам.

2. З заявай у суд аб ліквідацыі юрыдычнай асобы (спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка) мае права звярнуцца ўпаўнаважаны дзяржаўны орган у межах сваёй кампетэнцыі пры выяўленні падстаў для ліквідацыі (спынення дзейнасці), прадугледжаных заканадаўчымі актамі і не звязаных з банкруцтвам, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

3. Заява аб ліквідацыі юрыдычнай асобы (спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка) падаецца ў суд па месцы знаходжання (месцы жыхарства) зацікаўленай асобы з захаваннем правілаў радавой падсуднасці, устаноўленых параграфам 1 главы 6 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 402. Змест заявы аб ліквідацыі юрыдычнай асобы (спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка) і дакументы, даданыя да яе

1. Заява аб ліквідацыі юрыдычнай асобы (спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка) і даданыя да заявы дакументы павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 353 гэтага Кодэкса.

2. У заяве таксама ўказваюцца:

1) устаноўленыя заканадаўчымі актамі падставы для ліквідацыі юрыдычнай асобы (спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка) і фактычныя даныя, што іх пацвярджаюць;

2) звесткі аб асобе (асобах), на якую адпаведна заканадаўчым актам рашэннем суда аб ліквідацыі (спыненні дзейнасці) зацікаўленай асобы могуць быць ускладзены абавязкі па ажыццяўленні яе ліквідацыі (спынення дзейнасці);

3) іншыя звесткі, калі яны маюць значэнне для разгляду справы.

3. Да заявы таксама дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць указаныя ў ёй абставіны.

**Артыкул 403. Разгляд справы**

1. Пры разглядзе справы аб ліквідацыі юрыдычнай асобы (спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка) суд у судовым пасяджэнні:

1) высвятляе, ці выкананы тэрмін звароту ў суд, калі такі тэрмін устаноўлены заканадаўчымі актамі;

2) вызначае склад асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, у тым ліку ў выпадку неабходнасці – з улікам асобы (асоб), на якую адпаведна заканадаўчым актам рашэннем суда могуць быць ускладзены абавязкі па ажыццяўленні ліквідацыі (спынення дзейнасці) зацікаўленай асобы;

3) устанаўлівае, ці маюцца падставы, указаныя заяўнікам, для ліквідацыі (спынення дзейнасці) зацікаўленай асобы.

2. Абавязак доказвання абставін, што з'яўляюцца падставай для ліквідацыі (спынення дзейнасці) зацікаўленай асобы, ускладаецца на заяўніка.

3. У выпадку непрадстаўлення заяўнікам доказаў, неабходных для разгляду справы і прыняцця рашэння, суд мае права выпатрабаваць іх па сваёй ініцыятыве.

**Артыкул 404. Рашэнне суда па справе**

1. Па выніках разгляду справы аб ліквідацыі юрыдычнай асобы (спыненні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка) суд выносіць рашэнне аб задавальненні заявы ці аб адмове ў задавальненні заявы.

2. Рэзалютыўная частка рашэння суда аб задавальненні заявы павінна адпавядаць патрабаванням артыкулаў 290 і 296 гэтага Кодэкса (пры ўскладанні на асобу (асоб), якая ўдзельнічае ў справе, абавязку па ажыццяўленні ліквідацыі (спынення дзейнасці) зацікаўленай асобы). У рэзалютыўнай частцы рашэння суда аб задавальненні заявы ўказваюцца звесткі аб зацікаўленай асобе, аб асобе (асобах), на якую ўскладзены абавязкі па ажыццяўленні ліквідацыі (спынення дзейнасці) зацікаўленай асобы:

1) у дачыненні да грамадзяніна – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), ідэнтыфікацыйны нумар, а пры адсутнасці ідэнтыфікацыйнага нумара – даныя дакумента, які сведчыць асобу (серыя (пры наяўнасці), нумар, дата выдачы, назва або код дзяржаўнага органа, што выдаў дакумент), яго месца жыхарства (месца прысутнасці), дата і месца яго нараджэння (пры наяўнасці звестак аб месцы нараджэння), месца работы (калі яно вядомае), а ў дачыненні да індывідуальнага прадпрымальніка, апрача ўказанага, – таксама ўліковы нумар плацежніка;

2) у дачыненні да юрыдычнай асобы – назва і месца знаходжання, уліковы нумар плацежніка.

3. Рашэнне суда аб задавальненні заяўленага патрабавання на працягу пяці дзён пасля яго ўступлення ў законную сілу накіроўваецца заяўніку, зацікаўленай асобе, а таксама асобе (асобам), на якую суд усклаў абавязак па ажыццяўленні ліквідацыі (спынення дзейнасці) зацікаўленай асобы.

## ПАДРАЗДЗЕЛ 4
## АСАБЛІВАЕ ВЯДЗЕННЕ. АДНАЎЛЕННЕ СТРАЧАНАГА СУДОВАГА ВЯДЗЕННЯ

## ГЛАВА 38
## АСАБЛІВАЕ ВЯДЗЕННЕ

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 405. Справы, што разглядаюцца судом у парадку асаблівага вядзення**

1. У парадку асаблівага вядзення суд разглядае справы:

1) аб устанаўленні фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне;

2) аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным і аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым;

3) аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, а таксама аб прызнанні грамадзяніна дзеяздольным ці аб адмене абмежавання дзеяздольнасці;

4) аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях;

5) аб абвяшчэнні непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыі);

6) аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч;

7) аб прызнанні неэксплуатаванага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

8) аб прызнанні спадчыны вымарачнай;

9) аб аднаўленні правоў па дакументах на прад'яўніка;

10) аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзян, аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзян;

11) аб усынаўленні дзіцяці;

12) аб змяшчэнні непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову, аб спыненні знаходжання непаўналетняга ва ўказанай установе да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў ёй, аб працягу гэтага тэрміну, а таксама аб змяшчэнні непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх, аб працягу тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх, аб вызваленні непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх;

13) аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый, аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

2. У парадку асаблівага вядзення могуць разглядацца і іншыя справы ў выпадках, прадугледжаных актамі заканадаўства.

**Артыкул 406. Парадак разгляду спраў асаблівага вядзення**

1. Справы асаблівага вядзення разглядаюцца і вырашаюцца судом па правілах іскавага вядзення з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, і сутнасці асаблівага вядзення.

2. Справы асаблівага вядзення суд разглядае з удзелам заяўніка і зацікаўленых асоб. Зацікаўленыя асобы могуць быць далучаны да справы па хадайніцтве заяўніка, пракурора, па ініцыятыве суда, а таксама могуць уступіць у справу па сваёй ініцыятыве.

3. Калі пры разглядзе справы ў парадку асаблівага вядзення ўзнікла спрэчка аб праве, выніклая з грамадзянскіх праваадносін, падведамная суду, суд пакідае заяву без разгляду і растлумачвае заяўніку і зацікаўленым асобам, што яны маюць права прад'явіць іск на агульных падставах.

4. Пры звароце ў суд асоб, не ўказаных у артыкулах 417, 422, 425, 427, 431, 440, 443, 449 і 452 гэтага Кодэкса, суд адмаўляе ва ўзбуджэнні вядзення справы, а калі яна ўзбуджана – спыняе вядзенне справы.

## § 2. Устанаўленне фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне

**Артыкул 407. Умовы ўстанаўлення судом фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне**

1. Справы аб устанаўленні фактаў, ад якіх залежыць узнікненне, змяненне ці спыненне асабістых або маёмасных правоў грамадзян, юрыдычных асоб (фактаў, што

маюць юрыдычнае значэнне), падлягаюць разгляду судом, калі заканадаўствам не прадугледжаны іншы (пазасудовы) парадак іх устанаўлення і заяўнік не мае іншай магчымасці атрымаць або аднавіць належныя дакументы, што сведчаць указаныя факты.

2. Пры незахаванні ўмоў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, суд вяртае заяву ў адпаведнасці з пунктам 2 часткі 1 артыкула 244 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 408. Справы аб устанаўленні фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне**

Суд разглядае справы аб устанаўленні фактаў:

1) роднасных адносін асоб;

2) знаходжання асоб на ўтрыманні;

3) рэгістрацыі нараджэння, усынаўлення, заключэння шлюбу, скасавання шлюбу, смерці, устанаўлення мацярынства і (або) бацькоўства;

4) прыналежнасці праваўстаноўчых дакументаў (за выключэннем дакументаў, што сведчаць асобу, дакументаў з пацвярджэннем членства ў грамадскіх аб’яднаннях, вайсковых дакументаў, пасведчанняў, выдадзеных органамі рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану) грамадзяніну, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) ці прозвішча якога, указаныя ў дакуменце, не супадаюць з уласным імем, імем па бацьку (калі яно ёсць) або прозвішчам гэтай асобы па дакуменце, што сведчыць асобу, ці пасведчанню аб нараджэнні;

5) прыняцця спадчыны і месца адкрыцця спадчыны;

6) няшчаснага выпадку;

7) нараджэння або смерці асобы ў канкрэтны час і пры канкрэтных абставінах пры адмове органаў рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, у рэгістрацыі нараджэння ці смерці;

8) знаходжання ў фактычных шлюбных адносінах у прадугледжаных законам выпадках, калі рэгістрацыя заключэння шлюбу ў органах рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, не можа быць праведзена з прычыны смерці аднаго з сужэнцаў;

9) прызнання мацярынства і (або) бацькоўства ці факту мацярынства і (або) бацькоўства;

10) неадпаведнасці рэчаіснасці звестак, што няслáвяць гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю грамадзяніна, дзелавую рэпутацыю юрыдычнай асобы, калі ўстанавіць асобу, якая распаўсюдзіла такія звесткі, немагчыма;

11) прыналежнасці нерухомай маёмасці на праве ўласнасці юрыдычнай асобе, індывідуальнаму прадпрымальніку або іншаму грамадзяніну, калі дакументы аб рэгістрацыі такой маёмасці страчаны і ў іх аднаўленні адмоўлена;

12) добрасумленнага, адкрытага і неперарыўнага валодання грамадзянінам, юрыдычнай асобай нерухомай маёмасцю або іншай маёмасцю як сваім уласным;

13) іншых фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне.

**Артыкул 409. Падсуднасць**

1. Заява па справах аб устанаўленні фактаў, што маюць юрыдычнае значэнне, падаецца ў суд па месцы жыхарства або месцы знаходжання заяўніка, за выключэннем заявы аб устанаўленні факту, які мае юрыдычнае значэнне для ўзнікнення, змянення або спынення права на нерухомую маёмасць, што падаецца ў суд па месцы знаходжання нерухомай маёмасці, а таксама заявы аб устанаўленні факту прыняцця спадчыны і месца адкрыцця спадчыны, што падаецца ў суд па месцы адкрыцця спадчыны.

2. Пры наяўнасці па справе некалькіх заяўнікаў, якія пражываюць або знаходзяцца ў розных месцах, заява падаецца ў суд па месцы жыхарства або месцы знаходжання аднаго з іх па іх выбары.

**Артыкул 410. Змест заявы**

1. Заява аб устанаўленні факту, што мае юрыдычнае значэнне, павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкуламі 100 і 101 гэтага Кодэкса.

2. У заяве таксама павінны быць указаны:

1) факт, аб устанаўленні якога просіць заяўнік;

2) з якой мэтай заяўніку трэба ўстанавіць гэты факт;

3) нормы права, якія прадугледжваюць, што гэты факт выклікае юрыдычныя наступствы;

4) доказы, што пацвярджаюць немагчымасць атрымання або аднаўлення заяўнікам належных дакументаў са сведчаннем гэтага факту.

**Артыкул 411. Рашэнне суда па справе**

1. Суд, разгледзеўшы заяву, выносіць рашэнне аб устанаўленні факту, што мае юрыдычнае значэнне, ці аб адмове ў гэтым.

2. Пры задавальненні судом заявы аб устанаўленні факту, які мае юрыдычнае значэнне, у рэзалютыўнай частцы рашэння выкладаецца факт, які мае юрыдычнае значэнне, і ўказваецца аб устанаўленні гэтага факту.

3. Рашэнне суда аб устанаўленні факту, што мае юрыдычнае значэнне, служыць падставай для рэгістрацыі такога факту ў органах, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, або афармлення адпаведнымі органамі правоў, што ўзнікаюць у сувязі з устаноўленым фактам, і не замяняе сабой дакументы, выдадзеныя гэтымі органамі.

4. Указанне ў рашэнні суда мэты ўстанаўлення факту не перашкаджае яго выкарыстанню ва ўсіх іншых выпадках, калі з гэтым фактам звязваецца ўзнікненне, змяненне або спыненне правоў.

## § 3. Прызнанне грамадзяніна без вестак адсутным ці абвяшчэнне грамадзяніна памерлым

**Артыкул 412. Падача заявы**

1. Справа аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным ці аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым узбуджаецца судом па заяве асобы, якая мае юрыдычны інтарэс у зыходзе справы.

2. Заява аб прызнанні грамадзяніна без вестакадсутным ці аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым падаецца ў суд па месцы жыхарства або месцы знаходжання заяўніка.

**Артыкул 413. Змест заявы**

У заяве аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным ці аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым павінна быць указана:

1) з якой мэтай неабходна заяўніку прызнаць грамадзяніна без вестак адсутным ці абвясціць грамадзяніна памерлым;

2) абставіны, якія пацвярджаюць адсутнасць без вестак грамадзяніна, ці абставіны, што пагражалі прапаламу без вестак смерцю ці даюць падставу меркаваць аб гібелі грамадзяніна ад канкрэтнага няшчаснага выпадку. У дачыненні да вайскоўцаў або іншых грамадзян, якія прапалі без вестак у сувязі з ваеннымі дзеяннямі, у заяве ўказваецца дзень заканчэння ваенных дзеянняў.

### Артыкул 414. Падрыхтоўка справы да судовага разбору

1. Суд прыступае да вядзення справы аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным ці аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым пасля сканчэння тэрмінаў, устаноўленых Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

2. Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору суд высвятляе, хто можа паведаміць звесткі аб адсутным грамадзяніне (сваякі, суседзі, саслужыўцы і інш.), а таксама па хадайніцтве асоб – удзельнікаў у справе запытвае ў адпаведных арганізацыях па апошнім вядомым месцы жыхарства, месцы работы, службы, навучання адсутнага грамадзяніна, у органах унутраных спраў, вайсковых часцях наяўныя аб ім звесткі.

3. Суд выносіць вызначэнне аб публікацыі за кошт заяўніка ў друкаваных мясцовых і рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі аб’явы, размяшчэнні ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт інфармацыі аб пададзенай у суд заяве з просьбай да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, што маюць звесткі аб грамадзяніне, у дачыненні да якога ставіцца пытанне аб прызнанні яго без вестак адсутным ці аб абвяшчэнні яго памерлым, паведаміць іх суду.

4. У публікацыі павінны быць указаны: найменне суда, у які паступіла заява; прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), дату і месца нараджэння грамадзяніна, апошняе месца яго жыхарства і апошняе вядомае месца яго прысутнасці; прапанова на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі паведаміць аб указаным грамадзяніне наяўныя звесткі.

5. На ўказаны ў публікацыі тэрмін вядзенне справы прыпыняецца.

6. Пры наяўнасці даных, якія сведчаць аб пагрозе раскрадання або пашкоджання маёмасці адсутнага, суд можа прапанаваць органу апекі і апекавальніцтва назначыць апекуна над гэтай маёмасцю для яе аховы, аб чым выносіцца вызначэнне.

7. Суд аднаўляе вядзенне справы пасля сканчэння двух месяцаў з дня публікацыі ў сродках масавай інфармацыі аб’явы і размяшчэння ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт інфармацыі, указаныя ў частцы 3 гэтага артыкула, і назначае справу да судовага разбору, калі не атрымае ў гэты тэрмін пэўных звестак аб месцы прысутнасці адсутнага грамадзяніна.

8. Пры атрыманні звестак аб месцы прысутнасці адсутнага грамадзяніна суд разглядае справу і, калі заяўнік адмаўляецца ад заяўленага патрабавання, спыняе вядзенне справы.

9. Калі па справе аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным будуць устаноўлены абставіны, што даюць падставу абвясціць грамадзяніна памерлым, суд мае права вынесці рашэнне аб гэтым толькі ў тым выпадку, калі заяўнік зменіць сваё патрабаванне.

10. Справы аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным ці аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым разглядаюцца з удзелам пракурора.

### Артыкул 415. Рашэнне суда па справе

1. Суд выносіць матываванае рашэнне аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным ці аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым ці аб адмове ў гэтым.

2. У рашэнні павінны быць указаны прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) грамадзяніна, у дачыненні да якога разглядаецца справа, дата і месца яго нараджэння, апошняе вядомае месца жыхарства. Пры задавальненні патрабавання суд указвае ў рашэнні пачатак адсутнасці без вестак або дату смерці грамадзяніна, калі ўстаноўлены абставіны, што пагражаюць яму смерцю або даюць падставу меркаваць яго гібель ад канкрэтнага няшчаснага выпадку.

3. Пры наяўнасці абставін, указаных у частцы 6 артыкула 414 гэтага Кодэкса, адначасова з прызнаннем грамадзяніна без вестак адсутным суд можа паставіць пытанне аб назначэнні апекуна над яго маёмасцю, калі гэта пытанне не было вырашана пры падрыхтоўцы справы. Копія рашэння суда ў гэтым выпадку ў пяцідзённы тэрмін пасля

уступлення рашэння ў законную сілу накіроўваецца ў адпаведны орган апекі і апекавальніцтва.

4. Рашэнне суда аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным з’яўляецца падставай для перадачы яго маёмасці асобе, з якой орган апекі і апекавальніцтва заключае дагавор давернага кіравання гэтай маёмасцю пры неабходнасці пастаяннага кіравання ёй.

5. У выпадку абвяшчэння грамадзяніна памерлым суд у пяцідзённы тэрмін пасля ўступлення рашэння ў законную сілу паведамляе аб гэтым у орган рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, па месцы знаходжання суда для рэгістрацыі смерці грамадзяніна, а пры наяўнасці маёмасці ў такой асобы – натарыяльную кантору па месцы адкрыцця спадчыны для прыняцця пры неабходнасці мер па ахове спадчыннай маёмасці.

6. Рашэнне суда, якім грамадзянін аб’яўлены памерлым, з’яўляецца падставай для звароту ў орган рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану па рэгістрацыю смерці.

7. Суд не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння аб прызнанні грамадзяніна без вестак адсутным ці аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым, калі дзеці ўказаанай асобы застаюцца без апекавання бацькоў (аднаго з бацькоў), паведамляе аб гэтым упраўленню (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (аднаго з бацькоў) для рашэння пытання аб забеспячэнні дзяржаўнай абароны дзяцей.

**Артыкул 416. Наступствы яўкі або выяўлення месца прысутнасці грамадзяніна, прызнанага без вестак адсутным ці аб’яўленага памерлым**

1. У выпадку яўкі або выяўлення месца прысутнасці грамадзяніна, прызнанага без вестак адсутным ці аб’яўленага памерлым, суд новым рашэннем адмяняе сваё раней вынесенае рашэнне. Новае рашэнне суда з’яўляецца падставай для адмены давернага кіравання маёмасцю без вестак адсутнага грамадзяніна або для анулявання запісу акта аб смерці грамадзяніна, аб’яўленага памерлым, і адмены мер па ахове яго маёмасці.

2. Суд на працягу трох дзён з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб адмене рашэння аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым накіроўвае выпіску з гэтага рашэння ў орган рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, па месцы захоўвання запісу акта аб смерці.

3. Аб ануляванні запісу акта аб смерці на падставе рашэння суда аб адмене рашэння суда аб абвяшчэнні грамадзяніна памерлым орган рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану ў сямідзённы тэрмін з дня паступлення выпіскі з такога рашэння накіроўвае паведамленне ў адпаведны суд.

## § 4. Прызнанне грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, прызнанне грамадзяніна дзеяздольным, адмена абмежавання дзеяздольнасці

**Артыкул 417. Падача заявы**

1. Справа аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напоямі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі можа быць узбуджана па заяве членаў яго сям’і, пракурора, органа апекі і апекавальніцтва.

2. Заява аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напоямі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна.

3. Справа аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) можа быць узбуджана па заяве членаў яго сям’і, а ў выпадку іх адсутнасці – па заяве блізкіх сваякоў. Такая справа можа быць таксама ўзбуджана па заяве пракурора, органа апекі і апекавальніцтва, псіхіятрычнага стацыянару.

4. Заява аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна, а калі такі грамадзянін змешчаны ў псіхіятрычны стацыянар – па месцы знаходжання гэтай арганізацыі.

5. Справа аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, з-за якога не можа разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, можа быць узбуджана па заяве членаў яго сям'і, а ў выпадку іх адсутнасці – па заяве блізкіх сваякоў. Такая справа можа быць узбуджана таксама па заяве пракурора, органа апекі і апекавальніцтва, арганізацыі аховы здароўя, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць.

6. Заява аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, з-за якога не можа разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна, а калі такі грамадзянін змешчаны ў арганізацыю аховы здароўя, іншую арганізацыю, што ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць, – па месцы знаходжання гэтай арганізацыі.

**Артыкул 418. Змест заявы**

1. У заяве аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напоямі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі павінны быць выкладзены акалічнасці, якія сведчаць, што гэты грамадзянін ставіць сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча.

2. У заяве аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) павінны быць выкладзены акалічнасці, што сведчаць аб псіхічным расстройстве (захворванні), з прычыны чаго ў грамадзяніна абмежавана здольнасць разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі.

3. У заяве аб прызнанні грамадзяніна недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) павінны быць выкладзены акалічнасці, што сведчаць аб псіхічным расстройстве (захворванні), з прычыны чаго гэты грамадзянін не можа разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі.

4. У заяве аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, з-за якога не мае магчымасці разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, павінны быць выкладзены акалічнасці, што сведчаць аб стане гэтага грамадзяніна і яго немагчымасці разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, а таксама пацвярджаюць неабходнасць устанаўлення над гэтым грамадзянінам апекі.

**Артыкул 419. Назначэнне экспертызы для вызначэння псіхічнага стану грамадзяніна**

1. Суд у парадку падрыхтоўкі да судовага разбору справы аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) пры наяўнасці дастатковых даных аб псіхічным расстройстве (захворванні) грамадзяніна для вызначэння яго псіхічнага стану назначае судова-псіхіятрычную экспертызу.

2. У выключных выпадках, калі грамадзянін, у дачыненні да якога ўзбуджана справа аб прызнанні яго абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання), яўна ўхіляецца ад праходжання судова-псіхіятрычнай экспертызы, суд пры ўдзеле пракурора і ўрача-спецыяліста ў галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі ў судовым пасяджэнні можа вынесці вызначэнне аб правядзенні судова-псіхіятрычнай экспертызы ў дачыненні да гэтага грамадзяніна ў прымусовым парадку.

**Артыкул 420. Разгляд справы аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным, аб прызнанні грамадзяніна недзеяздольным**

1. Справу аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напоямі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі суд разглядае з абавязковым удзелам самога грамадзяніна, а таксама пракурора і прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва. Калі з прычын, прызнаных судом няўважлівымі, грамадзянін не прыбудзе ў судовае пасяджэнне, па вызначэнні суда ён можа быць прыведзены прымусова.

2. Справу аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) ці аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, з-за якога не мае магчымасці разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, суд разглядае з абавязковым удзелам пракурора і прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва. Грамадзянін, у дачыненні да якога разглядаецца справа аб прызнанні яго абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання), выклікаецца ў судовае пасяджэнне, калі суд прызнае гэта магчымым па стане яго здароўя.

3. Пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы аб прызнанні недзеяздольным грамадзяніна, які ў сувязі з захворваннем знаходзіцца ў непрытомным стане, з-за якога не мае магчымасці разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, суд запрошвае ў арганізацыі аховы здароўя, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць і дзе гэтаму грамадзяніну аказваецца медыцынская дапамога, заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі з пацвярджэннем такога стану грамадзяніна.

4. Рашэнне суда, якім грамадзянін прызнаны недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным, павінна быць матываваным. У рашэнні суда аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным указваецца аб’ём абмежаванняў дзеяздольнасці, прадугледжаны Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

5. Судовыя выдаткі, звязаныя з разглядам справы аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, з заяўніка не спаганяюцца. Суд, устанавіўшы, што асоба – падавец заявы, дзейнічала нядобрасумленна з мэтай заведама беспадстаўнага абмежавання ці пазбаўлення дзеяздольнасці грамадзяніна, спаганяе з такой асобы ўсе судовыя выдаткі, звязаныя з разглядам справы.

6. Прызнаўшы грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, суд на працягу пяці дзён пасля ўступлення рашэння суда ў законную сілу абавязаны накіраваць копію рашэння суда ў орган апекі і апекавальніцтва па месцы жыхарства грамадзяніна для ўстанаўлення над ім апекі ці апекавальніцтва.

7. Суд не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным або недзеяздольным, калі дзеці ўказанай асобы застаюцца без апекавання бацькоў (аднаго з бацькоў), паведамляе аб гэтым упраўленню (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (аднаго з бацькоў) для рашэння пытання аб забеспячэнні дзяржаўнай абароны дзяцей.

**Артыкул 421. Прызнанне недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным. Адмена абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна**

1. Справа аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным ці аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) ці аб адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна, прызнанага абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання), можа быць узбуджана па заяве яго апекуна або апекавальніка, а таксама асоб, указаных у частках 1, 3 і 5 артыкула 417 гэтага Кодэкса.

2. Пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным ці аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна абмежавана дзеяздольным з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання) суд назначае судова-псіхіятрычную экспертызу.

3. Пры падрыхтоўцы да судовага разбору справы аб прызнанні дзеяздольным грамадзяніна, прызнанага недзеяздольным з прычыны знаходжання яго ў сувязі з захворваннем у непрытомным стане і адсутнасці магчымасці разумець значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, суд запрошвае ў арганізацыі аховы здароўя, іншай арганізацыі, што ажыццяўляе медыцынскую дзейнасць, дзе гэтаму грамадзяніну аказваецца медыцынская дапамога, заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі з пацвярджэннем такога стану грамадзяніна.

4. Справа аб адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна, прызнанага абмежавана дзеяздольным з прычыны злоўжывання спіртнымі напоямі, наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі, можа быць узбуджана па заяве самога грамадзяніна або яго апекавальніка, а таксама асоб, указаных у частцы 1 артыкула 417 гэтага Кодэкса.

5. Заява аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольным ці аб адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна пры надыходзе ўмоў, прадугледжаных Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, падаецца ў суд па месцы жыхарства гэтага грамадзяніна незалежна ад таго, якім судом вынесена рашэнне аб прызнанні такога грамадзяніна недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольным.

6. Рашэнне суда аб прызнанні недзеяздольнага грамадзяніна дзеяздольнай ці аб адмене абмежавання дзеяздольнасці грамадзяніна павінна быць матываваным і з'яўляецца падставай для адмены ўстаноўленых над ім апекі або апекавальніцтва.

## § 5. Абмежаванне грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях

### Артыкул 422. Падача заявы. Змест заявы

1. З заявай аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях маюць права звярнуцца ў суд яго блізкія сваякі, апекуны, апекавальнікі, муж (жонка), іншыя асобы, якія пражываюць сумесна з ім і вядуць агульную гаспадарку, а таксама пракурор, орган апекі і апекавальніцтва.

2. Заява аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях падаецца ў суд па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) указанага грамадзяніна. У заяве павінны быць выкладзены акалічнасці, якія сведчаць, што грамадзянін з прычыны ўдзелу ў азартных гульнях ставіць сябе і (або) сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, а таксама ўказаны прапанаваны тэрмін абмежавання грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях у межах тэрміну, устаноўленага заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 423. Разгляд справы

Справу аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях суд разглядае з абавязковым удзелам самога грамадзяніна і заяўніка, а таксама пракурора. Калі з прычын, прызнаных судом няўважлівымі, грамадзянін не прыбудзе ў судовае пасяджэнне, па вызначэнні суда ён можа быць прыведзены прымусова.

**Артыкул 424. Рашэнне суда па справе**

1. Суд выносіць матываванае рашэнне аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях з указаннем тэрміну гэтага абмежавання ці аб адмове ў такім абмежаванні.

2. Цячэнне тэрміну абмежавання грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях пачынаецца з даты ўступлення рашэння суда ў законную сілу, калі іншы тэрмін не ўказаны ў рашэнні суда.

3. Копія рашэння суда аб абмежаванні грамадзяніна ў наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях, якое ўступіла ў законную сілу, накіроўваецца судом у арганізацыю, упаўнаважаную адпаведна заканадаўству на ўнясенне ва ўстаноўленым парадку звестак аб грамадзяніне ў пералік фізічных асоб, абмежаваных у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ўдзеле ў азартных гульнях (маніторынгавы цэнтр).

## § 6. Абвяшчэнне непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыя)

**Артыкул 425. Падача заявы. Разгляд заявы**

1. Непаўналетні, які дасягнуў шаснаццаці гадоў, мае права звярнуцца ў суд па месцы свайго жыхарства з заявай аб абвяшчэнні яго поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыі) у выпадках, прадугледжаных Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь.

2. Заява непаўналетняга прымаецца судом пры адсутнасці згоды абодвух яго законных прадстаўнікоў і ў выпадку адмовы органа апекі і апекавальніцтва абвясціць непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным.

3. Заява непаўналетняга разглядаецца судом з абавязковым удзелам заяўніка, абодвух яго законных прадстаўнікоў, а таксама прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва.

**Артыкул 426. Рашэнне суда па справе**

1. Суд, разгледзеўшы па сутнасці заяву непаўналетняга аб абвяшчэнні яго поўнасцю дзеяздольным (эмансіпацыі), прымае рашэнне, якім задавальняе або адмаўляе ў задавальненні патрабавання заяўніка.

2. Пры задавальненні патрабавання заяўніка непаўналетні, які дасягнуў шаснаццаці гадоў, абвяшчаецца поўнасцю дзеяздольным з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб абвяшчэнні непаўналетняй асобы поўнасцю дзеяздольнай (эмансіпацыі).

3. Рашэнне суда аб абвяшчэнні непаўналетняй асобы поўнасцю дзеяздольнай (эмансіпацыі) у пяцідзённы тэрмін пасля ўступлення яго ў законную сілу накіроўваецца органу апекі і апекавальніцтва па месцы жыхарства эмансіпіраванай асобы.

## § 7. Прызнанне рухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанне права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч. Прызнанне неэксплуатаванага транспартнага сродку безгаспадарным і перадача яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі

**Артыкул 427. Падача заявы**

1. Заява аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай падаецца ў суд па месцы жыхарства грамадзяніна або месцы знаходжання юрыдычнай асобы, што ўступілі ў валоданне гэтай рэччу.

2. Заява аб прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч, аб прызнанні самавольнай пабудовы або матэрыялаў, выкарыстаных пры самавольным будаўніцтве, безгаспадарнымі і прызнанні права камунальнай уласнасці на такія пабудову

ці матэрыялы падаецца ў суд па месцы знаходжання гэтых рэчы, пабудовы або матэрыялаў мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

3. У выпадку калі мясцовы выканаўчы і распарадчы орган звяртаецца ў суд з заявай аб прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч да сканчэння аднаго года з дня пастаноўкі гэтай рэчы на ўлік арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй, суд вяртае заяву, а калі вядзенне справы ўзбуджана – пакідае заяву без разгляду.

4. Заява аб прызнанні неэксплуатаванага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі падаецца ў суд па месцы выяўлення неэксплуатаванага транспартнага сродку мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.

5. У выпадку калі мясцовы выканаўчы і распарадчы орган звяртаецца ў суд з заявай аб прызнанні неэксплуатаванага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі да сканчэння трох месяцаў з дня ўручэння акта агляду ўказанага транспартнага сродку яго ўласніку (уладальніку), а пры адсутнасці звестак аб уласніку (уладальніку) такога транспартнага сродку – да сканчэння трох месяцаў з дня прымусовага перамяшчэння ўказанага транспартнага сродку на ахаваную стаянку, суд вяртае заяву, а калі вядзенне справы ўзбуджана – пакідае заяву без разгляду.

**Артыкул 428. Змест заявы**

1. У заяве аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай павінна быць указана, якая рухомая рэч падлягае прызнанню безгаспадарнай, павінны быць апісаны яе асноўныя адметныя прыкметы, а таксама прыведзены доказы, што сведчаць аб пакіданні гэтай рэчы ўласнікам без намеру захаваць права ўласнасці на яе, і доказы, што сведчаць аб уступленні заяўніка ў валоданне гэтай рэччу.

2. У заяве аб прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч павінна быць указана, кім і калі гэта рэч пастаўлена на ўлік як безгаспадарная, а таксама павінны быць прыведзены доказы, што сведчаць аб пакіданні гэтай рэчы ўласнікам без намеру захаваць права ўласнасці на яе, і доказы адсутнасці ўласніка рэчы.

3. У заяве аб прызнанні самавольнай пабудовы або матэрыялаў, выкарыстаных пры самавольным будаўніцтве, безгаспадарнымі і прызнанні права камунальнай уласнасці на іх павінны быць прыведзены доказы, што сведчаць аб факце ажыццяўлення самавольнага будаўніцтва і аб адмове асобы, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва на зямельным участку, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (за выключэннем зямельнага ўчастка, прадастаўленага ў пажыццёвае спадчыннае валоданне), выканаць рашэнне мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, упаўнаважанай нарматыўнымі прававымі актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўнай арганізацыі аб зносе самавольнай пабудовы і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан ці аб прывядзенні самавольнай пабудовы ў стан, адпаведны патрабаванням горадабудаўнічых нормаў і істотным патрабаванням бяспекі, і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан ці аб невыкананні асобай гэтага рашэння ва ўстаноўлены тэрмін.

4. У заяве аб прызнанні неэксплуатаванага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі павінны быць указаны звесткі аб неэксплуатаваным транспартным сродку, яго ўласніку (уладальніку) (пры наяўнасці такіх звестак), аб датах выяўлення неэксплуатаванага транспартнага сродку, накіравання і ўручэння ўласніку (уладальніку) паведамлення аб неабходнасці на працягу трыццаці каляндарных дзён перамясціць транспартны сродак на ахаваную стаянку, прывесці яго ў належны стан або ўтылізаваць яго, аб датах прымусовага перамяшчэння гэтага транспартнага сродку на ахаваную стаянку і ўручэння акта агляду ўказанага транспартнага сродку.

**Артыкул 429. Разгляд справы**

1. Пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору суддзя высвятляе, якія асобы (уласнікі, фактычныя ўладальнікі і інш.) могуць паведаміць звесткі аб прыналежнасці маёмасці. У неабходных выпадках суддзя запрошвае такія звесткі ў адпаведных арганізацыях.

2. Справы аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай, аб прызнанні права камунальнай уласнасці на безгаспадарную нерухомую рэч, аб прызнанні самавольнай пабудовы або матэрыялаў, выкарыстаных пры самавольным будаўніцтве, безгаспадарнымі і прызнанні права камунальнай уласнасці на іх, а таксама аб прызнанні неэксплуатаванага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі разглядаюцца судом з удзелам асоб, якія маюць юрыдычны інтарэс у зыходзе справы.

**Артыкул 430. Рашэнне суда па справе**

1. Суд, устанавіўшы, што рухомая рэч не мае ўласніка або пакінута ім без намеру захаваць права ўласнасці на яе, прымае рашэнне аб прызнанні рухомай рэчы безгаспадарнай і перадачы яе ва ўласнасць асобы, якая ўступіла ў валоданне ёю.

2. Суд, устанавіўшы, што нерухомая рэч не мае ўласніка або пакінута ім без намеру захаваць права ўласнасці на яе і пастаўлена на ўлік ва ўстаноўленым парадку, прымае рашэнне аб прызнанні нерухомай рэчы безгаспадарнай і прызнанні права камунальнай уласнасці на гэту рэч.

3. Суд, устанавіўшы, што асоба, якая ажыццявіла самавольнае будаўніцтва на зямельным участку, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці (за выключэннем зямельнага ўчастка, прадастаўленага ў пажыццёвае спадчыннае валоданне), адмовілася ад выканання рашэння мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, упаўнаважанай нарматыўнымі прававымі актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўнай арганізацыі аб зносе самавольнай пабудовы і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан ці аб прывядзенні самавольнай пабудовы ў стан, адпаведны патрабаванням горадабудаўнічых нормаў і істотным патрабаванням бяспекі, і прывядзенні зямельнага ўчастка ў прыдатны для выкарыстання па мэтавым прызначэнні стан або такое рашэнне не выканана асобай ва ўстаноўлены тэрмін, а таксама ўстанавіўшы адсутнасць парушэнняў патрабаванняў горадабудаўнічых нормаў і істотных патрабаванняў бяспекі, прымае рашэнне аб прызнанні самавольнай пабудовы ці матэрыялаў, выкарыстаных пры самавольным будаўніцтве, безгаспадарнымі і прызнанні права камунальнай уласнасці на іх.

4. Суд, устанавіўшы, што неэксплуатаваны транспартны сродак не мае ўласніка (уладальніка), або ўстанавіўшы, што ўласнікам (уладальнікам) неэксплуатаванага транспартнага сродку не прыняты меры па перамяшчэнні гэтага транспартнага сродку на ахаваную стаянку, прывядзенні яго ў належны стан ці яго ўтылізацыі, прымае рашэнне аб прызнанні неэксплуатаванага транспартнага сродку безгаспадарным і перадачы яго ва ўласнасць адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

## § 8. Прызнанне спадчыны вымарачнай

**Артыкул 431. Падача заявы. Змест заявы**

1. Заява аб прызнанні спадчыны вымарачнай падаецца мясцовым выканаўчым і распарадчым органам у суд па месцы адкрыцця спадчыны пасля сканчэння аднаго года з дня адкрыцця спадчыны або да сканчэння ўказанага тэрміну, калі выдаткі, звязаныя з аховай спадчыны і кіраваннем ёй, перавышаюць яе кошт.

2. У заяве аб прызнанні спадчыны вымарачнай павінны быць указаны звесткі аб часе і месцы адкрыцця спадчыны, аб маёмасці, якая ўваходзіць у склад спадчыны, а таксама прыведзены доказы, што сведчаць аб прыналежнасці гэтай маёмасці спадчынадаўцу, аб адсутнасці спадчыннікаў па завяшчанні і па закону ці аб тым, што ніхто са спадчыннікаў не мае права атрымліваць у спадчыну або ўсе яны адмовіліся ад спадчыны.

3. Суд адмаўляе ва ўзбуджэнні вядзення справы аб прызнанні спадчыны вымарачнай, калі заява пададзена да сканчэння тэрмінаў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула. Калі справа ў парушэнне ўстаноўленых правілаў узбуджана, яна падлягае спыненню.

**Артыкул 432. Разгляд справы. Рашэнне суда па справе**

1. Справа аб прызнанні спадчыны вымарачнай разглядаецца судом з абавязковым удзелам заяўніка і далучэннем зацікаўленых па справе асоб.

2. Суд, устанавіўшы, што спадчыннікі па завяшчанні і па закону адсутнічаюць, або ніхто са спадчыннікаў не мае права атрымліваць у спадчыну, або ўсе яны адмовіліся ад спадчыны, выносіць рашэнне аб прызнанні спадчыны вымарачнай і аб перадачы яе ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі па месцы знаходжання адпаведнай маёмасці, што ўваходзіць у склад спадчыны.

3. У рэзалютыўнай частцы рашэння павінны змяшчацца звесткі аб складзе вымарачнай спадчыны і аб тым, якой адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы яна перадаецца ва ўласнасць.

**§ 9. Аднаўленне правоў па дакументах на прад'яўніка (вядзенне па выкліку)**

**Артыкул 433. Падача заявы. Змест заявы**

1. Асоба, якая страціла дакумент на прад'яўніка (далей у гэтым параграфе – дакумент) або валодае дакументам, што страціў прыкметы плацежнасці, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, можа прасіць суд аб аднаўленні правоў па такім дакуменце.

2. Правы па страчаным дакуменце могуць быць адноўлены і пры страце дакументам прыкмет плацежнасці ў выніку неналежнага захоўвання або па іншых прычынах. Суд разглядае справы аб аднаўленні правоў па дакуменце, што страціў прыкметы плацежнасці, пры адмове асобы, якая выдала дакумент, рабіць па ім выплаты і выдачы.

3. Заява аб аднаўленні правоў па дакуменце падаецца ў раённы (гарадскі) суд па месцы знаходжання асобы, якая выдала дакумент.

4. У заяве павінны быць указаны адметныя прыкметы дакумента, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы, якая выдала дакумент, а таксама выкладзены абставіны, пры якіх адбыліся страта дакумента ці страта ім прыкмет плацежнасці. У заяве можа таксама змяшчацца просьба аб забароне асобе, якая выдала дакумент, рабіць па ім выплаты і выдачы.

**Артыкул 434. Падрыхтоўка справы да судовага разбору**

1. Суддзя пры ўзбуджэнні справы аб аднаўленні правоў па дакуменце ў сувязі з яго стратай у парадку падрыхтоўкі справы выносіць вызначэнне: аб публікацыі ў друкаваных мясцовых сродках масавай інфармацыі, на інтэрнэт-рэсурсе кампетэнтнага органа за кошт заяўніка аб'явы аб выкліку трымальніка страчанага дакумента (далей – трымальнік дакумента) у суд; аб забароне асобе, якая выдала дакумент, рабіць па ім выплаты і выдачы.

2. У публікацыі павінна быць указана найменне суда, у які паступіла заява аб аднаўленні правоў па дакуменце ў сувязі з яго стратай; прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы –падаўца заявы, і яе месца жыхарства або месца знаходжання; назва і адметныя прыкметы дакумента; прапанова трымальніку дакумента ў трохмесячны тэрмін з дня публікацыі падаць у суд заяву аб сваіх правах на гэты дакумент.

3. Вызначэнне аб забароне рабіць выплаты і выдачы па страчаным дакуменце выносіцца суддзёй неадкладна пасля ўзбуджэння вядзення справы і адразу ж накіроўваецца асобе, якая выдала гэты дакумент.

4. На тэрмін, указаны ў публікацыі, вядзенне справы прыпыняецца.

5. Вызначэнне суда аб адмове ў публікацыі і (або) аб забароне рабіць па страчаным дакуменце выплаты і выдачы можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 435. Заява трымальніка дакумента**

Трымальнік дакумента абавязаны да сканчэння трохмесячнага тэрміну з дня публікацыі падаць у суд, што вынес вызначэнне, указанае ў частцы 1 артыкула 434 гэтага Кодэкса, заяву аб наяўнасці ў яго названага дакумента, аб падставе, па якой ён валодае гэтым дакументам, і прадставіць пры гэтым арыгінал дакумента.

**Артыкул 436. Дзеянні суда пасля паступлення заявы трымальніка дакумента**

1. У выпадку паступлення ў суд да сканчэння трохмесячнага тэрміну з дня публікацыі ад трымальніка дакумента заявы аб сваіх правах на гэты дакумент суд пакідае без разгляду заяву асобы, якая страціла дакумент, і растлумачвае гэтай асобе права на прад'яўленне ў месячны тэрмін да трымальніка дакумента ў агульным парадку іску аб выпатрабаванні гэтага дакумента.

2. Адначасова трымальніку дакумента забараняецца рабіць па ім выплаты і выдачы, а таксама высвятляецца права на спагнанне з заяўніка страт, прычыненых прынятымі забароннымі мерамі.

3. Калі ва ўстаноўлены часткай 1 гэтага артыкула тэрмін заяўнік не прад'явіць іск да трымальніка дакумента, забарона рабіць выплаты і выдачы па гэтым дакуменце губляе сілу, аб чым апавяшчаецца асоба, якая выдала дакумент.

4. У выпадку паступлення ў суд ад трымальніка дакумента да сканчэння трохмесячнага тэрміну з дня публікацыі заявы аб тым, што ён не прад'яўляе права на гэты дакумент, суд выносіць вызначэнне аб вяртанні дакумента заяўніку, аб адмене забароны рабіць па ім выплаты і выдачы і аб спыненні вядзення справы.

5. Вызначэнне суда па пытаннях, указаных у гэтым артыкуле, можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 437. Дзеянні суда пры адсутнасці заявы трымальніка дакумента**

1. Калі ў трохмесячны тэрмін з дня публікацыі трымальнік дакумента не звернецца ў суд з заявай аб сваіх правах на гэты дакумент, справа аб аднаўленні правоў па страчаным дакуменце назначаецца да судовага разбору.

2. Паступленне ў суд заявы ад трымальніка дакумента пасля сканчэння трохмесячнага тэрміну, але да выхаду суда ў дарадчы пакой для вынясення судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, выклікае наступствы, прадугледжаныя артыкулам 436 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 438. Рашэнне суда па справе**

У выпадку задавальнення просьбы заяўніка аб аднаўленні правоў па дакуменце суд выносіць рашэнне, якім прызнае страчаны дакумент або дакумент, што страціў прыкметы плацежнасці, неправадзейным. Рашэнне суда з'яўляецца падставай для выдачы заяўніку новага дакумента замест прызнанага неправадзейным.

### Артыкул 439. Права трымальніка дакумента прад’явіць іск аб беспадстаўным набыцці або ашчадзе маёмасці

Трымальнік дакумента, які не заявіў па якіх-небудзь прычынах своечасова аб сваіх правах на гэты дакумент, пасля ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб прызнанні дакумента несапраўдным можа прад’явіць да асобы, якая атрымала на падставе рашэння суда маёмасць або новы дакумент замест страчанага, іск аб беспадстаўным набыцці або ашчадзе маёмасці.

## § 10. Прымусовая шпіталізацыя і лячэнне грамадзяніна, працяг тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзяніна

### Артыкул 440. Падсуднасць

1. У выпадку калі законам прадугледжаны прымусовая шпіталізацыя і лячэнне грамадзяніна па рашэнні суда, заява аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзяніна падаецца ў суд дзяржаўнай арганізацыяй аховай здароўя па месцы яе знаходжання або па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) гэтага грамадзяніна.

2. Заява аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзяніна падаецца ў суд дзяржаўнай арганізацыяй аховай здароўя па месцы яе знаходжання.

### Артыкул 441. Змест заявы і парадак яе разгляду

1. У заяве аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзяніна, апрача рэквізітаў, прадугледжаных артыкулам 100 гэтага Кодэкса, павінны быць указаны прадугледжаныя законам падставы заяўленага патрабавання.

2. Да заявы аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзяніна дадаецца заключэнне аб неабходнасці яго прымусовай шпіталізацыі і лячэння, вынесенае ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

3. Да заявы аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзяніна дадаецца заключэнне аб неабходнасці працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння, вынесенае ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

4. Заява аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні разглядаецца судом на працягу пяці каляндарных дзён пасля яе паступлення з абавязковым удзелам прадстаўніка дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя, грамадзяніна, у дачыненні да якога вырашаецца пытанне аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні і які ўдзельнічае ў справе ў якасці зацікаўленай асобы, або яго законнага прадстаўніка.

5. У выпадку ўхілення грамадзяніна, у дачыненні да якога разглядаецца заява аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні, ад яўкі ў суд ён можа быць прыведзены прымусова. Суд можа разгледзець справу ў адсутнасць грамадзяніна, калі яго ўдзел у судовым пасяджэнні немагчымы па стане здароўя.

6. Заява аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння разглядаецца судом на працягу трох каляндарных дзён пасля яе паступлення з абавязковым удзелам прадстаўніка дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя. Пры неабходнасці з улікам стану здароўя грамадзяніна, у дачыненні да якога разглядаецца заява аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння, і пры наяўнасці тэхнічнай магчымасці судовае пасяджэнне можа быць праведзена з выкарыстаннем сістэм відэаканферэнцсувязі.

### Артыкул 442. Рашэнне суда па справе

1. Разгледзеўшы заяву аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзяніна ці аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзяніна па сутнасці,

у залежнасці ад устаноўленых абставін суд выносіць матываванае рашэнне, якім задавальняе заяву або адмаўляе ў яе задавальненні.

2. Рашэнне суда аб задавальненні заявы аб прымусовай шпіталізацыі і лячэнні грамадзяніна з'яўляецца падставай для яго прымусовай шпіталізацыі і лячэння.

3. Рашэнне аб задавальненні заявы аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзяніна з'яўляецца падставай для працягу яго прымусовай шпіталізацыі і лячэння на тэрмін, устаноўлены законам.

4. Рашэнне суда аб адмове ў задавальненні заявы аб працягу тэрміну прымусовай шпіталізацыі і лячэння грамадзяніна з'яўляецца падставай для яго выпіскі з дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя.

## § 11. Усынаўленне дзіцяці

### Артыкул 443. Падсуднасць

1. Заява аб усынаўленні дзіцяці падаецца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, жадаюць усынавіць дзіця – грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, у раённы (гарадскі) суд па месцы свайго жыхарства або па месцы жыхарства (месцы знаходжання) усынаўлянага дзіцяці.

2. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне ці асобы без грамадзянства, якія жадаюць усынавіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіця – грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзяне Рэспублікі Беларусь, замежныя грамадзяне ці асобы без грамадзянства, якія жадаюць усынавіць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіця, якое з'яўляецца замежным грамадзянінам або асобай без грамадзянства і пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, падаюць заяву аб усынаўленні дзіцяці ў абласны суд па месцы жыхарства (месцы знаходжання) усынаўлянага дзіцяці, а ў горадзе Мінску – у Мінскі гарадскі суд. Заява падаецца праз установу «Нацыянальны цэнтр усынаўлення Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь» (далей – Нацыянальны цэнтр усынаўлення), якая ў пятнаццацідзённы тэрмін пасля паступлення заявы накіроўвае яе ва ўстаноўленым парадку ў адпаведны суд.

### Артыкул 444. Змест заявы

1. У заяве аб усынаўленні павінны быць указаны:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), дата нараджэння і месца жыхарства ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў);

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), месца і дата нараджэння, месца жыхарства (месца знаходжання) усынаўлянага дзіцяці;

4) абставіны, што абгрунтоўваюць просьбу ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) аб усынаўленні дзіцяці.

2. У заяве аб усынаўленні дзіцяці можа таксама змяшчацца просьба аб змяненні прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), даты і (або) месца нараджэння ўсынаўлянага дзіцяці, а таксама аб запісе ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) у запісе акта аб нараджэнні дзіцяці ў якасці яго бацькі ці маці (бацькі і маці).

### Артыкул 445. Дакументы, даданыя да заявы

Да заявы аб усынаўленні дзіцяці неабходна дадаць:

1) копію пасведчання аб нараджэнні ўсынаўляльніка – пры ўсынаўленні дзіцяці асобай, якая не знаходзіцца ў шлюбе;

2) копію пасведчання аб шлюбе ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) – пры ўсынаўленні дзіцяці асобай (асобамі), якая знаходзіцца (якія знаходзяцца) у шлюбе;

3) дакумент, што пацвярджае згоду аднаго з сужэнцаў на ўсынаўленне, – пры ўсынаўленні дзіцяці другім сужэнцам;

4) медыцынскае заключэнне аб стане здароўя ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў);

5) акт абследавання органа апекі і апекавальніцтва ўмоў жыцця ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў), дзе змешчана сярод іншых звестак інфармацыя аб тым, ці меў ўсынаўляльнік на момант усынаўлення непагашаную ці нязнятую судзімасць за наўмысныя злачынствы, ці асуджаўся за наўмысныя цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы супраць чалавека, ці прызнавалася патрэба дзіцяці ўсынаўляльніка ў дзяржаўнай абароне ў сувязі з невыкананнем або неналежным выкананнем указанай асобай сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзіцяці, ці пазбаўляўся бацькоўскіх правоў ці быў абмежаваны ў іх, прызнаваўся ці недзеяздольным ці абмежавана дзеяздольнай, ці адхіляўся ад абавязкаў апекуна, апекавальніка за неналежнае выкананне ўскладзеных на яго абавязкаў, ці не было раней у дачыненні да яго адменена ўсынаўленне;

6) даведку з месца работы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) аб пасадзе службоўцы (прафесіі рабочага) і заработнай плаце ці копію дэкларацыі аб даходах ці іншы дакумент аб даходах за папярэдні да ўсынаўлення год;

7) дакумент, што пацвярджае права валодання і карыстання ўсынаўляльнікам (усынаўляльнікамі) жылым памяшканнем або права ўласнасці на жылое памяшканне;

8) дакумент, дзе змешчаны дазвол Міністра адукацыі на ўсынаўленне, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці – грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства, а таксама пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам ці асобай без грамадзянства і пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства;

9) дакумент, дзе змешчаны дазвол кампетэнтнага органа дзяржавы, на тэрыторыі якой пастаянна пражываюць усынаўляльнікі, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці – грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама дзіцяці, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам ці асобай без грамадзянства і пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь;

10) дакумент, дзе змешчаны дазвол кампетэнтнага органа дзяржавы, грамадзянінам якой з’яўляецца дзіця, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам і пражывае ў Рэспубліцы Беларусь;

11) дакумент, які пацвярджае згоду дзіцяці на ўсынаўленне, калі гэта патрабуецца адпаведна заканадаўству замежнай дзяржавы, – пры ўсынаўленні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзіцяці, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам і пражывае ў Рэспубліцы Беларусь;

12) заключэнне Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення аб адсутнасці кандыдатаў ва ўсынаўляльнікі – грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, або сваякоў дзіцяці незалежна ад грамадзянства і месцы жыхарства гэтых сваякоў, якія выказалі намер усынавіць указанае дзіця, з уключэннем таксама звестак аб пастаноўцы ўсынаўлянага дзіцяці на цэнтралізаваны ўлік у рэспубліканскі банк даных аб усынаўленні (удачарэнні) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў, – пры ўсынаўленні грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекавання бацькоў і з’яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 446. Падрыхтоўка справы да судовага разбору**

1. Суддзя пры падрыхтоўцы справы да судовага разбору абавязвае орган апекі і апекавальніцтва па месцы жыхарства (месцы знаходжання) усынаўлянага дзіцяці ці

па месцы жыхарства ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) прадставіць у суд заключэнне аб абгрунтаванасці і аб адпаведнасці ўсынаўлення інтарэсам дзіцяці з указаннем звестак аб факце асабістых зносін усынаўляльніка (усынаўляльнікаў) з усынаўляным дзіцем.

2. Да заключэння органа апекі і апекавальніцтва неабходна дадаць:

1) акт абследавання ўмоў жыцця ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў), складзены па месцы яго (іх) жыхарства;

2) пасведчанне аб нараджэнні ўсынаўлянага дзіцяці;

3) медыцынскае заключэнне аб стане здароўя, фізічным і разумовым развіцці ўсынаўлянага дзіцяці;

4) дакумент, што пацвярджае згоду ўсынаўлянага дзіцяці, якое дасягнула ўзросту дзесяці гадоў, на ўсынаўленне, а таксама на магчымыя змяненні яго прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) і запіс усынаўляльніка (усынаўляльнікаў) у запісе акта аб нараджэнні дзіцяці ў якасці яго бацькі ці маці (бацькі і маці), за выключэннем выпадкаў, калі такая згода ў адпаведнасці з законам не патрабуецца;

5) дакумент, што пацвярджае згоду бацькоў дзіцяці на яго ўсынаўленне (пры ўсынаўленні дзіцяці непаўналетніх бацькоў, якія не набылі поўнай дзеяздольнасці, – таксама дакумент, што пацвярджае згоду іх законных прадстаўнікоў, апекуна, апекавальніка), або дакумент, што пацвярджае наяўнасць адной з акалічнасцей, калі ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям’і ўсынаўленне дзіцяці дапускаецца без згоды яго бацькоў;

6) дакумент, што пацвярджае згоду на ўсынаўленне дзіцяці яго апекуна, апекавальніка, прыёмных бацькоў ці кіраўніка ўстановы, дзе знаходзіцца дзіця, якое засталося без апекавання бацькоў;

7) звесткі аб наяўнасці ва ўсынаўлянага дзіцяці братоў і сясцёр і аб месцы іх знаходжання.

3. Суд пры неабходнасці можа запатрабаваць і іншыя дакументы.

4. Пры ўсынаўленні дзіцяці адной асобай суд у інтарэсах дзіцяці высвятляе таксама магчымасць захавання асабістых немаёмасных і маёмасных правоў і абавязкаў дзіцяці з адным з бацькоў або са сваякамі памерлых бацькі ці маці.

**Артыкул 447. Разгляд справы**

1. Заява аб усынаўленні дзіцяці разглядаецца судом на працягу пятнаццаці дзён з дня:

1) падачы ў суд заявы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) – пры ўсынаўленні дзіцяці – грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь;

2) паступленні ў суд заявы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) з Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення – пры ўсынаўленні дзіцяці – грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства, а таксама пры ўсынаўленні дзіцяці, якое з’яўляецца замежным грамадзянінам ці асобай без грамадзянства і пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства.

2. Справы аб усынаўленні дзіцяці суд разглядае з абавязковым удзелам самога ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў), прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва, пракурора, а па справах аб міжнародным усынаўленні – таксама з удзелам прадстаўніка Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення.

3. Справы аб усынаўленні дзіцяці разглядаюцца судом у закрытым судовым пасяджэнні, уключаючы абвяшчэнне рашэння.

**Артыкул 448. Рашэнне суда па справе**

1. Суд, разгледзеўшы справу аб усынаўленні дзіцяці па сутнасці, выносіць матываванае рашэнне аб задавальненні заявы аб усынаўленні дзіцяці ці аб адмове ў яе задавальненні. Пры задавальненні просьбы аб усынаўленні суд прызнае дзіця ўсыноўленым канкрэтнай асобай (асобамі) і указвае ў рашэнні суда ўсе звесткі аб усыноўленым дзіцяці і ўсынаўляльніку (усынаўляльніках), неабходныя для рэгістрацыі ўсынаўлення ў органе рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану.

2. У рашэнні суда павінна быць указана аб задавальненні ці аб адмове ў задавальненні просьбы ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) аб змяненні прозвішча, уласнага імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), даты і (або) месца нараджэння ўсынаўлянага дзіцяці, а таксама аб запісе ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) у запісе акта аб нараджэнні дзіцяці ў якасці яго бацькі ці маці (бацькі і маці).

3. У інтарэсах дзіцяці пры ўсынаўленні яго адной асобай у рашэнні суда аб усынаўленні па жаданні маці, калі ўсынаўляльнік – мужчына, або па жаданні бацькі, калі ўсынаўляльніца – жанчына, ці, калі адзін з бацькоў усынаўлянага дзіцяці памер, па просьбе бацькоў памерлых бацькі або маці (дзядулі ці бабулі) дзіцяці ўказваецца аб захаванні праваадносін усыноўленага дзіцяці з адным з бацькоў ці са сваякамі памерлых бацькі ці маці.

4. Пры задавальненні заяўленай просьбы ўзаемныя правы і абавязкі ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) і ўсыноўленага дзіцяці ўстанаўліваюцца з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб устанаўленні ўсынаўлення дзіцяці.

5. Усынаўленне лічыцца ўстаноўленым з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб усынаўленні.

6. Суд абавязаны на працягу трох дзён з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб устанаўленні ўсынаўлення дзіцяці накіраваць выпіску з гэтага рашэння суда ў орган рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, па месцы вынясення рашэння і па месцы захоўвання запісу акта аб нараджэнні ўсыноўленага дзіцяці, а таксама ў орган апекі і апекавальніцтва па месцы жыхарства ўсынаўляльніка (усынаўляльнікаў) і Нацыянальны цэнтр усынаўлення.

## § 12. Змяшчэнне непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову, спыненне знаходжання непаўналетняга ва ўказанай установе да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў ёй, працяг гэтага тэрміну, а таксама змяшчэнне непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх, працяг тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх, вызваленне непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх

### Артыкул 449. Падача заявы

1. Заява аб змяшчэнні непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову падаецца камісіяй па справах непаўналетніх у суд па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) непаўналетняга.

2. Заява аб спыненні знаходжання непаўналетняга ў спецыяльнай выхаваўчай установе да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў ёй, аб працягу гэтага тэрміну падаецца кіраўніком спецыяльнай выхаваўчай установы ў суд па месцы знаходжання гэтай установы.

3. Заява аб змяшчэнні непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх падаецца начальнікам органа ўнутраных спраў або яго намеснікам у суд па месцы затрымання непаўналетняга або па месцы знаходжання прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх.

4. Заява аб працягу тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх, аб вызваленні непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх падаецца начальнікам органа ўнутраных спраў або яго намеснікам у суд па месцы знаходжання прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх.

5. Да заявы дадаюцца матэрыялы, прадугледжаны заканадаўствам, што пацвярджаюць неабходнасць змяшчэння непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову або ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх.

**Артыкул 450. Разгляд справы**

1. Заява аб змяшчэнні непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову разглядаецца судом на працягу пятнаццаці каляндарных дзён пасля яе паступлення ў суд.

2. Заява аб спыненні знаходжання непаўналетняга ў выхаваўчай установе да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў ёй, аб працягу гэтага тэрміну, аб змяшчэнні непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх, аб працягу тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх, аб вызваленні непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх разглядаецца судом на працягу трох каляндарных дзён пасля яе паступлення ў суд.

3. Пры ўзбуджэнні вядзення справы аб змяшчэнні непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову суд абавязаны выпатрабаваць крымінальную справу ў дачыненні да гэтага непаўналетняга, вядзенне па якой спынена, ці матэрыялы аб адмове ва ўзбуджэнні крымінальнай справы або матэрыялы спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях.

4. Справа разглядаецца судом з абавязковым удзелам непаўналетняга, у дачыненні да якога ўзбуджана справа асаблівага вядзення, яго законных прадстаўнікоў, прадстаўнікоў камісіі па справах непаўналетніх, органа ўнутраных спраў, па чыёй ініцыятыве ўзбуджана справа, прадстаўнікоў спецыяльнай выхаваўчай установы, дзе знаходзіцца непаўналетні, а таксама пракурора і прадстаўнікоў органа апекі і апекавальніцтва.

5. Непаўналетнія, якія дасягнулі ўзросту шаснаццаці гадоў, а таксама законныя прадстаўнікі непаўналетніх, якія ўхіляюцца ад яўкі ў суд, могуць быць прыведзены прымусова па вызначэнні суда.

**Артыкул 451. Рашэнне (вызначэнне) суда па справе**

1. Разгледзеўшы заяву па сутнасці, суд выносіць матываванае рашэнне, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, – вызначэнне, якім задавальняе заяву ці адмаўляе ў яе задавальненні.

2. Рашэнне суда аб задавальненні заявы, што ўступіла ў законную сілу, з’яўляецца падставай для змяшчэння непаўналетняга ў спецыяльную выхаваўчую ўстанову на тэрмін, устаноўлены судом, або для спынення знаходжання непаўналетняга ў спецыяльнай выхаваўчай установе да сканчэння ўстаноўленага судом тэрміну знаходжання ў ёй, для працягу гэтага тэрміну.

3. Вызначэнне суда аб змяшчэнні непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх, аб працягу тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх, аб вызваленні непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх падлягае неадкладнаму выкананню.

## § 13. Накіраванне грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый, працяг тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэнне тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі

**Артыкул 452. Падача заявы аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Змест заявы**

1. Заява аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый падаецца ў суд органам унутраных спраў па месцы знаходжання гэтага органа ўнутраных спраў.

2. У заяве аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый павінны быць указаны прадугледжаныя заканадаўчымі актамі падставы для накіравання яго

ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Да заявы аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый дадаюцца дакументы, пералік якіх вызначаны заканадаўчымі актамі.

**Артыкул 453. Разгляд заявы аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый**

1. Заява аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядаецца на працягу дзесяці каляндарных дзён пасля ўзбуджэння вядзення справы з абавязковым удзелам прадстаўніка органа ўнутраных спраў, а таксама грамадзяніна, заява аб накіраванні якога ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядаецца судом.

2. У выпадку ўхілення грамадзяніна, заява аб накіраванні якога ў лячэбна-працоўны прафілакторый разглядаецца судом, ад яўкі ў суд ён можа быць прыведзены прымусова.

**Артыкул 454. Рашэнне суда па справе аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый**

1. Разгледзеўшы заяву аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый па сутнасці, суд выносіць матываванае рашэнне аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый ці аб адмове ў накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый.

2. У рашэнні аб накіраванні грамадзяніна ў лячэбна-працоўны прафілакторый указваецца тэрмін яго знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

3. Пры наяўнасці ў грамадзяніна, у дачыненні да якога судом вынесена рашэнне аб накіраванні ў лячэбна-працоўны прафілакторый, на ўтрыманні непаўналетніх дзяцей копія рашэння суда не пазней за наступны дзень пасля яго вынясення накіроўваецца ва ўпраўленне (аддзел) адукацыі гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства непаўналетніх дзяцей для рашэння пытання аб забеспячэнні іх дзяржаўнай абароны.

**Артыкул 455. Падача і разгляд заявы аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі**

1. Заява аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі падаецца начальнікам лячэбна-працоўнага прафілакторыя ў суд па месцы знаходжання лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

2. У заяве павінны быць указаны падставы для працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, скарачэння тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі. Да заявы дадаюцца дакументы, пералік якіх вызначаны заканадаўчымі актамі.

3. Заява аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі разглядаецца на працягу трох каляндарных дзён пасля ўзбуджэння справы судом з абавязковым удзелам прадстаўніка лячэбна-працоўнага прафілакторыя.

**Артыкул 456. Рашэнне суда па справе аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі**

1. Па выніках разгляду заявы аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі суд выносіць матываванае рашэнне аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, аб скарачэнні тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі ці аб адмове ў гэтым.

2. У рашэнні аб працягу тэрміну знаходжання грамадзяніна ў лячэбна-працоўным прафілакторыі ўказваецца, на які тэрмін працягваецца яго знаходжанне ў лячэбна-працоўным прафілакторыі.

## ГЛАВА 39
## АДНАЎЛЕННЕ СТРАЧАНАГА СУДОВАГА ВЯДЗЕННЯ

**Артыкул 457. Парадак аднаўлення страчанага судовага вядзення**

1. Страчанае судовае вядзенне па грамадзянскай справе, скончанай прыняццем рашэння або вынясеннем вызначэння аб спыненні вядзення справы, можа быць адноўлена судом поўнасцю ці ў частцы па заяве асоб – удзельнікаў у справе, а таксама па ініцыятыве суда, пракурора ў парадку, устаноўленым гэтай главой.

2. Палажэнні гэтай главы не прымяняюцца да аднаўлення судовага вядзення, страчанага да вырашэння справы па сутнасці або да спынення вядзення справы. У такіх выпадках зацікаўленыя асобы маюць права прад'явіць новы іск у агульным парадку, аб чым указваецца ў вызначэнні аб узбуджэнні вядзення справы.

**Артыкул 458. Форма і змест заявы аб аднаўленні страчанага судовага вядзення**

1. Заява аб аднаўленні страчанага судовага вядзення падаецца ў пісьмовай форме ці ў выглядзе электроннага дакумента ў суд, які прыняў рашэнне або вынес вызначэнне аб спыненні вядзення справы.

2. Заява аб аднаўленні страчанага судовага вядзення павінна адпавядаць патрабаванням, прадугледжаным артыкуламі 100 і 101 гэтага Кодэкса.

3. У заяве таксама ўказваецца:

1) аб аднаўленні якога канкрэтна судовага вядзення ці ў якой яго частцы просіць заяўнік;

2) ці была вырашана справа па сутнасці з прыняццем рашэння або было вынесена вызначэнне аб спыненні вядзення справы;

3) якое працэсуальнае становішча па справе займаў заяўнік; хто яшчэ прымаў удзел у справе і ў якім працэсуальным становішчы, іх найменне (для юрыдычных асоб) ці прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) (для фізічных асоб), іх месца знаходжання (для юрыдычных асоб) або месца жыхарства (для фізічных асоб); нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў, адрасы электроннай пошты ўдзельнікаў судовага працэсу – калі яны вядомыя заяўніку;

4) наяўныя ў заяўніка звесткі пра абставіны страты судовага вядзення, аб месцы знаходжання копій судовых (працэсуальных) дакументаў ці звестак аб іх;

5) аднаўленне якіх канкрэтна дакументаў заяўнік лічыць неабходным, з якой мэтай патрэбна іх аднаўленне.

4. Да заявы аб аднаўленні страчанага судовага вядзення дадаюцца захаваныя і датычныя да справы дакументы або іх копіі, нават калі яны не завераны ва ўстаноўленым парадку.

5. Заява аб аднаўленні страчанага судовага вядзення можа быць пададзена ў суд незалежна ад тэрміну захоўвання судовага вядзення, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай 6 гэтага артыкула.

6. Заява аб аднаўленні страчанага судовага вядзення для выканання судовага рашэння можа быць пададзена да сканчэння тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання. Суд можа аднавіць указаны тэрмін па хадайніцтве заяўніка, калі прызнае прычыны яго пропуску ўважлівымі.

### Артыкул 459. Наступствы незахавання патрабаванняў да зместу заявы

1. Пры адсутнасці ў заяве ўказання мэты звароту па пытанні аднаўлення страчанага судовага вядзення суд пакідае заяву без руху і прадастаўляе тэрмін, неабходны для яе выкладу.

2. У выпадку калі ўказаная заяўнікам мэта звароту не звязана з абаронай яго правоў, свабод і законных інтарэсаў, суд адмаўляе ва ўзбуджэнні вядзення аб аднаўленні страчанага судовага вядзення, а ў выпадку яго ўзбуджэння матываваным вызначэннем пакідае заяву без разгляду.

3. Суд адмаўляе ва ўзбуджэнні вядзення аб аднаўленні страчанага судовага вядзення, калі справа не разгледжана па сутнасці і не выносілася рашэнне або вызначэнне аб спыненні вядзення справы.

### Артыкул 460. Разгляд заявы аб аднаўленні страчанага судовага вядзення

1. Заява аб аднаўленні страчанага судовага вядзення разглядаецца судом у месячны тэрмін пасля яе паступлення з удзелам заяўніка і іншых зацікаўленых асоб па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

2. Пры разглядзе заявы суд бярэ пад увагу:

1) частку захаванага вядзення (асобныя тамы, матэрыялы з архіву суда і да т.п.);

2) дакументы, выдадзеныя судом са справы ўдзельнікам судовага працэсу і іншым асобам да страты справы, копіі такіх дакументаў;

3) матэрыялы выканаўчага вядзення, калі яно ажыццяўлялася па выніках разгляду справы;

4) любыя іншыя матэрыялы, дакументы і звесткі, датычныя да справы, прадстаўленыя ўдзельнікамі судовага працэсу, а таксама атрыманыя законным спосабам з іншых афіцыйных крыніц.

3. Суд можа дапытаць у якасці сведкаў тых асоб, якія ўдзельнічалі ў справе, а таксама асоб, якія прысутнічалі пры здзясненні якіх-небудзь працэсуальных дзеянняў па справе. У неабходных выпадках суд можа выслухаць асоб, якія ўваходзілі ў склад суда, што разглядаў справу.

### Артыкул 461. Вызначэнне суда аб аднаўленні страчанага судовага вядзення

1. Рашэнне або вызначэнне суда аб спыненні вядзення справы, калі яно прымалася, падлягае аднаўленню, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 462 гэтага Кодэкса.

2. У вызначэнні суда аб аднаўленні страчанага рашэння ці вызначэння суда аб спыненні вядзення справы ўказваецца, на падставе якіх звестак, прадстаўленых суду і даследаваных у судовым пасяджэнні з удзелам усіх удзельнікаў грамадзянскага судаводства па страчаным судовым вядзенні, суд лічыць устаноўленым змест аднаўлянай судовай пастановы.

3. У матывіровачнай частцы вызначэння суда аб аднаўленні страчанага судовага вядзення таксама ўказваюцца вывады суда пра абставіны, даследаваныя доказы і працэсуальныя дзеянні, здзейсненыя па страчаным судовым вядзенні.

### Артыкул 462. Адмова ў аднаўленні страчанага судовага вядзення

У выпадку недастатковасці сабраных матэрыялаў для дакладнага аднаўлення судовай пастановы, звязанай са страчаным судовым вядзеннем, суд выносіць вызначэнне аб адмове ў аднаўленні страчанага судовага вядзення і растлумачвае асобам – удзельнікам у справе права прад’явіць іск у агульным парадку.

### Артыкул 463. Парадак абскарджання (апратэставання) судовых пастаноў па пытаннях аднаўлення страчанага судовага вядзення

1. Судовыя пастановы па пытаннях аднаўлення страчанага судовага вядзення могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

2. Заяўнік вызваляецца ад аплаты судовых выдаткаў, панесеных судом пры разглядзе справы аб аднаўленні страчанага судовага вядзення. Пры заведама лжывай заяве судовыя выдаткі па справе аб аднаўленні страчанага судовага вядзення спаганяюцца з заяўніка.

# ПАДРАЗДЗЕЛ 5
# ІНШЫЯ ВІДЫ ВЯДЗЕННЯ

## ГЛАВА 40
## ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ НЕПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНАСЦІ ЦІ БАНКРУЦТВЕ І ПА СПРЭЧКАХ, ЗВЯЗАНЫХ З НЕПЛАЦЕЖАЗДОЛЬНАСЦЮ ЦІ БАНКРУЦТВАМ

### Артыкул 464. Разгляд спраў аб неплацежаздольнасці ці банкруцтве

1. Справы аб неплацежаздольнасці ці банкруцтве юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў разглядаюцца эканамічнымі судамі абласцей (горада Мінска) па месцы знаходжання даўжніка па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб урэгуляванні неплацежаздольнасці.

2. Па выніках разгляду спраў аб неплацежаздольнасці ці банкруцтве суд выносіць матываванае рашэнне.

### Артыкул 465. Разгляд спраў па спрэчках, звязаных з неплацежаздольнасцю ці банкруцтвам

Справы па спрэчках, звязаных з неплацежаздольнасцю ці банкруцтвам юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, разглядаюцца эканамічнымі судамі абласцей (горада Мінска) па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб урэгуляванні неплацежаздольнасці.

## ГЛАВА 41
## ВЯДЗЕННЕ ПА ХАДАЙНІЦТВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ТРАЦЕЙСКАГА СУДА, МІЖНАРОДНАГА АРБІТРАЖНАГА (ТРАЦЕЙСКАГА) СУДА, ІНШАГА ПАСТАЯННАГА АРБІТРАЖНАГА ОРГАНА, ШТО ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ТЭРЫТОРЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Артыкул 466. Падача хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

1. Хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць заяўлена бакамі па справе, разгледжанай трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, іншым пастаянным арбітражным органам (далей – бок трацейскага (арбітражнага) разбору).

2. Хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаецца ў суд па месцы знаходжання трацейскага суда, які вынес рашэнне.

3. Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаецца ў эканамічны суд вобласці (горада Мінска) па месцы знаходжання міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, якія вынеслі рашэнне.

4. Хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, утвораных для вырашэння канкрэтнай (разгляду асобнай) спрэчкі, падаецца ў суд па месцы трацейскага (арбітражнага) разбору на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 467. Тэрмін для заявы хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

1. Хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць пададзена на працягу трох месяцаў з дня, калі бокам трацейскага (арбітражнага) разбору, які заяўляе хадайніцтва, было атрымана адпаведнае рашэнне, а ў выпадку, калі любым з бакоў па справе, разгледжанай міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, была пададзена заява з просьбай аб выпраўленні, растлумачэнні рашэння або прыняцці дадатковага рашэння, – з дня вынясення міжнародным арбітражным (трацейскім) судом рашэння па гэтай заяве.

2. Суд вяртае хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, пададзенае пасля сканчэння тэрмінаў, устаноўленых часткай 1 гэтага артыкула, калі адначасова з ім не пададзена заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну ці суд адмовіў у яго аднаўленні. Аб вяртанні ўказанага хадайніцтва суд выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

3. Тэрмін падачы хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць адноўлены судом у выпадках і парадку, прадугледжаных артыкулам 119 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 468. Форма і змест хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

1. Хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, і даданыя да хадайніцтва дакументы могуць быць пададзены ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента.

2. У хадайніцтве ўказваюцца:

1) найменне суда, у які падаецца хадайніцтва;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) ці найменне асобы, якая заяўляе хадайніцтва, яе месца жыхарства (месца прысутнасці) або месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

3) найменне (пры наяўнасці), месца знаходжання і склад трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што прынялі рашэнне;

4) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) ці найменне бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору, трэціх асоб трацейскага разбору (пры наяўнасці), іх месца жыхарства (месца прысутнасці) або месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

5) нумар (пры наяўнасці) рашэння, аб адмене якога заяўлена хадайніцтва, дата і месца яго вынясення, прадмет спрэчкі, змест рэзалютыўнай часткі рашэння, рэгламент (правілы працэдуры) разгляду спрэчкі;

6) дата атрымання рашэння, а ў выпадку, калі любы з бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору падаваў заяву з просьбай аб выпраўленні, растлумачэнні рашэння або прыняцці дадатковага рашэння, – дата вынясення рашэння па гэтай заяве;

7) падставы для адмены рашэння, прадугледжаныя артыкулам 471 гэтага Кодэкса;

8) змест патрабавання асобы, якая заяўляе хадайніцтва, аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

9) пералік даданых дакументаў;

10) іншыя звесткі, калі яны маюць значэнне для разгляду хадайніцтва.

3. Хадайніцтва падпісваецца асобай, якая заяўляе хадайніцтва, або яе прадстаўніком, які мае адпаведныя паўнамоцтвы.

4. Пры падачы хадайніцтва ў выглядзе электроннага дакумента яно падпісваецца электронным лічбавым подпісам заяўніка ці яго прадстаўніка.

5. Да хадайніцтва дадаюцца:

1) арыгінал рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда або копія рашэння іншага пастаяннага арбітражнага органа, падпісаная арбітрам (арбітрамі) і высланая боку арбітражнага разбору ў адпаведнасці з рэгламентам гэтага арбітражнага органа, ці належным чынам завераная копія рашэння, аб адмене якога заяўлена хадайніцтва. Копія рашэння пастаянна дзейнага трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа завярацца іх старшынямі. Правільнасць копіі рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, утвораных для вырашэння канкрэтнай (разгляду асобнай) спрэчкі, павінна быць засведчана ў натарыяльным парадку;

2) арыгінал трацейскага (арбітражнага) пагаднення або яго належным чынам завераная копія;

3) дакументы, якія прадстаўляюцца ў абгрунтаванне хадайніцтва;

4) дакумент, што пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўчымі актамі, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы указаны ў хадайніцтве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы хадайніцтва;

5) копіі хадайніцтва ў колькасці экземпляраў па ліку бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору;

6) даверанасць ці іншы дакумент, што пацвярджае паўнамоцтвы асобы на падпісанне хадайніцтва.

6. Хадайніцтва, заяўленае з парушэннем патрабаванняў гэтага артыкула да яго формы і зместу, а таксама да даданых дакументаў, вяртаецца асобе, якая заявіла хадайніцтва.

7. Аб вяртанні хадайніцтва суд не пазней за пяць дзён пасля яго паступлення выносіць вызначэнне, што можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 469. Парадак і межы разгляду хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

1. Хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, разглядаецца ў тэрмін не больш за адзін месяц пасля паступлення хадайніцтва ў суд, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

2. Пры падрыхтоўцы да судовага разбору суд па ініцыятыве боку трацейскага (арбітражнага) разбору або па сваёй ініцыятыве мае права выпатрабаваць па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для выпатрабавання доказаў, матэрыялы справы, разгледжанай трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, іншым пастаянным арбітражным органам, з:

1) пастаянна дзейнага трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія разгледзелі спрэчку;

2) раённага (гарадскога) суда, эканамічнага суда вобласці (горада Мінска) па месцы трацейскага (арбітражнага) разбору – па спрэчках, якія адносяцца да кампетэнцыі гэтых судоў, разгледжаных трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, утворанымі для вырашэння канкрэтнай (разгляду асобнай) спрэчкі.

3. Бакам трацейскага (арбітражнага) разбору паведамляецца судом аб часе і месцы судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам, не перашкаджае разгляду хадайніцтва.

4. У межах тэрміну, устаноўленага часткай 1 гэтага артыкула, суд па хадайніцтве боку па справе, разгледжанай міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, мае права прыпыніць разгляд хадайніцтва для прадастаўлення магчымасці міжнароднаму арбітражнаму (трацейскаму) суду, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ліквідаваць падставы для адмены рашэння.

5. Пры разглядзе хадайніцтва суд даследуе доказы, прадстаўленыя бакамі трацейскага (арбітражнага) разбору ў абгрунтаванне сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, правярае наяўнасць або адсутнасць прадугледжаных артыкулам 471 гэтага Кодэкса падстаў для адмены адпаведнага рашэння, але не мае права пераглядаць рашэнне па сутнасці.

**Артыкул 470. Паўнамоцтвы суда пры разглядзе хадайніцтва аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

Па выніках разгляду хадайніцтва суд мае права:

1) адмяніць рашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, поўнасцю або ў частцы;

2) адмовіць у адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 471. Падставы для адмены рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

1. Рашэнне трацейскага суда можа быць адменена судом на падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб трацейскіх судах.

2. Рашэнне міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць адменена судом на падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб міжнародным арбітражным (трацейскім) судзе.

3. Рашэнне іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць адменена судом на падставах, прадугледжаных заканадаўчымі актамі аб міжнародным арбітражным (трацейскім) судзе.

**Артыкул 472. Вызначэнне суда па хадайніцтве аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

1. Па выніках разгляду хадайніцтва суд выносіць вызначэнне аб адмене ці аб адмове ў адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

2. У вызначэнні суда павінны змяшчацца:

1) нумар (пры наяўнасці) рашэння, аб адмене якога заяўлена хадайніцтва, дата і месца яго вынясення, прадмет спрэчкі, змест рэзалютыўнай часткі рашэння, рэгламент (правілы працэдуры) разгляду спрэчкі;

2) найменне (пры наяўнасці) і склад трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што прынялі рашэнне;

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору, трэціх асоб трацейскага разбору (пры наяўнасці);

4) указанне на адмену рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, поўнасцю або ў частцы ці на адмову ў задавальненні хадайніцтва поўнасцю або ў частцы, падставы і матывы прынятага рашэння.

3. Адмена рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, не перашкаджае бакам трацейскага (арбітражнага) разбору паўторна звярнуцца ў трацейскі суд, міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, іншы пастаянны арбітражны орган, калі магчымасць такога звароту не страчана, або ў суд па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

4. Калі рашэнне трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, адменена судом поўнасцю або ў частцы з прычыны неправадзейнасці трацейскага (арбітражнага) пагаднення ці калі рашэнне вынесена па спрэчцы, не прадугледжанай трацейскім (арбітражным) пагадненнем, ці не падпадае пад яго ўмовы, ці змяшчае пастановы па пытаннях, што выходзяць за межы трацейскага (арбітражнага) пагаднення,

бакі трацейскага (арбітражнага) разбору могуць звярнуцца за вырашэннем спрэчкі ў суд па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

5. Вызначэнне суда можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 473. Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, папярэдняга характару аб наяўнасці ў іх кампетэнцыі**

1. Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, папярэдняга характару аб наяўнасці ў іх кампетэнцыі можа быць заяўлена бокам арбітражнага разбору ў выпадках, прадугледжаных міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

2. Хадайніцтва аб адмене рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, папярэдняга характару аб наяўнасці ў іх кампетэнцыі разглядаецца судом па правілах, устаноўленых гэтай главой, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, заканадаўчымі актамі аб міжнародным арбітражным (трацейскім) судзе.

## ГЛАВА 42
## ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ АДМЕНЕ РАШЭННЯ ПРАЦОЎНАГА АРБІТРАЖУ

**Артыкул 474. Аспрэчванне рашэння працоўнага арбітражу**

1. Рашэнне працоўнага арбітражу па калектыўных працоўных спрэчках аб выкананні калектыўных дагавораў, пагадненняў, а таксама ў арганізацыях, дзе заканадаўствам устаноўлены абмежаванні ў рэалізацыі права на забастоўку, можа быць аспрэчана бакамі калектыўнай працоўнай спрэчкі праз падачу заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу ў адпаведнасці з гэтай главой.

2. Заява аб адмене рашэння працоўнага арбітражу падаецца ў раённы (гарадскі) суд, на тэрыторыі якога яно вынесена, у дзесяцідзённы тэрмін пасля атрымання аспрэчванага рашэння працоўнага арбітражу бокам калектыўнай працоўнай спрэчкі, які звярнуўся з такой заявай.

**Артыкул 475. Форма і змест заявы**

1. Заява аб адмене рашэння працоўнага арбітражу падаецца ў пісьмовай форме і падпісваецца прадстаўніком боку калектыўнай працоўнай спрэчкі, які аспрэчвае гэта рашэнне.

2. У заяве аб адмене рашэння працоўнага арбітражу павінны быць указаны:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) склад працоўнага арбітражу, што вынес аспрэчванае рашэнне;

3) найменне бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі, месца знаходжання наймальніка і прадстаўнічага органа работнікаў;

4) дата і месца вынясення рашэння працоўнага арбітражу;

5) дата атрымання аспрэчванага рашэння працоўнага арбітражу бокам калектыўнай працоўнай спрэчкі, які звярнуўся з заявай аб адмене ўказанага рашэння;

6) патрабаванне заяўніка аб адмене рашэння працоўнага арбітражу і падставы, па якіх аспрэчваецца гэта рашэнне.

3. У заяве аб адмене рашэння працоўнага арбітражу могуць быць указаны нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў, адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці) і іншыя звесткі.

4. Да заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу дадаюцца:

1) арыгінал рашэння працоўнага арбітражу ці яго натарыяльна засведчаная копія;

2) арыгінал пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу, заключанага адпаведна заканадаўчым актам аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак, або яго копія;

3) дакументы, што пацвярджаюць абгрунтаванне патрабавання заяўніка аб адмене рашэння працоўнага арбітражу;

4) дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўчымі актамі, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы;

5) копія заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу;

6) даверанасць або іншы дакумент, што пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка боку калектыўнай працоўнай спрэчкі на падпісанне заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу.

**Артыкул 476. Парадак разгляду заявы**

1. Заява аб адмене рашэння працоўнага арбітражу разглядаецца суддзёй у тэрмін не больш за адзін месяц пасля паступлення гэтай заявы ў суд, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

2. Бакам калектыўнай працоўнай спрэчкі паведамляецца судом аб часе і месцы судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы судовага пасяджэння, не з’яўляецца перашкодай для разгляду заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу.

3. Пры разглядзе заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу суд у судовым пасяджэнні ўстанаўлівае наяўнасць або адсутнасць падстаў для адмены рашэння працоўнага арбітражу, прадугледжаных артыкулам 477 гэтага Кодэкса, праз даследаванне прадстаўленых у суд доказаў у абгрунтаванне заяўленых патрабаванняў і пярэчанняў.

**Артыкул 477. Падставы для адмены рашэння працоўнага арбітражу**

Рашэнне працоўнага арбітражу падлягае адмене ў выпадку, калі бок калектыўнай працоўнай спрэчкі, які звярнуўся ў суд з заявай аб адмене рашэння працоўнага арбітражу, прадставіць суду доказы таго, што:

1) пагадненне аб стварэнні працоўнага арбітражу з’яўляецца несапраўдзейным у сувязі з яго заключэннем з парушэннем патрабаванняў заканадаўчых актаў аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак;

2) адзін з бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі не быў належным чынам апавешчаны аб часе і месцы разгляду калектыўнай працоўнай спрэчкі ў працоўным арбітражы ці па іншых уважлівых прычынах не мог рэалізаваць свае правы, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак;

3) рашэнне працоўнага арбітражу вынесена па спрэчцы, не прадугледжанай пагадненнем аб стварэнні працоўнага арбітражу, або па пытаннях, што выходзяць за межы пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу. Калі ў рашэнні працоўнага арбітражу вывады па пытаннях, ахопленых пагадненнем аб стварэнні працоўнага арбітражу, могуць быць аддзелены ад тых, што выходзяць за межы пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу, то можа быць адменена толькі тая частка рашэння працоўнага арбітражу, дзе змешчаны вывады па пытаннях, якія выходзяць за межы пагаднення аб стварэнні працоўнага арбітражу;

4) склад працоўнага арбітражу або разгляд калектыўнай працоўнай спрэчкі ў працоўным арбітражы не адпавядалі патрабаванням заканадаўчых актаў аб вырашэнні калектыўных працоўных спрэчак, пагадненню аб стварэнні працоўнага арбітражу;

5) маюцца істотныя для вырашэння працоўнай спрэчкі абставіны, што не былі і не маглі быць вядомыя аднаму з бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі на момант разгляду калектыўнай працоўнай спрэчкі ў працоўным арбітражы;

6) прыгаворам суда, які ўступіў у законную сілу, устаноўлены заведама лжывыя паказанні сведкі, заведама лжывае заключэнне эксперта, заведама няправільны пераклад, падложнасць дакументаў або рэчавых доказаў, што пацягнулі за сабой вынясенне незаконнага або неабгрунтаванага рашэння працоўнага арбітражу.

**Артыкул 478. Вызначэнне суда па заяве**

1. Суд па выніках разгляду заявы аб адмене рашэння працоўнага арбітражу выносіць вызначэнне аб адмене рашэння працоўнага арбітражу ці аб адмове ў адмене рашэння працоўнага арбітражу.

2. У вызначэнні суда аб адмене рашэння працоўнага арбітражу ці аб адмове ў адмене рашэння працоўнага арбітражу павінны быць указаны:

1) звесткі абаспрэчваным рашэнні працоўнага арбітражу;

2) склад працоўнага арбітражу, што вынес аспрэчванае рашэнне;

3) найменне бакоў калектыўнай працоўнай спрэчкі;

4) указанне на адмену рашэння працоўнага арбітражу поўнасцю або ў частцы ці на адмову ў задавальненні патрабавання заяўніка аб адмене рашэння працоўнага арбітражу, падставы і матывы прынятага судом рашэння.

3. Вызначэнне суда аб адмене рашэння працоўнага арбітражу ці аб адмове ў адмене рашэння працоўнага арбітражу можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

## ГЛАВА 43
## ВЯДЗЕННЕ, ЗВЯЗАНАЕ З ВЫКАНАННЕМ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ, ВЫКАНАЛЬНЫХ ДАКУМЕНТАЎ, ЯКІЯ ВЫДАЮЦЦА ІНШЫМІ ОРГАНАМІ

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 479. Кампетэнцыя судоў, звязаная з выкананнем судовых пастаноў, выканальных дакументаў, якія выдаюцца іншымі органамі**

1. Суды выдаюць выканальныя лісты, дублікаты выканальных лістоў, вызначэнняў аб судовым загадзе, вырашаюць пытанне аб павароце выканання судовай пастановы, аднаўляюць прапушчаны тэрмін прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання, зацвярджаюць міравыя пагадненні, заключаныя ў рамках выканаўчага вядзення, рашаюць пытанне аб дазволе судоваму выканаўцу зрабіць агляд зямельнага ўчастка, жылога, нежылога памяшканняў без згоды даўжніка, разглядаюць заявы аб адтэрміноўцы або растэрміноўцы выканання судовай пастановы, аб часовым абмежаванні права даўжніка, які з’яўляецца грамадзянінам, у тым ліку тым, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, службовай асобы юрыдычнай асобы, што з’яўляецца даўжніком, на выезд з Рэспублікі Беларусь, аб часовым абмежаванні даўжніка, які з’яўляецца грамадзянінам, у тым ліку тым, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, у наведванні ігральных устаноў, віртуальных ігральных устаноў і ва ўдзеле ў азартных гульнях, прадстаўлення судовага выканаўцы, заявы аб абскарджанні пастановы, дзеянняў (бяздзейнасці) судовага выканаўцы, пастановы кіраўніка органа прымусовага выканання, а таксама рашаюць іншыя пытанні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

2. Рашэнне пытанняў, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, адносіцца да кампетэнцыі эканамічных судоў у выпадку, калі:

1) выканальны дакумент выдадзены эканамічным судом;

2) выканальны дакумент выдадзены іншым органам у дачыненні да юрыдычнай асобы, грамадзяніна, які ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, калі змешчанае ў ім патрабаванне звязана з ажыццяўленнем імі прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці і вынікае з адносін з удзелам юрыдычных асоб, грамадзян, якія ажыццяўляюць індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, дзяржаўных органаў, службовых асоб, а ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках – іншых грамадзян.

**Артыкул 480. Выдача судом выканальнага ліста**

1. Выканальны ліст выдаецца на падставе рашэнняў, прыгавораў, вызначэнняў і пастаноў судоў (суддзяў), рашэнняў трацейскіх судоў, міжнародных арбітражных (трацейскіх) судоў, іншых пастаянных арбітражных органаў, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абавязковых рашэнняў працоўных арбітражаў, рашэнняў замежных судоў, рашэнняў замежных трацейскіх судоў (арбітражаў), міжнародных медыятыўных пагадненняў, міравых пагадненняў, пагадненняў аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, пагадненняў аб прымірэнні, пагадненняў аб дзецях, зацверджаных судом, медыятыўных пагадненняў, шлюбных дагавораў, пагадненняў аб дзецях, пагадненняў аб раздзеле маёмасці, якая з’яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю сужэнцаў, пагадненняў аб утрыманні сваіх непаўналетніх і (або) непрацаздольных паўналетніх дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, і іншых актаў, калі гэта прадугледжана заканадаўствам.

2. Выканальны ліст на падставе судовых пастаноў у межах тэрмінаў, устаноўленых заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні для прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання, выдаецца спагнанніку судом першай інстанцыі пасля ўступлення рашэння, прыгавору, вызначэння, пастановы ў законную сілу, за выключэннем выпадкаў неадкладнага выканання, калі выканальны ліст выдаецца неадкладна пасля вынясення судовай пастановы. У выпадку пропуску ўказаных тэрмінаў суд выдае выканальны ліст па заяве спагнанніка толькі ў выпадку аднаўлення такіх тэрмінаў, аб чым выносіць вызначэнне.

3. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь па разгледжанай ім у якасці суда першай інстанцыі справе мае права даручыць выдаць выканальны ліст суду ніжэйшага ўзроўню.

4. Выканальны ліст можа накіроўвацца судом для выканання ў выглядзе электроннага дакумента, падпісанага суддзёй электронным лічбавым подпісам у парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі.

5. Пры вырашэнні пытання аб выдачы выканальнага ліста на падставе медыятыўных пагадненняў, шлюбных дагавораў, пагадненняў аб дзецях, пагадненняў аб раздзеле маёмасці, якая з’яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю сужэнцаў, пагадненняў аб утрыманні сваіх непаўналетніх і (або) непрацаздольных паўналетніх дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, і іншых актаў суд абавязаны праверыць іх законнасць.

6. Суд у межах сваёй кампетэнцыі вырашае пытанні аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рашэнняў замежных судоў, рашэнняў замежных трацейскіх судоў (арбітражаў), міжнародныя медыятыўных пагадненняў і выносіць вызначэнне ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

7. Выканальны ліст выдаецца спагнанніку (у тым ліку ў выглядзе электроннага дакумента ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі) на падставе яго заявы, за выключэннем выпадкаў, калі суд па сваёй ініцыятыве накіроўвае для выканання выканальныя лісты, выдадзеныя на падставе прыгавораў, вызначэнняў і пастаноў суда па крымінальных справах у частцы маёмасных спагнанняў, аб чым паведамляе

спагнанніку. Пры спагнанні дзяржаўнай пошліны ў бюджэт суд накіроўвае выканальны ліст у падатковы орган.

**Артыкул 481. Выдача па адной судовай пастанове некалькіх выканальных лістоў, вызначэнняў аб судовым загадзе**

1. У выпадках калі выкананне судовай пастановы павінна быць праведзена ў розных месцах ці калі судовая пастанова вынесена на карысць некалькіх істцоў або супраць некалькіх адказчыкаў, суд можа па просьбе спагнаннікаў ці па прадстаўленні судовага выканаўцы выдаць некалькі выканальных лістоў, вызначэнняў аб судовым загадзе з дакладным указаннем часткі, падлеглай выкананню па гэтых лісце, вызначэнні.

2. Пры спагнанні грашовых сум з салідарных адказчыкаў можа быць выдадзена некалькі выканальных лістоў, вызначэнняў аб судовым загадзе ў колькасці экземпляраў па ліку салідарных адказчыкаў. У кожным выканальным лісце, вызначэнні павінны быць указаны яго нумар, агульная сума спагнання і пералічаны ўсе адказчыкі з указаннем на іх салідарную адказнасць.

3. Пры субсідыярнай адказнасці аднаго з даўжнікоў выканальны ліст, вызначэнне аб судовым загадзе выдаюцца пасля прадстаўлення спагнаннікам доказаў немагчымасці спагнання ўсёй прысуджанай сумы з асноўнага даўжніка.

4. Калі падчас прымусовага выканання выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе зроблена замена боку выканаўчага вядзення і ўзнікла некалькі даўжнікоў або спагнаннікаў, суд, які выдаў выканальны ліст і вынес вызначэнне аб судовым загадзе, на падставе прадстаўлення судовага выканаўцы і пастановы аб замене боку выканаўчага вядзення выдае неабходную колькасць экземпляраў выканальных лістоў, вызначэнняў аб судовым загадзе.

**Артыкул 482. Парадак разгляду судом заявы аб выдачы выканальнага ліста**

1. Заява аб выдачы выканальнага ліста на падставе шлюбных дагавораў, пагадненняў аб дзецях, пагадненняў аб раздзеле маёмасці, якая з’яўляецца агульнай сумеснай уласнасцю сужэнцаў, пагадненняў аб утрыманні сваіх непаўналетніх і (або) непрацаздольных паўналетніх дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе, і іншых актаў разглядаецца судом без апавяшчэння спагнанніка і даўжніка. У выпадку неабходнасці суд мае права выклікаць указаных асоб у судовае пасяджэнне. Аднак іх няяўка ў судовае пасяджэнне не з’яўляецца перашкодай для разгляду заявы, калі яны былі належным чынам апавешчаны аб часе і месцы судовага пасяджэння.

2. Па выніках разгляду заявы суд выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 483. Змест выканальнага ліста, выдадзенага судом**

1. У выканальным лісце, выдадзеным судом, павінны быць указаны:

1) найменне і месца знаходжання суда (прозвішча і ініцыялы суддзі), які выдаў выканальны ліст;

2) найменне і нумар справы ці матэрыялаў, на падставе якіх выдадзены выканальны ліст;

3) дата прыняцця судовай пастановы, на падставе якой выдадзены выканальны ліст;

4) дата ўступлення ў законную сілу судовай пастановы, на падставе якой выдадзены выканальны ліст, або ўказанне на яго неадкладнае выкананне;

5) звесткі аб даўжніку і спагнанніку ў дачыненні да грамадзяніна – прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), ідэнтыфікацыйны нумар, а пры яго адсутнасці – даныя дакумента, які сведчыць асобу (серыя (пры наяўнасці), нумар, дата выдачы, назва або код дзяржаўнага органа, што выдаў дакумент), яго месца жыхарства (месца прысутнасці), дата

і месца яго нараджэння (пры наяўнасці звестак аб месцы нараджэння), а ў дачыненні да грамадзяніна, які ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, апрача ўказанага, – таксама ўліковы нумар плацежніка. У дачыненні да даўжніка, які з’яўляецца грамадзянінам, у тым ліку тым, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, таксама павінна быць ўказана месца работы (службы) (калі яно вядомае);

6) звесткі аб даўжніку і спагнанніку ў дачыненні да юрыдычнай асобы, арганізацыі, што не з’яўляецца юрыдычнай асобай, – іх назва і месца знаходжання, уліковы нумар плацежніка або іншы аналагічны нумар, прысвоены ў замежнай дзяржаве;

7) звесткі аб даўжніку і спагнанніку ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак – найменне, уліковы нумар плацежніка і месца знаходжання органа, упаўнаважанага выступаць ад іх імя бокам выканаўчага вядзення;

8) рэзалютыўная частка судовай пастановы, на падставе якой выдадзены выканальны ліст, дзе змешчана патрабаванне аб ускладанні на даўжніка абавязку па перадачы спагнанніку грашовых сродкаў і (або) іншай маёмасці ці па здзясненні на карысць спагнанніка пэўных дзеянняў ці ўстрыманню ад здзяснення пэўных дзеянняў;

9) звесткі аб мерах па забеспячэнні іску, калі яны прымаліся;

10) дата выдачы выканальнага ліста.

2. У выканальным лісце аб спагнанні аліментаў на непаўналетніх дзяцей, апрача звестак, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, указваюцца прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) і дата нараджэння кожнага дзіцяці, на ўтрыманне якога прысуджаны аліменты, памер выплат, якія спаганяюцца штомесяц з даўжніка, у тым ліку мінімальны памер аліментаў (калі ён устаноўленыны), і тэрмін іх спагнання.

3. Калі да выдачы выканальнага ліста прадастаўлены адтэрміноўка або растэрміноўка выканання судовай пастановы, на падставе якой выдаецца выканальны ліст, то ў выканальным лісце ўказваецца, з якога часу пачынаецца цячэнне тэрміну выканання патрабаванняў, змешчаных у гэтым выканальным лісце.

4. У выканальным лісце могуць быць указаны і іншыя звесткі, неабходныя для яго выканання.

5. Выканальны ліст, выдадзены судом, падпісваецца суддзёй і завяраецца пячаткай з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 484. Выдача дубліката выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе

1. У выпадку страты выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе суд, што выдаў выканальны дакумент, па заяве бакоў або прадстаўленні судовага выканаўцы можа выдаць дублікат выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе. Заява бакоў або прадстаўленне судовага выканаўцы могуць быць пададзены ў межах тэрмінаў, устаноўленых заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні для прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання, за выключэннем выпадкаў, калі выканальны ліст, вызначэнне аб судовым загадзе былі страчаны судовым выканаўцам ці іншай асобай, якая ажыццяўляе выкананне, і спагнанніку або судоваму выканаўцу стала аб гэтым вядома пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага для прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання. У гэтых выпадках заява бакоў ці прадстаўленне судовага выканаўцы аб выдачы дубліката выканальнага дакумента могуць быць пададзены ў суд на працягу месяца, калі спагнанніку або судоваму выканаўцу стала вядома аб страце выканальнага дакумента.

2. Заява бакоў ці прадстаўленне судовага выканаўцы аб выдачы дубліката выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе разглядаюцца судом у тэрмін не пазней за адзін месяц без апавяшчэння бакоў выканаўчага вядзення, судовага выканаўцы. У выпадку неабходнасці суд мае права выклікаць бакі, судовага выканаўцу ў судовае пасяджэнне. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы судовага пасяджэння, не з’яўляецца перашкодай для разгляду заявы бакоў або

прадстаўлення судовага выканаўцы аб выдачы дубліката выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе.

3. Па выніках разгляду заявы бакоў ці прадстаўлення судовага выканаўцы аб выдачы дубліката выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе судом выносіцца вызначэнне. Вызначэнне суда аб выдачы ці аб адмове ў выдачы дубліката выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

## § 2. Паварот выканання судовай пастановы. Аднаўленне прапушчанага тэрміну прад'яўлення выканальнага дакумента да выканання. Дазвол судом судоваму выканаўцу зрабіць агляд зямельнага ўчастка, жылога, нежылога памяшканняў без згоды даўжніка. Прыняцце мер па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента. Вызваленне маёмасці ад арышту

### Артыкул 485. Паварот выканання судовай пастановы

У выпадках калі прыведзеная ў выкананне судовая пастанова зменена або адменена і прынята новая судовая пастанова аб поўнай ці частковай адмове ў задавальненні патрабавання, ці вядзенне справы спынена, або заява пакінута без разгляду ў цэлым ці яе частцы, другому боку вяртаецца ўсё, што было спагнана з яго на карысць заяўніка (істца) па зменена ці адмененай судовай пастанове (паварот выканання судовай пастановы).

### Артыкул 486. Разгляд пытання аб павароце выканання судовай пастановы судом першай інстанцыі

1. Суд, у які справа перададзена на новы разгляд, па сваёй ініцыятыве разглядае пытанне аб павароце выканання судовай пастановы і вырашае яго ў новай судовай пастанове, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці.

2. У выпадку калі суд, які нанава разглядае справу, не вырашыў пытанне аб павароце выканання судовай пастановы, даўжнік мае права падаць у гэты суд заяву аб павароце выканання судовай пастановы.

3. Заява аб павароце выканання судовай пастановы разглядаецца не пазней за адзін месяц пасля яе паступлення ў суд у судовым пасяджэнні з апавяшчэннем асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы судовага пасяджэння, не з'яўляецца перашкодай для вырашэння пытання аб павароце выканання судовай пастановы.

4. Па выніках разгляду заявы аб павароце выканання судовай пастановы судом выносіцца вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

### Артыкул 487. Вырашэнне пытання аб павароце выканання судовай пастановы судом апеляцыйнай, касацыйнай або наглядная інстанцыі

1. Суд, які разглядае справу ў апеляцыйнай, касацыйнай або наглядная інстанцыі, калі ён канчаткова вырашае спрэчку, ці спыняе вядзенне справы, ці пакідае заяву без разгляду, абавязаны вырашыць пытанне аб павароце выканання судовай пастановы, прыведзенай у выкананне, ці перадаць яе на вырашэнне суда першай інстанцыі.

2. Калі ў вызначэнні або пастанове суда апеляцыйнай, касацыйнай ці наглядная інстанцыі няма ўказання аб павароце выканання судовай пастановы, даўжнік, які выканаў судовую пастанову, мае права падаць адпаведную заяву ў суд першай інстанцыі.

3. У выпадку адмены ў касацыйным парадку або ў парадку нагляду судовай пастановы па справах аб спагнанні грашовых сум па патрабаваннях, што вынікаюць з працоўных і звязаных з імі адносін, па патрабаваннях аб выплаце аўтарскага

ўзнагароджання, аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, аб спагнанні сум на пакрыццё шкоды, прычыненай грамадзяніну калецтвам ці іншым пашкоджаннем здароўя, паварот выканання судовай пастановы дапускаецца, калі адмененая судовая пастанова была заснавана на паведамленых істцом лжывых звестках або прадстаўленых ім падложных дакументах.

4. У выпадку адмены ў апеляцыйным парадку судовай пастановы паварот выканання судовай пастановы праводзіцца па ўсіх справах, за выключэннем спраў аб спагнанні аліментаў, аб спагнанні выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, паварот выканання судовай пастановы па якіх дапускаецца толькі ў тых выпадках, калі адмененая судовая пастанова была заснавана на паведамленых істцом лжывых звестках ці прадстаўленых ім падложных дакументах.

**Артыкул 488. Аднаўленне прапушчанага тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання**

1. Пры пропуску тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання з прычын, прызнаных судом уважлівымі, прапушчаны тэрмін можа быць адноўлены судом па заяве спагнанніка.

2. Заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання падаецца ў суд, які выдаў выканальны дакумент, або ў суд па месцы выканання выканальнага дакумента.

3. Заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання разглядаецца ў тэрмін не пазней за адзін месяц пасля яе паступлення ў суд у судовым пасяджэнні з апавяшчэннем спагнанніка і даўжніка аб часе і месцы судовага пасяджэння. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы судовага пасяджэння, не з’яўляецца перашкодай для разгляду гэтай заявы.

4. Па выніках разгляду заявы аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання суд выносіць вызначэнне.

5. Вызначэнне суда аб аднаўленні прапушчанага тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання ці аб адмове ў аднаўленні прапушчанага тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 489. Разгляд судом прадстаўлення судовага выканаўцы аб дазволе зрабіць агляд зямельнага ўчастка, жылога, нежылога памяшканняў без згоды даўжніка**

1. Прадстаўленне судовага выканаўцы аб дазволе зрабіць агляд зямельнага ўчастка, жылога, нежылога памяшканняў без згоды даўжніка разглядаецца судом па месцы выканання выканальнага дакумента ў судовым пасяджэнні з апавяшчэннем даўжніка, спагнанніка, іншай зацікаўленай асобы, судовага выканаўцы ў тэрмін не больш за пяць каляндарных дзён пасля паступлення прадстаўлення ў суд. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду прадстаўлення судовага выканаўцы.

2. Па выніках разгляду прадстаўлення судовага выканаўцы аб дазволе зрабіць агляд зямельнага ўчастка, жылога, нежылога памяшканняў без згоды даўжніка судом выносіцца вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку. Падача апеляцыйнай скаргі на ўказанае вызначэнне не прыпыняе яго выканання.

3. Копія вызначэння не пазней за наступны дзень пасля дня яго вынясення накіроўваецца судоваму выканаўцу.

**Артыкул 490. Прыняцце судом меры па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента**

1. У выпадку калі даўжнік не выконвае або ўхіляецца ад выканання патрабаванняў, змешчаных у выканальным дакуменце, або мер па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента, прынятых судовым выканаўцам у выканаўчым вядзенні, недастакова для своечасовага і поўнага выканання выканальнага дакумента, суд па заяве спагнанніка або прадстаўленні судовага выканаўцы можа прыняць у дачыненні да даўжніка меру па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента ў выглядзе часовага абмежавання права даўжніка, які з’яўляецца грамадзянінам, у тым ліку тым, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, службовай асобы юрыдычнай асобы, што з’яўляецца даўжніком, на выезд з Рэспублікі Беларусь, калі прыняцце гэтай меры не перашкаджае выкананню іншых абавязкаў даўжніка.

2. Заява (прадстаўленне) аб прыняцці меры па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента падаецца ў суд па месцы выканання выканальнага дакумента і разглядаецца ў тэрмін не больш за дзесяць каляндарных дзён пасля яе паступлення ў суд у судовым пасяджэнні з апавяшчэннем бакоў выканаўчага вядзення, службовай асобы юрыдычнай асобы, якая з’яўляецца даўжніком, у дачыненні да якой пададзена заява або прадстаўленне, аб часе і месцы судовага пасяджэння.

3. Па выніках разгляду заявы (прадстаўлення) аб прыняцці меры па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента суд выносіць вызначэнне, копіі якога накіроўваюцца бакам выканаўчага вядзення, судоваму выканаўцу, а таксама іншым асобам, на каго ўскладзены абавязак выканання адпаведнай меры па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента.

4. Выключана.

5. Выкананне вызначэння суда аб прыняцці меры па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента можа быць прыпынена на тэрмін, устаноўлены судом. Пытанне аб прыпыненні ўказанай меры разглядаецца судом па заяве даўжніка, які з’яўляецца грамадзянінам, у тым ліку тым, хто ажыццяўляе індывідуальную прадпрымальніцкую дзейнасць, службовай асобы юрыдычнай асобы, якая з’яўляецца даўжніком, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежаваны.

6. Прынятая раней мера па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента можа быць адменена судом па заяве бакоў выканаўчага вядзення ці па прадстаўленні судовага выканаўцы. Пытанне аб адмене меры па забеспячэнні выканання выканальнага дакумента разглядаецца судом не пазней за тры каляндарныя дні пасля паступлення заявы (прадстаўлення).

7. Пры разглядзе пытанняў, указаных у частках 5 і 6 гэтага артыкула, бакі выканаўчага вядзення, судовы выканаўца выклікаюцца ў судовае пасяджэнне ў выпадках, калі суд прызнае гэта неабходным.

8. Вызначэнні суда па пытаннях забеспячэння выканання выканальнага дакумента могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў апеляцыйным парадку. Падача прыватнай скаргі або прынясенне апеляцыйнага пратэсту на ўказаныя вызначэнні суда не прыпыняюць іх выканання.

**Артыкул 491. Вызваленне маёмасці ад арышту**

1. У выпадку ўзнікнення спрэчкі, звязанай з прыналежнасцю ўжо арыштаванай або апісанай маёмасці, асоба, чыё права закранута ў выніку такіх дзеянняў, мае права звярнуцца ў суд з іскам аб вызваленні маёмасці ад арышту ці выдаленні маёмасці з акта вопісу маёмасці.

2. Іскі аб вызваленні маёмасці ад арышту або выдаленні маёмасці з акта вопісу маёмасці могуць прад’яўляцца як уласнікамі арыштаванай маёмасці, не прыналежнай

даўжніку, так і асобамі, якім такая маёмасць належыць на праве гаспадарчага вядзення або аператыўнага кіравання.

3. Калі арышт на маёмасць накладзены з мэтай забеспячэння канфіскацыі маёмасці, адказчыкамі з'яўляюцца асоба, у дачыненні да якой прыменена канфіскацыя, і орган, што адыццяўляў арышт маёмасці. Калі арыштаваная маёмасць ужо рэалізавана, іск прад'яўляецца таксама да той асобы (асобаў), у каго знаходзіцца гэта маёмасць.

## ГЛАВА 44
## ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ ВЫДАЧЫ ВЫКАНАЛЬНАГА ЛІСТА НА ПРЫМУСОВАЕ ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯ ТРАЦЕЙСКАГА СУДА, МІЖНАРОДНАГА АРБІТРАЖНАГА (ТРАЦЕЙСКАГА) СУДА, ІНШАГА ПАСТАЯННАГА АРБІТРАЖНАГА ОРГАНА, ШТО ЗНАХОДЗЯЦЦА НА ТЭРЫТОРЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

### Артыкул 492. Зварот па выдачу выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

1. У выпадку невыканання добраахвотна рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, выдача выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння праводзіцца судом па заяве боку трацейскага (арбітражнага) разбору, на карысць якога вынесена рашэнне.

2. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаецца ў суд па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) або месцы знаходжання даўжніка ці па месцы знаходжання маёмасці даўжніка, калі месца жыхарства (месца прысутнасці) або месца знаходжання даўжніка невядомыя.

3. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць пададзена не пазней за шэсць месяцаў пасля заканчэння тэрміну для добраахвотнага выканання рашэння.

4. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін падачы заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа быць адноўлены судом у выпадках і парадку, прадугледжаных артыкулам 119 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 493. Форма і змест заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

1. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падаецца ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента.

2. У заяве аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, указваюцца:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) найменне (пры наяўнасці), месца знаходжання і склад трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што прынялі рашэнне;

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору і іх месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

4) нумар (пры наяўнасці) рашэння, у дачыненні да якога пададзена заява, час і месца яго вынясення, прадмет спрэчкі, змест рэзалютыўнай часткі рашэння;

5) дата атрымання рашэння асобай, на карысць якой яно прынята, а ў выпадку, калі любы з бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору падаваў заяву з просьбай аб выпраўленні, растлумачэнні рашэння або прыняцці дадатковага рашэння, – дата вынясення рашэння па гэтай заяве;

6) патрабаванне аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

7) пералік дадзеных дакументаў;

8) іншыя звесткі, калі яны маюць значэнне для разгляду заявы.

3. Заява падпісваецца заяўнікам або яго прадстаўніком, які мае адпаведныя паўнамоцтвы.

4. Пры падачы заявы ў выглядзе электроннага дакумента яна падпісваецца электронным лічбавым подпісам заяўніка ці яго прадстаўніка.

5. Да заявы дадаюцца:

1) арыгінал рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда або копія рашэння іншага пастаяннага арбітражнага органа, падпісаная арбітрам (арбітрамі) і высланая боку арбітражнага разбору ў адпаведнасці з рэгламентам гэтага арбітражнага органа, ці належным чынам завераная копія рашэння, па якім просіцца выканальны ліст. Копія рашэння пастаянна дзейнага трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, можа завярацца іх старшынямі. Правільнасць копіі рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, утвораных для вырашэння канкрэтнай (разгляду асобнай) спрэчкі, павінна быць засведчана ў натарыяльным парадку;

2) арыгінал трацейскага (арбітражнага) пагаднення або яго належным чынам завераная копія;

3) дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўчымі актамі, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы;

4) доказы, што пацвярджаюць факт невыканання другім бокам трацейскага (арбітражнага) разбору рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ва ўстаноўлены тэрмін;

5) копіі заявы ў колькасці экземпляраў па ліку бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору;

6) даверанасць ці іншы дакумент, які пацвярджае паўнамоцтвы асобы на падпісанне заявы.

### Артыкул 494. Вяртанне заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

1. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, пададзеная пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага часткай 3 артыкула 492 гэтага Кодэкса (калі не была пададзена заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну ці суд адмовіў у яго аднаўленні), і (або) без захавання патрабаванняў, прадугледжаных артыкулам 493 гэтага Кодэкса, вяртаецца асобе – падаўцу такой заявы.

2. Аб вяртанні заявы суд не пазней за пяць дзён пасля яе паступлення выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

### Артыкул 495. Парадак і межы разгляду заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

1. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, разглядаецца ў тэрмін не больш за адзін месяц пасля паступлення заявы ў суд, па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для разгляду справы судом першай інстанцыі, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой.

2. Пры падрыхтоўцы да судовага разбору суд па хадайніцтве заяўніка, іншых бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору ці па сваёй ініцыятыве мае права выпатрабаваць па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для выпатрабавання доказаў, матэрыялы справы, разгледжанай трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, іншым пастаянным арбітражным органам, з:

1) пастаянна дзейнага трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія разгледзелі спрэчку;

2) раённага (гарадскога) суда, эканамічнага суда вобласці (горада Мінска) па месцы трацейскага (арбітражнага) разбору – па спрэчках, што адносяцца да кампетэнцыі гэтых судоў, разгледжаных трацейскім судом, міжнародным арбітражным (трацейскім) судом, утворанымі для вырашэння канкрэтнай (разгляду асобнай) спрэчкі.

3. Бакам трацейскага (арбітражнага) разбору паведамляецца судом аб часе і месцы судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам, не перашкаджае разгляду заявы.

4. У межах тэрміну, устаноўленага часткай 1 гэтага артыкула, суд па хадайніцтве боку трацейскага (арбітражнага) разбору або па сваёй ініцыятыве мае права прыпыніць разгляд заявы, калі ў вядзенні гэтага або іншага суда знаходзіцца хадайніцтва аб адмене рашэння, па якім просіцца выканальны ліст.

5. Пры разглядзе заявы суд даследуе доказы, прадстаўленыя заяўнікам, іншымі бакамі трацейскага (арбітражнага) разбору ў абгрунтаванне сваіх патрабаванняў і пярэчанняў, устанаўлівае наяўнасць ці адсутнасць прадугледжаных артыкулам 496 гэтага Кодэкса падстаў для адмовы ў выдачы выканальнага ліста.

**Артыкул 496. Падставы для адмовы ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

1. Суд можа адмовіць у выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, калі ўстановіць наяўнасць абставін, якія з'яўляюцца падставамі для адмены гэтага рашэння, прадугледжанымі заканадаўчымі актамі аб трацейскіх судах.

2. Суд можа адмовіць у выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі ўстановіць наяўнасць абставін, якія з'яўляюцца падставамі для адмены гэтага рашэння, прадугледжанымі заканадаўчымі актамі аб міжнародным арбітражным (трацейскім) судзе.

**Артыкул 497. Вызначэнне суда па заяве аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь**

1. Па выніках разгляду заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, суд выносіць вызначэнне аб выдачы выканальнага ліста ці аб адмове ў выдачы выканальнага ліста.

2. У вызначэнні суда павінны быць указаны:

1) найменне (пры наяўнасці) і склад трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што прынялі рашэнне;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) ці найменне бакоў трацейскага (арбітражнага) разбору;

3) нумар (пры наяўнасці) рашэння, па якім заяўнік просіць выдаць выканальны ліст, дата і месца яго вынясення, змест рэзалютыўнай часткі рашэння;

4) указанне на выдачу выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, поўнасцю або ў частцы ці на адмову ў задавальненні заявы поўнасцю або ў частцы, падставы і матывы прынятага рашэння.

3. Адмова ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, не перашкаджае бакам арбітражнага (трацейскага) разбору паўторна звярнуцца ў трацейскі суд, міжнародны арбітражны (трацейскі) суд, іншы пастаянны арбітражны орган, калі магчымасць такога звароту не страчана, або ў суд за вырашэннем спрэчкі па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

4. Калі ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, адмоўлена судом поўнасцю ці ў частцы з прычыны несапраўднасці трацейскага (арбітражнага) пагаднення або калі рашэнне вынесена па спрэчцы, не прадугледжанай трацейскім (арбітражным) пагадненнем, ці не падпадае пад яго ўмовы, або змяшчае пастановы па пытаннях, якія выходзяць за межы трацейскага (арбітражнага) пагаднення, бакі трацейскага (арбітражнага) разбору могуць звярнуцца за вырашэннем спрэчкі ў суд па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

5. Вызначэнне суда можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

6. Уступіўшае ў законную сілу вызначэнне суда аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца падставай для выдачы выканальнага ліста.

## ГЛАВА 45
## ВЯДЗЕННЕ ПА ЗАЯВЕ АБ ВЫДАЧЫ ВЫКАНАЛЬНАГА ЛІСТА НА ПРЫМУСОВАЕ ВЫКАНАННЕ МЕДЫЯТЫЎНАГА ПАГАДНЕННЯ

### Артыкул 498. Зварот па выдачу выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення

1. У выпадку невыканання добраахвотна медыятыўнага пагаднення, адпаведнага патрабаванням гэтага Кодэкса аб міравым пагадненні, выдача выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення праводзіцца судом па заяве зацікаўленага боку медыятыўнага пагаднення.

2. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення па спрэчцы, падведамнай суду, падаецца ў суд па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) або месцы знаходжання боку, які не выканаў медыятыўнае пагадненне, ці па месцы знаходжання маёмасці боку, які не выканаў медыятыўнае пагадненне, калі яго месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання невядомыя.

3. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення можа быць пададзена на працягу шасці месяцаў пасля заканчэння тэрміну добраахвотнага выканання медыятыўнага пагаднення.

4. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін падачы заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення можа быць адноўлены судом у выпадках і парадку, прадугледжаных артыкулам 119 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 499. Форма і змест заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення

1. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення падаецца ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента.

2. У заяве аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення ўказваюцца:

1) найменне суда, у які падаецца заява;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне бакоў медыятыўнага пагаднення, іх месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) медыятара (медыятараў), яго (іх) месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

4) патрабаванне аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення.

3. Да заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення дадаюцца:

1) арыгінал медыятыўнага пагаднення;

2) доказы, што пацвярджаюць факт невыканання другім бокам медыятыўнага пагаднення ў тэрмін, устаноўлены ў ім;

3) даверанасць або іншы дакумент, што пацвярджае паўнамоцтвы прадстаўніка заяўніка на падпісанне заявы;

4) дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў заяве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы заявы.

4. Заява аб выдачы выканальнага дакумента на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення падпісваецца заяўнікам ці яго прадстаўніком.

**Артыкул 500. Вяртанне заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення**

1. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення, пададзеная пасля сканчэння тэрміну, устаноўленага часткай 3 артыкула 498 гэтага Кодэкса (калі не была пададзена заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну), і (або) без захавання патрабаванняў, прадугледжаных артыкулам 499 гэтага Кодэкса, вяртаецца асобе –падаўцу такой заявы.

2. Аб вяртанні заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення суд не пазней за пяць дзён пасля паступлення заявы выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 501. Парадак разгляду заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення**

1. Заява аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення разглядаецца ў судовым пасяджэнні не пазней за адзін месяц пасля паступлення заявы ў суд.

2. Бакі медыятыўнага пагаднення апавяшчаюцца аб часе і месцы судовага пасяджэння. Няяўка бакоў, апавешчаных належным чынам аб часе і месцы судовага пасяджэння, не перашкаджае разгляду заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення.

3. Па выніках разгляду заявы аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення суд выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 502. Адмова ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення**

1. Суд адмаўляе ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення, калі ўстановіць, што медыятыўнае пагадненне не адпавядае патрабаванням гэтага Кодэкса аб міравым пагадненні і (або) медыятыўнае пагадненне заключана з удзелам асобы, якая не мае пасведчання медыятара, выдадзенага ва ўстаноўленым парадку.

2. Адмова ў выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне медыятыўнага пагаднення не перашкаджае звароту ў суд для вырашэння спрэчкі па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

# РАЗДЗЕЛ VII
# МІЖНАРОДНЫ ГРАМАДЗЯНСКІ ПРАЦЭС

## ГЛАВА 46
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 503. Працэсуальныя правы і абавязкі замежных асоб

1. Замежныя асобы маюць права звяртацца ў суды Рэспублікі Беларусь для абароны сваіх парушаных або аспрэчваных правоў і свабод ці абароны сваіх законных інтарэсаў.

2. Замежныя асобы маюць права звяртацца ў суды Рэспублікі Беларусь па правілах падведамнасці і падсуднасці, устаноўленым гэтым Кодэксам.

3. Замежныя асобы карыстаюцца працэсуальнымі правамі і выконваюць працэсуальныя абавязкі нароўні з грамадзянамі і арганізацыямі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

4. Урадам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены ў адказ абмежаванні (рэторсіі) у дачыненні да замежных асоб тых замежных дзяржаў, дзе дапускаюцца спецыяльныя абмежаванні грамадзянскіх працэсуальных правоў грамадзян і арганізацый Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 504. Заканадаўства аб судаводстве па справах з удзелам замежных асоб

1. Судаводства па справах з удзелам замежных асоб ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі і (або) міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Пры ажыццяўленні правасуддзя па справах з удзелам замежных асоб суды Рэспублікі Беларусь кіруюцца агульнымі прынцыпамі грамадзянскага судаводства, а таксама прыярытэтам агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права, прынцыпамі працэсуальнага раўнапраўя замежных асоб з грамадзянамі і арганізацыямі Рэспублікі Беларусь, захавання юрысдыкцыі замежных судоў і іншых правапрымяняльных органаў, узаемнасці.

### Артыкул 505. Працэсуальная праваздольнасць і працэсуальная дзеяздольнасць замежных грамадзян, асоб без грамадзянства

1. Працэсуальная праваздольнасць і працэсуальная дзеяздольнасць замежных грамадзян, асоб без грамадзянства вызначаюцца іх асабістым законам.

2. Асабістым законам замежнага грамадзяніна з’яўляецца:

1) права той дзяржавы, грамадзянінам (падданым) якой ён з’яўляецца;

2) права той дзяржавы, з якой ён найбольш цесна звязаны (у тым ліку дзе мае месца жыхарства), калі ў яго ёсць грамадзянства (падданства) дзвюх ці больш дзяржаў;

3) права Рэспублікі Беларусь, калі ён нароўні з грамадзянствам Рэспублікі Беларусь мае грамадзянства (падданства) дзвюх ці больш замежных дзяржаў.

3. Асабістым законам асобы без грамадзянства з’яўляецца права дзяржавы, дзе гэта асоба мае пастаяннае месца жыхарства, а пры яго адсутнасці – права дзяржавы месца яго прысутнасці.

4. Асабістым законам фізічнай асобы, якой прадастаўлены статус бежанца або іншыя формы абароны, у дзяржаве, што не з’яўляецца дзяржавай яго грамадзянства (падданства), з’яўляецца права дзяржавы, дзе гэта асоба пастаянна пражывае.

5. Асоба, якая не з’яўляецца на аснове асабістага закона працэсуальна дзеяздольнай, можа быць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прызнана працэсуальна дзеяздольнай, калі яна ў адпаведнасці з правам Рэспублікі Беларусь валодае працэсуальнай дзеяздольнасцю.

**Артыкул 506. Працэсуальная правааздольнасць замежнай арганізацыі**

1. Працэсуальная правааздольнасць замежнай арганізацыі вызначаецца па праве замежнай дзяржавы, на тэрыторыі якой яна заснавана.

2. Замежная арганізацыя, што не валодае ў адпаведнасці з асабістым законам працэсуальнай правааздольнасцю, можа быць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прызнана правааздольнай у адпаведнасці з правам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 507. Працэсуальная правааздольнасць міжнароднай арганізацыі**

Працэсуальная правааздольнасць міжнароднай арганізацыі ўстанаўліваецца на аснове міжнароднага дагавора, у адпаведнасці з якім яна створана, яе ўстаноўчых дакументаў ці пагаднення з кампетэнтным органам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 47
## ПАДСУДНАСЦЬ СПРАЎ З УДЗЕЛАМ ЗАМЕЖНЫХ АСОБ

**Артыкул 508. Правілы падсуднасці**

1. Падсуднасць судам Рэспублікі Беларусь спраў з удзелам замежных асоб, а таксама спрэчак, па якіх хаця б адзін з бакоў пражывае (знаходзіцца) за мяжой, вызначаецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам, іншымі заканадаўчымі актамі, калі іншае не ўстаноўлена міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь або пісьмовым пагадненнем бакоў.

2. Судам Рэспублікі Беларусь падсудныя справы па исках замежных асоб да адказчыкаў, якія маюць месца жыхарства (месца прысутнасці) або месца знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь. Судам Рэспублікі Беларусь падсудныя таксама справы па исках да замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, калі яны маюць месца жыхарства (месца прысутнасці) у Рэспубліцы Беларусь, і да замежных арганізацый, калі ў Рэспубліцы Беларусь знаходзяцца орган кіравання, прадстаўніцтва ці філіял такіх арганізацый.

3. Суды Рэспублікі Беларусь разглядаюць справы з удзелам замежных асоб таксама ў выпадках, калі:

1) па справе аб спагнанні аліментаў, аб устанаўленні бацькоўства ісцец мае месца жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

2) па справе аб скасаванні шлюбу ісцец мае месца жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь або хаця б адзін з сужэнцаў з’яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь;

3) па справе аб пакрыцці шкоды, прычыненай калецтвам, іншым пашкоджаннем здароўя ці ў сувязі са смерцю карміцеля, шкода прычынена на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь або ісцец мае месца жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

4) па справе аб пакрыцці шкоды, прычыненай маёмасці, дзеянне ці іншыя абставіны, што паслужылі падставай для прад’яўлення патрабавання аб пакрыцці шкоды, адбыліся на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

5) спрэчка ўзнікла з дагавора, па якім поўнае або частковае выкананне павінна адбывацца ці адбылося на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

6) спрэчка ўзнікла з беспадстаўнага абагачэння, што адбылося на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

7) па справе аб абароне гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі ісцец мае месца знаходжання або месца жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

8) спрэчка ўзнікла з адносін, звязаных з абарачэннем каштоўных папер, эмісія (выдача) якіх адбылася на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

9) заяўнік па справе аб устанаўленні факту, што мае юрыдычнае значэнне, указае на наяўнасць гэтага факту на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

10) асоба, у дачыненні да якой падаецца заява аб усынаўленні, аб абмежаванні дзеяздольнасці грамадзяніна, аб прызнанні яго недзеяздольным, аб абвяшчэнні непаўналетняга поўнасцю дзеяздольным (эмансіпіраваным), з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь;

11) асоба, у дачыненні да якой падаецца заява аб прызнанні яе без вестак адсутнай ці аб абвяшчэнні яе памерлай, з'яўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь;

12) рэч, у дачыненні да якой пададзена заява аб прызнанні яе безгаспадарнай, знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

13) пададзена заява аб аднаўленні правоў па дакументах на прад'яўніка (вядзенне па выкліку), выдадзеных грамадзянінам ці грамадзяніну, якія маюць месца жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, або арганізацыяй ці арганізацыі, што знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь;

14) маецца цесная сувязь спрэчных праваадносін з тэрыторыяй Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 509. Выключная падсуднасць спраў з удзелам замежных асоб**

Да выключнай падсуднасці судоў Рэспублікі Беларусь адносяцца справы з удзелам замежных асоб:

1) па спрэчках у дачыненні да маёмасці, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці, у тым ліку па спрэчках, звязаных з прыватызацыяй дзяржаўнай маёмасці і прымусовым адчужэннем маёмасці для дзяржаўных патрэб;

2) калі прадметам спрэчкі з'яўляецца нерухомая маёмасць, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку аб устанаўленні факту валодання нерухомай маёмасцю або права на яе;

3) аб прызнанні несапраўднымі запісаў у дзяржаўным рэестры (рэгістры, кадастры), зробленых дзяржаўным органам (іншай арганізацыяй) Рэспублікі Беларусь, у кампетэнцыю якога ўваходзіць вядзенне такога рэестру (рэгістру, кадастру);

4) па спрэчках аб вызваленні маёмасці ад арышту ці аб выдаленні маёмасці з акта вопісу маёмасці, калі арышт маёмасці праведзены дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь;

5) па спрэчках, звязаных з заснаваннем, дзяржаўнай рэгістрацыяй або ліквідацыяй (спыненнем дзейнасці) юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама з аспрэчваннем рашэнняў органаў гэтых юрыдычных асоб;

6) па патрабаваннях, што ўзнікаюць з адміністрацыйных і іншых публічных праваадносін, прадугледжаных падраздзелам 3 раздзела VI гэтага Кодэкса;

7) аб неплацежаздольнасці ці банкруцтве юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, месцам знаходжання або месцам жыхарства якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь.

**Артыкул 510. Дагаворная падсуднасць спраў з удзелам замежных асоб**

1. Падсуднасць спраў з удзелам замежных асоб суду Рэспублікі Беларусь або замежнаму суду можа вызначацца пісьмовым пагадненнем бакоў. Такім пагадненнем не можа быць зменена выключная падсуднасць спраў суду Рэспублікі Беларусь або замежнаму суду.

2. Калі ў пагадненні аб падсуднасці спрэчкі суду Рэспублікі Беларусь не зроблены выбар паміж некалькімі судамі, якімі падсудная справа, а таксама адсутнічаюць падставы для прымянення выключнай падсуднасці і агульных правілаў падсуднасці, прадугледжаных гэтым Кодэксам, то іск прад'яўляецца ў суд па месцы жыхарства ці месцы знаходжання істца ў Рэспубліцы Беларусь.

**Артыкул 511. Нязменнасць першапачатковай падсуднасці**

Справа, прынятая судом Рэспублікі Беларусь да свайго вядзення з захаваннем правілаў падсуднасці, вырашаецца ім па сутнасці, нават калі ў далейшым у сувязі са змяненнем грамадзянства, месца жыхарства ці месца знаходжання бакоў або іншымі абставінамі, што ўплываюць на падсуднасць, яна стала падсуднай замежнаму суду.

**Артыкул 512. Прыняцце забяспечвальных мер па справах з удзелам замежных асоб**

Па справах з удзелам замежных асоб, узбуджаных судом Рэспублікі Беларусь з захаваннем правілаў падсуднасці, суд мае права прыняць забяспечвальныя меры ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

**Артыкул 513. Наступствы непадсуднасці справы з удзелам замежных асоб суду Рэспублікі Беларусь**

1. Непадсуднасць справы з удзелам замежных асоб суду Рэспублікі Беларусь з'яўляецца падставай для адмовы ва ўзбуджэнні вядзення справы.
2. Суд Рэспублікі Беларусь спыняе вядзенне справы з удзелам замежных асоб на любой стадыі грамадзянскага судаводства, калі выявіць, што справа падсудная замежнаму суду, і калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 514. Наступствы разгляду замежным судом тоеснай справы з удзелам замежных асоб**

1. Калі спрэчка па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, падсудная толькі суду Рэспублікі Беларусь, ён разглядае справу і выносіць рашэнне нават у выпадках, калі тоесная справа знаходзіцца ў вядзенні замежнага суда або ўжо разгледжана гэтым замежным судом.
2. Пры двайной падсуднасці спрэчкі з удзелам замежных асоб суд Рэспублікі Беларусь:

1) вяртае іскавую заяву, калі ў вядзенні замежнага суда знаходзіцца на разглядзе тоесная справа;
2) пакідае іскавую заяву без разгляду, калі ў вядзенні замежнага суда знаходзіцца на разглядзе тоесная справа, вядзенне па якой было ўзбуджана раней;
3) адмаўляе ва ўзбуджэнні вядзення справы ці спыняе вядзенне справы, калі па тоеснай справе маецца рашэнне замежнага суда, што ўступіла ў законную сілу, за выключэннем выпадкаў, калі суд адмовіў у прызнанні і прывядзенні яго ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 48
## АСАБЛІВАСЦІ РАЗГЛЯДУ СПРАЎ З УДЗЕЛАМ ЗАМЕЖНЫХ АСОБ

**Артыкул 515. Правілы, што прымяняюцца па справах з удзелам замежных асоб**

1. Справы з удзелам замежных асоб разглядаюцца судамі Рэспублікі Беларусь па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей гэтага раздзела, калі іншае не ўстаноўленана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.
2. Справы з удзелам замежных арганізацый, калі гэтыя арганізацыі або органы іх кіравання, філіялы, прадстаўніцтвы ці іх прадстаўнікі, упаўнаважаныя на вядзенне справы, знаходзяцца або пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, разглядаюцца ў тэрміны, устаноўленыя часткай 1 артыкула 122 гэтага Кодэкса.

3. Калі замежныя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, разгляданай судом Рэспублікі Беларусь, маюць месца знаходжання ці месца жыхарства за межамі Рэспублікі Беларусь, яны апавяшчаюцца аб судовым разборы ў парадку, устаноўленым міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь па пытаннях аказання міжнароднай прававой дапамогі па грамадзянскіх справах, а пры адсутнасці такога міжнароднага дагавора – у адпаведнасці з артыкулам 525 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 516. Прызнанне дакументаў, выдадзеных, складзеных або засведчаных кампетэнтнымі органамі замежных дзяржаў

1. Дакументы, складзеныя на замежнай мове, пры прадстаўленні ў суд Рэспублікі Беларусь павінны суправаджацца належным чынам завераным іх перакладам на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь.

2. Дакументы, выдадзеныя, складзеныя або засведчаныя па ўстаноўленай форме кампетэнтнымі органамі замежных дзяржаў за межамі Рэспублікі Беларусь згодна заканадаўству замежных дзяржаў у дачыненні да грамадзян і арганізацый Рэспублікі Беларусь, а таксама замежных асоб, прымаюцца судамі Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці іх легалізацыі ці прастаўлення апостылю, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 517. Вядзенне спраў з удзелам замежных асоб праз прадстаўнікоў

Прадстаўнікі замежных асоб маюць права весці справы замежных асоб у судах Рэспублікі Беларусь па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі.

### Артыкул 518. Дыпламатычнае (консульскае) прадстаўніцтва

1. Дыпламатычныя і іншыя афіцыйныя прадстаўніцтвы, консульскія ўстановы замежных дзяржаў, што знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, маюць права прадстаўляць і абараняць інтарэсы сваіх дзяржаў, іх грамадзян і арганізацый у судах Рэспублікі Беларусь у межах, вызначаных заканадаўствам і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Акрэдытаваныя ў Рэспубліцы Беларусь дыпламатычныя прадстаўнікі (консульскія службовыя асобы) замежных дзяржаў маюць права прадстаўляць без даручэння і даверанасці інтарэсы грамадзян і арганізацый сваіх дзяржаў у судах Рэспублікі Беларусь, калі гэтыя грамадзяне і арганізацыі ў сувязі з адсутнасцю ці па іншых уважлівых прычынах не маюць магчымасці абараняць свае правы, свабоды і законныя інтарэсы. Такое прадстаўніцтва можа працягвацца да тых пор, пакуль грамадзянін ці арганізацыя не даручаць вядзенне справы іншаму прадстаўніку або не возьмуць абарону на сябе.

## ГЛАВА 49
## АСАБЛІВАСЦІ РАЗГЛЯДУ СПРАЎ З УДЗЕЛАМ АСОБ, ЯКІЯ ВАЛОДАЮЦЬ СУДОВЫМ ІМУНІТЭТАМ

### Артыкул 519. Вядзенне па справах з удзелам замежных дзяржаў

1. Замежная дзяржава, выступаючы ў якасці суверэна, валодае судовым імунітэтам ад прад’яўленага да яе іску ў судзе Рэспублікі Беларусь, далучэння яе да ўдзелу ў справе ў якасці трэцяй асобы, накладання арышту на маёмасць, што прыналежыць замежнай дзяржаве і знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама ад прыняцця ў адносінах да яе судом Рэспублікі Беларусь мер па забеспячэнні іску і выканання рашэння суда Рэспублікі Беларусь.

2. Замежная дзяржава не разглядаецца ў якасці суверэна ў спрэчках, што ўзнікаюць з (у дачыненні да):

1) грамадзянска-прававых дагавораў з арганізацыямі і фізічнымі асобамі, калі ў такіх дагаворах бакі яўна не дамовіліся аб іншым;

2) працоўных дагавораў паміж замежнай дзяржавай і работнікам у дачыненні да работы, што павінна быць выканана поўнасцю або часткова на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выканання канкрэтных абавязкаў па ажыццяўленні ўладных паўнамоцтваў замежнай дзяржавы, а таксама за выключэннем выпадкаў, калі работнік з'яўляецца асобай, якая карыстаецца імунітэтам;

3) прычынення шкоды жыццю, здароўю, маёмасці, гонару і годнасці, дзелавой рэпутацыі фізічнай асобы або маёмасці, дзелавой рэпутацыі юрыдычнай асобы ў выніку дзеяння (бяздзейнасці) замежнай дзяржавы, што адбылася поўнасцю ці часткова на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі прычыняльнік шкоды знаходзіўся ў момант яе прычынення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

4) адносін з нагоды нерухомай маёмасці замежнай дзяржавы, якая знаходзіцца ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама маёмасці, што замежная дзяржава набывае ў сілу дарэння, наследавання, давернага кіравання або прызнання арганізацыі неплацежаздольнай ці банкрутам ці яе ліквідацыі;

5) парушэння замежнай дзяржавай правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, ахаваныя ў Рэспубліцы Беларусь, або ўстанаўлення права замежнай дзяржавы на такія аб'екты на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

6) удзелу ў юрыдычных асобах Рэспублікі Беларусь;

7) эксплуатацыі судна, якое знаходзіцца ва ўласнасці замежнай дзяржавы ці эксплуатуецца такой дзяржавай, калі ў момант узнікнення факту, што паслужыў падставай для ўзнікнення спрэчкі, гэта судна выкарыстоўвалася з іншымі мэтамі, чым некамерцыйныя мэты (вайсковыя, дапаможныя судны і г.д.).

3. Акрамя таго, прызнаецца адмова замежнай дзяржавы ад судовага імунітэту ў дачыненні да прад'яўлення да яе іску ў судзе Рэспублікі Беларусь у выпадку, калі яна:

1) прадаставіла яўную адмову ад судовага імунітэту з прычыны пісьмовай заявы замежнай дзяржавы, міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь ці пісьмовага пагаднення;

2) прад'явіла іск (у тым ліку сустрэчны) у суд Рэспублікі Беларусь, уступіла ў працэс у судзе Рэспублікі Беларусь ці зрабіла іншае дзеянне па сутнасці спрэчкі.

4. У выпадку адмовы замежнай дзяржавы ад судовага імунітэту суд Рэспублікі Беларусь разглядае справу ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

5. Адмова замежнай дзяржавы ад судовага імунітэту ў дачыненні да прад'яўлення да яе іску ў судзе Рэспублікі Беларусь не разглядаецца ў якасці адмовы ўказанай замежнай дзяржавы ад імунітэту ў дачыненні да накладання арышту на прыналежную ёй маёмасць, а таксама мер па забеспячэнні іску і выканання рашэння суда Рэспублікі Беларусь.

6. Накіраванне спагнання на маёмасць, што прыналежыць замежнай дзяржаве і знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у парадку прымусовага выканання судовай пастановы дапускаецца толькі са згоды кампетэнтных органаў адпаведнай дзяржавы, калі іншае не прадугледжана гэтым Кодэксам або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

7. Замежная дзяржава не валодае імунітэтам у дачыненні да накладання арышту на прыналежную ёй маёмасць, а таксама мер па забеспячэнні іску і выканання рашэння ў выпадках, калі яна:

1) яўна выказала згоду на прынядце адпаведных мер і дзеянняў;

2) папярэдне паведаміла ці іншым чынам абазначыла маёмасць на выпадак задавальнення патрабавання, што з'яўляецца прадметам спрэчкі.

8. Замежная дзяржава таксама не валодае імунітэтам ад выканання рашэння суда Рэспублікі Беларусь, калі ўстаноўлена, што маёмасць замежнай дзяржавы

выкарыстоўваецца і (або) прызначана для выкарыстання ім з мэтай, не звязанай з ажыццяўленнем уладных паўнамоцтваў.

**Артыкул 520. Вядзенне па справах з удзелам міжнародных арганізацый**

1. Міжнародныя арганізацыі падлягаюць юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь па грамадзянскіх справах у межах, вызначаных заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Межы судовага імунітэту міжнародных арганізацый вызначаюцца міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Адмова міжнароднай арганізацыі ад судовага імунітэту ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным правіламі адпаведнай міжнароднай арганізацыі. У выпадку афармлення адмовы ад судовага імунітэту суд Рэспублікі Беларусь разглядае справу ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

**Артыкул 521. Вядзенне па справах з удзелам дыпламатычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў і іншых асоб, якія карыстаюцца судовым імунітэтам**

1. Акрэдытаваныя ў Рэспубліцы Беларусь дыпламатычныя прадстаўнікі замежных дзяржаў і іншыя асобы, якія карыстаюцца судовым імунітэтам, указаныя ў заканадаўчых актах і міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, падлягаюць юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь у межах, вызначаных гэтым Кодэксам або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь. Калі іншае не прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, да такіх асоб могуць прад’яўляцца:

1) рэчавыя іскі, датычныя да прыватнай нерухомай маёмасці, што знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі адпаведная асоба валодае гэтай маёмасцю не ад імя прадстаўляных ёй замежнай дзяржавы ці міжнароднай арганізацыі;

2) іскі, што вынікаюць са спадчыннага права, калі адпаведная асоба выступае ў якасці выканаўцы завяшчання або асобы, назначанай для аховы і кіравання спадчыннай маёмасцю, спадчынніка ці адмоваатрымальніка як прыватную асобу, а не ад імя прадстаўляных ім замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі;

3) іскі, якія вынікаюць з ажыццяўлення адпаведнай асобай любой прафесійнай ці прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, што выходзіць за межы афіцыйных функцый гэтай асобы;

4) іскі аб пакрыцці шкоды, прычыненай на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь транспартным сродкам.

2. Адмова ад судовага імунітэту ў дачыненні да асоб, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам замежных дзяржаў, правіламі міжнародных арганізацый, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь. Адмова ад імунітэту ажыццяўляецца ў пісьмовай форме.

3. Калі любая асоба, указаная ў частцы 1 гэтага артыкула, у тым выпадку, калі яна магла б скарыстацца судовым імунітэтам, прад’явіла іск у суд Рэспублікі Беларусь, гэтаму суду падсудныя і любыя сустрэчныя іскі да яе, непасрэдна звязаныя з першапачатковым іскам.

**Артыкул 522. Дзеянні суда пасля выхаду асобы з-пад юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь пасля ўзбуджэння вядзення справы**

Калі адказчык поўнасцю або ў дачыненні да канкрэтнай справы выходзіць з-пад юрысдыкцыі судоў Рэспублікі Беларусь ужо пасля прад’яўлення іску, суд спыняе вядзенне справы па ўласнай ініцыятыве.

### Артыкул 523. Меры ў адказ ў выпадку парушэння імунітэту Рэспублікі Беларусь або яе прадстаўнікоў

У выпадках калі Рэспубліцы Беларусь, яе маёмасці ці яе прадстаўнікам не забяспечваецца ў замежнай дзяржаве такая ж судовая недатыкальнасць, якая згодна з гэтым Кодэксам забяспечваецца гэтай замежнай дзяржаве, яе маёмасці і прадстаўніку ў Рэспубліцы Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь або іншым упаўнаважаным органам Рэспублікі Беларусь можа быць прадпісана ў дачыненні да гэтай дзяржавы, яе маёмасці ці прадстаўніка прымяненне мер у адказ.

## ГЛАВА 50
## МІЖНАРОДНАЯ ПРАВАВАЯ ДАПАМОГА ПА ГРАМАДЗЯНСКІХ СПРАВАХ

### Артыкул 524. Агульныя палажэнні

1. Суды Рэспублікі Беларусь звяртаюцца па прававую дапамогу па грамадзянскіх справах (у тым ліку сямейных, працоўных, а таксама звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці) у суды і іншыя кампетэнтныя органы замежных дзяржаў, а таксама самі прадастаўляюць ім прававую дапамогу па грамадзянскіх справах.

2. Міжнародная прававая дапамога па грамадзянскіх справах запытваецца (прадастаўляецца) судамі Рэспублікі Беларусь у аб'ёме, устаноўленым заканадаўчымі актамі, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь па пытаннях аказання міжнароднай прававой дапамогі па грамадзянскіх справах, а пры адсутнасці такога міжнароднага дагавора – на аснове ўзаемнасці. У міжнародную прававую дапамогу па грамадзянскіх справах уваходзіць здзяйсненне асобных працэсуальных дзеянняў (уручэнне паведамленняў і іншых дакументаў, атрыманне пісьмовых доказаў, тлумачэнняў бакоў, паказанняў сведкаў, заключэння эксперта, агляд на месцы і інш.).

3. Па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы грамадзянскага судаводства цэнтральным органам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

4. Суды Рэспублікі Беларусь звязваюцца з судамі і іншымі кампетэнтнымі органамі замежных дзяржаў, а таксама з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі або консульскімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах праз Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

5. Палажэнні артыкулаў 525 і 526 гэтага Кодэкса прымяняюцца да адносін у сувязі з аказаннем міжнароднай прававой дапамогі пры адсутнасці міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь па пытаннях аказання міжнароднай прававой дапамогі па грамадзянскіх справах ці пры наяўнасці такога міжнароднага дагавора – у частцы, не ўрэгуляванай ім.

### Артыкул 525. Зварот судоў Рэспублікі Беларусь з даручэннямі аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў па грамадзянскіх справах на тэрыторыі замежных дзяржаў

1. Калі па грамадзянскай справе трэба здзейсніць асобныя працэсуальныя дзеянні на тэрыторыі замежнай дзяржавы, суд Рэспублікі Беларусь мае права звярнуцца з адпаведным даручэннем у суд ці іншы кампетэнтны орган замежнай дзяржавы, а таксама ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову Рэспублікі Беларусь у замежнай дзяржаве, калі асобныя працэсуальныя дзеянні ў дачыненні да грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць на тэрыторыі гэтай дзяржавы, могуць быць

здзейснены указанымі дыпламатычным прадстаўніцтвам ці консульскай установай у адпаведнасці з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

2. Даручэнне аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў на тэрыторыі замежнай дзяржавы складаецца ў пісьмовай форме. З улікам характару даручэння ў ім указваюцца:

1) найменне суда, што разглядае справу;

2) найменне суда або іншага кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы, да якіх звернута даручэнне;

3) пры наяўнасці міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь – спасылка на яго палажэнні;

4) звесткі аб грамадзянскай справе, па якой запытваецца прававая дапамога;

5) звесткі аб грамадзянах, у дачыненні да якіх запытваецца дапамога, уключаючы прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), дату і месца іх нараджэння, грамадзянства (падданства), род заняткаў, месца жыхарства ці месца прысутнасці, для арганізацый – іх найменне і месца знаходжання, а таксама працэсуальнае становішча і іншыя звесткі, неабходныя для выканання даручэння;

6) змест даручэння;

7) пералік дададзеных дакументаў.

3. Даручэнне аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў, працэсуальныя і іншыя дададзеныя да яго дакументы сведчацца подпісам суддзі, які складае даручэнне, завяраюцца пячаткай з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь. Калі даручэнне і дададзеныя да яго дакументы прызначаны суду ці іншаму кампетэнтнаму органу замежнай дзяржавы, яны суправаджаюцца завераным пісьмовым іх перакладам на мову запытанай дзяржавы.

4. Выдаткі, звязаныя з накіраваннем даручэння, узніклыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ускладаюцца на істца ці на бок, які заявіў адпаведнае хадайніцтва, а калі хадайніцтва заяўлена абодвума бакамі або даручэнне накіроўваецца па ініцыятыве суда – на бакі ў роўных долях, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі. Панесеныя выдаткі, звязаныя з накіраваннем даручэння, размяркоўваюцца паміж бакамі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

5. Даручэнне аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў на тэрыторыі замежнай дзяржавы накіроўваецца праз Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

6. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае пытанне аб запыце міжнароднай прававой дапамогі на аснове ўзаемнасці, накіраванні даручэння ў Міністэрства замежных спраў для перадачы ў дыпламатычным парадку.

7. Пры звароце з даручэннем у дыпламатычнае прадстаўніцтва ці консульскую ўстанову Рэспублікі Беларусь у замежнай дзяржаве Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае пытанне аб накіраванні даручэння ў Міністэрства замежных спраў для перадачы ў дыпламатычнае прадстаўніцтва або консульскую ўстанову Рэспублікі Беларусь у замежнай дзяржаве. Выкананне дыпламатычным прадстаўніцтвам ці консульскай установай Рэспублікі Беларусь у замежнай дзяржаве даручэння суда Рэспублікі Беларусь аб здзяйсненні асобнага працэсуальнага дзеяння па грамадзянскай справе праводзіцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

### Артыкул 526. Прадастаўленне судамі Рэспублікі Беларусь міжнароднай прававой дапамогі па даручэннях (просьбах) аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў па грамадзянскіх справах

1. Суд або іншы кампетэнтны орган замежнай дзяржавы мае права звярнуцца з даручэннем (просьбай) аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў па грамадзянскіх справах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у суд Рэспублікі Беларусь праз Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

2. Даручэнне (просьба) суда ці іншага кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў па грамадзянскіх справах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь на аснове ўзаемнасці накіроўваецца ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь праз Міністэрства замежных спраў у дыпламатычным парадку.

3. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь перадае даручэнні (просьбы) судам Рэспублікі Беларусь з улікам правілаў падсуднасці, устаноўленых главой 6 гэтага Кодэкса.

4. У даручэнні (просьбе) аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў павінна быць указана:

1) найменне суда або іншага кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы, што робіць запыт;

2) найменне суда Рэспублікі Беларусь, да якога звернута даручэнне (просьба);

3) пры наяўнасці міжнароднага дагавора Рэспублікі Беларусь – спасылку на яго палажэнні;

4) звесткі аб сутнасці даручэння (просьбы) і грамадзянскай справе, па якой запытваецца прававая дапамога;

5) звесткі аб грамадзянах, у дачыненні да якіх запытваецца дапамога, уключаючы прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць), дату і месца іх нараджэння, грамадзянства (падданства), род заняткаў, месца жыхарства ці месца прысутнасці, для арганізацый – іх назва і месца знаходжання, а таксама працэсуальнае становішча і іншыя звесткі, неабходныя для выканання даручэння (просьбы).

5. Даручэнне (просьба) і дадзеныя да яго (яе) дакументы павінны быць прадстаўлены ў пісьмовай форме, засведчаны подпісам суддзі ці службовай асобы, якія склалі даручэнне (просьбу), і заверены гербавай пячаткай суда ці кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы. Даручэнне (просьба) і дадзеныя да яго (яе) дакументы складаюцца на мове замежнай дзяржавы, што робіць запыт, суправаджаюцца завераным пісьмовым іх перакладам на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь.

6. Суды Рэспублікі Беларусь выконваюць перададзеныя ім у парадку, устаноўленым гэтым артыкулам, даручэнні (просьбы) судоў і іншых кампетэнтных органаў замежных дзяржаў аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў па грамадзянскіх справах, за выключэннем выпадкаў, калі:

1) выкананне даручэння (просьбы) супярэчыла б публічнаму парадку Рэспублікі Беларусь;

2) выкананне даручэння (просьбы) не ўваходзіць у кампетэнцыю суда;

3) не ўстаноўлена арыгінальнасць дакумента, дзе змешчана даручэнне (просьба) аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў;

4) у іншых выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

7. Выкананне судом Рэспублікі Беларусь даручэнняў (просьбаў) судоў і іншых кампетэнтных органаў замежных дзяржаў аб здзяйсненні асобных працэсуальных дзеянняў па грамадзянскіх справах праводзіцца ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам.

8. Выкананне судом Рэспублікі Беларусь даручэння (просьбы) суда або іншага кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы пацвярджаецца дакументамі, складзенымі ці атрыманымі пры яго (яе) выкананні (пратаколам судовага пасяджэння, паведамленнем аб уручэнні дакументаў і інш.), што сведчацца подпісам суддзі, завяраюцца пячаткай з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і накіроўваюцца суду ці органу, што зрабілі запыт, у тым жа парадку, у якім даручэнне (просьба) паступіла ў суд.

9. У выпадку незахавання патрабаванняў, прадугледжаных часткай 5 гэтага артыкула, а таксама ў выпадку немагчымасці выканання даручэння (просьбы) суда ці іншага кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы па іншых прычынах яно (яно) вяртаецца без выканання з указаннем абставін, што перашкаджаюць гэтаму. Вяртанне даручэння (просьбы) і дадзеных да яго (яе) дакументаў ажыццяўляецца ў тым жа парадку, у якім яны паступілі ў суд.

# ГЛАВА 51
# ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ ПРЫЗНАННІ І ПРЫВЯДЗЕННІ Ў ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ ЗАМЕЖНЫХ СУДОЎ, ЗАМЕЖНЫХ ТРАЦЕЙСКІХ СУДОЎ (АРБІТРАЖАЎ)

## Артыкул 527. Прызнанне і прывядзенне ў выкананне рашэнняў замежных судоў, замежных трацейскіх судоў (арбітражаў)

1. Рашэнні замежных судоў, замежных трацейскіх судоў (арбітражаў) прызнаюцца і прыводзяцца ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь судом Рэспублікі Беларусь, калі іх прызнанне і прывядзенне ў выкананне прадугледжаны заканадаўствам або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, ці на аснове ўзаемнасці.

2. У выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, рашэнне замежнага суда не мае патрэбы ў спецыяльнай працэдуры прызнання і выконваецца ў такім жа парадку, што і судовая пастанова суда агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь, на падставе выканальнага дакумента замежнага суда, які прыняў рашэнне.

3. Пад рашэннем замежнага суда ў гэтай главе разумеюцца:

1) рашэнне суда замежнай дзяржавы па грамадзянскай справе (у тым ліку па справе, звязанай з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці);

2) прыгавор суда замежнай дзяржавы па крымінальнай справе ў частцы пакрыцця шкоды, прычыненай злачынствам;

3) акт іншага кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы, калі гэта прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

4. Пад рашэннем замежнага трацейскага суда (арбітражу) у гэтай главе разумеюцца:

1) рашэнне трацейскага суда (арбітражу), вынесенае на тэрыторыі замежнай дзяржавы;

2) рашэнне, вынесенае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь трацейскім судом (арбітражам), які знаходзіцца на тэрыторыі замежнай дзяржавы.

## Артыкул 528. Падача хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу)

1. Пытанне аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) разглядаецца судом па хадайніцтве спагнанніка (боку, на карысць якога вынесена рашэнне) па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) або месцы знаходжання даўжніка (боку, супраць якога вынесена рашэнне), а калі даўжнік не мае месца жыхарства (месца прысутнасці) або месца знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь ці яны невядомыя, – па месцы знаходжання яго маёмасці.

2. Калі іншае не прадугледжана заканадаўствам ці міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, рашэнне замежнага суда можа быць прад'яўлена да прымусовага выканання на працягу трох гадоў з моманту, калі яно ўступіла ў законную сілу. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін можа быць адноўлены судом у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

## Артыкул 529. Падача пярэчання супраць прызнання рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), што не патрабуе прымусовага выканання

1. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам або міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, рашэнне замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), што не патрабуе прымусовага выканання, прызнаецца ў Рэспубліцы Беларусь без якога-небудзь вядзення, калі з боку зацікаўленай асобы не паступіць пярэчанне супраць гэтага.

2. Зацікаўленая асоба можа на працягу аднаго месяца пасля таго, як ёй стала вядома аб паступленні ў кампетэнтны орган, арганізацыю, службовай асобе Рэспублікі Беларусь рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), што не патрабуе прымусовага выканання, заявіць у абласны (Мінскі гарадскі) суд, эканамічны суд вобласці (горада Мінска) па сваім месцы жыхарства або месцы знаходжання пярэчанне супраць прызнання гэтага рашэння.

**Артыкул 530. Форма і змест хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) ці пярэчанні супраць прызнання рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), што не патрабуе прымусовага выканання**

1. Хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) ці пярэчанне супраць прызнання рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), якое не патрабуе прымусовага выканання, і даданыя да іх дакументы могуць быць пададзены ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента ў выпадку, калі іншае не прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

2. Калі іншае не прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, у хадайніцтве (пярэчанні) указваюцца:

1) найменне суда, у які падаецца хадайніцтва (пярэчанне);

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы, якая заяўляе хадайніцтва (пярэчанне), яе прадстаўніка, калі яно падаецца прадстаўніком, іх месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

3) найменне і месца знаходжання замежнага суда (іншага кампетэнтнага органа замежнай дзяржавы) або найменне (пры наяўнасці), месца знаходжання, склад замежнага трацейскага суда (арбітражу), якія вынеслі рашэнне, трацейская (арбітражная) працэдура;

4) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне бакоў судовага ці трацейскага (арбітражнага) разбору і іх месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці), а калі даўжнік не мае месца жыхарства (месца прысутнасці) ці месца знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь або яны невядомыя – месца знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь яго маёмасці;

5) нумар (пры наяўнасці) рашэння, у дачыненні да якога заяўлена хадайніцтва (пярэчанне), дата і месца яго вынясення, прадмет спрэчкі, змест рэзалютыўнай часткі рашэння;

6) дата ўступлення ў законную сілу рашэння замежнага суда або дата, з якой яно падлягае выкананню да ўступлення ў законную сілу, або дата, калі рашэнне замежнага трацейскага суда (арбітражу) стала абавязковым (канчатковым) для бакоў;

7) просьба асобы, якая заяўляе хадайніцтва (пярэчанне). У тым выпадку, калі рашэнне раней выконвалася, – указанне на тое, у якой частцы ці з якога часу патрабуецца выкананне рашэння.

3. У хадайніцтве (пярэчанні) таксама ўказваецца пералік даданых дакументаў, могуць змяшчацца іншыя звесткі, калі яны маюць значэнне для яго разгляду.

4. Хадайніцтва (пярэчанне) падпісваецца асобай, якая яго заяўляе, ці яе прадстаўніком, які мае адпаведныя паўнамоцтвы.

5. Пры падачы хадайніцтва (пярэчання) у выглядзе электроннага дакумента яно падпісваецца электронным лічбавым подпісам заяўніка ці яго прадстаўніка.

6. Да хадайніцтва (пярэчання), калі іншае не ўстаноўлена міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, дадаюцца:

1) належным чынам завераная копія рашэння замежнага суда, у дачыненні да якога заяўлена хадайніцтва (пярэчанне), арыгінал рашэння або належным чынам завераная копія рашэння замежнага трацейскага суда (арбітражу), у дачыненні да якога заяўлена хадайніцтва;

2) арыгінал пагаднення (аб вызначэнні дагаворнай падсуднасці спрэчкі замежнаму суду) ці трацейскае (арбітражнае) пагадненне ці іх належным чынам завераныя копіі;

3) належным чынам засведчаны афіцыйны дакумент аб тым, што рашэнне замежнага суда ўступіла ў законную сілу, ці аб пацвярджэнні, што яно падлягае выкананню да яго ўступлення ў законную сілу, калі гэта не ўказана ў самім рашэнні;

4) пры падачы хадайніцтва – належным чынам засведчаны дакумент з пацвярджэннем, што бок, у дачыненні да якога вынесена рашэнне і які не прыняў удзелу ў працэсе, быў своечасова і належным чынам апавешчаны аб разглядзе справы;

5) належным чынам засведчаныя даверанасць або іншы дакумент, што пацвярджае паўнамоцтвы асобы, якая падпісала хадайніцтва (пярэчанне);

6) дакумент аб выкананні рашэння, калі яно раней выконвалася на тэрыторыі замежнай дзяржавы, з указаннем выкананай часткі і (або) перыяду – пры спагнанні перыядычных выплат;

7) пры звароце ў эканамічныя суды абласцей (горада Мінска) – дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны ў парадку і памеры, устаноўленых заканадаўчымі актамі, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў хадайніцтве ці паведамлены суду іншым спосабам пры падачы хадайніцтва;

8) копіі хадайніцтва (пярэчання) у колькасці экземпляраў па ліку асоб, у дачыненні да якіх заяўлена хадайніцтва (пярэчанне).

7. Дакументы, прадугледжаныя пунктамі 1–6 часткі 6 гэтага артыкула, складзеныя на замежнай мове, павінны суправаджацца належным чынам заверанымі іх перакладамі на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь.

8. Хадайніцтва (пярэчанне), заяўленае з парушэннем патрабаванняў гэтага артыкула да яго формы і зместу, а таксама да даданых дакументаў, вяртаецца асобе, якая заявіла хадайніцтва. Вяртанне хадайніцтва (пярэчання) і даданых да яго дакументаў ажыццяўляецца ў тым жа парадку, у якім яны паступілі ў суд.

9. Аб вяртанні хадайніцтва (пярэчання) суд не пазней за пяць дзён пасля яго паступлення выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана ў апеляцыйным парадку.

### Артыкул 531. Парадак разгляду хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне (пярэчання супраць прызнання) рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу)

1. Хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) або пярэчанне супраць прызнання рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), якое не патрабуе прымусовага выканання, разглядаюцца ў судовым пасяджэнні ў тэрмін не больш як адзін месяц пасля паступлення хадайніцтва або пярэчання ў суд па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, калі іншае не ўстаноўлена міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Аб часе і месцы разгляду хадайніцтва паведамляецца даўжніку. Аб часе і месцы разгляду пярэчання паведамляецца асобе, якая заявіла пярэчанне. Няяўка ўказаных асоб, апавешчаных належным чынам, не перашкаджае разгляду хадайніцтва (пярэчання).

3. Падчас судовага разбору суд правярае наяўнасць ці адсутнасць падстаў, прадугледжаных артыкуламі 532 або 533 гэтага Кодэкса, у тым ліку заслухвае тлумачэнні даўжніка ці асобы, якая заявіла пярэчанне, а таксама даследуе прадстаўленыя дакументы.

4. Суд мае права па заяве даўжніка ці асобы, якая заявіла пярэчанне, выпатрабаваць дадатковыя звесткі, датычныя да ўстанаўлення абставін, што маюць значэнне для правільнага вырашэння хадайніцтва (пярэчання).

5. Пры разглядзе хадайніцтва (пярэчання) суд не мае права пераглядаць рашэнне замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) па сутнасці.

### Артыкул 532. Падставы для адмовы ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда

1. Суд адмаўляе ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, калі:

1) рашэнне замежнага суда па заканадаўстве дзяржавы, на тэрыторыі якой яно вынесена, не ўступіла ў законную сілу;

2) бок, у дачыненні да якога вынесена рашэнне замежнага суда, быў пазбаўлены магчымасці прыняць удзел у працэсе з прычыны таго, што не быў своечасова і належным чынам апавешчаны аб разглядзе справы;

3) разгляд справы адпаведна заканадаўству або міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь адносіцца да выключнай кампетэнцыі суда або іншага органа ў Рэспубліцы Беларусь;

4) маецца рашэнне суда Рэспублікі Беларусь, вынесенае па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах і ўступіла ў законную сілу, або ў судзе знаходзіцца справа па спрэчцы паміж тымі ж бакамі, аб тым жа прадмеце і па тых жа падставах, вядзенне па якой узбуджана да ўзбуджэння справы ў замежным судзе;

5) выкананне рашэння супярэчыла б публічным парадку Рэспублікі Беларусь;

6) скончыўся тэрмін даўнасці прад'яўлення рашэння замежнага суда да прымусовага выканання, устаноўлены часткай 2 артыкула 528 гэтага Кодэкса, і гэты тэрмін не адноўлены судом.

2. Суд таксама адмаўляе ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда ў іншых выпадках, прадугледжаных міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

3. Калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, падставы, прадугледжаныя пунктамі 3–6 часткі 1 гэтага артыкула, могуць быць прыменены судом і пры ўмове, што даўжнік або асоба, якая заявіла пярэчанне, на іх не спасылаюцца.

### Артыкул 533. Падставы для адмовы ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага трацейскага суда (арбітражу)

1. Суд можа адмовіць у прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага трацейскага суда (арбітражу) па хадайніцтве боку, супраць якога яно накіравана, калі ён прадставіць доказы таго, што:

1) адзін з бакоў трацейскага (арбітражнага) пагаднення не валодаў поўнай дзеяздольнасцю або трацейскае (арбітражнае) пагадненне несапраўдзейнае па закону, якому бакі яго падпарадкавалі, а пры адсутнасці ўказання аб гэтым – па закону краіны, дзе рашэнне замежнага трацейскага суда (арбітражу) было вынесена;

2) бок, супраць якога вынесена рашэнне, не быў належным чынам апавешчаны аб назначэнні трацейскага суддзі (арбітра) ці аб трацейскім (арбітражным) разборы або па іншых прычынах не мог прадставіць свае тлумачэнні;

3) рашэнне вынесена па спрэчцы, не прадугледжанай трацейскім (арбітражным) пагадненнем, або не падпадае пад яго ўмовы, або змяшчае пастановы па пытаннях, што выходзяць за межы трацейскага (арбітражнага) пагаднення. У выпадку калі пастановы па пытаннях, ахопленых трацейскім (арбітражным) пагадненнем, могуць быць аддзелены ад тых, што не ахопліваюцца такім пагадненнем, тая частка рашэння замежнага трацейскага

суда (арбітражу), дзе змешчаны пастановы па пытаннях, ахопленых трацейскім (арбітражным) пагадненнем, можа быць прызнана і дазволена яе прымусовае выкананне;

4) склад замежнага трацейскага суда (арбітражу) або трацейская (арбітражная) працэдура не адпавядалі пагадненню бакоў ці ў яго адсутнасць не адпавядалі закону той краіны, дзе адбыўся трацейскі суд (арбітраж);

5) рашэнне замежнага трацейскага суда (арбітражу) яшчэ не стала абавязковым (канчатковым) для бакоў ці было адменена або яго выкананне было прыпынена судом краіны, у якой ці ў адпаведнасці з законам якой яно было вынесена.

2. Суд адмаўляе ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага трацейскага суда (арбітражу), калі ўстановіць, што:

1) рашэнне замежнага трацейскага суда (арбітражу) вынесена па спрэчцы, што не можа быць прадметам трацейскага (арбітражнага) разбору ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

2) выкананне рашэнні супярэчыла б публічнаму парадку Рэспублікі Беларусь.

3. Падставы, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, могуць быць прыменены судом і пры ўмове, што даўжнік або асоба, якая заявіла пярэчанне, на іх не спасылаюцца.

### Артыкул 534. Вызначэнне суда па справах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу)

1. Па выніках разгляду хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) суд выносіць вызначэнне аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) ці аб адмове ў гэтым.

2. Па выніках разгляду пярэчання супраць прызнання рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), якое не патрабуе прымусовага выканання, суд выносіць вызначэнне аб задавальненні пярэчання і адмове ў прызнанні рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), якое не патрабуе прымусовага выканання, ці аб пакіданні пярэчання без задавальнення.

3. У вызначэнні суда па справах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага арбітражнага (трацейскага) рашэння ўказваюцца:

1) найменне і месца знаходжання замежнага суда або найменне (пры наяўнасці), месца знаходжання, склад замежнага трацейскага суда (арбітражу), што вынеслі рашэнне;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) ці найменне бакоў судовага або трацейскага (арбітражнага) разбору;

3) нумар (пры наяўнасці) рашэння, у дачыненні да якога заяўлена хадайніцтва (пярэчанне), дата і месца яго вынясення, прадмет спрэчкі, змест рэзалютыўнай часткі рашэння;

4) падставы і матывы, па якіх суд прыйшоў да сваіх вывадаў.

4. Калі рашэнне замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) раней выконвалася, суд вызначае, у якой частцы або з якога часу яно падлягае выкананню.

5. Вызначэннем па пытаннях прызнання і прывядзення ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) суд не можа змяніць змест рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу).

6. Копіі вызначэння, указанага ў частцы 1 гэтага артыкула, у пяцідзённы тэрмін пасля вынясення вызначэння накіроўваюцца судом спагнанніку (боку, на карысць якога вынесена рашэнне) у тым жа парадку, у якім хадайніцтва паступіла ў суд, і даўжніку (боку, супраць якога вынесена рашэнне), а копіі вызначэння, указанага ў частцы 2 гэтага артыкула, – у той жа тэрмін асобе, па просьбе якой было вынесена рашэнне, і асобе, якая заявіла пярэчанні.

7. Вызначэнні суда па справах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 535. Прымусовае выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу)**

Прымусовае выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу) праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, на падставе выканальных лістоў, выдадзеных судом, што вынес вызначэнне аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу). Выканальны ліст выдаецца па правілах, устаноўленых артыкулам 480 гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА 52
## ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ ПРЫЗНАННІ І ПРЫВЯДЗЕННІ Ў ВЫКАНАННЕ МІЖНАРОДНЫХ МЕДЫЯТЫЎНЫХ ПАГАДНЕННЯЎ

**Артыкул 536. Прызнанне і прывядзенне ў выкананне міжнародных медыятыўных пагадненняў**

1. Міжнародныя медыятыўныя пагадненні прызнаюцца і прыводзяцца ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь судом Рэспублікі Беларусь, калі іх прызнанне і прывядзенне ў выкананне прадугледжаны заканадаўствам або міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

2. Не выкананае добраахвотна міжнароднае медыятыўнае пагадненне прызнаецца і прыводзіцца ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым гэтай главой.

**Артыкул 537. Падача хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення**

1. Пытанне аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь міжнароднага медыятыўнага пагаднення разглядаецца эканамічным судом вобласці (горада Мінска) па хадайніцтве зацікаўленага боку міжнароднага медыятыўнага пагаднення. Хадайніцтва падаецца па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) або па месцы знаходжання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь боку, які не выканаў міжнароднае медыятыўнае пагадненне, а калі яны невядомыя, – па месцы знаходжання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь маёмасці гэтага боку.

2. Хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь міжнароднага медыятыўнага пагаднення можа быць пададзена на працягу шасці месяцаў пасля заканчэння тэрміну яго добраахвотнага выканання. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін можа быць адноўлены судом у выпадках і парадку, прадугледжаных артыкулам 119 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 538. Форма і змест хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення**

1. Хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь міжнароднага медыятыўнага пагаднення і дададзеныя да хадайніцтва дакументы могуць быць пададзены ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента ў выпадку, калі іншае не прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

2. Калі іншае не прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, у хадайніцтве ўказваюцца:

1) найменне эканамічнага суда вобласці (горада Мінска), у які падаецца хадайніцтва;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне зацікаўленага боку міжнароднага медыятыўнага пагаднення, які заяўляе хадайніцтва, яе прадстаўніка,

калі яно падаецца прадстаўніком, іх месца знаходжання ці месца жыхарства (месца прысутнасці), нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне бакоў міжнароднага медыятыўнага пагаднення, іх месца знаходжання або месца жыхарства (месца прысутнасці), нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці), а калі даўжнік не мае месца жыхарства (прысутнасці) ці месца знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь або яны невядомыя, – месца знаходжання ў Рэспубліцы Беларусь яго маёмасці;

4) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) медыятара (медыятараў), яго (іх) месца знаходжання, нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў і адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці);

5) дата заключэння і ўмовы міжнароднага медыятыўнага пагаднення;

6) дата, калі міжнароднае медыятыўнае пагадненне стала абавязковым (канчатковым) для бакоў;

7) дакумент аб выкананні міжнароднага медыятыўнага пагаднення, калі яно раней выконвалася, з указаннем выкананай часткі і (або) перыяду – пры спагнанні перыядычных выплат;

8) просьба зацікаўленага боку міжнароднага медыятыўнага пагаднення, які заяўляе хадайніцтва. У тым выпадку, калі міжнароднае медыятыўнае пагадненне раней выконвалася, – указанне на тое, у якой частцы ці з якога часу патрабуецца яго выкананне.

3. У хадайніцтве таксама ўказваецца пералік дадаcreatedных дакументаў, могуць змяшчацца іншыя звесткі, калі яны маюць значэнне для яго разгляду.

4. Хадайніцтва падпісваецца асобай, якая яго заяўляе, або яе прадстаўніком, які мае адпаведныя паўнамоцтвы.

5. Пры падачы хадайніцтва ў выглядзе электроннага дакумента яно падпісваецца электронным лічбавым подпісам заяўніка ці яго прадстаўніка.

6. Да хадайніцтва, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, дадаюцца:

1) арыгінал міжнароднага медыятыўнага пагаднення, падпісанага бакамі;

2) доказы аб заключэнні міжнароднага медыятыўнага пагаднення пры садзейнічанні медыятара (наяўнасць подпісу медыятара на міжнародным медыятыўным пагадненні або дакумент, які пацвярджае правядзенне медыяцыі, падпісаны медыятарам ці выдадзены арганізацыяй, што забяспечвала правядзенне медыяцыі, або іншы доказ, прымальны для суда ў адпаведнасці з палажэннямі гэтага Кодэкса);

3) доказы, якія пацвярджаюць факт невыканання міжнароднага медыятыўнага пагаднення ў тэрмін, устаноўлены ў ім, другім бокам гэтага пагаднення;

4) належным чынам засведчаныя даверанасць ці іншы дакумент, што пацвярджае паўнамоцтвы асобы, якая падпісала хадайніцтва;

5) дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў хадайніцтве або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы хадайніцтва;

6) копіі хадайніцтва ў колькасці экзэмпляраў па ліку асоб, у дачыненні да якіх заяўлена хадайніцтва.

7. Дакументы, прадугледжаныя часткай 6 гэтага артыкула, складзеныя на замежнай мове, павінны суправаджацца належным чынам завераным іх перакладам на адну з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь.

### Артыкул 539. Вяртанне хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення

1. Хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення, а таксама дададзеныя да яго дакументы вяртаюцца асобе, якая яго заявіла, у выпадках, калі яно пададзена:

1) да сканчэння тэрміну добраахвотнага выканання міжнароднага медыятыўнага пагаднення, замацаванага ў ім;

2) пасля сканчэння шасці месяцаў пасля заканчэння тэрміну добраахвотнага выканання міжнароднага медыятыўнага пагаднення (калі не была пададзена заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну ці суд адмовіў у яго аднаўленні);

3) без захавання патрабаванняў, устаноўленых артыкулам 538 гэтага Кодэкса.

2. Аб вяртанні хадайніцтва суд не пазней за пяць дзён пасля яго паступлення выносіць вызначэнне, якое можа быць абскарджана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 540. Парадак разгляду спраў аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення**

1. Хадайніцтва аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення разглядаецца ў судовым пасяджэнні ў тэрмін не больш за адзін месяц пасля паступлення хадайніцтва ў суд па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, калі іншае не ўстаноўлена міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

2. Аб часе і месцы разгляду хадайніцтва паведамляецца боку, які не выканаў міжнароднае медыятыўнае пагадненне. Няяўка асобы, апавешчанай належным чынам, не перашкаджае разгляду хадайніцтва.

3. Падчас судовага разбору суд правярае наяўнасць або адсутнасць падстаў, прадугледжаных артыкулам 541 гэтага Кодэкса, выкананне патрабаванняў, устаноўленых міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь для працэдуры заключэння міжнароднага медыятыўнага пагаднення, у тым ліку заслухвае тлумачэнні боку, які не выканаў міжнароднае медыятыўнае пагадненне, даследуе прадстаўленыя дакументы.

4. Па заяве боку, які не выканаў міжнароднае медыятыўнае пагадненне, суд мае права выпатрабаваць дадатковыя звесткі, датычныя да ўстанаўлення абставін, што маюць значэнне для правільнага вырашэння хадайніцтва. Дадатковыя дакументы, неабходныя для праверкі выканання патрабаванняў, устаноўленых міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь для працэдуры заключэння міжнароднага медыятыўнага пагаднення, могуць быць выпатрабаваны па ініцыятыве суда.

5. Пры разглядзе хадайніцтва суд не мае права пераглядаць міжнароднае медыятыўнае пагадненне па сутнасці.

**Артыкул 541. Падставы для адмовы ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення**

1. Суд можа адмовіць у прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення па хадайніцтве боку, які яго не выканаў, калі ён прадставіць доказы таго, што:

1) адзін з бакоў міжнароднага медыятыўнага пагаднення не валодаў поўнай дзеяздольнасцю;

2) міжнароднае медыятыўнае пагадненне з’яўляецца несапраўдным, страціла сілу або не можа быць выканана па закону, якому бакі правамерна яго падпарадкавалі, а пры адсутнасці такога ўказання – па закону, які палічыць дастасавальным суд, што разглядае хадайніцтва;

3) міжнароднае медыятыўнае пагадненне не мае абавязковай сілы або не з’яўляецца канчатковы згодна яго ўмовам ці было пазней зменена;

4) абавязнасці, замацаваныя ў міжнародным медыятыўным пагадненні, былі выкананы або з’яўляюцца няяснымі;

5) прызнанне і прывядзенне ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь будуць супярэчыць яго ўмовам;

6) было сур'ёзнае парушэнне медыятарам стандартаў, дастасавальных да медыятара або медыяцыі, паколькі без такога парушэння гэты бок не заключыў бы міжнароднае медыятыўнае пагадненне;

7) медыятар не раскрыў бакам абставіны, што выклікаюць абгрунтаваныя сумненні ў яго непрадузятасці або незалежнасці, і такое нераскрыццё аказала істотнае ўздзеянне ці неналежны ўплыў на адзін з бакоў, паколькі без гэтага нераскрыцця бок не заключыў бы міжнароднае медыятыўнае пагадненне.

2. Суд адмаўляе ў прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення, калі ўстановіць, што:

1) міжнароднае медыятыўнае пагадненне заключана па спрэчцы, што не можа быць урэгулявана пры дапамозе медыяцыі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі;

2) выкананне пагаднення супярэчыла б публічнаму парадку Рэспублікі Беларусь.

3. Падставы, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, могуць быць прыменены судом і пры ўмове, што пры разглядзе хадайніцтва бок, які не выканаў міжнароднае медыятыўнае пагадненне, на іх не спасылаецца.

**Артыкул 542. Вызначэнне суда па справе аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення**

1. Па выніках разгляду справы суд выносіць вызначэнне аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення ці аб адмове ў гэтым. У вызначэнні ўказваюцца:

1) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне бакоў міжнароднага медыятыўнага пагаднення;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) медыятара (медыятараў);

3) дата заключэння і ўмовы міжнароднага медыятыўнага пагаднення;

4) падставы і матывы, па якіх суд прыйшоў да сваіх вывадаў.

2. Калі міжнароднае медыятыўнае пагадненне раней выконвалася, суд вызначае, у якой частцы або з якога часу яно падлягае выкананню.

3. Вызначэннем па пытаннях прызнання і прывядзення ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення суд не можа выключыць з міжнароднага медыятыўнага пагаднення якія-небудзь умовы, узгодненыя бакамі, змяніць яго.

4. Копіі вызначэння аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення ці аб адмове ў гэтым у пяцідзённы тэрмін пасля вынясення вызначэння накіроўваюцца судом боку, які заявіў хадайніцтва, у тым жа парадку, у якім хадайніцтва паступіла ў суд, і боку, які не выканаў міжнароднае медыятыўнае пагадненне.

5. Вызначэнні суда аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення ці аб адмове ў гэтым могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 543. Прымусовае выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення**

Прымусовае выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення праводзіцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб выканаўчым вядзенні, на падставе выканальных лістоў, выдадзеных судом, што вынес вызначэнне аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне міжнароднага медыятыўнага пагаднення. Выканальны ліст выдаецца па правілах, устаноўленых артыкулам 480 гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА 53
## ВЯДЗЕННЕ ПА ПРОСЬБАХ АБ ПРЫЗНАННІ ЦІ АБ ПРЫЗНАННІ І ВЫКАНАННІ РАШЭННЯЎ ЗАМЕЖНЫХ СУДОЎ АБ СПАГНАННІ АЛІМЕНТАЎ НА ДЗЯЦЕЙ, ПА ПРОСЬБАХ АБ ВЫНЯСЕННІ ЦІ АБ ДАСКАНАЛЕННІ РАШЭННЯЎ АБ СПАГНАННІ АЛІМЕНТАЎ НА ДЗЯЦЕЙ У МІЖНАРОДНЫМ ПАРАДКУ

### Артыкул 544. Асаблівасці разгляду просьбаў аб спагнанні аліментаў на падставе Канвенцыі аб міжнародным парадку спагнання аліментаў на дзяцей і іншых формаў утрымання сям'і ад 23 лістапада 2007 года

1. Просьбы аб прызнанні ці аб прызнанні і выкананні рашэння замежнага суда аб спагнанні аліментаў на дзяцей, а таксама просьбы аб вынясенні ці аб дасканаленні рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей у міжнародным парадку на падставе Канвенцыі аб аліментах (далей, калі не ўказана іншае, – просьбы аб спагнанні аліментаў на дзяцей), што паступілі праз Міністэрства юстыцыі, разглядаюцца абласным (Мінскім гарадскім) судом па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) асобы, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдытора), або асобы, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніка). Просьбы аб спагнанні аліментаў на дзяцей разглядаюцца таксама абласным (Мінскім гарадскім) судом па месцы знаходжання маёмасці асобы, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніка).

2. Просьбы аб спагнанні аліментаў на дзяцей з'яўляюцца працэсуальнымі дакументамі. Патрабаванні да формы і зместу просьбаў аб спагнанні аліментаў на дзяцей устанаўліваюцца Канвенцыяй аб аліментах.

3. Копіі судовых пастаноў па выніках разгляду просьбаў аб спагнанні аліментаў на дзяцей накіроўваюцца судом у Міністэрства юстыцыі ў трохдзённы тэрмін пасля іх вынясення.

### Артыкул 545. Разгляд просьбаў аб прызнанні ці аб прызнанні і выкананні рашэнняў замежных судоў аб спагнанні аліментаў на дзяцей

1. Просьбы аб прызнанні ці аб прызнанні і выкананні рашэнняў замежных судоў аб спагнанні аліментаў на дзяцей разглядаюцца па правілах, устаноўленых главой 51 гэтага Кодэкса, з улікам палажэнняў Канвенцыі аб аліментах.

2. Рашэнне замежнага суда аб спагнанні аліментаў на дзяцей, якое не можа быць прызнана і выканана ў Рэспубліцы Беларусь у цэлым, павінна быць прызнана і выканана ў любой адлучнай частцы, што можа быць прызнаная і выкананая, без змянення рашэння па сутнасці.

### Артыкул 546. Разгляд просьбы аб вынясенні рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей у міжнародным парадку

1. Просьба аб вынясенні рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей у міжнародным парадку можа быць пададзена асобай, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдыторам), у выпадку, калі:

1) адсутнічае рашэнне аб спагнанні аліментаў на дзяцей;

2) рашэнне замежнага суда аб спагнанні аліментаў на дзяцей не можа быць прызнана і выканана ў Рэспубліцы Беларусь;

3) у прызнанні і выкананні рашэння замежнага суда аб спагнанні аліментаў на дзяцей у Рэспубліцы Беларусь адмоўлена з прычыны адсутнасці падстаў для яго прызнання і выканання, прадугледжаных Канвенцыяй аб аліментах, або на падставах для адмовы ў прызнанні і выкананні рашэння, прадугледжаных названай Канвенцыяй.

2. Просьба аб вынясенні рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей у міжнародным парадку разглядаецца па правілах іскавага вядзення з улікам палажэнняў Канвенцыі аб аліментах.

**Артыкул 547. Разгляд просьбы аб дасканаленні рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей у міжнародным парадку**

1. Просьба аб дасканаленні рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей у міжнародным парадку, вынесенага ў Рэспубліцы Беларусь або замежнай дзяржаве, можа быць пададзена асобай, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдыторам), ці асобай, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніком), у дачыненні да якога вынесена такое рашэнне.

2. Суд мае права пры змяненні матэрыяльнага і (або) сямейнага становішча асобы, якая мае права на атрыманне аліментаў (крэдытора), і (або) асобы, абавязанай выплачваць аліменты (даўжніка), змяніць памер аліментаў, спосабы і парадак іх выплаты, прадугледжаныя рашэннем аб спагнанні аліментаў на дзяцей, праз вынясенне новага рашэння на падставе раней вынесенага рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей (удасканаленне рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей).

3. Просьба аб удасканаленні рашэння аб спагнанні аліментаў на дзяцей у міжнародным парадку разглядаецца па правілах іскавага вядзення з улікам палажэнняў Канвенцыі аб аліментах.

## ГЛАВА 54
## ВЯДЗЕННЕ ПА СПРАВАХ АБ ВЯРТАННІ ДЗІЦЯЦІ ЦІ АБ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ ПРАВОЎ ДОСТУПУ

**Артыкул 548. Падача заявы аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу**

1. Заява аб вяртанні дзіцяці, якое неправамерна перамешчана ў Рэспубліку Беларусь або неправамерна ўтрымліваецца ў Рэспубліцы Беларусь, ці аб ажыццяўленні ў дачыненні да такога дзіцяці правоў доступу на падставе Канвенцыі аб грамадзянскіх аспектах міжнароднага крадзяжу дзяцей ад 25 кастрычніка 1980 года (далей – Канвенцыя аб крадзяжы дзяцей) падаецца бацькам ці маці або іншай асобай, якія мяркуюць, што адказчыкам парушаны іх правы апекі або правы доступу* ў дачыненні да дзіцяці (далей у гэтай главе – заяўнік).

* Для мэт гэтай главы пад правамі апекі і правамі доступу разумеюцца паняцці, выкарыстаныя ў Канвенцыі аб крадзяжы дзяцей.

2. Заява аб вяртанні дзіцяці, якое неправамерна перамешчана ў Рэспубліку Беларусь або неправамерна ўтрымліваецца ў Рэспубліцы Беларусь, ці аб ажыццяўленні ў дачыненні да такога дзіцяці правоў доступу (далей – заява аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу) падаецца праз Міністэрства юстыцыі ў суд па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) дзіцяці або непасрэдна ў суд па месцы жыхарства (месцы прысутнасці) дзіцяці.

3. Заява аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу з’яўляецца працэсуальным дакументам. Патрабаванні да зместу заявы аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу ўстанаўліваюцца Канвенцыяй аб крадзяжы дзяцей.

**Артыкул 549. Парадак разгляду і вырашэння спраў аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу**

1. Справы аб вяртанні дзіцяці, якое неправамерна перамешчана ў Рэспубліку Беларусь або неправамерна ўтрымліваецца ў Рэспубліцы Беларусь, ці аб ажыццяўленні ў дачыненні

да такога дзіцяці правоў доступу на падставе Канвенцыі аб крадзяжы дзяцей (далей – справы аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу) на падставе заявы аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу разглядаюцца судом па правілах іскавага вядзення з улікам асаблівасцей гэтай главы і Канвенцыі аб крадзяжы дзяцей.

2. Справы аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу разглядаюцца судом з абавязковым удзелам пракурора і прадстаўніка органа апекі і апекавальніцтва.

3. Справы аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу разглядаюцца судом у тэрмін не больш за сорак два дні пасля прыняцця заявы судом, уключаючы тэрмін на падрыхтоўку справы да судовага разбору.

4. Аб часе і месцы судовага пасяджэння або здзяснення працэсуальных дзеянняў заяўніку паведамляецца праз Міністэрства юстыцыі.

**Артыкул 550. Забяспечвальныя меры**

У неабходных выпадках нароўні з іншымі мерамі ў адпаведнасці з главой 19 гэтага Кодэкса суд можа забараніць адказчыку да ўступлення ў законную сілу рашэння суда па справе аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу змяняць месца жыхарства (месца прысутнасці) дзіцяці і часова абмежаваць права адказчыка і (або) дзіцяці на выезд з Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 551. Адкладанне судовага разбору і прыпыненне вядзення справы, звязанай са спрэчкай аб дзецях (дзіцяці)**

1. Суд, у чыім вядзенні знаходзіцца справа, звязаная са спрэчкай аб дзецях (дзіцяці), абавязаны адкласці на трыццаць дзён разбор указанай справы ў выпадку паступлення пісьмовага паведамлення ад Міністэрства юстыцыі аб атрыманні ім заявы аб неправамерным перамяшчэнні гэтых дзяцей (дзіцяці) у Рэспубліку Беларусь або іх (яго) неправамерным утрыманні ў Рэспубліцы Беларусь з дададнем копіі такой заявы.

2. Вядзенне справы, звязанай са спрэчкай аб дзецях (дзіцяці), прыпыняецца да ўступлення ў законную сілу рашэння суда па справе аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу, або вызначэння суда аб спыненні вядзення па гэтай справе, або вызначэння суда аб пакіданні заявы без разгляду.

**Артыкул 552. Недапушчальнасць злучэння патрабаванняў і прад’яўлення сустрэчнага іску**

Злучэнне некалькіх патрабаванняў, за выключэннем выпадку аб’яднання заяўнікам патрабаванняў аб вяртанні двух і больш дзяцей ці аб ажыццяўленні ў дачыненні да двух і больш дзяцей правоў доступу, і прад’яўленне сустрэчнага іску па справе аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу не дапускаюцца.

**Артыкул 553. Рашэнне суда па справе аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу**

1. Рашэнне суда па справе аб вяртанні дзіцяці павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым главой 27 гэтага Кодэкса, і змяшчаць абгрунтаванне вяртання дзіцяці ў дзяржаву пастаяннага пражывання ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб крадзяжы дзяцей, пры неабходнасці – парадак і тэрміны вяртання дзіцяці і ўказанне на размеркаванне судовых выдаткаў, звязаных з разглядам справы аб вяртанні дзіцяці, ці абгрунтаванне адмовы ў вяртанні дзіцяці ў дзяржаву пастаяннага пражывання ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб крадзяжы дзяцей і ўказанне на размеркаванне судовых выдаткаў.

2. Рашэнне суда па справе аб ажыццяўленні правоў доступу павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым главой 27 гэтага Кодэкса, і змяшчаць абгрунтаванне ажыццяўлення заяўнікам правоў доступу ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб крадзяжы дзяцей, пры неабходнасці – меры па забеспячэнні ажыццяўлення заяўнікам правоў доступу і ўказанне на размеркаванне судовых выдаткаў, звязаных з разглядам справы аб ажыццяўленні правоў доступу, ці абгрунтаванне адмовы ў ажыццяўленні правоў доступу ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб крадзяжы дзяцей і ўказанне на размеркаванне судовых выдаткаў.

**Артыкул 554. Накіраванне копій судовых пастаноў**

Копіі судовых пастаноў па справе аб вяртанні дзіцяці ці аб ажыццяўленні правоў доступу накіроўваюцца судом у Міністэрства юстыцыі ў трохдзённы тэрмін пасля вынясення гэтых пастаноў.

## РАЗДЗЕЛ VIII
## ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ

## ГЛАВА 55
## ВЯДЗЕННЕ Ў СУДЗЕ АПЕЛЯЦЫЙНАЙ ІНСТАНЦЫІ

### § 1. Перагляд у апеляцыйным парадку судовых пастаноў суда першай інстанцыі

**Артыкул 555. Права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне) рашэнняў суда, што не ўступілі ў законную сілу**

1. Рашэнні суда першай інстанцыі, што не ўступілі ў законную сілу, могуць быць абскарджаны поўнасцю ці часткова ў апеляцыйным парадку ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтай главой.

2. Права апеляцыйнага абскарджання рашэння суда належыць бакам і іншым асобам – удзельнікам у справе, а таксама іншым асобам, не далучаным да ўдзелу ў справе, калі суд вынес рашэнне аб іх правах і (або) абавязках.

3. Іншыя асобы, не далучаныя да ўдзелу ў справе, у дачыненні да якіх суд вынес рашэнне аб іх правах і (або) абавязках, пры вядзенні ў судзе апеляцыйнай інстанцыі карыстаюцца правамі і нясуць абавязкі, прадугледжаныя гэтым Кодэксам для асоб – удзельнікаў у справе.

4. Рашэнне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесенае па першай інстанцыі, можа быць абскарджана (апратэставана) у апеляцыйным парадку, за выключэннем выпадкаў, калі ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі такое рашэнне ўступае ў законную сілу неадкладна пасля яго абвяшчэння.

5. Пракурор ці намеснік пракурора маюць права прынесці пратэст на рашэнне суда незалежна ад таго, ці ўдзельнічалі яны ў разглядзе гэтай справы. Памочнікі па асаблівых даручэннях, старшыя памочнікі і памочнікі пракурораў, начальнікі структурных падраздзяленняў органаў пракуратуры і іх намеснікі, старшыя пракуроры па асаблівых даручэннях, старшыя пракуроры і пракуроры структурных падраздзяленняў органаў пракуратуры маюць права прынесці пратэсты на рашэнні суда толькі па справах, у разглядзе якіх яны ўдзельнічалі.

**Артыкул 556. Права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў суда першай інстанцыі, што не ўступілі ў законную сілу**

1. Бакі і іншыя асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць права ў апеляцыйным парадку падаць прыватную скаргу, а пракурор – прынесці прыватны пратэст на вызначэння суда першай інстанцыі, што не ўступілі ў законную сілу, у выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Вызначэнне Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, што вынесена па першай інстанцыі і не ўступіла ў законную сілу, можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў выпадках і парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам, за выключэннем вызначэнняў па пытаннях, звязаных з судовымі выдаткамі, аб прыпыненні вядзення справы, аб адмове ў аднаўленні вядзення справы, па пытаннях працягу, скарачэння і аднаўлення працэсуальных тэрмінаў, забеспячэння доказаў, забеспячэння іску (заявы), забеспячэння выканання рашэння, не накіраванага на неадкладнае выкананне, растлумачэння рашэння, выпраўлення апісак і яўных падліковых памылак, адтэрміноўкі і растэрміноўкі выканання рашэння, змянення спосабу і парадку выканання рашэння.

**Артыкул 557. Суды, якія разглядаюць апеляцыйныя скаргі, апеляцыйныя пратэсты**

1. Апеляцыйныя скаргі і (або) апеляцыйныя пратэсты на рашэнні суда першай інстанцыі, якія не ўступілі ў законную сілу, разглядаюцца:

1) на рашэнні раённых (гарадскіх) судоў – судовай калегіяй па грамадзянскіх справах адпаведнага абласнога (Мінскага гарадскога) суда ў калегіяльным складзе трох суддзяў;

2) на рашэнні абласных (Мінскага гарадскога) суда – судовай калегіяй па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у калегіяльным складзе трох суддзяў;

3) на рашэнні эканамічнага суда вобласці (горада Мінска) – судовай калегіяй Апеляцыйнага эканамічнага суда ў калегіяльным складзе трох суддзяў;

4) на рашэнні Апеляцыйнага эканамічнага суда – судовай калегіяй па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у калегіяльным складзе трох суддзяў;

5) на рашэнні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, прынятыя па першай інстанцыі, – апеляцыйнай інстанцыяй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Прыватныя скаргі і (або) прыватныя пратэсты на не ўступіўшыя ў законную сілу вызначэнні суда першай інстанцыі разглядаюцца аднаасобна суддзёй адпаведнага суда апеляцыйнай інстанцыі. Прыватныя скаргі і (або) прыватныя пратэсты на не ўступіўшыя ў законную сілу вызначэнні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесеныя па першай інстанцыі, разглядаюцца апеляцыйнай інстанцыяй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

## § 2. Узбуджэнне апеляцыйнага вядзення

**Артыкул 558. Парадак падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту**

1. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст адрасуюцца ў суд апеляцыйнай інстанцыі, але адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў суд, што вынес рашэнне.

2. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст, адпаведна пададзеная і (або) прынесены непасрэдна ў суд апеляцыйнай інстанцыі, падлягаюць накіраванню не пазней за наступны дзень у суд першай інстанцыі для вырашэння пытання аб іх прыняцці ў парадку, устаноўленым гэтым параграфам.

**Артыкул 559. Тэрміны апеляцыйнага абскарджання (апратэставання)**

1. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст на рашэнне суда першай інстанцыі адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў пятнаццацідзённы тэрмін пасля вынясення рашэння ці ўручэння асобе, якая мае права на апеляцыйныя абскарджанне і (або) апратэставанне, па патрабаванні такой асобы матывіровачнай часткі рашэння.

2. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст на рашэнне па справе, у матэрыялах якой маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў пятнаццацідзённы тэрмін пасля вынясення рашэння ці ўручэння выпіскі з яе, а ў выпадку складання матывіровачнай часткі рашэння – з дня азнаямлення з ёй.

3. Пры вынясенні судом па справе дадатковага рашэння тэрмін яго апеляцыйнага абскарджання (апратэставання) вылічваецца з дня вынясення дадатковага рашэння.

4. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст на рашэнне, вынесенае ў парадку завочнага вядзення, адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў пятнаццацідзённы тэрмін пасля сканчэння тэрміну падачы адказчыкам заявы аб адмене завочнага рашэння ці пасля вынясення вызначэння суда аб адмове ў задавальненні такой заявы.

5. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст на рашэнне, вынесенае ў парадку спрошчанага вядзення, адпаведна падаецца і (або) прыносіцца ў пятнаццацідзённы тэрмін пасля атрымання яго копіі асобай – удзельнікам у справе, а ў выпадку складання матывіровачнай часткі рашэння, – у той жа тэрмін пасля атрымання матывіровачнай часткі рашэння.

6. Па хадайніцтве асобы, якая падае апеляцыйную скаргу і (або) прыносіць апеляцыйны пратэст, прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту можа быць адноўлены судом, што вынес рашэнне. Заява аб аднаўленні прапушчанага тэрміну падаецца ў суд, што вынес рашэнне, адначасова з апеляцыйнай скаргай і (або) апеляцыйным пратэстам. У выпадку аднаўлення прапушчанага тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту ў вызначэнні суда ўказваецца аб прыпыненні выканання рашэння.

**Артыкул 560. Падставы для адмовы ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

1. Суддзя адмаўляе ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту:

1) асобам, якія не маюць права на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне);

2) калі судовая пастанова не падлягае абскарджанню (апратэставанню) у апеляцыйным парадку;

3) калі апеляцыйная скарга пададзена і (або) апеляцыйны пратэст прынесены пасля сканчэння тэрміну на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне) і ў апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце не змешчана хадайніцтва аб аднаўленні тэрміну ці ў яго аднаўленні адмоўлена.

2. Вызначэнне суддзі аб адмове ў прыняцці апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 561. Форма і змест апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

1. Апеляцыйная скарга падаецца ў суд у пісьмовай форме ці ў выглядзе электроннага дакумента і падпісваецца асобай – падаўцом скаргі ці яе прадстаўніком, упаўнаважаным на яе падпісанне.

2. Апеляцыйны пратэст падпісваецца адпаведным пракурорам.

3. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 100 гэтага Кодэкса, а таксама мець:

1) указанне на рашэнне, якое абскарджваецца або апратэстоўваецца, межы яго абскарджання (апратэставання) і найменне суда, што вынес рашэнне;

2) абгрунтаванне таго, у чым заключаецца няправільнасць разгляду справы, незаконнасць і неабгрунтаванасць рашэння, са спасылкай на акты заканадаўства, абставіны справы і доказы;

3) указанне аспрэчванай сумы па маёмасных патрабаваннях;

4) просьбу асобы – падаўца апеляцыйнай скаргі або пракурора, які прыносіць апеляцыйны пратэст, у частцы таго, абскарджваецца ці апратэстоўваецца рашэнне поўнасцю або ў частцы, якія змяненні патрабуецца ў яго ўнесці;

5) хадайніцтва аб даследаванні новых доказаў, якія маюць значэнне для справы, але бок не меў магчымасці прадставіць суду першай інстанцыі па ўважлівых прычынах, у тым ліку калі суд першай інстанцыі неабгрунтавана адмовіў у іх прыняцці ці асоба не была далучана да ўдзелу ў справе ў судзе першай інстанцыі;

6) пералік пісьмовых матэрыялаў, дададзеных да апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту;

7) дату падачы апеляцыйнай скаргі або прынясення апеляцыйнага пратэсту.

4. У апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце таксама можа змяшчацца хадайніцтва аб аднаўленні тэрміну на апеляцыйнае абскарджанне (апратэставанне).

5. У апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце могуць быць указаны нумары кантактных тэлефонаў, нумары факсаў, адрасы электроннай пошты (пры іх наяўнасці) і іншыя неабходныя для разгляду справы звесткі, а таксама заяўлены наяўныя хадайніцтвы.

6. У выпадку, прадугледжаным часткай 1 артыкула 171 гэтага Кодэкса, апеляцыйная скарга можа змяшчаць хадайніцтва аб назначэнні прымірэнца.

7. Да апеляцыйнай скаргі, падпісанай (пададзенай) прадстаўніком, неабходна дадаць даверанасць або іншы дакумент, што сведчыць паўнамоцтвы прадстаўніка, афармленыя ва ўстаноўленым парадку.

8. Апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст і дададзеныя да іх пісьмовыя матэрыялы адпаведна падаюцца і (або) прыносяцца ў суд першай інстанцыі з копіямі ў колькасці экземпляраў па ліку асоб – удзельнікаў у справе.

9. Да апеляцыйнай скаргі дадаецца дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны (калі апеляцыйная скарга падлягае аплаце), за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў скарзе або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы скаргі.

10. Калі апеляцыйная скарга падаецца асобай, вызваленай ад аплаты дзяржаўнай пошліны, у ёй указваюцца падставы для вызвалення ад такой аплаты.

11. У апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце не могуць змяшчацца патрабаванні, не заяўленыя пры разглядзе справы ў судзе першай інстанцыі.

**Артыкул 562. Пакіданне апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту без руху**

1. Пры падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясенні апеляцыйнага пратэсту, не адпаведных патрабаванням, устаноўленым часткай 1 артыкула 100, пунктамі 1–4 часткі 3 і часткамі 7–9 артыкула 561 гэтага Кодэкса, суддзя выносіць вызначэнне, якім пакідае апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст без руху і прызначае тэрмін для выпраўлення недахопаў.

2. Калі асоба – падавец апеляцыйнай скаргі або пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст, ва ўстаноўлены тэрмін выканаюць указанні, змешчаныя ў вызначэнні, апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст лічацца адпаведна пададзенай і (або) прынесеным у дзень першапачатковага прадстаўлення іх у суд. У адваротным выпадку апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст лічацца адпаведна непададзенай і (або)

непрынесеным і накіроўваюцца асобе – падаўцу апеляцыйнай скаргі ці пракурору, які прынёс апеляцыйны пратэст.

3. Вызначэнне суддзі аб пакіданні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту без руху можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў апеляцыйным парадку.

**Артыкул 563. Дзеянні суда першай інстанцыі пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

1. Пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, адпаведна пададзенай і (або) прынесенага ў тэрмін у адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі артыкуламі 558–560 гэтага Кодэкса, суддзя абавязаны не пазней за наступны дзень накіраваць асобам – удзельнікам у справе копіі апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту і даданых да іх пісьмовых матэрыялаў.

2. Асобы – удзельнікі ў справе маюць права знаёміцца ў судзе з матэрыяламі справы, апеляцыйнай скаргай і (або) апеляцыйным пратэстам, даданымі да іх пісьмовымі матэрыяламі, што паступілі.

3. Пракурор мае права знаёміцца з матэрыяламі справы і ў тым выпадку, калі ён у справе не ўдзельнічаў.

4. Пасля сканчэння тэрміну падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту суд першай інстанцыі накіроўвае справу з апеляцыйнай скаргай і (або) апеляцыйным пратэстам і з пададзенымі на іх водзывамі ў суд апеляцыйнай інстанцыі.

5. Да ўступлення рашэння ў законную сілу справа нікім не можа быць выпатрабавана з суда.

**Артыкул 564. Дапаўненні, змяненні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту**

Асоба – падавец апеляцыйнай скаргі, пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст, маюць права дапоўніць або змяніць іх у межах тэрміну апеляцыйнага абскарджання (апратэставання).

**Артыкул 565. Далучэнне да апеляцыйнай скаргі**

1. Суістцы, суадказчыкі і трэція асобы, якія выступаюць у працэсе на баку асобы – падаўца апеляцыйнай скаргі, маюць права падаць заяву аб далучэнні да апеляцыйнай скаргі, калі іх патрабаванні супадаюць.

2. Заява аб далучэнні да апеляцыйнай скаргі можа быць пададзена толькі ў суд першай інстанцыі ў межах тэрміну апеляцыйнага абскарджання (апратэставання). За разгляд такой заявы дзяржаўная пошліна не выплачваецца.

3. Калі патрабаванне, выкладзенае ў заяве аб далучэнні да апеляцыйнай скаргі, не супадае з патрабаваннямі апеляцыйнай скаргі, яно з’яўляецца самастойнай апеляцыйнай скаргай, якая павінна быць аформлена і пададзена ў адпаведнасці з правіламі, устаноўленымі гэтым Кодэксам.

**Артыкул 566. Водзыў на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст**

1. Асобы – удзельнікі ў справе маюць права падаць у суд першай інстанцыі, што вынес рашэнне, водзыў на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст у пісьмовай форме ці ў выглядзе электроннага дакумента з даданнем да яго дакументаў, якія пацвярджаюць пярэчанні адносна да довадаў апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, са спасылкай на акты заканадаўства.

2. Водзыў на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст, а таксама дадыныя да яго дакументы падаюцца ў суд з копіямі ў колькасці экземпляраў па ліку асоб, якія ўдзельнічаюць у справе.

3. Водзыў на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст можа быць пададзены непасрэдна ў суд апеляцыйнай інстанцыі, але не пазней чым за пяць дзён да пачатку разгляду грамадзянскай справы. У такім выпадку да водзыву таксама дадаецца дакумент, што пацвярджае накіраванне копій водзыву і дадыных да яго дакументаў асобам – удзельнікам у справе.

4. Водзыў на апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст, дзе маюцца звесткі, што з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, асобам – удзельнікам у справе не накіроўваецца. Азнаямленне з такімі дакументамі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і заканадаўствам аб дзяржаўных сакрэтах.

### Артыкул 567. Адмова ад апеляцыйнай скаргі, адкліканне апеляцыйнага пратэсту

1. Асоба – падавец апеляцыйнай скаргі мае права адмовіцца ад яе да вынясення судом апеляцыйнай інстанцыі судовай пастановы.

2. Пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст, мае права адклікаць яго да пачатку разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі.

3. Адмова ад апеляцыйнай скаргі і адкліканне апеляцыйнага пратэсту афармляюцца праз падачу пісьмовай заявы ў суд першай або апеляцыйнай інстанцыі.

4. Пры адмове ад апеляцыйнай скаргі і (або) адкліканні апеляцыйнага пратэсту суддзя суда першай інстанцыі, калі справа знаходзіцца ў гэтым судзе, выносіць вызначэнне аб вяртанні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, аб чым паведамляе асобам – удзельнікам у справе.

5. Аб прыняцці адмовы ад апеляцыйнай скаргі і (або) адклікання апеляцыйнага пратэсту суд апеляцыйнай інстанцыі выносіць вызначэнне, якім спыняе вядзенне па пададзенай апеляцыйнай скарзе і (або) прынесеным апеляцыйным пратэсце.

6. У вызначэнні суда апеляцыйнай інстанцыі аб спыненні вядзення па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце могуць быць вырашаны пытанні аб судовых выдатках, а таксама аб вяртанні дзяржаўнай пошліны з бюджэту.

7. Калі на рашэнне суда першай інстанцыі пададзена апеляцыйная скарга іншымі асобамі, якія не адмаўляюцца ад апеляцыйнай скаргі, ці калі прынесены апеляцыйны пратэст, то справа падлягае разгляду судом апеляцыйнай інстанцыі ў парадку, устаноўленым гэтай главой.

### Артыкул 568. Адмова істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам, зацвярджэнне міравога пагаднення ў судзе апеляцыйнай інстанцыі

1. Адмова істца ад іску, прызнанне іску адказчыкам, заключэнне міравога пагаднення, здзейсненыя пасля падачы апеляцыйнай скаргі і (або) прынясення апеляцыйнага пратэсту, павінны быць выказаны ў пісьмовых заявах, адрасаваных суду апеляцыйнай інстанцыі.

2. Заявы, указаныя ў частцы 1 гэтага артыкула, разглядаюцца судом апеляцыйнай інстанцыі па правілах, устаноўленых артыкулам 272 гэтага Кодэкса.

3. Пры прыняцці адмовы істца ад іску ці зацвярджэнні міравога пагаднення бакоў суд апеляцыйнай інстанцыі адмяняе вынесенае судом першай інстанцыі рашэнне і спыняе вядзенне справы ў адпаведнасці з пунктамі 8 і 9 артыкула 130 гэтага Кодэкса.

4. Прызнанне іску адказчыкам можа быць прынята судом апеляцыйнай інстанцыі, калі ў судовым пасяджэнні прысутнічаюць усе асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, маюць непасрэдны інтарэс у яго зыходзе. У гэтым выпадку суд апеляцыйнай інстанцыі можа адмяніць рашэнне суда першай інстанцыі і прыняць па справе новае рашэнне.

5. Калі на падставах, прадугледжаных часткай 5 артыкула 62 гэтага Кодэкса, суд апеляцыйнай інстанцыі не прымае адмовы істца ад іску, прызнання іску адказчыкам або не зацвярджае міравое пагадненне бакоў, ён выносіць аб гэтым вызначэнне і разглядае справу ў апеляцыйным парадку.

### Артыкул 569. Медыяцыя, перагаворы бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, прымірэнчая працэдура ў судзе апеляцыйнай інстанцыі

1. Заява бакоў аб заключэнні пагаднення аб прымяненні медыяцыі, хадайніцтва бакоў аб урэгуляванні спрэчкі праз правядзенне перагавораў пры садзейнічанні іх адвакатаў, заява бакоў аб урэгуляванні спрэчкі з удзелам прымірэнца ў прымірэнчай працэдуры падаюцца суду апеляцыйнай інстанцыі ў пісьмовай форме да выхаду суда ў дарадчы пакой для вынясення судовай пастановы, якой заканчваецца разгляд справы па сутнасці, і падпісваюцца бакамі, а таксама іх прадстаўнікамі, якія ўдзельнічаюць у судовым пасяджэнні, і заносяцца ў сціслы пратакол, пратакол судовага пасяджэння, калі яны складаюцца.

2. Пры падачы бакамі заявы аб заключэнні пагаднення аб прымяненні медыяцыі, хадайніцтва аб урэгуляванні спрэчкі праз правядзенне перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, заявы аб урэгуляванні спрэчкі з удзелам прымірэнца ў прымірэнчай працэдуры суд устанаўлівае тэрмін правядзення медыяцыі, перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, прымірэнчай працэдуры. У гэтых выпадках вядзенне справы можа быць прыпынена на вызначаны судом апеляцыйнай інстанцыі тэрмін.

3. Пры заключэнні бакамі медыятыўнага пагаднення, пагаднення аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў, пагаднення аб прымірэнні суд аднаўляе прыпыненае вядзенне справы і разглядае пададзеныя заявы па правілах, устаноўленых главой 20 гэтага Кодэкса і гэтай главой.

### Артыкул 570. Вяртанне справы судом апеляцыйнай інстанцыі

Суд апеляцыйнай інстанцыі вяртае справу, якая паступіла з апеляцыйнай скаргай і (або) апеляцыйным пратэстам, у суд першай інстанцыі, калі:

1) судом першай інстанцыі не выкананы патрабаванні, устаноўленыя артыкуламі 560 і 562 гэтага Кодэкса;

2) не разгледжаны заява аб аднаўленні тэрміну на падачу апеляцыйнай скаргі і (або) прынясенне апеляцыйнага пратэсту, заўвагі на пратакол судовага пасяджэння, заява аб вынясенні дадатковага рашэння;

3) судом першай інстанцыі не была выраблена матывіровачная частка рашэння і не страчана магчымасць яе вырабу.

### Артыкул 571. Спыненне вядзення па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце

1. Суд апеляцыйнай інстанцыі спыняе вядзенне па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, калі:

1) апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст адпаведна пададзена і (або) прынесены асобай, якая не мае права на абскарджанне (апратэставанне) судовай пастановы, і былі памылкова прыняты судом апеляцыйнай інстанцыі;

2) апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст адпаведна пададзена і (або) прынесены на судовую пастанову, што ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам не падлягае абскарджанню (апратэставанню) у апеляцыйным парадку, і былі памылкова прыняты судом апеляцыйнай інстанцыі;

3) пасля прыняцця апеляцыйнай скаргі да вядзення ад асобы – падаўца скаргі паступіла заява аб адмове ад скаргі і адмова была прынята судом апеляцыйнай інстанцыі;

4) да пачатку разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі апеляцыйны пратэст адазваны пракурорам, яго які прынёс.

2. Аб спыненні вядзення па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце суд выносіць вызначэнне, дзе могуць быць вырашаны пытанні аб судовых выдатках.

3. Вызначэнне суда аб спыненні вядзення па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце можа быць абскарджана і (або) апратэставана ў парадку, установленым гэтым Кодэксам.

4. У выпадку спынення вядзення па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце паўторныя падача і (або) прынясенне той жа асобай у суд адпаведна апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту не дапускаюцца.

**Артыкул 572. Прыпыненне выканання рашэння суда першай інстанцыі судом апеляцыйнай інстанцыі**

1. Суддзя суда апеляцыйнай інстанцыі пры падрыхтоўцы справы да разгляду ў апеляцыйным парадку па хадайніцтве асоб – удзельнікаў у справе мае права прыпыніць выкананне рашэння, прынятага судом першай інстанцыі і накіраванага на неадкладнае выкананне, пры ўмове, калі заяўнік абгрунтаваў немагчымасць ці ўскладненасць павароту выканання рашэння або прадставіў забеспячэнне, прадугледжанае часткай 2 гэтага артыкула.

2. Выкананне рашэння суда першай інстанцыі прыпыняецца суддзёй пры прадастаўленні асобай, якая хадайнічае аб такім прыпыненні, забеспячэння пакрыцця другому боку па справе магчымых страт (сустрэчнага забеспячэння) праз унясенне на дэпазітны рахунак суда грашовых сродкаў у памеры аспрэчванай сумы ці прадастаўлення банкаўскай гарантыі, парукі або іншага фінансавага забеспячэння на тую ж суму.

3. Аб прыпыненні выканання рашэння ці аб адмове ў прыпыненні выканання рашэння суддзя суда апеляцыйнай інстанцыі выносіць вызначэнне ў трохдзённы тэрмін пасля паступлення хадайніцтва ў суд.

4. Копіі вызначэння аб прыпыненні выканання рашэння суда ці аб адмове ў прыпыненні выканання рашэння суда на наступны дзень пасля яго вынясення накіроўваюцца асобам, якія ўдзельнічаюць у справе.

5. Выкананне рашэння суда прыпыняецца на тэрмін да прыняцця судом апеляцыйнай інстанцыі вызначэння па выніках разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту.

## § 3. Падрыхтоўка і разгляд справы судом апеляцыйнай інстанцыі

**Артыкул 573. Падрыхтоўка да разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі**

1. Суддзя суда апеляцыйнай інстанцыі правярае захаванне судом першай інстанцыі патрабаванняў, установленых артыкуламі 558–562 і 570 гэтага Кодэкса, і з улікам патрабаванняў і хадайніцтваў, выкладзеных у апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, водзывах на іх, у пятнаццацідзённы тэрмін пасля паступлення справы ў суд апеляцыйнай інстанцыі праводзіць падрыхтоўку справы да разгляду ў апеляцыйным парадку.

2. У працэсе падрыхтоўкі справы да разгляду ў апеляцыйным парадку па ўласнай ініцыятыве ці па хадайніцтве асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, суддзя:

1) вырашае пытанні выкліку ў судовае пасяджэнне экспертаў, а таксама дапытаных у судзе першай інстанцыі асоб для растлумачэнняў па сутнасці дадзеных імі заключэнняў і паказанняў, калі прызнае гэта неабходным;

2) вырашае хадайніцтвы бакоў аб даследаванні новых доказаў, якія маюць значэнне для справы і якія бок не меў магчымасці прадставіць суду першай інстанцыі па ўважлівых

прычынах, у тым ліку калі суд першай інстанцыі неабгрунтавана адмовіў у іх прыняцці ці асоба не была далучана да ўдзелу ў справе ў судзе першай інстанцыі. Асобы, якія прадстаўляюць суду новыя доказы, абавязаны ўказаць, як яны атрыманы, у сувязі з якімі абставінамі ўзнікла неабходнасць іх прадстаўлення;

3) вырашае хадайніцтвы аб прыпыненні выканання рашэння суда першай інстанцыі ў выпадку, калі яно накіравана на неадкладнае выкананне;

4) разглядае пытанне аб магчымасці прымірэння бакоў у адпаведнасці з патрабаваннямі, устаноўленымі главой 20 гэтага Кодэкса;

5) здзяйсняе іншыя неабходныя для забеспячэння разгляду справы працэсуальныя дзеянні з улікам патрабаванняў гэтага Кодэкса і сутнасці апеляцыйнага вядзення.

3. Па заканчэнні падрыхтоўкі справы суддзя суда апеляцыйнай інстанцыі выносіць вызначэнне аб назначэнні справы да разгляду ў апеляцыйным парадку і паведамляе асобам – удзельнікам у справе аб часе і месцы яго правядзення, а таксама прапануе да разгляду справы азнаёміцца з дадатковымі доказамі пры іх наяўнасці.

4. Спіс спраў, назначаных да разгляду ў апеляцыйным парадку, размяшчаецца судом у агульнадаступным месцы ў памяшканні суда апеляцыйнай інстанцыі, а таксама на інтэрнэт-партале судоў агульнай юрысдыкцыі Рэспублікі Беларусь за дзень да пачатку судовага пасяджэння.

**Артыкул 574. Тэрміны разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі**

1. Справа ў судзе апеляцыйнай інстанцыі павінна быць разгледжана ў месячны тэрмін пасля яе паступлення, а ў выпадку неабходнасці даследавання новых доказаў – не пазней за два месяцы пасля яе паступлення, калі іншае не прадугледжана часткай 2 гэтага артыкула.

2. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь разглядае справу, што паступіла па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, у тэрмін не больш за тры месяцы пасля яе паступлення.

3. У выключных выпадках з улікам асаблівай складанасці справы тэрмін, устаноўлены часткамі 1 і 2 гэтага артыкула, можа быць працягнуты старшынёй адпаведнага суда ці яго намеснікам, але не больш чым на адзін месяц.

4. У выпадку змянення часу і месца судовага пасяджэння або працягу тэрміну разгляду справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі асобы – удзельнікі ў справе павінны быць загадзя і належным чынам апавешчаны аб новых часе і месцы судовага пасяджэння.

**Артыкул 575. Прадмет і межы разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі**

1. Пры разглядзе справы па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце суд апеляцыйнай інстанцыі па наяўных у справе і дадаткова прадстаўленых доказах правярае правільнасць устанаўлення судом першай інстанцыі фактычных абставін справы, прымянення нормаў матэрыяльнага і працэсуальнага права.

2. Суд апеляцыйнай інстанцыі разглядае справу ў межах довадаў і патрабаванняў, выкладзеных у апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, водзывах на іх, і правярае законнасць і абгрунтаванасць рашэння толькі ў абскарджванай (апратэставанай) частцы.

3. Суд апеляцыйнай інстанцыі можа даследаваць новыя доказы, якія маюць значэнне для справы і якія бок не меў магчымасці прадставіць суду першай інстанцыі па ўважлівых прычынах, у тым ліку калі суд першай інстанцыі неабгрунтавана адмовіў у іх прыняцці ці асоба не была далучана да ўдзелу ў справе ў судзе першай інстанцыі.

4. Калі пры праверцы рашэння суда першай інстанцыі ў абскарджванай (апратэставанай) частцы ўстаноўлена, што судом парушаны ці няправільна прыменены нормы матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права, суд апеляцыйнай інстанцыі мае права праверыць такое рашэнне ў поўным аб’ёме. У гэтым выпадку вызначэнне суда

апеляцыйнай інстанцыі павінна змяшчаць матывы, па якіх суд прыйшоў да вываду аб неабходнасці такой праверкі.

**Артыкул 576. Парадак разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі**

1. Суд апеляцыйнай інстанцыі разглядае справу ў судовым пасяджэнні па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для вядзення па справах у судзе першай інстанцыі, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, і сутнасці апеляцыйнага вядзення.

2. У судзе апеляцыйнай інстанцыі не прымяняюцца правілы аб злучэнні і раз’яднанні некалькіх патрабаванняў, аб змяненні падставы ці прадмету іску, памеру іскавых патрабаванняў, аб прад’яўленні сустрэчнага іску, аб замене неналежнага адказчыка, аб далучэнні ці допуску да ўдзелу ў справе трэціх асоб, працэсуальных саўдзельнікаў, іншыя правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам толькі для разгляду справы ў судзе першай інстанцыі.

3. Разгляд спраў у судзе апеляцыйнай інстанцыі ажыццяўляецца ў судовым пасяджэнні з апавяшчэннем асоб – удзельнікаў у справе аб часе і месцы разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту. Няяўка належна апавешчаных асоб – удзельнікаў у справе не перашкаджае разгляду справы судом апеляцыйнай інстанцыі. Аднак суд мае права, прызнаўшы прычыны няяўкі ўважлівымі, адкласці судовы разбор. У неабходных выпадках яўка асоб – удзельнікаў у справе ў судовае пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі можа быць прызнана абавязковай.

4. Асоба, якая старшынюе, адкрывае пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі і абвяшчае склад суда, сакратара судовага пасяджэння – памочніка суддзі (калі ён удзельнічае), пракурора, растлумачвае асобам – удзельнікам у справе іх правы і абавязкі, у тым ліку права заяўляць адводы, хадайніцтвы.

5. Разгляд справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі пачынаецца са сціслага дакладу асобы, якая старшынюе, або аднаго з суддзяў аб сутнасці справы, змесце абскарджванага (апратэставанага) рашэння суда першай інстанцыі, довадах апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, аб водзывах на іх, а таксама суддзя паведамляе аб прадстаўленых і сабраных падчас падрыхтоўкі справы да разгляду ў апеляцыйным парадку новых доказах, аб іншых звестках, неабходных для праверкі рашэння суда першай інстанцыі ў абскарджванай (апратэставанай) частцы.

6. Пасля дакладу суд апеляцыйнай інстанцыі заслухвае тлумачэнні асоб, якія з’явіліся ў судовае пасяджэнне, удзельнічаюць у справе, іх прадстаўнікоў. Першымі выступаюць асоба – падавец апеляцыйнай скаргі і (або) яе прадстаўнік ці пракурор, які прынёс апеляцыйны пратэст. У выпадку абскарджання рашэння суда абодвума бакамі першымі выступаюць ісцец і (або) яго прадстаўнік.

7. Пракурор, дзяржаўныя органы, юрыдычныя асобы і грамадзяне, якія ад уласнага імя абараняюць правы, свабоды і законныя інтарэсы іншых асоб, выступаюць пасля асоб, якія маюць непасрэдны інтарэс у зыходзе справы, іх прадстаўнікоў.

8. Пасля тлумачэнняў асоб – удзельнікаў у справе, іх прадстаўнікоў суд апеляцыйнай інстанцыі пры наяўнасці адпаведных хадайніцтваў абвяшчае наяўныя ў справе доказы, а пры наяўнасці новых доказаў пераходзіць да іх даследавання па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для вядзення па справах у судзе першай інстанцыі.

**Артыкул 577. Фіксаванне ходу судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі**

1. У выпадку неабходнасці допыту выкліканых у судовае пасяджэнне суда апеляцыйнай інстанцыі сведкаў, экспертаў, спецыялістаў, удзелу перакладчыка ход судовага пасяджэння суда апеляцыйнай інстанцыі фіксуецца па правілах, устаноўленых артыкулам 104 гэтага Кодэкса.

2. Суд апеляцыйнай інстанцыі мае права фіксаваць ход судовага пасяджэння па ўласнай ініцыятыве.

3. Змест сціслага пратакола, пратакола судовага пасяджэння, парадак іх складання, азнаямлення з гука- або відэазапісам, са сціслым пратаколам, пратаколам судовага пасяджэння, прынясення заўваг на іх і разгляду такіх заўваг рэгулююцца правіламі, устаноўленымі главой 11 гэтага Кодэкса, з улікам сутнасці апеляцыйнага вядзення.

### Артыкул 578. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі

Суд апеляцыйнай інстанцыі, разгледзеўшы справу па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце, мае права:

1) пакінуць рашэнне суда першай інстанцыі без змянення, а апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст – без задавальнення;

2) змяніць рашэнне суда першай інстанцыі;

3) адмяніць рашэнне суда першай інстанцыі поўнасцю ці ў частцы і прыняць новае рашэнне па сутнасці заяўленых патрабаванняў;

4) адмяніць рашэнне суда першай інстанцыі поўнасцю ці ў частцы і спыніць вядзенне справы або пакінуць заяву без разгляду;

5) адмяніць рашэнне суда першай інстанцыі поўнасцю ці ў частцы і накіраваць справу на новы разгляд у суд першай інстанцыі, калі пры разглядзе справы судом апеляцыйнай інстанцыі ўстаноўлены істотныя парушэнні нормаў працэсуальнага права, прадугледжаныя часткамі 3 і 4 артыкула 579 гэтага Кодэкса, якія не могуць быць ліквідаваны ў парадку апеляцыйнага вядзення ці перашкаджаюць суду апеляцыйнай інстанцыі ў даследаванні новых доказаў або ва ўстанаўленні фактаў, што не з'яўляліся прадметам даследавання суда першай інстанцыі.

### Артыкул 579. Падставы для адмены або змянення рашэння суда першай інстанцыі

1. Рашэнне суда першай інстанцыі можа быць адменена або зменена ў апеляцыйным парадку, калі:

1) судом не ўлічаны ўсе факты, што ўваходзяць у прадмет даказвання па справе;

2) факты, пакладзеныя судом у аснову рашэння, не пацверджаны дастатковымі і пэўнымі доказамі;

3) выкладзеныя ў рашэнні суда вывады не адпавядаюць устаноўленым фактам;

4) судом парушаны ці няправільна прыменены нормы матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права.

2. Нормы матэрыяльнага права лічацца парушанымі ці няправільна прымененымі ў выпадку:

1) прымянення судом не падлеглай прымяненню нормы матэрыяльнага права;

2) няправільнага прымянення судом падлеглай прымяненню нормы матэрыяльнага права;

3) няправільнага тлумачэння судом прымененага нарматыўнага прававога акта.

3. Парушэнне ці няправільнае прымяненне падлеглай прымяненню нормы працэсуальнага права з'яўляюцца падставамі для адмены або змянення рашэння суда першай інстанцыі, калі гэта прывяло ці магло прывесці да няправільнага вырашэння справы.

4. Падставай для адмены рашэння суда першай інстанцыі ў любым выпадку з'яўляюцца:

1) разгляд справы судом у незаконным складзе;

2) парушэнне парадку разгляду заявы аб адводзе (самаадводзе) суддзі, устаноўленага артыкулам 37 гэтага Кодэкса;

3) разгляд справы ў адсутнасць каго-небудзь з асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, не апавешчаных належным чынам аб часе і месцы судовага пасяджэння, калі аб гэтым указана ў іх апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце;

4) парушэнне права асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, карыстацца роднай мовай або паслугамі перакладчыка;

5) вырашэнне судом пытання аб правах і абавязках асоб, не далучаных да ўдзелу ў справе;

6) парушэнне правілаў аб таямніцы нарады суддзяў падчас прыняцця рашэння;

7) непадпісанне рашэння суддзёй, які разглядаў справу, або вынясенне ці падпісанне не тым суддзёй ці не тымі суддзямі, якія ўваходзілі ў склад суда, што разглядаў справу;

8) адсутнасць па справе гука- ці відэазапісу ходу судовага пасяджэння ці адсутнасць у справе пратакола судовага пасяджэння ў выпадку яго складання, або тое, што пратакол судовага пасяджэння не падпісаны асобамі, абавязанымі яго падпісаць;

9) разгляд судом у парадку спрошчанага вядзення справы, падлеглай разгляду па агульных правілах іскавага вядзення.

5. Змяненне судовага рашэння можа заключацца ў дапаўненні ці змяненні яго матывіровачнай і (або) рэзалютыўнай частак.

6. Правільнае па сутнасці рашэнне суда першай інстанцыі не можа быць адменена па адных толькі фармальных падставах.

**Артыкул 580. Падставы для адмены рашэння суда поўнасцю ці ў частцы са спыненнем вядзення справы або пакіданнем заявы без разгляду**

Рашэнне суда падлягае адмене поўнасцю ці ў частцы са спыненнем вядзення справы або пакіданнем заявы без разгляду на падставах, прадугледжаных пунктамі 1–16, 20 і 21 артыкула 128, артыкулам 130 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 581. Парадак разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, што паступілі пасля разгляду справы ў апеляцыйным парадку**

1. У выпадку калі апеляцыйная скарга і (або) апеляцыйны пратэст, адпаведна пададзеная і (або) прынесены ва ўстаноўлены тэрмін ці пасля аднаўлення прапушчанага тэрміну, паступяць у суд апеляцыйнай інстанцыі пасля разгляду справы па іншых апеляцыйных скаргах і (або) апеляцыйным пратэсце, суд абавязаны прыняць апеляцыйную скаргу і (або) апеляцыйны пратэст да свайго вядзення.

2. Калі ў выніку разгляду такіх апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту суд апеляцыйнай інстанцыі прыйдзе да іншага выніку разгляду справы, гэты суд адмяняе раней вынесенае апеляцыйнае вызначэнне і выносіць новае апеляцыйнае вызначэнне.

## § 4. Вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі

**Артыкул 582. Змест апеляцыйнага вызначэння**

1. Па выніках разгляду справы па апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце на рашэнне суда першай інстанцыі суд апеляцыйнай інстанцыі выносіць апеляцыйнае вызначэнне.

2. Апеляцыйнае вызначэнне суда складаецца з уводнай, апісальнай, матывіровачнай і рэзалютыўнай частак.

3. Ва ўводнай частцы апеляцыйнага вызначэння ўказваюцца час і месца вынясення вызначэння; найменне і склад суда апеляцыйнай інстанцыі, што вынес вызначэнне; асобы, якія падалі апеляцыйную скаргу і (або) прынеслі апеляцыйны пратэст; асобы – удзельнікі ў разглядзе справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі.

4. У апісальнай і матывіровачнай частках апеляцыйнага вызначэння павінны быць выкладзены сціслы змест заяўленых па справе патрабаванняў; змест рашэння суда першай інстанцыі; абагульненыя довады апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, водзывы на іх; матывы неабходнасці змянення ці адмены рашэння суда першай інстанцыі і вынясення новага рашэння; устаноўленыя судом апеляцыйнай інстанцыі факты і адпаведныя ім праваадносіны; звесткі аб выкарыстанні сістэм відэаканферэнцсувязі; нормы матэрыяльнага права, на падставе якіх разгледжана справа; нормы працэсуальнага права, якімі суд апеляцыйнай інстанцыі кіраваўся; матывы, па якіх суд апеляцыйнай інстанцыі прыйшоў да сваіх вывадаў падчас судовага разбору.

5. Пры пакіданні апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту без задавальнення суд абавязаны ўказаць матывы, па якіх довады апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту адхіляюцца.

6. У рэзалютыўнай частцы вызначэння павінны змяшчацца вывады суда апеляцыйнай інстанцыі па выніках разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту; указанне на размеркаванне судовых выдаткаў, у тым ліку выдаткаў, панесеных пры разглядзе справы ў судзе апеляцыйнай інстанцыі.

**Артыкул 583. Парадак вынясення і абвяшчэння апеляцыйнага вызначэння**

1. Па выніках разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту суд апеляцыйнай інстанцыі ў дарадчым пакоі выносіць апеляцыйнае вызначэнне, што падпісваецца складам суда, у тым ліку суддзёй, у якога засталося асобае меркаванне.

2. Пасля падпісання апеляцыйнага вызначэння суд неадкладна вяртаецца ў залу судовага пасяджэння і абвяшчае рэзалютыўную частку вызначэння з вусным абгрунтаваннем прынятага рашэння. Абвяшчэнне ажыццяўляецца асобай, якая старшынюе, ці адным з суддзяў.

**Артыкул 584. Законная сіла апеляцыйнага вызначэння**

Апеляцыйнае вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі ўступае ў законную сілу з моманту яго вынясення.

**Артыкул 585. Прыватнае вызначэнне суда апеляцыйнай інстанцыі**

Суд апеляцыйнай інстанцыі мае права ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 321 гэтага Кодэкса, вынесці прыватнае вызначэнне.

**§ 5. Перагляд у апеляцыйным парадку вызначэнняў суда першай інстанцыі**

**Артыкул 586. Абскарджанне (апратэставанне) вызначэнняў суда першай інстанцыі**

1. Вызначэнні суда першай інстанцыі могуць быць абскарджаны (апратэставаны) асобамі – удзельнікамі ў справе, прыватна ад рашэнняў суда першай інстанцыі ў суд апеляцыйнай інстанцыі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, а таксама калі вызначэнне суда першай інстанцыі перашкаджае магчымасці далейшага руху справы.

2. Вызначэнне суда першай інстанцыі ў выпадках, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, мае права апратэставаць пракурор.

3. На іншыя вызначэнні суда першай інстанцыі прыватныя скаргі і прыватныя пратэсты не падаюцца і не прыносяцца. Пярэчанні супраць гэтых вызначэнняў могуць быць выкладзены ў апеляцыйнай скарзе і (або) апеляцыйным пратэсце.

**Артыкул 587. Парадак падачы і разгляду прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту**

1. Падача і разгляд прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту ажыццяўляюцца ў парадку, устаноўленым гэтай главой для падачы і разгляду апеляцыйнай скаргі і (або) апеляцыйнага пратэсту, калі іншае не прадугледжана часткамі 2 і 3 гэтага артыкула.

2. Прыватная скарга і (або) прыватны пратэст на вызначэнне суда першай інстанцыі разглядаюцца без правядзення судовага пасяджэння і без апавяшчэння асоб, якія ўдзельнічаюць у справе. Суд мае права выклікаць асоб – удзельнікаў у справе, у судовае пасяджэнне, паведаміўшы ім аб часе і месцы яго правядзення, калі з улікам складанасці разгляданага пытання прызнае гэта неабходным.

3. Тэрмін падачы прыватнай скаргі на вызначэнне суда першай інстанцыі па пытаннях, што ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам вырашаюцца без выкліку бакоў і без правядзення судовага пасяджэння, вылічваецца пасля атрымання копіі вызначэння асобай – падаўцом прыватнай скаргі.

**Артыкул 588. Паўнамоцтвы суда апеляцыйнай інстанцыі пры разглядзе прыватнай скаргі і (або) прыватнага пратэсту на вызначэнне суда першай інстанцыі**

Суд апеляцыйнай інстанцыі, разгледзеўшы прыватную скаргу і (або) прыватны пратэст на вызначэнне суда першай інстанцыі, мае права:

1) пакінуць вызначэнне без змянення, а прыватную скаргу і (або) прыватны пратэст – без задавальнення;

2) змяніць вызначэнне;

3) адмяніць вызначэнне поўнасцю ці ў частцы і вырашыць пытанне па сутнасці;

4) адмяніць вызначэнне поўнасцю ці ў частцы і перадаць пытанне на новы разгляд у суд першай інстанцыі, калі рашэнне такога пытання аднесена гэтым Кодэксам толькі да кампетэнцыі суда першай інстанцыі ці судом першай інстанцыі дапушчаны істотныя парушэнні нормаў працэсуальнага права, прадугледжаныя часткамі 3 і 4 артыкула 579 гэтага Кодэкса, якія не могуць быць ліквідаваны ў парадку апеляцыйнага вядзення.

**Артыкул 589. Законная сіла апеляцыйнага вызначэння, вынесенага па прыватнай скарзе і (або) прыватным пратэсце**

Апеляцыйнае вызначэнне, вынесенае па прыватнай скарзе і (або) прыватным пратэсце, уступае ў законную сілу з моманту яго вынясення.

## ГЛАВА 56
## ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ СУДОЎ ПЕРШАЙ І АПЕЛЯЦЫЙНАЙ ІНСТАНЦЫЙ (КАСАЦЫЙНАЕ ВЯДЗЕННЕ)

### § 1. Перагляд судовых пастаноў у касацыйным парадку

**Артыкул 590. Суды касацыйнай інстанцыі**

Судамі касацыйнай інстанцыі з’яўляюцца прэзідыумы абласных (Мінскага гарадскога) судоў, прэзідыум Апеляцыйнага эканамічнага суда.

**Артыкул 591. Права на зварот з касацыйнай скаргай у суд касацыйнай інстанцыі**

1. Судовыя пастановы раённых (гарадскіх) судоў, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), а таксама вызначэнні абласных (Мінскага гарадскога) судоў,

Апеляцыйнага эканамічнага суда, што вынесены імі ў апеляцыйным парадку і ўступілі ў законную сілу, могуць быць абскарджаны ў суд касацыйнай інстанцыі ва ўстаноўленым гэтай главой парадку асобамі – удзельнікамі ў справе, а таксама іншымі асобамі, чые правы і законныя інтарэсы парушаны вынесенай судовай пастановай, калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам.

2. Не падлягаюць абскарджанню ў касацыйным парадку:

1) судовыя пастановы, што не былі абскарджаны ў апеляцыйным парадку, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам, за выключэннем выпадкаў, калі прычыны, па якіх не падавалася апеляцыйная скарга, прызнаны старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшынёй Апеляцыйнага эканамічнага суда ўважлівымі;

2) судовыя пастановы па справах, скончаных у судзе першай інстанцыі прызнаннем іску.

3. У касацыйным парадку не падлягаюць абскарджанню вызначэнні суда першай інстанцыі, за выключэннем вызначэнняў:

1) аб адмове ва ўзбуджэнні вядзення справы;

2) аб спыненні вядзення справы, за выключэннем выпадкаў адмовы істца ад іску, заключэння міравога пагаднення, пагаднення аб урэгуляванні спрэчкі па выніках перагавораў бакоў пры садзейнічанні іх адвакатаў або пагаднення аб прымірэнні;

3) аб часовым абмежаванні права грамадзяніна на выезд з Рэспублікі Беларусь;

4) аб змяшчэнні непаўналетняга ў прыёмнік-размеркавальнік для непаўналетніх, аб працягу тэрміну знаходжання непаўналетняга ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх ці аб вызваленні непаўналетняга з прыёмніка-размеркавальніка для непаўналетніх;

5) па хадайніцтвах аб адмене рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

6) па заявах аб адмене рашэння працоўнага арбітражу;

7) аб выдачы выканальнага ліста на прымусовае выкананне рашэння трацейскага суда, міжнароднага арбітражнага (трацейскага) суда, іншага пастаяннага арбітражнага органа, што знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, медыятыўнага пагаднення;

8) эканамічнага суда па справах аб прызнанні і прывядзенні ў выкананне рашэння замежнага суда, замежнага трацейскага суда (арбітражу), міжнароднага медыятыўнага пагаднення;

9) аб завяршэнні ліквідацыйнага вядзення справы аб банкруцтве;

10) аб адмове ў аднаўленні тэрміну на абскарджанне (апратэставанне) судовай пастановы ў апеляцыйным парадку;

11) па пытаннях аб павароце выканання судовай пастановы;

12) па пытаннях выдачы дубліката выканальнага ліста, вызначэння аб судовым загадзе;

13) аб адмове ў задавальненні заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах;

14) па пытаннях спагнання судовых выдаткаў, індэксацыі прысуджаных грашовых сум;

15) па пытаннях аднаўлення тэрміну прад’яўлення выканальнага дакумента да выканання;

16) па пытаннях аднаўлення страчанага судовага вядзення.

4. Абмежаванні, устаноўленыя часткамі 2 і 3 гэтага артыкула, не падлягаюць прымяненню, калі судовая пастанова:

1) не падлягае абскарджанню ў апеляцыйным парадку ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам;

2) перашкаджае вынясенню законнай і абгрунтаванай судовай пастановы па іншай справе.

**Артыкул 592. Прадстаўленне суддзі ў суд касацыйнай інстанцыі**

Суддзя мае права ўнесці прадстаўленне аб пераглядзе ў касацыйным парадку судовых пастаноў, што ўступілі ў законную сілу, калі яны перашкаджаюць прыняццю законнай і абгрунтаванай судовай пастановы па іншай справе, якая знаходзіцца ў яго вядзенні. Прадстаўленне суддзі разглядаецца ў парадку, устаноўленым для разгляду касацыйных скаргаў.

**Артыкул 593. Парадак і тэрмін падачы касацыйнай скаргі**

1. Касацыйная скарга падаецца ў суд касацыйнай інстанцыі.

2. Справа па касацыйнай скарзе разглядаецца:

1) на рашэнні, вызначэнні раённых (гарадскіх) судоў, вызначэнні абласных (Мінскага гарадскога) судоў, вынесеныя ў апеляцыйным парадку, – прэзідыумам абласных (Мінскага гарадскога) суда;

2) на рашэнні, вызначэнні эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), а таксама на вызначэнні Апеляцыйнага эканамічнага суда, вынесеныя ў апеляцыйным парадку, – прэзідыумам Апеляцыйнага эканамічнага суда.

3. Судовыя пастановы могуць быць абскарджаны ў суд касацыйнай інстанцыі на працягу шасці месяцаў з дня іх уступлення ў законную сілу.

4. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін падачы касацыйнай скаргі можа быць адноўлены старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшынёй Апеляцыйнага эканамічнага суда. Па выніках разгляду заявы аб аднаўленні тэрміну падачы касацыйнай скаргі выносіцца вызначэнне. Вызначэнне аб адмове ў аднаўленні тэрміну падачы касацыйнай скаргі можа быць абскарджана ў парадку нагляду.

**Артыкул 594. Форма і змест касацыйнай скаргі**

1. Касацыйная скарга падаецца ў пісьмовай форме ці ў выглядзе электроннага дакумента і, апрача звестак, прадугледжаных артыкулам 100 гэтага Кодэкса, павінна змяшчаць:

1) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы – падаўца касацыйнай скаргі, яе месца жыхарства ці месца знаходжання, працэсуальнае становішча ў справе;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне іншых асоб – удзельнікаў у справе, іх месца жыхарства ці месца знаходжання;

3) указанне на суды, што разглядалі справу ў якасці суда першай і апеляцыйнай інстанцыі, змест вынесеных імі судовых пастаноў;

4) указанне на судовыя пастановы, што абскарджваюцца;

5) указанне на дапушчаныя судамі першай і апеляцыйнай інстанцый парушэнні, што з'яўляюцца падставай для адмены ці змянення судовых пастаноў у касацыйным парадку, прадугледжаныя артыкулам 606 гэтага Кодэкса;

6) просьбу падаўца скаргі ў дачыненні да судовай пастановы, якая абскарджваецца.

2. У касацыйнай скарзе іншай асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны вынесенай судовай пастановай, павінна быць указана, якія правы ці законныя інтарэсы гэтай асобы парушаны і ў чым заключаецца такое парушэнне.

3. Касацыйная скарга павінна быць падпісана асобай – падаўцом скаргі ці яе прадстаўніком.

4. Да касацыйнай скаргі дадаюцца завераныя адпаведным судом копіі абскарджваных судовых пастаноў, а таксама дакументы, што пацвярджаюць:

1) аплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі)

у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы указаны ў скарзе або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы скаргі;

2) паўнамоцтвы прадстаўніка на падпісанне і падачу касацыйнай скаргі.

5. Касацыйная скарга ў пісьмовай форме падаецца ў суд касацыйнай інстанцыі з копіямі ў колькасці экземпляраў па ліку асоб – удзельнікаў у справе.

**Артыкул 595. Вяртанне касацыйнай скаргі**

1. Касацыйная скарга не падлягае разгляду і вяртаецца заяўніку, калі:

1) касацыйная скарга і дададзеныя да яе дакументы не адпавядаюць патрабаванням, устаноўленых артыкулам 594 гэтага Кодэкса;

2) касацыйная скарга пададзена асобай, якая не мае права на зварот у суд касацыйнай інстанцыі;

3) касацыйная скарга пададзена на судовую пастанову, што не была абскарджана ў апеляцыйным парадку ў выпадках, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам, і прычыны, па якіх не падавалася апеляцыйная скарга, не прызнаны старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшынёй Апеляцыйнага эканамічнага суда ўважлівымі;

4) маецца вызначэнне аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі па касацыйнай скарзе гэтай жа асобы;

5) маецца судовая пастанова суда касацыйнай інстанцыі па гэтай жа справе;

6) касацыйная скарга пададзена на судовую пастанову, якая ў адпаведнасці з артыкулам 591 гэтага Кодэкса не можа быць абскарджана ў касацыйным парадку;

7) прапушчаны тэрмін абскарджання судовай пастановы ў касацыйным парадку, калі адсутнічае просьба аб яго аднаўленні ці ў аднаўленні тэрміну адмоўлена;

8) паступіла заява аб адмове ад касацыйнай скаргі.

2. Пры ліквідаванні ўказаных у пункце 1 часткі 1 гэтага артыкула недахопаў, што паслужылі падставай для вяртання касацыйнай скаргі, яна можа быць пададзена нанава на агульных падставах.

## § 2. Узбуджэнне касацыйнага вядзення

**Артыкул 596. Разгляд касацыйнай скаргі**

1. Старшыня абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшыня Апеляцыйнага эканамічнага суда ў тэрмін не больш як пяць дзён пасля паступлення касацыйнай скаргі вырашаюць пытанні аб наяўнасці або адсутнасці падстаў для выпатрабавання справы.

2. Па выніках разгляду касацыйнай скаргі выносіцца адно з наступных вызначэнняў:

1) аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі, калі адсутнічаюць падставы, прадугледжаныя артыкулам 606 гэтага Кодэкса, для перагляду судовых пастаноў у касацыйным парадку;

2) аб перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі.

3. Касацыйная скарга на судовыя пастановы разглядаецца ў тэрмін не пазней за адзін месяц пасля яе паступлення, а ў выпадку выпатрабавання справы – не пазней за адзін месяц пасля паступлення справы.

4. Установлены часткай 3 гэтага артыкула тэрмін разгляду касацыйнай скаргі з улікам складанасці справы можа быць працягнуты на адзін месяц старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшынёй Апеляцыйнага эканамічнага суда.

**Артыкул 597. Вызначэнне аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі**

У вызначэнні аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі павінна быць указана:

1) дата і месца вынясення вызначэння;

2) прозвішча і ініцыялы старшыні абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшыні Апеляцыйнага эканамічнага суда, якія вынеслі вызначэнне;

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы – падаўца касацыйнай скаргі;

4) указанне на судовыя пастановы, што абскарджваюцца;

5) сціслы выклад матываў, па якіх адмоўлена ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі.

### Артыкул 598. Вызначэнне аб перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі

1. У вызначэнні аб перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі павінна быць указана:

1) дата і месца вынясення вызначэння;

2) прозвішча і ініцыялы старшыні абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшыні Апеляцыйнага эканамічнага суда, якія вынеслі вызначэнне;

3) найменне суда касацыйнай інстанцыі, у які перадаецца справа для разгляду па сутнасці;

4) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы – падаўца касацыйнай скаргі;

5) указанне на судовыя пастановы, што абскарджваюцца;

6) выклад сутнасці справы, па якой прыняты судовыя пастановы.

2. Пры гэтым асобам – удзельнікам у справе накіроўваюцца копіі вызначэння аб перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі і копіі касацыйнай скаргі.

### Артыкул 599. Прынясенне касацыйнага пратэсту

1. На судовыя пастановы раённых (гарадскіх) судоў, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), а таксама на вызначэнні абласных (Мінскага гарадскога) судоў, Апеляцыйнага эканамічнага суда, што вынесены імі ў апеляцыйным парадку і ўступілі ў законную сілу, можа быць прынесены касацыйны пратэст у суд касацыйнай інстанцыі ў парадку, устаноўленым гэтым Кодэксам, Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікамі, старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшынёй Апеляцыйнага эканамічнага суда, Генеральным пракурорам, яго намеснікамі, пракурорамі абласцей, горада Мінска.

2. Копіі касацыйнага пратэсту накіроўваюцца судом касацыйнай інстанцыі асобам, якія ўдзельнічаюць у справе.

### Артыкул 600. Касацыйны пратэст Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікаў, старшыні абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшыні Апеляцыйнага эканамічнага суда

Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікі, старшыня абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшыня Апеляцыйнага эканамічнага суда па сваёй ініцыятыве маюць права прынесці касацыйны пратэст у суд касацыйнай інстанцыі з мэтай забеспячэння законнасці судовых пастаноў, а таксама аднназначнага тлумачэння і аднастайнага прымянення нормаў права.

### Артыкул 601. Касацыйны пратэст пракурора

1. Генеральны пракурор і яго намеснікі, пракуроры абласцей, горада Мінска прыносяць касацыйны пратэст непасрэдна ў адпаведны суд касацыйнай інстанцыі.

Указаныя службовыя асобы, а таксама раённыя (гарадскія) і міжраённыя пракуроры маюць права выпатрабаваць з адпаведных судоў грамадзянскія справы для рашэння пытання аб наяўнасці падстаў для прынясення касацыйнага пратэсту. Калі пракурор, які выпатрабаваў справу, не мае права прынясення касацыйнага пратэсту на судовую пастанову, што ўступіла ў законную сілу, ён у неабходных выпадках уносіць прадстаўленне аб прынясенні касацыйнага пратэсту пракурору больш высокага ўзроўню, які мае права прынясення касацыйнага пратэсту.

2. Асобы – удзельнікі ў справе, а таксама іншыя асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны вынесенымі судовымі пастановамі, маюць права звярнуцца з заявай аб прынясенні касацыйнага пратэсту на судовыя пастановы да службовых асоб пракуратуры, указаных у частцы 1 гэтага артыкула. Заява аб прынясенні касацыйнага пратэсту па тэрміне, парадку яе падачы, форме і змесце павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым часткай 3 артыкула 593, часткамі 1–4 артыкула 594 гэтага Кодэкса. Генеральнаму пракурору і яго намеснікам заява аб прынясенні касацыйнага пратэсту можа быць пададзена ў выпадку пакідання яе без задавальнення пракурорамі абласцей, горада Мінска.

3. Рашэнне аб прынясенні ці аб адмове ў прынясенні касацыйнага пратэсту прымаецца пракурорам на працягу аднаго месяца пасля паступлення заявы аб прынясенні касацыйнага пратэсту, а ў выпадку выпатрабавання справы – у той жа тэрмін пасля паступлення справы.

4. Заява аб прынясенні касацыйнага пратэсту падлягае вяртанню на падставах, прадугледжаных пунктамі 2 і 5–8 часткі 1 артыкула 595 гэтага Кодэкса, у выпадку парушэння патрабавання часткі 2 гэтага артыкула, а таксама калі судовая пастанова не была абскарджана ў апеляцыйным парадку, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам. Калі заява аб прынясенні касацыйнага пратэсту пададзена на судовую пастанову, што не была абскарджана ў апеляцыйным парадку, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам, такая заява прымаецца да разгляду, калі пракурор, упаўнаважаны на прынясенне пратэсту, прызнае прычыны, па якіх не падавалася апеляцыйная скарга, уважлівымі.

5. Не дапускаецца падача паўторнай заявы аб прынясенні касацыйнага пратэсту асобай, якой Генеральным пракурорам ці яго намеснікамі паведамлена аб адсутнасці падстаў для прынясення касацыйнага пратэсту. У такім выпадку заява аб прынясенні касацыйнага пратэсту не падлягае разгляду і вяртаецца заяўніку.

6. Касацыйны пратэст, прынесены па выніках разгляду заявы, пададзенай пракурору з парушэннем тэрміну, устаноўленага часткай 3 артыкула 593 гэтага Кодэкса, падлягае вяртанню.

**Артыкул 602. Водзыў на касацыйную скаргу і (або) касацыйны пратэст, прадстаўленне**

1. Асоба, якая ўдзельнічае ў справе, можа прадставіць водзыў на касацыйную скаргу і (або) касацыйны пратэст, прадстаўленне. У такім выпадку водзыў накіроўваецца ўказанай асобай іншым асобам – удзельнікам у справе з дададзеннем дакументаў, што пацвярджаюць пярэчанні супраць касацыйнай скаргі і (або) касацыйнага пратэсту, прадстаўлення, якія ў іх адсутнічаюць, а таксама суду касацыйнай інстанцыі – з дада765нем копій дакументаў, накіраваных іншым асобам – удзельнікам у справе, і дакументаў, што пацвярджаюць накіраванне ім водзыву на касацыйную скаргу і (або) касацыйны пратэст, прадстаўленне.

2. Водзыў на касацыйную скаргу і (або) касацыйны пратэст, прадстаўленне накіроўваецца ў тэрмін, што забяспечвае яго паступленне ў суд касацыйнай інстанцыі да дня разгляду справы.

3. Водзыў на касацыйную скаргу і (або) касацыйны пратэст, прадстаўленне, дзе маюцца звесткі, што з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі, асобам – удзельнікам у справе не накіроўваецца. Азнаямленне з такімі скаргай, пратэстам, прадстаўленнем

ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам і заканадаўствам аб дзяржаўных сакрэтах.

**Артыкул 603. Прыпыненне выканання судовай пастановы**

Па хадайніцтве асоб – удзельнікаў у справе, а таксама іншых асоб, чые правы і законныя інтарэсы парушаны вынесенай судовай пастановай, пракурора ці па ўласнай ініцыятыве старшынёй абласнога (Мінскага гарадскога) суда, старшынёй Апеляцыйнага эканамічнага суда, якія разглядаюць касацыйную скаргу, або судом касацыйнай інстанцыі, што разглядае справу, выкананне абскарджаных ці апратэставаных судовых пастаноў можа быць прыпынена.

**Артыкул 604. Спыненне касацыйнага вядзення**

Касацыйнае вядзенне спыняецца, калі пры разглядзе справы судом касацыйнай інстанцыі ўзніклі ці ўстаноўлены абставіны, указаныя ў пунктах 2, 3, 5, 6 і 8 часткі 1 артыкула 595 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку адклікання касацыйнага пратэсту.

**§ 3. Разгляд справы судом касацыйнай інстанцыі**

**Артыкул 605. Парадак і тэрміны разгляду справы судом касацыйнай інстанцыі**

1. Суд касацыйнай інстанцыі разглядае справу ў судовым пасяджэнні па касацыйнай скарзе не пазней чым у месячны тэрмін пасля вынясення вызначэння аб перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі, а па касацыйным пратэсце – у двухмесячны тэрмін пасля паступлення справы ў суд касацыйнай інстанцыі.

2. Пры разглядзе справы судом касацыйнай інстанцыі прымяняюцца правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам для вядзення па справах у судзе першай інстанцыі, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, і сутнасці касацыйнага вядзення.

3. Аб часе і месцы пасяджэння суда касацыйнай інстанцыі апавяшчаюцца асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, аднак іх няяўка ў судовае пасяджэнне не перашкаджае разгляду справы. У неабходных выпадках яўка асоб – удзельнікаў у справе ў судовае пасяджэнне суда касацыйнай інстанцыі можа быць прызнана абавязковай.

4. У пасяджэнні суда касацыйнай інстанцыі справа коратка дакладаецца асобай, якая старшынюе, або адным з суддзяў.

5. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, іх прадстаўнікі даюць тлумачэнні пасля дакладу справы. Калі ў разглядзе справы прымае ўдзел пракурор, ён выказвае сваё меркаванне па справе.

6. Пры разглядзе справы ў касацыйным парадку ўсе пытанні вырашаюцца большасцю галасоў. У выпадку роўнай колькасці галасоў, пададзеных за ці супраць перагляду справы, касацыйная скарга і (або) касацыйны пратэст лічацца пакінутымі без задавальнення.

7. Службовая асоба, якая прынесла касацыйны пратэст, мае права адклікаць яго да пачатку разгляду справы судом касацыйнай інстанцыі.

**Артыкул 606. Падставы для адмены або змянення судовых пастаноў у касацыйным парадку**

Падставамі для адмены або змянення судовых пастаноў у касацыйным парадку з’яўляюцца істотныя парушэнні нормаў матэрыяльнага і (або) працэсуальнага права, прадугледжаныя часткамі 2–4 артыкула 579 гэтага Кодэкса. Правільная па сутнасці судовая пастанова не можа быць адменена па адных толькі фармальных падставах.

### Артыкул 607. Прадмет і межы разгляду справы ў касацыйным парадку

1. Пры разглядзе справы ў касацыйным парадку суд у межах довадаў касацыйнай скаргі і (або) касацыйнага пратэсту, прадстаўлення і ў абскарджанай або апратэставанай частцы правярае законнасць судовай пастановы, устанаўліваючы правільнасць прымянення і тлумачэння судамі першай і апеляцыйнай інстанцый нормаў матэрыяльнага і працэсуальнага права.

2. Пры разглядзе справы ў касацыйным парадку прадстаўленне і даследаванне новых доказаў не дапускаюцца.

3. Суд касацыйнай інстанцыі ў інтарэсах законнасці мае права выйсці за межы касацыйнай скаргі і (або) касацыйнага пратэсту, прадстаўлення і праверыць законнасць судовай пастановы ў поўным аб’ёме. Незалежна ад довадаў, выкладзеных у касацыйнай скарзе і (або) касацыйным пратэсце, прадстаўленні, суд касацыйнай інстанцыі правярае, ці не дапушчаны судамі першай і апеляцыйнай інстанцый парушэнні нормаў працэсуальнага права, што з’яўляюцца ў любым выпадку падставай для адмены судовай пастановы.

### Артыкул 608. Паўнамоцтвы суда касацыйнай інстанцыі

1. Суд касацыйнай інстанцыі па выніках разгляду справы ў касацыйным парадку мае права:

1) пакінуць судовыя пастановы судоў першай і апеляцыйнай інстанцый без змянення, касацыйную скаргу і (або) касацыйны пратэст, прадстаўленне – без задавальнення;

2) адмяніць судовыя пастановы судоў першай і апеляцыйнай інстанцый поўнасцю або ў частцы і накіраваць справу на новы разгляд у адпаведны суд;

3) адмяніць судовыя пастановы судоў першай і апеляцыйнай інстанцый поўнасцю або ў частцы і пакінуць заяву без разгляду ці спыніць вядзенне справы;

4) пакінуць у сіле адну з вынесеных па справе судовых пастаноў, адмяніўшы астатнія;

5) адмяніць ці змяніць пастановы судоў першай і апеляцыйнай інстанцый і вынесці новую судовую пастанову, не перадаючы справу на новы разгляд, калі дапушчана памылка ў тлумачэнні і (або) прымяненні нормаў матэрыяльнага права.

2. У выпадку калі справа вырашана судом па сутнасці правільна, але дапушчана няправільнае тлумачэнне і прымяненне нормаў права, суд касацыйнай інстанцыі ўказвае матывы, а таксама нормы матэрыяльнага і працэсуальнага права, у адпаведнасці з якімі судовыя пастановы пакідаюцца без змянення.

### Артыкул 609. Судовая пастанова суда касацыйнай інстанцыі

1. Па выніках разгляду справы ў касацыйным парадку прэзідыум абласнога (Мінскага гарадскога) суда, прэзідыум Апеляцыйнага эканамічнага суда выносяць пастанову, дзе павінны быць указаны:

1) найменне і склад суда, што вынес пастанову;

2) дата і месца вынясення пастановы;

3) справа, па якой вынесена пастанова;

4) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы – падаўца касацыйнай скаргі, службовая асоба, якая прынесла пратэст, прадстаўленне аб пераглядзе справы ў касацыйным парадку;

5) змест абскарджваных судовых пастаноў;

6) вывады суда па выніках разгляду касацыйнай скаргі і (або) касацыйнага пратэсту, прадстаўлення;

7) матывы, па якіх суд прыйшоў да сваіх вывадаў, і спасылка на акты заканадаўства, якімі суд кіраваўся.

2. Пры пакіданні касацыйнай скаргі і (або) касацыйнага пратэсту, прадстаўлення без задавальнення суд абавязаны ўказаць матывы, па якіх змешчаныя ў іх довады не прызнаны падставай для адмены ці змянення судовых пастаноў.

3. Пастанова прэзідыума абласнога (Мінскага гарадскога) суда, прэзідыума Апеляцыйнага эканамічнага суда падпісваецца асобай, якая старшынюе ў судовым пасяджэнні.

4. Судовая пастанова суда касацыйнай інстанцыі ўступае ў законную сілу з моманту яе вынясення.

**Артыкул 610. Абавязковасць указанняў суда касацыйнай інстанцыі**

1. Указанні суда касацыйнай інстанцыі, выкладзеныя ў пастанове аб адмене судовых пастаноў судоў першай і апеляцыйнай інстанцый, у тым ліку аб тлумачэнні нормаў права, абавязковыя для суда, які нанава разглядае справу.

2. Суд касацыйнай інстанцыі не мае права прадрашаць пытанні пэўнасці або няпэўнасці таго або іншага доказу, перавагі адных доказаў перад іншымі, а таксама ўказваць, якая судовая пастанова павінна быць прынята пры новым разглядзе справы.

**Артыкул 611. Недапушчальнасць падачы паўторнай касацыйнай скаргі**

Не дапускаецца падача паўторнай касацыйнай скаргі, калі асобе – падаўцу касацыйнай скаргі раней было адмоўлена ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі. У такім выпадку паўторная касацыйная скарга не падлягае разгляду і вяртаецца заяўніку.

## ГЛАВА 57
## ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ ЎСТУПІЎШЫХ У ЗАКОННУЮ СІЛУ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ У ВЯРХОЎНЫМ СУДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (НАГЛЯДНАЕ ВЯДЗЕННЕ)

### § 1. Агульныя палажэнні

**Артыкул 612. Абскарджанне судовых пастаноў у парадку нагляду**

1. Судовыя пастановы судоў першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных пунктам 3 часткі 2 артыкула 613 і часткай 4 артыкула 628 гэтага Кодэкса, – і суда наглядной інстанцыі, што ўступілі ў законную сілу, могуць быць абскарджаны ў парадку нагляду, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткай 2 гэтага артыкула.

2. Не падлягаюць абскарджанню ў парадку нагляду судовыя пастановы:

1) якія не былі абскарджаны ў апеляцыйным і касацыйным парадку, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам, за выключэннем выпадкаў, калі прычыны, па якіх не падаваліся апеляцыйная і касацыйная скаргі, прызнаны Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікамі ўважлівымі;

2) якія ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам не падлягаюць абскарджанню ў касацыйным парадку;

3) па справах, скончаных прызнаннем іску.

3. Вызначэнні суда першай інстанцыі не падлягаюць абскарджанню ў парадку нагляду, за выключэннем вызначэнняў, указаных у частцы 3 артыкула 591 гэтага Кодэкса.

4. Абмежаванні, устаноўленыя часткамі 2 і 3 гэтага артыкула, не падлягаюць прымяненню, калі судовая пастанова перашкаджае прыняццю законнай і абгрунтаванай судовай пастановы па іншай справе.

**Артыкул 613. Суд наглядная інстанцыі**

1. Судом наглядная інстанцыі з’яўляецца Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

2. Наглядныя скаргі, прадстаўленні, пратэсты ў парадку нагляду падаюцца ў:

1) судовую калегію па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – на судовыя пастановы раённых (гарадскіх) судоў, якія былі прадметам разгляду ў судах апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, а таксама на судовыя пастановы абласных (Мінскага гарадскога) судоў, вынесеныя імі ў апеляцыйным і касацыйным парадку ці па першай інстанцыі, калі яны не былі прадметам апеляцыйнага разгляду ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь;

2) судовую калегію па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – на судовыя пастановы эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), якія былі прадметам разгляду ў судах апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, а таксама на судовыя пастановы Апеляцыйнага эканамічнага суда, вынесеныя ім у апеляцыйным і касацыйным парадку ці па першай інстанцыі, калі яны не былі прадметам апеляцыйнага разгляду ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь;

3) Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – на судовыя пастановы раённых (гарадскіх) судоў, эканамічных судоў абласцей (горада Мінска), якія былі прадметам разгляду ў судах апеляцыйнай, касацыйнай і наглядная інстанцый; на судовыя пастановы абласных (Мінскага гарадскога) судоў, Апеляцыйнага эканамічнага суда, якія вынесены па першай інстанцыі і былі прадметам апеляцыйнага разгляду ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь; на судовыя пастановы Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесеныя па першай інстанцыі, а таксама ў апеляцыйным парадку і ў парадку нагляду.

**Артыкул 614. Права на зварот з нагляднай скаргай**

1. Права на зварот з нагляднай скаргай маюць асобы – удзельнікі ў справе, а таксама іншыя асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны вынесенай судовай пастановай.

2. Наглядная скарга прымаецца да разгляду, калі судовыя пастановы па справе былі прадметам разгляду ў судах апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый ці калі заяўніку было адмоўлена ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі.

**Артыкул 615. Прадстаўленне суддзі ў суд нагляднай інстанцыі**

Суддзя мае права ўнесці прадстаўленне аб пераглядзе судовых пастаноў, што ўступілі ў законную сілу, у парадку нагляду, калі яны перашкаджаюць вынясенню законнага і абгрунтаванага рашэння па іншай справе, якая знаходзіцца ў яго вядзенні. Прадстаўленне суддзі разглядаецца ў парадку, устаноўленым для разгляду наглядных скаргаў.

**Артыкул 616. Парадак і тэрмін падачы нагляднай скаргі**

1. Наглядная скарга падаецца ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

2. Судовыя пастановы, указаныя ў частцы 1 артыкула 612 гэтага Кодэкса, могуць быць абскарджаны ў парадку нагляду на працягу аднаго года з дня ўступлення іх у законную сілу. Калі судовыя пастановы судоў апеляцыйнай і (або) касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных пунктам 3 часткі 2 артыкула 613 і часткай 4 артыкула 628 гэтага Кодэкса, – і суда нагляднай інстанцыі не адмяняюць (не змяняюць) судовую пастанову, якой справа вырашана па сутнасці, тэрмін падачы нагляднай скаргі вылічваецца з дня ўступлення ў законную сілу гэтай судовай пастановы. Наглядныя скаргі, пададзеныя пасля сканчэння ўказанага тэрміну, не прымаюцца да разгляду і вяртаюцца, за выключэннем скаргаў адказчыкаў на судовыя пастановы, вынесеныя ў іх адсутнасць без своечасовага і належнага паведамлення аб часе і месцы разгляду справы, пры ўмове, што справа не знішчана ў сувязі са сканчэннем тэрміну яе захоўвання, устаноўленага

заканадаўствам. У выпадку калі ў выніку аднаўлення тэрміну на падачу касацыйнай скаргі тэрмін абскарджання судовай пастановы ў парадку нагляду скончыўся або складае менш за тры месяцы, такі тэрмін павялічваецца да трох месяцаў.

3. Пасля разгляду справы судом нагляднай інстанцыі падача нагляднай скаргі ў тую ж наглядную інстанцыю не дапускаецца.

**Артыкул 617. Форма і змест нагляднай скаргі**

1. Наглядная скарга падаецца ў пісьмовай форме ці ў выглядзе электроннага дакумента і, апрача звестак, прадугледжаных артыкулам 100 гэтага Кодэкса, павінна змяшчаць:

1) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы – падаўца нагляднай скаргі, яе месца жыхарства ці месца знаходжання, працэсуальнае становішча ў справе;

2) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне іншых асоб – удзельнікаў у справе, іх месца жыхарства ці месца знаходжання;

3) указанне на суды, што разглядалі справу ў якасці суда першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцыі, змест вынесеных імі судовых пастаноў;

4) указанне на судовыя пастановы, што абскарджваюцца;

5) указанне на дапушчаныя судамі першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных пунктам 3 часткі 2 артыкула 613 і часткай 4 артыкула 628 гэтага Кодэкса, – і судом нагляднай інстанцыі парушэнні, што з'яўляюцца падставай для адмены або змянення судовых пастаноў у парадку нагляду, прадугледжаныя артыкулам 625 гэтага Кодэкса;

6) просьбу падаўца скаргі ў дачыненні да абскарджванай судовай пастановы.

2. У нагляднай скарзе асобы, якая не прымала ўдзелу ў справе, павінна быць указана, якія правы або законныя інтарэсы гэтай асобы парушаны судовай пастановай, што ўступіла ў законную сілу.

3. Наглядная скарга павінна быць падпісана асобай – падаўцом скаргі ці яе прадстаўніком.

4. Да нагляднай скаргі дадаюцца дакументы, якія пацвярджаюць:

1) аплату дзяржаўнай пошліны, за выключэннем выпадку, калі дзяржаўная пошліна аплачана пры дапамозе выкарыстання сістэмы АРІП і ўліковы нумар аперацыі (транзакцыі) у адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы ўказаны ў скарзе або паведамлены суду іншым спосабам пры падачы скаргі;

2) паўнамоцтвы прадстаўніка на падпісанне і падачу скаргі;

3) завераныя адпаведным судом копіі абскарджваных судовых пастаноў.

5. Наглядная скарга ў пісьмовай форме падаецца ў суд з копіямі ў колькасці экземпляраў па ліку асоб – удзельнікаў у справе.

**Артыкул 618. Вяртанне нагляднай скаргі**

1. Пытанне аб прыняцці нагляднай скаргі да разгляду вырашаецца ў дзесяцідзённы тэрмін пасля яе паступлення.

2. Наглядная скарга не падлягае разгляду і вяртаецца заяўніку, калі:

1) наглядная скарга і дададзеныя да яе дакументы не адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 617 гэтага Кодэкса;

2) наглядная скарга пададзена асобай, якая не мае права на зварот у суд нагляднай інстанцыі;

3) наглядная скарга пададзена на судовую пастанову, якая ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам не можа быць абскарджана ў парадку нагляду;

4) прапушчаны тэрмін абскарджання судовай пастановы ў парадку нагляду;

5) абскарджваная судовая пастанова не была абскарджана ў апеляцыйным і касацыйным парадку ў выпадках, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам, і прычыны, па якіх не падаваліся апеляцыйная і касацыйная скаргі, не прызнаны Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікамі ўважлівымі;

6) паступіла заява аб адмове ад нагляднай скаргі;

7) маецца судовая пастанова той жа нагляднай інстанцыі па той жа справе;

8) наглядная скарга пакінута без задавальнення ў парадку, устаноўленым часткай 3 артыкула 620 гэтага Кодэкса.

3. У выпадку ліквідавання недахопаў, указаных у пункце 1 часткі 2 гэтага артыкула, што паслужылі падставай для вяртання нагляднай скаргі, яна можа быць пададзена на агульных падставах.

## § 2. Узбуджэнне вядзення ў парадку нагляду

### Артыкул 619. Разгляд нагляднай скаргі суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь

1. Суддзя Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь разглядае наглядную скаргу па дадзеных да яе матэрыялаў ці па матэрыялах выпатрабаванай справы, калі яна выпатрабавалася.

2. Па выніках разгляду нагляднай скаргі выносіцца адно з наступных вызначэнняў:

1) аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі, калі адсутнічаюць падставы для адмены або змянення судовых пастаноў у парадку нагляду, прадугледжаныя артыкулам 625 гэтага Кодэкса;

2) аб перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі.

3. Калі пры разглядзе нагляднай скаргі ўстаноўлена, што меліся падставы для перагляду судовай пастановы ў касацыйным парадку, але ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі было адмоўлена, суддзя мае права адмяніць вызначэнне аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда касацыйнай інстанцыі і перадаць справу на разгляд такога суда.

4. Наглядная скарга на судовыя пастановы разглядаецца ў тэрмін не пазней за два месяцы пасля яе паступлення, а ў выпадку выпатрабавання справы – у той жа тэрмін пасля паступлення справы.

5. Устаноўлены часткай 4 гэтага артыкула тэрмін разгляду нагляднай скаргі з улікам складанасці справы можа быць працягнуты Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ці яго намеснікам, але не больш чым на два месяцы.

### Артыкул 620. Вызначэнне аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі

1. У вызначэнні суддзі аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі павінна быць указана:

1) дата і месца вынясення вызначэння;

2) прозвішча і ініцыялы суддзі, які вынес вызначэнне;

3) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы – падаўца нагляднай скаргі;

4) указанне на судовыя пастановы, што абскарджваюцца;

5) сціслы выклад матываў, па якіх адмоўлена ў перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі.

2. Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікі па нагляднай скарзе заяўніка маюць права адмяніць вызначэнне аб адмове ў перадачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі і перадаць справу на разгляд такога суда.

3. У выпадку пакідання Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікамі без задавальнення наглядной скаргі асобы, якой вызначэннем суддзі адмоўлена ў перадачы справы на разгляд суда наглядной інстанцыі, падача паўторнай наглядной скаргі той жа асобай не дапускаецца.

**Артыкул 621. Вызначэнне суддзі аб перадачы справы на разгляд суда наглядной інстанцыі**

У вызначэнні суддзі аб перадачы справы на разгляд суда наглядной інстанцыі ўказваюцца:

1) дата і месца вынясення вызначэння;

2) прозвішча і ініцыялы суддзі, які вынес вызначэнне;

3) найменне суда наглядной інстанцыі, у які перадаецца справа для разгляду;

4) прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі яно ёсць) або найменне асобы – падаўца наглядной скаргі;

5) указанне на судовыя пастановы, што абскарджваюцца;

6) выклад сутнасці справы, па якой прыняты судовыя пастановы.

**Артыкул 622. Прынясенне пратэсту ў парадку нагляду**

1. Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Генеральны пракурор, іх намеснікі маюць права прынесці пратэст у парадку нагляду на судовыя пастановы любога суда Рэспублікі Беларусь, за выключэннем пастаноў Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

2. Генеральны пракурор, яго намеснікі прыносяць пратэст у парадку нагляду непасрэдна ў адпаведны суд наглядной інстанцыі. Указаныя службовыя асобы, а таксама пракуроры абласцей, горада Мінска, раённыя (гарадскія) і міжраённыя пракуроры маюць права выпатрабаваць з адпаведных судоў грамадзянскія справы для рашэння пытання аб наяўнасці падстаў для прынясення пратэсту ў парадку нагляду. Калі пракурор, які выпатрабаваў справу, не мае права прынясення пратэсту ў парадку нагляду на судовую пастанову, якая ўступіла ў законную сілу, ён у неабходных выпадках уносіць прадстаўленне аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду Генеральнаму пракурору, яго намеснікам. Генеральнаму пракурору, яго намеснікам заява аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду можа быць пададзена, калі справа разглядалася судамі апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый або ў выпадку пакідання пракурорамі абласцей, горада Мінска заявы аб прынясенні касацыйнага пратэсту без задавальнення.

3. Асобы – удзельнікі ў справе, а таксама іншыя асобы, чые правы і законныя інтарэсы парушаны вынесенымі судовымі пастановамі, маюць права звярнуцца з заявай аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду на судовыя пастановы да Генеральнага пракурора, яго намеснікаў у тэрмін, устаноўлены часткай 2 артыкула 616 гэтага Кодэкса. Заява аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду па форме і змесце павінна адпавядаць патрабаванням, устаноўленым часткамі 1–4 артыкула 617 гэтага Кодэкса.

4. Рашэнне аб прынясенні ці аб адмове ў прынясенні пратэсту ў парадку нагляду прымаецца Генеральным пракурорам, яго намеснікамі на працягу аднаго месяца пасля паступлення заявы аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду, а ў выпадку выпатрабавання справы – у той жа тэрмін пасля паступлення справы. З улікам складанасці справы ўказаны тэрмін можа быць працягнуты Генеральным пракурорам ці яго намеснікам, але не больш чым на два месяцы.

5. Заява аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду падлягае вяртанню на падставах, прадугледжаных пунктамі 2–4 і 6 часткі 2 артыкула 618 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку парушэння патрабаванняў частак 2 і 3 гэтага артыкула. Заява аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду прымаецца да разгляду пракурорам, упаўнаважаным на прынясенне пратэсту, калі прычыны, па якіх судовая пастанова не абскарджвалася

ў апеляцыйным парадку і не з’яўлялася прадметам разгляду ў судзе касацыйнай інстанцыі, калі такі парадак устаноўлены гэтым Кодэксам, або заява аб прынясенні касацыйнага пратэсту пракурору вобласці, горада Мінска не падавалася, будуць прызнаны ўважлівымі.

6. Не дапускаецца падача паўторнай заявы аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду асобай, якой Генеральным пракурорам, яго намеснікамі паведамлена аб адсутнасці падстаў для прынясення пратэсту ў парадку нагляду. У такім выпадку заява аб прынясенні пратэсту ў парадку нагляду не падлягае разгляду і вяртаецца заяўніку.

7. Пратэст Генеральнага пракурора, яго намеснікаў у парадку нагляду, прынесены па выніках разгляду заявы, пададзенай указанай службовай асобай з парушэннем тэрміну, устаноўленага часткай 2 артыкула 616 гэтага Кодэкса, падлягае вяртанню.

**Артыкул 623. Прыпыненне выканання судовай пастановы**

Выкананне вынесеных па справе судовых пастаноў можа быць прыпынена Старшынёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, яго намеснікамі, суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, якія разглядаюць наглядную скаргу, Генеральным пракурорам, яго намеснікамі.

## § 3. Разгляд справы судом нагляднай інстанцыі

**Артыкул 624. Парадак і тэрміны разгляду справы судом нагляднай інстанцыі**

1. Пры разглядзе справы ў судзе нагляднай інстанцыі прымяняюцца правілы, устаноўленыя гэтым Кодэксам для вядзення па справах у судзе першай інстанцыі, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, і сутнасці нагляднага вядзення.

2. Суд нагляднай інстанцыі прымае справу да свайго разгляду на падставе вызначэння суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, указанага ў артыкуле 621 гэтага Кодэкса, пратэсту службовай асобы, указанай у артыкуле 622 гэтага Кодэкса.

3. Асобам – удзельнікам у справе суд нагляднай інстанцыі накіроўвае копіі нагляднай скаргі (пратэсту), прадстаўлення, вызначэння аб передачы справы на разгляд суда нагляднай інстанцыі. Указаныя дакументы накіроўваюцца асобам – удзельнікам у справе з такім разлікам, каб яны мелі магчымасць прадставіць у суд водзыў на наглядную скаргу (пратэст), прадстаўленне з даданнем дакументаў, што пацвярджаюць пярэчанні супраць нагляднай скаргі (пратэсту), прадстаўлення, да пачатку разгляду справы.

4. Аб часе і месцы разгляду справы асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, апавяшчаюцца ў неабходных выпадках або па іх просьбе. Няяўка ўказаных асоб у судовае пасяджэнне, калі яны былі своечасовае і належным чынам апавешчаны аб часе і месцы разгляду справы, не з’яўляецца перашкодай для разгляду справы. У выпадках калі судовыя пастановы судоў першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый у адпаведнасці з патрабаваннямі гэтага Кодэкса былі вынесены без правядзення судовага пасяджэння, асобы – удзельнікі ў справе выклікаюцца ў судовае пасяджэнне, толькі калі суд нагляднай інстанцыі прызнае гэта неабходным.

5. У пасяджэнні суда нагляднай інстанцыі справа дакладаецца суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь. Асобы, якія ўдзельнічаюць у справе, даюць тлумачэнні пасля дакладу справы. Калі ў разглядзе справы ў парадку нагляду прымае ўдзел пракурор, ён выказвае сваё меркаванне па справе.

6. Справа ў парадку нагляду разглядаецца судом нагляднай інстанцыі ў судовым пасяджэнні не пазней як два месяцы пасля паступлення справы з вызначэннем суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, указаным у артыкуле 621 гэтага Кодэкса, пратэстам службовай асобы, указанай у артыкуле 622 гэтага Кодэкса.

7. Пры разглядзе справы ў парадку нагляду ўсе пытанні вырашаюцца большасцю галасоў суддзяў суда нагляднай інстанцыі. Пры разглядзе справы Прэзідыумам Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь у выпадку роўнасці галасоў, пададзеных за перагляд справы ці

супраць яе перагляду, судовая пастанова пакідаецца без змянення, а наглядная скарга (пратэст), прадстаўленне – без задавальнення.

8. Службовая асоба, якая прынесла пратэст у парадку нагляду, мае права адклікаць яго да пачатку разгляду справы судом наглядной інстанцыі.

9. Вядзенне справы ў парадку нагляду спыняецца, калі пры разглядзе справы судом наглядной інстанцыі ўзніклі або ўстаноўлены абставіны, указаныя ў пунктах 2–4 і 6 часткі 2 артыкула 618 гэтага Кодэкса, а таксама ў выпадку адклікання пратэсту ў парадку нагляду.

**Артыкул 625. Падставы для адмены або змянення судовых пастаноў у парадку нагляду**

Судовыя пастановы падлягаюць адмене або змяненню ў парадку нагляду на падставах, прадугледжаных артыкулам 606 гэтага Кодэкса, калі пры гэтым парушаны:

1) дзяржаўныя і (або) грамадскія інтарэсы (у тым ліку правы, свабоды і законныя інтарэсы нявызначанага кола асоб);

2) аднастайнае прымяненне судамі нормаў права.

**Артыкул 626. Прадмет і межы разгляду справы ў парадку нагляду**

1. Пры разглядзе справы ў парадку нагляду суд наглядной інстанцыі правярае, ці маюцца падставы для адмены або змянення судовых пастаноў судоў першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных пунктам 3 часткі 2 артыкула 613 і часткай 4 артыкула 628 гэтага Кодэкса, – і суда наглядной інстанцыі, прадугледжаныя артыкулам 625 гэтага Кодэкса, на падставе наяўных у справе матэрыялаў, а таксама ў межах довадаў наглядной скаргі (пратэсту), прадстаўлення.

2. Суд наглядной інстанцыі ў інтарэсах законнасці мае права выйсці за межы наглядной скаргі (пратэсту), прадстаўленні і праверыць законнасць судовай пастановы ў поўным аб’ёме.

**Артыкул 627. Паўнамоцтвы суда наглядной інстанцыі**

Суд наглядной інстанцыі па выніках разгляду справы ў парадку нагляду мае права:

1) пакінуць судовую пастанову суда першай, апеляцыйнай, касацыйнай ці наглядной інстанцыі без змянення, а наглядную скаргу (пратэст), прадстаўленне – без задавальнення;

2) адмяніць судовую пастанову суда першай, апеляцыйнай, касацыйнай або наглядной інстанцыі поўнасцю ці ў частцы і накіраваць справу на новы разгляд у адпаведны суд;

3) адмяніць судовую пастанову суда першай, апеляцыйнай, касацыйнай або наглядной інстанцыі поўнасцю ці ў частцы і пакінуць заяву без разгляду або спыніць вядзенне справы;

4) пакінуць у сіле адну з вынесеных па справе судовых пастаноў;

5) адмяніць ці змяніць пастанову суда першай, апеляцыйнай, касацыйнай або наглядной інстанцыі і вынесці новую судовую пастанову, не перадаючы справу на новы разгляд, калі дапушчана памылка ў тлумачэнні і прымяненні нормаў матэрыяльнага права.

**Артыкул 628. Судовая пастанова суда наглядной інстанцыі**

1. Па выніках разгляду справы ў парадку нагляду Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь выносіць пастанову, а судовая калегія па грамадзянскіх справах, судовая калегія па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – вызначэнне, змест якіх вызначаецца правіламі, устаноўленымі артыкулам 609 гэтага Кодэкса.

2. Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь падпісваецца асобай, якая старшынюе, а вызначэнне судовай калегіі па грамадзянскіх справах, судовай калегіі

па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь – суддзямі, якія разглядалі справу ў парадку нагляду.

3. Судовая пастанова суда наглядней інстанцыі ўступае ў законную сілу з моманту яе вынясення.

4. Вызначэнні судовай калегіі па грамадзянскіх справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, судовай калегіі па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, вынесеныя па выніках разгляду справы ў парадку нагляду, могуць быць абскарджаны і (або) апратэставаны ў Прэзідыум Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь па правілах, устаноўленых гэтай главой.

5. Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь абскарджанню і (або) апратэставанню не падлягае.

**Артыкул 629. Абавязковасць указанняў суда наглядной інстанцыі**

1. Указанні суда наглядной інстанцыі, выкладзеныя ў судовай пастанове аб адмене судовых пастаноў судоў першай, апеляцыйнай і касацыйнай інстанцый, а ў выпадках, прадугледжаных пунктам 3 часткі 2 артыкула 613 і часткай 4 артыкула 628 гэтага Кодэкса, – і суда наглядной інстанцыі, у тым ліку аб тлумачэнні нормаў права, абавязковыя для суда, які нанава разглядае справу.

2. Суд наглядной інстанцыі не мае права прадрашаць пытанні пэўнасці або няпэўнасці таго ці іншага доказу, перавагі адных доказаў перад другімі, а таксама ўказваць, якая судовая пастанова павінна быць прынята пры новым разглядзе справы.

## ГЛАВА 58
## ВЯДЗЕННЕ ПА ПЕРАГЛЯДЗЕ СУДОВЫХ ПАСТАНОЎ ПА НАНАВА АДКРЫТЫХ АБСТАВІНАХ

**Артыкул 630. Падставы для перагляду судовых пастаноў па нанава адкрытых абставінах**

1. Рашэнні, вызначэнні і пастановы, што ўступілі ў законную сілу, могуць быць перагледжаны па нанава адкрытых абставінах.

2. Падставамі для перагляду судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах з'яўляюцца:

1) істотныя для справы абставіны, якія не былі і не маглі быць вядомыя заяўніку і суду;

2) устаноўленыя прыгаворам суда, што ўступіў у законную сілу, заведама лжывыя паказанні сведкі, заведама лжывыя заключэнне эксперта або вывад спецыяліста, заведама няправільны пераклад, падложнасць дакументаў або рэчавых доказаў, якія пацягнулі за сабой вынясенне незаконнай або неабгрунтаванай судовай пастановы;

3) устаноўленыя прыгаворам суда, што ўступіў у законную сілу, злачынныя дзеянні асоб, якія ўдзельнічаюць у справе, або іх прадстаўнікоў або злачынныя дзеянні суддзяў, што пацягнулі за сабой вынясенне незаконнай або неабгрунтаванай судовай пастановы;

4) адмена судовай пастановы, пастановы іншага дзяржаўнага органа, што паслужылі падставай для вынясення перагляданай судовай пастановы;

5) прызнанне судовай пастановай, што ўступіла ў законную сілу, несправядлівасці здзелкі, якая пацягнула за сабой прыняцце незаконнай або неабгрунтаванай судовай пастановы па справе;

6) прызнанне Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь нарматыўнага прававога акта, прымененага пры разглядзе справы, або яго асобных палажэнняў не адпаведнымі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (неканстытуцыйнымі), калі адпаведна заканадаўству аб канстытуцыйным судаводстве такое прызнанне выклікае перагляд судовых пастаноў.

### Артыкул 631. Суды, якія пераглядаюць судовыя пастановы па нанава адкрытых абставінах

Перагляд па нанава адкрытых абставінах рашэння суда першай інстанцыі ажыццяўляецца судом, што вынес гэта рашэнне, а вызначэнняў і пастаноў судоў апеляцыйнай, касацыйнай або нагляднай інстанцый, якімі зменена рашэнне суда першай інстанцыі ці вынесена новае рашэнне, – судом, што змяніў рашэнне ці вынес новае рашэнне.

### Артыкул 632. Парадак і тэрмін падачы заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах

1. Заява аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах можа быць пададзена асобамі – удзельнікамі ў справе, а прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах – службовай асобай, надзеленай правам прынясення касацыйнага пратэсту і пратэсту ў парадку нагляду, у суд, што прыняў указаную судовую пастанову.

2. Заява аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах падаецца на працягу трох месяцаў з дня ўстанаўлення гэтых абставін. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін можа быць адноўлены судом у выпадках і парадку, прадугледжаных артыкулам 119 гэтага Кодэкса.

3. Тэрмін для падачы заявы аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах вылічваецца:

1) у выпадку, прадугледжаным пунктам 1 часткі 2 артыкула 630 гэтага Кодэкса, – з дня, калі заяўніку сталі вядомыя нанава адкрытыя абставіны;

2) у выпадках, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 часткі 2 артыкула 630 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда;

3) у выпадку, прадугледжаным пунктам 4 часткі 2 артыкула 630 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў законную сілу рашэння, прыгавору, вызначэння, пастановы суда ці вынясення іншым дзяржаўным органам актаў, процілеглых па сваім змесце рашэнню, прыгавору, вызначэнню, пастанове, на якіх была заснавана пераглядаемая судовая пастанова;

4) у выпадку, прадугледжаным пунктам 5 часткі 2 артыкула 630 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў законную сілу судовай пастановы;

5) у выпадку, прадугледжаным пунктам 6 часткі 2 артыкула 630 гэтага Кодэкса, – з дня ўступлення ў сілу адпаведных заключэння, рашэння Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь.

4. Перагляд судовай пастановы ажыццяўляецца судом пры ўмове, што справа не знішчана ў сувязі са сканчэннем тэрміну яе захоўвання, устаноўленага заканадаўствам.

### Артыкул 633. Форма і змест заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах

1. Заява, прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах падаюцца ў суд у пісьмовай форме або ў выглядзе электроннага дакумента.

2. Заява, прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах павінны адпавядаць патрабаванням, устаноўленым артыкулам 100 гэтага Кодэкса, а таксама ў іх павінны быць указаны нанава адкрытыя абставіны, якія прадугледжаны артыкулам 630 гэтага Кодэкса і з'яўляюцца, па меркаванні заяўніка, падставай для пастаноўкі пытання аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах, са спасылкай на дакументы, што пацвярджаюць адкрыццё гэтых абставін.

3. Да заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах дадаюцца:

1) копія судовай пастановы, аб пераглядзе якой хадайнічае заяўнік;

2) копіі дакументаў, што пацвярджаюць нанава адкрытыя абставіны і момант іх адкрыцця;

3) копіі заявы, прадстаўлення ў колькасці экземпляраў па ліку асоб – удзельнікаў у справе.

4. У выпадку калі заява, прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах пададзены з парушэннем правіл, устаноўленых артыкулам 632 гэтага Кодэкса, ці не адпавядаюць патрабаванням, устаноўленым гэтым артыкулам, такія заява, прадстаўленне вяртаюцца асобе – падаўцу.

**Артыкул 634. Разгляд заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах**

1. Заява, прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах разглядаюцца ў судовым пасяджэнні ў месячны тэрмін пасля іх паступлення ў суд.

2. Заяўнік і іншыя асобы – удзельнікі ў справе апавяшчаюцца аб часе і месцы судовага пасяджэння. Няяўка ўказаных асоб не з’яўляецца перашкодай для разгляду заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах.

3. Заява, прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах разглядаюцца па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам для вядзення па справах у судзе першай інстанцыі, з улікам асаблівасцей, прадугледжаных гэтай главой, і сутнасці вядзення па пераглядзе судовых пастаноў па нанава адкрытых абставінах.

**Артыкул 635. Вызначэнне суда па заяве, прадстаўленні аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах**

1. Суд, разгледзеўшы заяву, прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах, мае права:

1) задаволіць заяву, прадстаўленне аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах і адмяніць судовую пастанову;

2) адмовіць у пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах.

2. Вызначэнне суда аб задавальненні заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах абскарджанню і (або) апратэставанню ў апеляцыйным парадку не падлягае.

**Артыкул 636. Разгляд справы пасля вынясення вызначэння аб задавальненні заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах**

Пасля вынясення вызначэння аб задавальненні заявы, прадстаўлення аб пераглядзе судовай пастановы па нанава адкрытых абставінах справа разглядаецца судом на агульных падставах.

# РАЗДЗЕЛ IX
# ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

## ГЛАВА 59
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 637. Прызнанне страты сілы заканадаўчымі актамі і асобнымі палажэннямі законаў

Прызнаць, што страцілі сілу:

1) Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 сакавіка 1999 г. № 9 «О вступлении в силу Гражданского процессуального кодекса Рэспублікі Беларусь»;

2) Гаспадарчы працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 15 снежня 1998 г.;

3) Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11 студзеня 1999 г.;

4) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 г. № 285-З «О внесении дополнений в некоторые законодательные акты Республики Беларусь»;

5) Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 1999 г. № 349-З «О внесении дополнения в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

6) Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 мая 2000 г. № 375-З «О внесении дополнений в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

7) артыкул 21 Закона Рэспублікі Беларусь ад 24 ліпеня 2002 г. № 134-З «О внесении изменений и дополнения в некоторые законодательные акты Республики Беларусь в связи с реорганизацией системы республиканских органов государственного управления»;

8) Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 лістапада 2002 г. № 153-З «О внесении дополнения в Хозяйственный процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

9) Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2002 г. № 171-З «О внесении изменений и дополнений в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

10) артыкулы 14 і 15 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 183-З «О внесении изменений в некоторые законодательные акты Республики Беларусь»;

11) Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2003 г. № 212-З «О внесении изменений в некоторые законодательные акты Республики Беларусь по вопросу государственной пошлины»;

12) Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 лістапада 2003 г. № 246-З «О внесении изменений и дополнения в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

13) Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 жніўня 2004 г. № 314-З «О внесении изменений и дополнений в Хозяйственный процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

14) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 37-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законодательные акты Республики Беларусь по вопросам возмещения расходов на содержание детей, находящихся на государственном обеспечении»;

15) артыкулы 8 і 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2005 г. № 76-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законодательные акты Республики Беларусь по вопросам нотариальной деятельности»;

16) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16 мая 2006 г. № 118-З «О внесении дополнений и изменения в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам возмещения расходов на содержание детей, находящихся на государственном обеспечении»;

17) артыкулы 19 і 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 29 июня 2006 г. № 137-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам лицензирования отдельных видов деятельности и признании утратившими силу некоторых законодательных актов Республики Беларусь»;

18) Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 кастрычніка 2006 г. № 173-З «О внесении дополнений и изменений в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

19) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2007 г. № 250-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам совершенствования системы профилактики безнадзорности и правонарушений несовершеннолетних, а также гражданского судопроизводства»;

20) артыкулы 6 і 7 Закона Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2007 г. № 251-З «О внесении изменений в некоторые законы Республики Беларусь»;

21) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 1 лістапада 2007 г. № 281-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь, признании утратившими силу некоторых актов законодательства Республики Беларусь и отдельных положений актов законодательства Республики Беларусь в связи с принятием Кодекса Республики Беларусь о судоустройстве и статусе судей»;

22) артыкул 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 301-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам уплаты государственной пошлины»;

23) Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 студзеня 2008 г. № 307-З «О внесении дополнений и изменений в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

24) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 г. № 315-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам государственной защиты детей в неблагополучных семьях»;

25) Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2008 г. № 346-З «О внесении дополнения в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь по вопросу обращения взыскания на жилой дом или квартиру, обремененные ипотекой»;

26) артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2008 г. № 349-З «О внесении изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам деятельности прокуратуры Республики Беларусь»;

27) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 366-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам защиты прав потребителей»;

28) Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 376-З «О внесении изменений и дополнений в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь по вопросам совершенствования приказного и исполнительного производства»;

29) Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 395-З «О внесении дополнений и изменений в Хозяйственный процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

30) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 397-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам оценочной деятельности»;

31) артыкул 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 г. № 417-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам деятельности органов внутренних дел Рэспублікі Беларусь»;

32) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 лістапада 2008 г. № 446-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам взыскания алиментов на детей»;

33) артыкул 11 Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2008 г. № 449-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам налогообложения»;

34) артыкулы 2 і 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2009 г. № 26-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам защиты государственных секретов и иной охраняемой законом тайны»;

35) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 г. № 77-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые кодексы Республики Беларусь»;

36) артыкул 4 Закона Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 г. № 96-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам регулирования земельных отношений»;

37) артыкул 63 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 104-З «О порядке и условиях направления граждан в лечебно-трудовые профилактории и условиях нахождения в них»;

38) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2010 г. № 166-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам защиты прав и законных интересов детей»;

39) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2011 г. № 241-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам совершенствования хозяйственного судопроизводства»;

40) артыкулы 2 і 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 3 ліпеня 2011 г. № 285-З «О внесении изменений и дополнений в Гражданский, Хозяйственный процессуальный, Гражданский процессуальный кодексы Республики Беларусь»;

41) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 302-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам совершенствования правового механизма пересмотра судебных постановлений»;

42) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 322-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам выезда из Республики Беларусь и въезда в Республику Беларусь»;

43) пункты 5 і 6 артыкула 51 Закона Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 334-З «Об адвокатуре и адвокатской деятельности в Республике Беларусь»;

44) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2012 г. № 337-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь»;

45) пункт 1 артыкула 45 Закона Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 2012 г. № 349-З «Об оказании психиатрической помощи»;

46) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2012 г. № 376-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам профилактики безнадзорности и правонарушений несовершеннолетних»;

47) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 411-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам нотариальной деятельности»;

48) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 417-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам подсудности дел военным судам»;

49) артыкулы 1 і 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 54-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам ипотеки»;

50) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 55-З «О внесении изменений и дополнений в Гражданский процессуальный и Уголовно-исполнительный кодексы Республики Беларусь»;

51) артыкулы 2 і 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 59-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые кодексы Республики Беларусь по вопросам развития медиации»;

52) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2014 г. № 174-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам совершенствования судопроизводства в судах, рассматривающих экономические дела»;

53) Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2014 г. № 175-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам совершенствования гражданского судопроизводства»;

54) артыкулы 1 і 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2016 г. № 356-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые кодексы Республики Беларусь»;

55) пункты 2 і 3 артыкула 133 Закона Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2016 г. № 439-З «Об исполнительном производстве»;

56) артыкулы 3 і 4 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2017 г. № 19-З «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь»;

57) Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 студзеня 2018 г. № 94-З «О внесении изменений и дополнений в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

58) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 124-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам защиты государственных секретов»;

59) артыкул 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 135-З «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь»;

60) Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2018 г. № 142-З «О внесении дополнения в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь»;

61) Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2019 г. № 233-З «Об изменении кодексов»;

62) артыкулы 2 і 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2019 г. № 277-З «Об изменении законов»;

63) пункты 1 і 2 артыкула 54 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 2019 г. № 281-З «О судебно-экспертной деятельности»;

64) артыкулы 1 і 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2020 г. № 45-З «Об изменении кодексов»;

65) артыкул 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2020 г. № 50-З «Об изменении законов по вопросам контрольной (надзорной) деятельности»;

66) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 снежня 2020 г. № 69-З «Об изменении кодексов»;

67) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2021 г. № 89-З «Об изменении законов по вопросам медиации»;

68) артыкулы 1 і 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2021 г. № 90-З «Об изменении законов по вопросам исполнительного производства»;

69) артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2021 г. № 104-З «Об изменении законов по вопросам противодействия экстремизму»;

70) артыкулы 1 і 2 Закона Рэспублікі Беларусь ад 27 мая 2021 г. № 113-З «Об изменении законов по вопросам адвокатской деятельности»;

71) артыкулы 2 і 3 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2023 г. № 284-З «Об изменении законов по вопросам конституционного судопроизводства».

**Артыкул 638. Пераходныя палажэнні**

1. Да прывядзення актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Кодэксам акты заканадаўствы прымяняюцца ў той частцы, у якой яны не супярэчаць гэтаму Кодэксу.

2. Вядзенне ў судах першай, апеляцыйнай, касацыйнай і нагляднай інстанцый па справах, не разгледжаных да ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса, ажыццяўляецца па правілах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

3. Справы, пачатыя вядзеннем да ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса, падведамныя судам па гэтым Кодэксе ў іншым відзе судаводства, разглядаюцца па правілах, якія дзейнічалі на момант узбуджэння вядзення справы.

4. Апеляцыйныя скаргі і апеляцыйныя пратэсты, прынятыя да вядзення эканамічным судом вобласці (горада Мінска) і не разгледжаныя да ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса, перадаюцца для разгляду ў судовую калегію Апеляцыйнага эканамічнага суда.

5. Наглядныя скаргі, што паступілі пракурорам абласцей, горада Мінска, а таксама наглядныя скаргі і пратэсты ў парадку нагляду, якія адпаведна паступілі і прынесеныя, прынятыя да вядзення абласным (Мінскім гарадскім) судом і не разгледжаныя да

ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса, разглядаюцца па правілах, устаноўленых главой 56 гэтага Кодэкса.

6. Касацыйныя скаргі і касацыйныя пратэсты, прынятыя да вядзення судовай калегіяй па эканамічных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь і не разгледжаныя да ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса, перадаюцца для разгляду ў прэзідыум Апеляцыйнага эканамічнага суда.

7. Наглядныя скаргі і пратэсты ў парадку нагляду, якія адпаведна паступілі і прынесеныя ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь і не разгледжаныя да ўступлення ў сілу гэтага Кодэкса, разглядаюцца па правілах, устаноўленых главой 57 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 639. Меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса**

1. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін:

1) сумесна з Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь і Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў падрыхтаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку прапановы аб прывядзенні законаў у адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

2) забяспечыць прывядзенне іншых актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Кодэксам;

3) прыняць іншыя меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Кодэкса.

2. Вярхоўнаму Суду Рэспублікі Беларусь у трохмесячны тэрмін падрыхтаваць і ўнесці ва ўстаноўленым парадку Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы па ўтварэнні Апеляцыйнага эканамічнага суда.

**Артыкул 640. Уступленне ў сілу гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс уступае ў сілу ў наступным парадку:

артыкулы 1–638 – з 1 студзеня 2026 г.;

іншыя палажэнні – пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Кодэкса.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**

(Неафіцыйны пераклад). Распаўсюджваецца згодна з пунктам 14 Палажэння аб дзейнасці па распаўсюджанні (прадастаўленні) прававой інфармацыі, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2010 г. № 712 «О совершенствовании государственной системы правовой информации Республики Беларусь».